# Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі ў 2009 годзе

## Аналітычны агляд

Менск 2010

# СІТУАЦЫЯ З ПРАВАМІ ЧАЛАВЕКА Ў БЕЛАРУСІ Ў 2009 ГОДЗЕ

## Аналітычны агляд

Аўтары: Бяляцкі Алесь
Рэвяка Тацяна
Стэфановіч Валянцін
Чавусаў Юрый

Рэдактары: Бяляцкі Алесь
Рэвяка Тацяна

У Аглядзе прадстаўлены аналіз сітуацыі з выкананьнем правоў і асноўных свабодаў чалавека ў Беларусі ў 2009 годзе. Зборнік утрымлівае найбольш яўныя і характэрныя факты парушэньняў правоў грамадзянаў за дадзены перыяд.

Агляд падрыхтаваны на падставе аналізу асабістых зваротаў ахвяраў парушэньняў правоў чалавека, фактаў, зафіксаваных праваабаронцамі, а таксама інфармацыі з адкрытых крыніцаў (spring96.org, baj.by, nn.by і іншых.)

У кнізе выкарыстаныя фотаздымкі Ю. Дарашкевіч, Н. Лойкі, У. Грыдзіна, С. Серабро, сайтаў spring96.org, photo.bymedia.net.

ISN 376-8-240057-22-9



# Уступ

Неадназначна складвалася сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі ў 2009 годзе, і гэты перыяд можна ахарактарызаваць як час нясправуджаных надзеяў.

Найбольшы ўплыў на сітуацыю з правамі чалавека ў 2009 годзе аказваў зьнешнепалітычны фактар. Відавочна, што ўлады выбралі тактыку фармальнага зьмяншэньня колькасьці рэпрэсіўных дзеяньняў, бо гэтага патрабавала неабходнасьць падвышэньня міжнароднага іміджу, імкненьне палепшыць узровень палітычных ды эканамічных кантактаў з Еўрапейскім Саюзам і ЗША, падключэньне Беларусі да новых праграмаў з ЕС, у прыватнасьці, да «Усходняга партнёрства» і дыялогу па правах чалавека. У гэтым годзе была фактычна зламаная палітычная ізаляцыя беларускага дзяржаўнага кіраўніцтва: упершыню за многія гады краіну наведаў адзін з лідэраў заходніх краінаў — прэм'ер-міністр Італіі Сільвіа Берлусконі ды еўрапейскія чыноўнікі высокага рангу — Генеральны сакратар Савету ЕС Хаўер Салана, камісар ЕС Беніта Ферэра-Вальднэр, міністры замежных справаў Іспаніі Мігель Анхел Марацінас, Чэхіі — Карэл Шварцэнберг, Славеніі — Самуэль Жбогар, Славакіі — Міраслаў Лайчак, а сам А.Лукашэнка быў запрошаны ў Літву, Украіну, Італію і Ватыкан.

Вызначэньне афіцыйнага накірунку разьвіцьця краіны па разнастайных пытаньнях па-ранейшаму заставалася за А.Лукашэнкам. Эканамічны крызіс паспрыяў павелічэньню значнасьці кантактаў з заходнімі краінамі, якія былі найбуйнейшай крыніцаю атрыманьня фінансавых крэдытаў праз МВФ. Доўгі час беларускія ўлады ігнаравалі крытыку еўрапейскіх краінаў па пытаньнях правоў чалавека і разьвіцьця дэмакратыі ў Беларусі. Падмуркам для такой абструкцыянісцкай пазіцыі была моцная эканамічная падтрымка беларускага рэжыму з боку Расіі ды адсутнасьць істотных рычагоў уплыву на беларускі рэжым з боку еўрапейскіх краінаў. Але ў апошнія два-тры гады эканамічная падтрымка з Расіі пачала імкліва скарачацца, і для захаваньня вельмі сумнеўнай «беларускай мадэлі разьвіцьця» спатрэбіліся заходнія крэдыты, у сувязі з чым рэзка ўзрасла роля эканамічных кантактаў з еўрапейскімі дэмакратычнымі краінамі.

Эканамічная сітуацыя прымусіла беларускі рэжым шукаць саюзьнікаў там, дзе раней яны бачылі толькі непрыяцеляў. Пасьля «аранжавай рэвалюцыі» палітычныя кантакты паміж кіраўніцтвам Украіны і Беларусі былі зьведзеныя да мінімуму. Беларускія афіцыйныя СМІ паказвалі палітычныя і эканамічныя рэформы, якія праходзілі ва Украіне, толькі ў негатыўным сьвятле. Больш таго, беларускі рэжым яшчэ больш абмежаваў дэмакратычныя свабоды ў Беларусі, каб не дапусьціць разьвіцьцё сітуацыі па ўкраінскім варыянце. Але ў апошнія гады ў суседняй Украіне, якая займае значна больш самастойную пазіцыю у стасунках з Расіяй, А.Лукашэнка ўбачыў магчымага стратэгічнага партнёра для сумесных палітычных ды эканамічных праектаў. 20 студзеня, сустракаючыся з прэзідэнтам Украіны Віктарам Юшчанкам, А. Лукашэнка падзякаваў яму «за тую каласальную падтрымку, якую вы аказвалі на розных узроўнях, сустракаючыся з еўрапейцамі і амерыканцамі. Тое, што сёньня наладжаны дыялог паміж Беларусьсю і Захадам, у гэтым ёсьць і вашая заслуга». Ён адзначыў, што абодва бакі могуць прапанаваць «шэраг праектаў, якія цікавяць Еўропу… Такіх праектаў ужо сёньня больш за дзясятак».

У лютым Беларусь наведаў Генеральны сакратар Савету ЕС Хаўер Салана. Падчас гэтай сустрэчы А.Лукашэнка выклаў сваё бачаньне разьвіцьця стасункаў паміж Беларусьсю і ЕС: «Дыялог у выглядзе гандлю непазьбежны ў палітыцы, але непажаданы. Гэта непатрэбна». Верагодна, меліся на ўвазе абавязковыя ўмовы па паляпшэньні сітуацыі з правамі чалавека і дэмакратыяй, якія вылучыў ЕС для наладжваньня больш шчыльных эканамічных кантактаў з Беларусьсю. Таксама А.Лукашэнка прапанаваў, «каб у нашых стасунках мы пастараліся выключыць усялякіх пасярэднікаў, якія нядобразычліва ставяцца да нашай краіны. Пасярэднікаў як у самой краіне, так і за яе межамі. А іх нямала». 17 сакавіка ў сваім эмацыйным выступе А.Лукашэнка расшыфраваў, каго ён меў на ўвазе: «Калі б мы ўсё апублікавалі, як працуе апазіцыя ў Бруселі, Стразбургу, іншых еўрапейскіх сталіцах і ў Амерыцы, дык вы б жахнуліся… як толькі мы паспрабавалі дамовіцца з еўрапейцамі і працэс гэты пайшоў у патрэбным накірунку, дык гэта выклікала ў іх істэрыю… У іх ці па п’яні ці ад нейкай дуры ўсё гэта палезла праз вушы, праз іншыя месцы, праз усе дзіркі… Некаторыя вялікія дзеячы, якіх мы з турмаў павыпускалі, аж енчаць уголас што трэба патрабаваць ад уладаў, ад Лукашэнкі, душыць, цкаваць





ў гэты час крызісу… Гэта страшная шкода, якую яны хочуць прынесьці нашай дзяржаве».

Адначасова спрадвечны еўраскептыцызм беларускіх уладаў, традыцыйна зарыентаваных на Расію, зьмяніўся іншай рыторыкай. Апроч заўсёдных выказваньняў А.Лукашэнкі пра тое, што «Расія — наш традыцыйны саюзьнік, і мы ніколі ўбок ад Расіі ня сыйдзем», загучалі іншыя сентэнцыі: «Беларусь — еўрапейская дзяржава, і нам ня трэба гэта даказваць», «Беларусь праводзць шчырую палітыку ў адносінах да ЕС», «Знаходзячыся ў цэнтры Еўропы, мы хацелі б мець самыя добрыя адносіны з нашым суседам — Еўрапейскім Саюзам» і гэтак далей.

Упершыню за многія гады у 2009 годзе адчулася выразнае жаданьне беларускіх уладаў далучыцца да агульнаеўрапейскіх структураў. Зноў жа гэтыя зьмены можна тлумачыць спажывецкім падыходам беларускіх уладаў, якія такім чынам хацелі палепшыць палітычны імідж краіны і падвысіць узровень эканамічных стасункаў з ЕС. Гэта датычылася найперш праграмы ЕС з шасьцю постсавецкімі краінамі (Малдовай, Украінай, Грузіяй, Арменіяй, Азербайджанам і Беларусьсю) «Усходняе партнёрства», дыялогу па правах чалавека ЕС з Беларусьсю, а таксама спробы аднавіць Беларусі статус сьпецыяльна запрошанай у Савеце Еўропы.

### *Беларусь і «Усходняе партнёрства»*

Далучэньне Беларусі да праграмы «Усходняе партнёрства» абумоўлівалася ЕС некаторымі фактарамі дэмакратычнага характару. На пачатку студзеня 2009 году Еўрапейскі парламент прыняў рэзалюцыю па Беларусі, дзе адзначалася, што «для значнага паляпшэньня адносінаў з ЕС» Беларусь павінна: 1. заставацца краінаю без палітзьняволеных; 2. гарантаваць свабоду СМІ; 3. працягваць супрацоўніцтва з АБСЕ па рэфармаваньні выбарчага заканадаўства; 4. палепшыць умовы для працы няўрадавых арганізацыяў; 5. гарантаваць свабоду сходаў і палітычных асацыяцыяў.

Фактычна ўсе гэтыя патрабаваньні і гучалі пры абмеркаваньні магчымасьці Беларусі далучыцца да «Усходняга партнёрства». Як тлумачыла ў студзені камісар ЕС Б.Ферэра-Вальднэр, «Усходняе партнёрства зьяўляецца нашай прапановай шасьці краінам з Усходу. Беларусь яшчэ сюды не ўваходзіць, таму што на самой справе існуе шмат засьцярогаў з прычыны яе дэмакратычнасьці.

Для пяці астатніх краінаў прапанова ў прынцыпе сапраўдная, але толькі пасьля таго, як яны выканаюць тое, што мы ад іх хочам: гэта значыць, ня будуць парушаць свабоду сродкаў масавай інфармацыі, свабоду сходаў і шмат іншых рэчаў. Тады мы будзем гатовыя зрабіць наступны крок. А наступны крок — гэта магчымасьць для кожнай з гэтых краінаў падпісаць дамову аб асацыяцыі з Эўрасаюзам». У іншым інтэрвію Б.Ферэра-Вальднэр назвала далейшыя эканамічныя перспэктывы: «Пасьля таго, як вашыя краіны ўвойдуць у СГА (Сусьветная гандлёвая арганізацыя), мы падпішам разнастайныя пагадненьні аб стварэньні паміж імі і ЕС зоны свабоднага гандлю. Мы хочам, каб у нас была сапраўдная эканамічная супольнасьць з нашымі суседзямі».

На пачатку сакавіка Б.Ферэра-Вальднэр яшчэ раз патлумачыла пазіцыю ЕС адносна далучэньня Беларусі да праграмы «Усходняе партнёрства»: «Мы прапанавалі Беларусі ўдзельнічаць у ёй, але для гэтага павінны быць выкананыя шэраг умоваў. У першую чаргу — працягнуць дэмакратычныя працэсы. Мы бачым, што адбываюцца пэўныя зьмены, выйшлі на свабоду палітычныя зьняволеныя. Але мы павінны быць асьцярожнымі. Павінны пераканацца ў меркаваньні, што зьмены ўкараніліся, што ня проста прыймаюцца нейкія касьметычныя меры, ня толькі дэкларуюцца».

У канцы лютага старшыня камісіі Эўрапарламенту па сувязях з Беларусьсю Яцак Пратасевіч заявіў, што існуюць розныя варыянты: як далучэньне Беларусі да «Усходняга партнёрства», так і адсутнасьць яе ў складзе ўдзельнікаў. Як вырашыцца гэтае пытаньне, заявіў Я.Пратасевіч, шмат у чым залежыць ад самой Беларусі. 4 сакавіка выказаў сумнеў наконт удзелу Беларусі ва «Усходнім партнёрстве» намесьнік міністра замежных справаў ФРГ па справах Эўропы Гюнтэр Глозер.

Такія асьцярожныя выказваньні эўрапейскіх палітыкаў мелі пад сабой падставу, паколькі мала што паказвала на сур’ёзнае жаданьне беларускіх уладаў пачаць працэс лібералізацыі ў краіне. У студзені адбыліся палітычна матываваныя прызывы ў войска моладзевых лідэраў: Франака Вячоркі — старшыні Моладзі БНФ, Івана Шылы — намесьніка старшыні «Маладога Фронту» і аднаго з кіраўнікоў арганізацыі Зьміцера Федарука. Усе яны мелі сур’ёзныя медыцынскія падставы для адтэрміноўкі службы ў войску, а іх прызыў адбываўся з ужываньнем гвалту і цынічным парушэньнем заканадаўства. У лютым у Менску былі гвалтоўна разагнаныя мірныя акцыі: 14 лютага — Дзень любові і 16 лютага — Дзень салідарнасьці. Пры тым, што нікога з удзельнікаў акцыяў не асудзілі, многія былі моцна зьбітыя пры затрыманьні і вымушаныя зьвярнуцца па медыцынскую дапамогу. 8 лютага ў Ваўкавыску былі арыштаваныя па сумнеўных падставах актывісты прадпрымальніцкага руху Мікалай Аўтуховіч, Уладзімір Асіпенка і Юры Лявонаў. 12 лютага быў узяты пад варту моладзевы актывіст Арцём Дубскі, адзін з асуджаных у 2008 годзе па справе «14-ці» за ўдзел у мірнай акцыі пратэсту прадпрымальнікаў, а 23 лютага Максіму Дашуку, удзельніку гэтага ж працэсу, было прад’яўленае абвінавачаньне «ва ўхіленьні ад адбыцьця пакараньня»; астатнія асуджаныя па «справе 14-ці» заставаліся абмежаванымі ў правах. На заснавальнікаў Партыі Беларуская Хрысьціянская Дэмакратыя, якія падалі дакументы на рэгістрацыю партыі, аказваўся моцны ціск з боку КДБ і дзяржаўных органаў улады. Па ўсёй краіне неабгрунтавана забаранялася правядзеньне мірных масавых мерапрыемстваў; за ўдзел у несанкцыянаваных акцыях затрымліваліся без складаньняў пратаколаў грамадзкія актывісты ў Менску, Віцебску, Магілёве, Баранавічах, былі асуджаныя да штрафаў у Менску і Гомелі. Заставаўся беспадстаўна невыязным з краіны старшыня АГП Анатоль Лябедзька, працягваліся абавязковыя праверкі пры перасячэньні мяжы праваабаронцаў Алеся Бяляцкага і Валянціна Стэфановіча. На пачатку сакавіка не пусьцілі ў Беларусь прадстаўніцу Фонду імя Стэфана Баторыя Агнешку Камароўску і кіраўніка Нацыянальнага дэмакратычнага інстытуту ва Украіне Дэвіда Гамільтона.

Пры гэтым створаныя ў студзені па ініцыятыве беларускіх уладаў Грамадзка-кансультацыйны савет пры Адміністрацыі прэзідэнта, Грамадзкі каардынацыйны савет у сьферы масавай інфармацыі і Міжведамасная рабочая група для выпрацоўкі плану дзеяньня па разьвіцьці краінавага маркетынгу з удзелам прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасьці не мянялі агульную сітуацыю татальнага кантролю ўладамі любых грамадзка-палітычных працэсаў.

Ацэньваючы разьвіцьцё сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, даволі рэзкую заяву ў гэты перыяд зрабіў кіраўнік дэлегацыі Эўрапарламенту па сувязях з Беларусьсю Яцак Пратасевіч, які рашуча асудзіў гвалтоўны прызыў у войска моладзевых актывістаў. Таксама выказала вялікае засмучэньне адсутнасьцю бачнага прагрэсу ў галіне правоў чалавека дзяржсакратар ЗША Хілары Клінтан. Ча-

совы паверaны ў справах ЗША Джанатан Мур на пачатку сакавіка заявіў: «Той факт, што два былых палітычных зьняволеных — Аўтуховіч і Лявонаў — зноўку знаходзяцца пад сьледзтвам, нас вельмі непакоіць. Таксама мы не разумеем, чаму ў лютым былі разагнаныя мірныя дэманстрацы. І, вядома, для Злучаных Штатаў застаецца нявырашаным пытаньне пра лёс амерыканскага грамадзяніна Эмануіла Зэльцэра, які амаль год знаходзіцца ў Беларусі за кратамі. Ягоны стан здароўя нас вельмі непакоіць, мы неаднаразова заклікалі беларускія ўлады вызваліць спадара Зэльцэра з гуманных меркаваньняў, але гэта не было зроблена».

Здавалася, што пытаньне пра ўступленьне Беларусі ва «Усходняе партнёрства» мае ўсё менш шанцаў на станоўчае вырашэньне, аднак вызначальнымі тут, на наш погляд, паслужылі два фактары.

Па-першае, нягледзячы на тое, што беларускія ўлады так і не прыступілі, як чакалася, да відавочных рэформаў у грамадзка-палітычным жыцьці краіны, еўрапейскія палітыкі захавалі спадзеў на тое, што праз уцягваньне беларускіх уладаў у еўрапейскія праграмы ўдасца актывізаваць гэты працэс. Большасьць беларускіх няўрадавых арганізацыяў, а таксама палітычных партыяў таксама выказаліся за ўключэньне Беларусі ў гэтую праграму, зыходзячы, у асноўным, з тых жа меркаваньняў.

Па-другое, вялікі ўплыў на прыняцьце станоўчага рашэньня аказаў фактар Абхазіі і Паўднёвай Асеціі, на прызнаньні незалежнасьці якіх беларускімі ўладамі моцна настойвалі расійскія ўлады. Яшчэ на пачатку году ў інтэрвью «Комсомольской правде» прэзідэнт Паўднёвай Асеціі Эдуард Какойты сказаў: «Лукашэнка кажа: я сваё слова стрымаю, абавязкова ў бліжэйшы час будзе прызнаньне. Мы на пахаваньні Алексія II нефармальна сустракаліся: я, Багапш і Лукашэнка». Але гэтыя рухі беларускіх уладаў, накіраваныя на прызнаньне Абхазіі і Паўднёвай Асеціі, не засталіся незаўважанымі і еўрапейскімі палітыкамі. Беніта Ферэра-Вальднэр заявіла: «Нашая пазіцыя ў адносінах Паўднёвай Асеціі і Абхазіі вядомая і нязьменная — мы не прызнаем незалежнасьці гэтых краінаў. Калі ж Беларусь прызнае іхнюю незалежнасьць, гэта моцна сапсуе нашыя ўзаемаадносіны, затармозіць усе нашыя ініцыятывы па збліжэньні». 23 лютага 2009 года Карл Шварцэнберг на паседжаньні Рады ЕС заявіў, што прызнаньне беларускім парламентам незалежнасьці Абхазіі і Паўднёвай Асеціі ўскладніць удзел





Беларусі ва «Усходнім партнёрстве». 16 сакавіка Хаўер Салана таксама пацьвердзіў, што «ў далейшых адносінах Беларусі і ЕС вялікае значэньне будзе мець тое, як вырашыць Менск пытаньне прызнаньня незалежнасьці Паўднёвай Асеціі і Абхазіі. У адваротным выпадку адносіны арганізацыі і Менску будуць перагледжаныя». Прызнаньня Беларусьсю Абхазіі і Паўднёвай Асеціі не адбылося. А.Лукашэнка паабяцаў, што рашэньне будзе прынятае пазьней новым парламентам.

Расія таксама непакоілася, што паляпшэньне стасункаў шасьці былых постсавецкіх краінаў з ЕС праз уключэньне ў праграму «Усходняе партнёрства» зробіць іх больш незалежнымі, паставіць пад пытаньне новыя і старыя геапалітычныя праекты Расіі на постсавецкай прасторы і яшчэ больш аддаліць шасьцёрку ад былой метраполіі. У інтэрвью газеце «Завтра» А. Лукашэнка адзначыў: «Трэба прызнацца, «Усходняе партнёрства» вельмі непакоіць кіраўніцтва Расіі. Мы ня раз абмяркоўвалі гэтую тэму з Дзьмітрыем Анатольевічам Мядзьведзевым. Мне здаецца, у вас не разумеюць, што значыць «Усходняе парнёрства», лічаць яго антырасійскай ініцыятывай Захаду. Можа быць, там і ёсьць такая задума. Але я вам дакладваю, сёньня мы гандлюем з Еўрапейскім Саюзам, і наш гандлёвы абарот роўны 47% і гадлёвы баланс с плюсам у наш бок… «Усходняе партнёрства» абяцае ў перспектыве «зону свабоднага гандлю», для нас гэта агромністая выгада. Мы атрымліваем магчымасьць пазычаць ў банках, у якіх і вы пазычаеце. І мы ўжо атрымалі крэдыт ад МВФ, які ў некалькі разоў выгаднейшы за крэдыт ад нашай брацкай Расіі». З гэтых выказваньняў выразна бачна, што ініцыятыву ЕС «Усходняе партнёрства» беларускія ўлады ацанілі як рэальны шанец узьняць гандлёва-эканамічныя стасункі з ЕС на іншы, больш высокі ўзровень, і дзеля гэтага беларускі бок гатовы быў нават ахвяраваць дадзенымі раней абяцаньнямі.

20 сакавіка Еўрасаюз уключыў Беларусь у праграму «Усходняе партнёрства», праўда, А. Лукашэнку на саміце ў Празе 7 траўня, дзе падпісваліся ўстаноўчыя дакументы, еўрапейскія палітыкі бачыць не пажадалі. Хаця яму перадалі афіцыйнае запрашэньне, але негатыўныя выказваньні асобных палітыкаў — прэзідэнта Чэхіі Вацлава Клаўса, міністра замежных справаў Галандыі Максіма Ферхагена, які заявіў, што «калі краіны «Усходняга партнёрства» хочуць паўнавартасных адносінаў з ЕС, дык няхай паважаюць на-

шыя каштоўнасці, дэмакратыю і правы чалавека», ды іншых прывялі да таго, што Беларусь у Празе прадстаўляў міністр замежных справаў Сяргей Мартынаў. Па выніках саміту ў Празе была прынятая ўстаноўчая дэкларацыя, у якой указвалася, што ініцыятыва «Усходняе партнёрства» будзе грунтавацца на адданасьці асноватворным прынцыпам, уключаючы дэмакратыю, вяршэнства законаў і павагу да правоў чалавека і асноўных свабодаў. Таксама было заяўлена, што ўзровень удзелу Беларусі ва «Усходнім партнёрстве» залежыць ад прагрэсу дэмакратычных рэформаў у краіне. У прыватнасьці, Б. Ферэра-Вальднэр адзначала, што «калі Беларусь зробіць выбар на карысьць рэформаў і большай адкрытасьці, ЕС гатовы даць пазітыўны адказ і дапамагчы Беларусі дзе толькі магчыма». У сваю чаргу, у ліпені А.Лукашэнка, выступаючы на нарадзе з кіраўнікамі замежных установаў Беларусі, такім чынам вызначыў месца краіны ў гэтай праграме: «Беларусь уваходзіць ва «Усходняе партнёрства» ня просьбітам, а раўнапраўным удзельнікам. Ступень нашага ўдзелу, умовы нашай прысутнасьці ў праграме будуць вызначацца, зыходзячы з нацыянальных інтарэсаў, а ня дзеля падзякі, што нас туды паклікалі… Дэмакратыі ў Беларусі ня меней, чым у суседзяў. Той дэмакратыі, якая паўсядзённа патрэбная простаму чалавеку і ягонай сям’і, а не балбатні за кошт замежных спонсараў».

Сур’ёзнай плямай на разьвіцьці праграмы «Усходняе партнёрства» з беларускім бокам зьявілася сітуацыя, якая паўстала пасьля першага паседжаньня Форуму грамадзянскай супольнасьці, што прайшоў у лістападзе ў Брусэлі. Форум, як пастаянны інструмент удзелу грамадзянскай супольнасьці ў праграме «Усходняе партнёрства», было вырашана стварыць падчас адкрыцьця праграмы ўвесну ў Празе. Глава МЗС Швецыі К.Більдт, выступіўшы на Форуме, у чарговы раз запэўніў удзельнікаў, што супрацоўніцтва з краінамі «Усходняга партнёрства» будзе будавацца як на міждзяржаўным узроўні, так і на ўзроўні грамадзянскіх супольнасьцяў. З Беларусі на Форум былі запрошаныя прадстаўнікі 27 арганізацыяў, і пасьля вяртаньня ў Беларусь адна з беларускіх удзельніц — пасьпяховая студэнтка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэту Тацяна Шапуцька (прадстаўляла «Малады Фронт») была адлічаная з юрыдычнага факультэту універсітэту за ўдзел у гэтым мерапрыемстве. Гэтае адлічэньне не засталося без увагі еўрапейскіх палітыкаў.





### *Дыялог ЕС і Беларусі па правах чалавека*

У чарговай рэзалюцыі Еўрапарламенту ад 2 красавіка, дзе выказвалася занепакоенасьць сітуацыяй з правамі чалавека ў Беларусі і былі выкладзеныя тыя пункты, якія Еўрапарламент лічыць неабходнымі вырашыць беларускім уладам за прадстаўленыя ім 9 месяцаў прыпыненьня санкцыяў, таксама выказвалася спадзяваньне, што ў найбліжэйшай будучыні пачнецца дыялог ЕС і Беларусі па правах чалавека.

Пра пачатак такога дыялогу Савет ЕС на ўзроўні міністраў юстыцыі краінаў ЕС абвясьціў 6 красавіка. Дамоўленасьць па гэтым пытаньні з беларускім бокам была дасягнутая яшчэ падчас візіту Хаўера Саланы ў Менск 19 лютага і ягонай сустрэчы з А. Лукашэнкам і міністрам замежных справаў С.Мартынавым. Савет ЕС адзначыў, што «мэтай гэтага дыялогу, з аднаго боку, зьяўляецца абмеркаваньне пытаньняў правоў чалавека ў Беларусі і краінах ЕС, а з іншага — абмеркаваньне пытаньняў, якія ўяўляюць агульную цікавасьць для абодвух бакоў і пашырэньне дыскусіі па правах чалавека ў шматбаковым калектыўным органе».

Вядома, што перад пачаткам дыялогу беларускія дыпламаты кансультаваліся з расійскім МЗС па тым, як вядзецца падобны дыялог паміж ЕС і Расіяй. У сваю чаргу, чэскія дыпламаты, якія арганізоўвалі гэты дыялог ад ЕС, у Менску сустракаліся з прадстаўнікамі няўрадавых арганізацыяў і дэмакратычных апазіцыйных партыяў. Улічваючы, што такі дыялог не прадугледжвае ўдзел прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасьці, пра ягоны зьмест мы можам меркаваць з афіцыйнага прэс-рэлізу прадстаўніцтва Еўракамісіі ў Беларусі, у якім сказана: «16-17 чэрвеня ў Празе Еўрапейскі Саюз і Беларусь правялі першы раунд дыялогу па правах чалавека… На сустрэчы бакі мелі магчымасьць абмяняцца поглядамі адносна сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі і ў ЕС. У прыватнасьці, бакі засяродзіліся на пытаньнях свабоды сходаў і аб’яднаньняў, абмяркоўваліся працоўныя правы, свабода выказваньняў і інфармацыі, свабода думкі, сумленьня і веравызнаньняў, барацьба з рознымі формамі нецярпімасьці і злачынстваў на глебе нянавісьці, правы мігрантаў і меншасьцяў, барацьба з гандлем людзьмі, абарона розных слабых групаў, сітуацыя ў турмах і папраўчых установах, а таксама сьмяротнае пакараньне». Як вынікае з гэтага прэс-рэлізу, «бакі таксама абмеркавалі перспектывы ўзнаўлень-

ня стасункаў Беларусі з Саветам Еўропы». Паміж бакамі дыялогу было дамоўлена, што такія сустрэчы будуць адбывацца як найменей раз на год.

Пакуль немагчыма казаць пра хуткую і бачную выніковасьць гэтага дыялогу, які мае хутчэй форму абмену думкамі, меркаваньнямі і занепакоенасьцямі без канкрэтных высноваў і дзеяньняў. Тым ня менш, відавочна, што беларускі ўрад яшчэ раз атрымаў выразныя сігналы адносна тых парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, якія турбуюць міжнародную супольнасьць.

### *Беларусь і Савет Еўропы*

Яшчэ ў красавіку 2009 году на сесіі Савету Еўропы Генеральны сакратар арганізацыі Тэры Дэвіс выказаўся за працяг дыялогу з урадам Беларусі, вітаючы дзеяньні ЕС у гэтым накірунку. Пытаньне ўзнаўленьня стасункаў Беларусі з Саветам Еўропы пачало даволі актыўна разьвівацца ў траўні-чэрвені. 26 траўня палітычны камітэт Парламенцкай асамблеі СЕ, выслухаўшы даклад сьпецыяльнага дакладчыка ПАСЕ па Беларусі Андрэа Рыгоні, прагаласаваў за вяртаньне парламенту Беларусі статусу сьпецыяльна запрошанага. У падрыхтаваным А.Рыгоні дакладзе былі ўказаныя канкрэтныя крытэрыі: «Мы просім, каб беларускімі ўладамі былі зробленыя наступныя крокі ў кірунку дэмакратызацыі краіны». Мелася на ўвазе: свабода ў рэгістрацыі палітычных аб’яднаньняў і рухаў, свабода СМІ, свабода выказваньня меркаваньняў, а таксама неабходнасьць увядзеньня мараторыю на сьмяротнае пакараньне і перагляд выбарчага заканадаўства. А.Рыгоні патлумачыў, што «ўвесь гэты працэс падлягае праверцы», якую будуць ажыцьцяўляць палітычны камітэт ПАСЕ і падкамітэт па Беларусі пры ўдзеле як прадстаўнікоў беларускага парламенту, так і грамадзянскай супольнасьці. «У маім дакладзе ўстаноўлены тэрмін у адзін год для таго, каб праверыць рэалізацыю гэтых крокаў», — адзначыў сьпецдакладчык.

8 чэрвеня Менск наведаў старшыня Камітэту міністраў СЕ, міністр замежных справаў Славеніі Самуэль Жбогар (з траўня па лістапад Славенія старшынствавала ў Камітэце міністраў СЕ), візіт якога быў прымеркаваны да адкрыцьця інфармацыйнага цэнтру Савету Еўропы. Падчас сустрэчы з міністрам замежных справаў Беларусі С.Мартынавым С.Жбогар сказаў, што дзеля таго, каб Беларусь у бліжэйшай будучыні была прынятая ў Савет Еўропы, Славенія «будзе прыкладаць усе намаганьні, каб зьдзейсьніць гэтую мэту». Ён спаслаўся на меркаваньне міністраў краінаў СЕ аб «вялікім прагрэсе Беларусі ў галіне дэмакратыі і павагі правоў чалавека». С.Мартынаў ў адказ заявіў, што «сітуацыя з дэмакратыяй і правамі чалавека ў Беларусі ніколькі ня горш чым у краінах-суседзях і краінах Еўрасаюзу». Пра важнасьць для беларускіх уладаў узнаўленьня сувязяў з Саветам Еўропы сьведчыць і той факт, што ў гэты ж дзень С.Жбогар быў прыняты А.Лукашэнкам. Падчас гэтай сустрэчы А.Лукашэнка заявіў: «Вы павінны быць абсалютна ўпэўненыя, што усё, што адбываецца ў стасунках з нашым заходнім партнёрам — Еўрапейскім Саюзам, гэта ня разавае мерапрыемства з нашага боку, ня нейкая там гульня — гэта зьдзяйсьненьне нашага даўняга стратэгічнага курсу».

Сітуацыя разьвівалася так, што пытаньне з узнаўленьнем парламенту Беларусі статусу сьпецзапрошанага ў ПАСЕ выглядала практычна вырашаным. 23 чэрвеня, выступаючы на сесіі Парламенцкай асамблеі СЕ, А.Рыгоні пералічыў станоўчыя крокі, зробленыя беларускімі ўладамі ў галіне дэмакратыі і правоў чалавека, адзначыўшы, што палітыка ізаляцыі беларускіх уладаў не была плённай, і заклікаў вырашыць гэтае пытаньне станоўча для Беларусі. Аднак нечакана як для беларускай афіцыйнай дэлегацыі, так і для замежных прыхільнікаў дадзенай пазіцыі, выступіў дэпутат Хрыстас Пургурыдэс, былы дакладчык ПАСЕ па Беларусі, аўтар дакладу аб палітычных зьніклых у Беларусі, які прапанаваў вярнуць статус сьпецзапрошанага парламенту Беларусі толькі пасьля ўвядзеньня ў краіне мараторыю на сьмяротнае пакараньне. Намесьнік старшыні Палаты прадстаўнікоў Валеры Іваноў, які прадстаўляў на сесіі ПАСЕ парламент Беларусі, паспрабаваў ратаваць сітуацыю, адзначыўшы, што «адмена або мараторый — умова для ўступленьня ў арганізацыю, але не для наданьня статусу сьпецзапрошанага». Але ў канчатковым выніку папраўка пра мараторый на сьмяротнае пакараньне была ўхваленая Парламенцкай Асамблеяй СЕ. Апроч гэтага, у прынятай рэзалюцыі дэпутаты заклікалі беларускія ўлады вызваліць усіх палітвязьняў, спыніць перасьлед актывістаў апазіцыі, спыніць прымусовы прызыў на вайсковую службу, скасаваць перашкоды пры рэгістрацыі грамадзкіх аб’яднаньняў, правесьці рэформу выбарчага заканадаўства, дазволіць дзейнасьць незалежных медыя, дазволіць правядзеньне мірных акцыяў пратэсту.

Трэба сказаць, што ўлады Беларусі не даравалі Х.Пургурыдэсу правалу сваіх палітычных планаў, і дэпутату было адмоўлена ў атрыманьні беларускай візы ў лістападзе, калі ён зьбіраўся прыехаць на Беларускі еўрапейскі форум.

### *Беларусь і Расія*

Актыўныя стасункі беларускіх уладаў з Захадам, пасьпяховасьць якіх залежала ад пастаўленых еўрапейцамі ўмоваў дэмакратызацыі беларускага рэжыму і захаваньня правоў чалавека, адбывался паралельна з ня менш актыўнымі кантактамі беларускіх уладаў з кіраўніцтвам Расіі. Гэтыя стасункі ў асноўным датычыліся вырашэньня эканамічных праблемаў і як ніколі раней суправаджаліся эканамічнымі спрэчкамі і адпаведнымі дзеяньнямі і каментарамі з двух бакоў. Хаця ніводнага разу паміж кіраўнікамі дзьвюх краінаў не вялося размоваў пра дэмакратыю ці правы чалавека, для нас гэтыя стасункі цікавыя з таго пункту гледжаньня, што яны зьяўляліся вельмі істотным фактарам, які ўплываў на геапалітычны разварот беларускага кіраўніцтва ў бок ЕС.

Яшчэ ў красавіку А.Лукашэнка заявіў, што ў Расіі «болей несумленных адносінаў да нас». Ён заклікаў беларускі ўрад «спыніцца поўзаць на каленях па іхніх кабінетах… Ня хочуць пускаць нас на свае рынкі — нам трэба шукаць іншыя вектары экспарту. Жыцьцё прымушае насісьці на іншыя рынкі». 29 траўня падобныя ўказаньні паўтарыліся. На наступны дзень пасьля сустрэчы з У.Пуціным А.Лукашэнка заявіў: «Наступае іншы час. Не атрымліваецца ў Расіі, ня трэба кланяцца, ня трэба ныць і плакаць. Трэба шукаць сваё шчасьце ў іншай частцы планеты. Я гэта ўсьвядомлена публічна кажу». Узьніклі цяжкасьці з атрыманьнем часткі крэдыту, паабяцанай урадам Расіі. На заўвагі расійскага віцэ-прэм'ера і міністра фінансаў А.Кудрына пра стан беларускай эканомікі А.Лукашэнка нярвова адрэагаваў: «Ён цалкам скансалідаваўся з нашымі адмарозкамі і пачынае нас вучыць працаваць».

На пачатку чэрвеня Расія абмежавала ўвоз беларускага малака, паколькі адбывалася, па словах расійскага губернатара Белгародзкай вобласьці «зьнішчэньне нашай малочнай галіны». Выбухнуў канфлікт, які ў прэсе назвалі «малочнай вайной». 14 чэрвеня беларускія ўлады заявілі аб няўдзеле беларускай дэлегацыі ў паседжаньні Арганізацыі Дамовы аб калектыўнай бясьпецы (АДКБ). Прэс-служба А.Лукашэнкі заявіла: «Эканоміка зьяўляецца фундаментам нашай агульнай бясьпекі. Аднак калі бліжэйшы саюзьнік Беларусі па АДКБ спрабуе, цалкам усьведамляючы тое, што адбываецца, зьнішчыць гэтую аснову, фактычна паставіць беларусаў на калені — як у такой сітуацыі можна казаць аб умацаваньні калектыўнай бясьпекі на агульнай прасторы Арганізацыі?» Больш за тое, Дзяржаўнаму сакратарыяту Савету бясьпекі Беларусі па даручэньні А.Лукашэнкі было загадана «ў сувязі з недружалюбнымі дзеяньнямі з боку Расіі… прыняць неабходныя меры па прагназаваньні магчымых далейшых акцыяў, накіраваных на нанясеньне эканамічных стратаў нашай краіне». Саміт АДКБ у Маскве, на якім было падпісанае пагадненьне аб Калектыўных сілах аператыўнага рэагаваньня АДКБ, адбыўся без Беларусі. На паседжаньні прэзідыуму расійскага ўраду віцэ-прэм'ер Расіі Сяргей Сабянін заявіў, што беларускія ўлады «занадта палітызуюць гэтае пытаньне і робяць вельмі некарэктныя заявы, што ў цэлым ускладняе вядзеньне перамоваў». На гэта прэм'ер-міністр Расіі У.Пуцін заўважыў: «Некарэктныя — гэта, вядома, нядобра, але крыўдзіцца ня трэба. Крызіс, стомленасьць, стрэсы…»





### *Беларусь і Еўрапейскі Саюз*

Адразу пасьля абвастрэньня беларуска-расійскіх адносінаў тэрміновае запрашэньне наведаць Менск у чэрвені атрымала камісар ЕС Б.Ферэра-Вальднэр. Як яна паведаміла журналістам, «прэзідэнт Беларусі сам сказаў мне, каб я прыехала як мага хутчэй». Падчас гэтага візіту Бенітай Ферэра-Вальднэр былі фактычна паўтораныя тыя патрабаваньні да беларускіх уладаў з боку ЕС, якія гучалі раней: «Мы ясна ставім задачу: трэба зрабіць значна болей, і Беларусь мае перад сабой іншы шлях. Мы хочам бачыць болей прагрэсу у такіх сьферах, як свабода СМІ, недзяржаўных арганізацыяў (іх рэгістрацыя павінна быць прасьцей і умовы працы лепей), грамадзянская супольнасьць (яна павінна мець права на выказваньне сваіх поглядаў без перасьледу і арыштаў). Беларусь таксама павінна вызваліць усіх палітычных зьняволеных. Мы шчыра хочам бачыць Беларусь як паўнапраўнага партнёра ў палітыцы суседства Еўрасаюзу і ва «Усходнім партнёрстве».

У ліпені ў Брусэлі адбыліся перамовы міністра замежных справаў Беларусі С.Мартынава і кіраўніцтва ЕС: міністра замежных

справаў Швецыі Карла Більдта, Вярхоўнага прадстаўніка ЕС па зьнешняй палітыцы і палітыцы бясьпекі Хаўера Саланы і камісара ЕС Беніты Ферэра-Вальднэр. З каментароў удзельнікаў сустрэчы відаць, што еўрапейская тройка ў цэлым была незадаволеная тымі тэмпамі рэформаў у Беларусі, на якія яны спадзяваліся пасьля далучэньня Беларусі да праграмы ЕС «Усходняе партнёрства». Б.Ферэра-Вальднэр заявіла, што ў сваіх стасунках ЕС і Беларусь «падыйшлі да скрыжаваньня, і ў агульных інтарэсах надаць ім новы імпульс». К.Більдт, які прадстаўляў старшынюючую ў ЕС Швецыю, паведаміў, што падчас сустрэчы бакі адкрыта абмеркавалі палітычную сітуацыю, якая «не адпавядае чаканьням» ЕС. Абмяркоўвалася становішча ў галіне правоў чалавека: «абмежаваньне палітычных свабодаў, праблемы з рэгістрацыяй і працай у арганізацыях грамадзянскай супольнасьці і палітычных партыях, а таксама пытаньне ўжываньня ў Беларусі сьмяротнага пакараньня».

С.Мартынаў, адказваючы на пытаньні інфармагенцтва «Agence Europe», у чарговы раз падкрэсьліў, што беларускі ўрад хацеў бы бачыць супрацоўніцтва з ЕС толькі ў эканамічнай сьферы: «Зьвярніце ўвагу на тое, чаго чакае ЕС ад сваіх партнёраў. Як мы разумеем, гэта перш за ўсё стабільнасьць і эканамічны дабрабыт — менавіта на гэтых крытэрыях заснаваная ініцыятыва «Усходняе партнёрства». Далей выказаўся адносна патрабаваньняў з боку ЕС у галіне правоў чалавека: «Вельмі важна мець на ўвазе, што, кажучы пра паляпшэньні, мы мяркуем не пра паляпшэньні пад ціскам ці жорсткім наглядам ЕС, а пра рэформы ўнутры нашага грамадства, ад якіх будзе карысьць для нас саміх».

А.Лукашэнка, у сваю чаргу, зьмены ў зьнешняй палітыцы краіны ўспрымаў як рэальную пагрозу для свайго неабмежаванага ўладараньня. У жніўні ён выказаўся на гэтую тэму: «Скажу аб адной праблеме. Калі будуць нам ставіць умовы і разьлічваць, што нібыта Лукашэнку няма куды дзявацца, як некалі Расія думала, што ў іх з Расіяй дрэнныя адносіны, дык нічога не атрымаецца… У нас добрыя з Расіяй адносіны, выдатныя у нас з Расіяй адносіны… Калі хто на Захадзе думае, што ў нас з Расіяй сапсаваліся адносіны, і мы Лукашэнку падкруцім, і ён усіх злачынцаў з турмаў павыпускае, зламае заканадаўства, дык яны памыляюцца!... Калі на Захадзе разьлічваюць, што шляхам нейкіх махінацыяў, мерапрыемстваў гэтую ўладу можна адняць у цяперашняй улады і апазіцыі перадаць, дык таксама нічога не атрымаецца… Я хачу каб еўрапейцы вялі шчыры, прыстойны, сумленны дыялог і не спрабавалі праз калена сагнуць і нахіліць нас». У выніку, ня гледзячы на абяцаньні падчас міжнародных сустрэчаў палепшыць сітуацыю з правамі чалавека ў краіне, ніякіх рэальных зьменаў не адбывалася.

16 сьнежня ў Еўрапарламенце прайшлі дэбаты па сітуацыі ў Беларусі, падчас якіх еўракамісар па разьвіцьці і гуманітарнай дапамозе Карэл дэ Гюхт заявіў, што калі Менск пойдзе на істотныя і незваротныя крокі ў галіне дэмакратызацыі, правоў чалавека і вяршэнства закону, тады ЕС уключыць краіну ў Еўрапейскую палітыку добрасуседзтва і пашырыць узаемадзеяньне. Камісар ЕС Б.Ферэра-Вальднэр паведаміла, што Савет ЕС даручыў Камісіі ЕС распрацаваць прамежкавы план супрацоўніцтва з Беларусьсю ў рамках Еўрапейскай палітыкі добрасуседзтва. Па яе словах, гэты план будзе складацца разам з уладамі і грамадзянскай супольнасьцю Беларусі і дапаможа пачаць дыялог таксама і па палітычных пытаньнях. Б.Ферэра-Вальднэр заявіла: «Павага да правоў і свабодаў у Беларусі павінна стаць нормай». 17 сьнежня Еўрапарламентам была прынятая чарговая рэзалюцыя, датычная сітуацыі з правамі і свабодамі ў Беларусі, у якой выказвалася шкадаваньне, што пасьля шэрагу станоўчых крокаў беларускіх уладаў не адбылося істотнага прагрэсу ў галіне правоў і свабодаў.

### *Беларускія ўлады і грамадзянская супольнасьць*

Новая геапалітычная сітуацыя вымагала ад беларускіх уладаў зьмяненьня тактыкі і ў адносінах да грамадзянскай супольнасьці: 2009 год адзначаўся фармальным зьмяншэньнем рэпрэсіўных дзеяньняў, аднак цалкам ад іх адмовіцца ўлады не змаглі. Толькі ў дзень салідарнасьці 16 ліпеня ў Менску, Баранавічах, Віцебску было арыштавана каля 70 удзельнікаў мірных акцыяў, многія з іх былі зьбітыя міліцыяй. 7 ліпеня Асіповіцкі раённы суд за парушэньне правілаў адбыцьця пакараньня пакараў фігуранта «працэсу 14-ці» маладафронтаўца Арцёма Дубскага пазбаўленьнем волі на адзін год. У чэрвені-ліпені, з яўным выклікам міжнароднай супольнасьці, былі вынесеныя два новыя сьмяротныя прысуды. Пракуратура выносіла папярэджаньні грамадзкім актывістам за незаконную дзейнасьць ад імя незарэгістраваных арганізацыяў: такое папярэджаньне ў жніўні атрымаў актывіст «Маладога фронту з Берасьця Міхась Ільлін, а ў сьнежні — ягоная паплечніца Юлія

Пашко. У чэрвені супраць прадстаўніка незарэгістраванай рэлігійнай арганізацыі «Рух яднаньня» (царквы Муна), менчука Яўгена Волкава была ўзбуджаная крымінальная справа па артыкуле 193.1 Крымінальнага кодэксу з гэтым жа абвінавачаньнем.

Працягваўся перасьлед уладамі акатывістаў польскай нацыянальнай меншасьці. Так, 23 чэрвеня на шашы Горадня — Менск міліцыянты затрымалі намесьніка старшыні непрызнанага ўладамі «Саюзу палякаў на Беларусі» (СПБ) Мечыслава Яскевіча, прэс-сакратара СПБ Ігара Банцара, журналіста газеты «RzeczPospolita» Анджэя Пісальніка і журналіста выданьня «Gazeta Wyborcza» Андрэя Пачобута. У Шчучынскім РАУСе іх пратрымалі тры гадзіны, канфіскаваўшы газету «Glos znad Niemna na uchodzstwie» і часопіс «Magazyn Polski», што выдаюцца СПБ. Міліцыянты патлумачылі, што затрыманьне было зьвязанае з інфармацыяй аб тым, што яны вязуць нібыта антыдзяржаўныя выданьні. А ў жніўні А.Пісальнік атрымаў папярэджаньне пракуратуры Гарадзенскай вобласьці за перавозку незарэгістраваных выданьняў, якія знаходзіліся ў аўтамабілі журналіста.

Міністэрства юстыцыі пасьлядоўна адмаўляла ў рэгістрацыі новым палітычным партыям і грамадзкім арганізацыям: Партыі «Беларуская хрысьціянская Дэмакратыя», Партыі свабоды і прагрэсу, Беларускай партыі працоўных, праваабарончым арганізацыям «Наша Вясна» і «Брэсцкая вясна», моладзевай арганізацыі «Маладыя дэмакраты» ды іншым.

Па-ранейшаму замежныя грамадзкія дзеячы, няўгодныя беларускім уладам, не маглі наведаць Беларусь. Так, у жніўні беларускі кансулят у Парыжы адмовіў Прэзідэнту Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека (FIDH) Сухайр Белхасэн у атрыманьні беларускай візы. Падчас свайго візіту С. Белхасэн планавала сустрэцца з прадстаўнікамі грамадзянскай супольнасьці, а таксама прыняць удзел у слуханьні справы па адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі ГПА «Наша Вясна» ў Вярхоўным судзе.

Працягваўся судовы перасьлед вернікаў. 14 ліпеня судзьдзя Баранавічаў і Баранавіцкага раёну Аксана Сарахман аштрафавала на 10 базавых велічыняў царкву «Новае пакаленьне» аб’яднаньня абшчын хрысьціян поўнага Евангельля за «нестатутную дзейнасьць», а 12 жніўня судзьдзя Чыгуначнага райсуду Гомелю Віталь Козыраў пакараў штрафам у памеры 30 базавых велічыняў кіраўніка рэлігійнай суполкі «Сьведкі Іеговы» Юрыя Рашэтнікава за правядзеньне рэлігійнай сустрэчы, што было расцэнена судом як парушэньне парадку арганізацыі масавага мерапрыемства.





Фіксаваліся выпадкі канфіскацыі друкаваных матэрыялаў, пракурорскіх папярэджаньняў журналістаў за дзейнасьць без акрэдытацыі. Так, 14 ліпеня пракуратура Менскай вобласьці вынесла папярэджаньні за «незаконную журналісцкую дзейнасьць» сябрам ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» Аксане і Аляксандру Калінкіным за супрацоўніцтва з расійскім «Телеканалом благих новостей» (ТБН). 29 ліпеня пракуратура Гарадзенскай вобласьці вынесла афіцыйнае папярэджаньне галоўнаму рэдактару часопіса «Магазын польскі» Ігару Банцару за тое, што часопіс непрызнанага ўладамі «Саюзу палякаў на Беларусі» ня ўтрымлівае выходных дадзеных. 21 жніўня сябра БАЖ Вольга Шарапкіна з Магілёву атрымала папярэджаньне ад пракуратуры Чавускага раёну за дзейнасьць без акрэдытацыі. Нагодай для пакараньня стаў тэлесюжэт пра чавускі дзіцячы прытулак недзяржаўнаму тэлеканалу «Белсат».

1 верасьня, абагульняючы сітуацыю са станам дэмакратыі ў Беларусі, амбасадар Вялікабрытаніі ў Беларусі Найджэл Гулд-Дэвіс адзначыў: «ЕС спадзяваўся на пастаянную дынаміку ў стасунках з Беларусьсю, але я павінен сказаць, што тэмпы вельмі запаволіліся… Еўрасаюз гатовы працягваць паглыбленьне супрацоўніцтва, але наўзамен чакае пэўных намаганьняў».

Аднак беларускія ўлады і надалей не сьпяшаліся сур’ёзным чынам зьмяніць сітуацыю. 9 верасьня ў Менску была жорстка разагнаная мірная акцыя пратэсту супраць уводу расійскіх войскаў на тэрыторыю Беларусі, прымеркаваная да пачатку сумесных беларуска-расійскіх вайсковых вучэньняў «Захад-2009». Супрацоўнікамі міліцыі былі затрыманыя каля 30 чалавек, 17 з якіх былі прыцягнутыя да адміністрацыйнай адказнасьці ў выглядзе штрафаў. Затрыманьні суправаджаліся выкарыстаньнем фізічнай сілы, нецэнзурнай лаянкай, журналістам забаранялі здымаць разгон акцыі. У РУУС Цэнтральнага раёну міліцыянты прымусілі затрыманых стаяць каля сьцяны чатыры гадзіны, а некаторых моцна білі. Відавочна, што такім жорсткім разгонам мірнай акцыі ўлады адмыслова хацелі паказаць расійскаму боку, што яны кантралююць сітуацыю ў краіне і не дазволяць дэмакратычнай апазіцыі ставіць пад сумнеў сумесныя беларуска-расійскія вайсковыя дамовы. Пасьля вучэньняў А.Лукашэнка адзначыў: «Гэтыя вучэньні мы правялі не

з амерыканцамі, ня з блокам НАТА, а з нашымі расіянамі. І толькі ідыёт пасьля гэтага можа сказаць, што Лукашэнка павярнуў на Захад ці яшчэ кудысьці і кінуў Расію».

16 верасьня, у 10-ю гадавіну зьнікненьня апазіцыйнага палітыка Віктара Ганчара і бізнэсоўцы Анатоля Красоўскага, сталічная міліцыя зноў разагнала мірную акцыю. У Менску было затрымана больш за дваццаць чалавек, міліцыянты ў цывільным не дазвалялі здымаць фота- і тэлекарэспандэнтам ход падзеяў. Пры затрыманьні супрацоўнікі міліцыі моцна зьбівалі дэманстрантаў, абражалі іх. Усіх затрыманых адвезьлі ў пастарунак, адкуль вызвалілі без складаньня пратаколаў. Адначасова на затрыманых удзельнікаў аналагічнай акцыі ў Гомелі былі складзеныя адміністрацыйныя пратаколы за правядзеньне несанкцыянаванага масавага мерапрыемства (арт. 23.34. КаАП РБ), затым яны былі асуджаныя і аштрафаваныя.

17 верасьня Швецыя, «як краіна, якая старшынюе ў Еўрапейскім Саюзе, заклікала беларускія ўлады ўстрымацца ад ужываньня гвалту ў адносінах да мірных дэманстрантаў, а таксама абараніць праўстаўнікоў незалежных СМІ ад умяшальніцтва ў іхнюю працу». Тым ня менш, 16 кастрычніка, у чарговы Дзень салідарнасьці, у Менску зноў была разагнаная мірная акцыя, было затрымана 22 чалавекі, многія ўдзельнікі былі зьбітыя, а журналістам не давалі асьвятляць падзею. Такім чынам, тактыка зьбіцьця дэманстрантаў у Менску ўжывалася міліцыянтамі на працягу ўсяго году, пры гэтым ніводная з пададзеных зьбітымі дэманстрантамі скаргаў не была па сутнасьці разгледжаная пракуратурай.

У верасьні на сесіі Савету ААН па правах чалавека была выказаная «глыбокая заклапочанасьць» у сувязі з парушэньнем правоў чалавека ў Беларусі. Падобныя выказваньні гучалі ад дэлегацыяўудзельнікаў на нарадзе АБСЕ па чалавечым вымярэньні ў кастрычніку. 28 кастрычніка памочнік дзяржсакратара ЗША па справах Эўропы і Еўразіі назваў крокі беларускіх уладаў у галіне правоў чалавека «сьціплымі» і заявіў пра іх недастатковасьць для сапраўднага пацяпленьня адносінаў паміж ЗША і Беларусьсю.

У сваю чаргу ў кастрычніку А.Лукашэнка паведаміў, што еўрапейцы «павінны зразумець, што мы можам пайсьці на тыя саступкі і ўмовы, якія не супярэчаць інтарэсам народа, суседзям і Еўропе ў цэлым… Дзесяцігодзьдзе санкцыяў, якія ЕС накіраваў супраць нас, не дало вынікаў».





***Офіс АБСЕ ў Менску***

Кіраўнік Офісу АБСЕ ў Менску амбасадар Ханс-Ёган Шмідт у верасьні пакінуў Беларусь раней тэрміну спыненьня ягоных паўнамоцтваў, якія ў яго былі сапраўднымі да лютага 2010 году. Перад гэтым у цэнтральны офіс АБСЕ ў Вене на працягу некалькіх месяцаў было пададзена некалькі скаргаў на дзеяньні ці выказваньні дыпламата ад дэмакратычных палітычных партыяў ды арганізацыяў.

27 траўня Х.Шмідт падчас сустрэчы з сустаршынём Аб'яднаных дэмакратычных сілаў (АДС), старшынём Аб'яднанай грамадзянскай партыі А.Лябедзькам паведаміў, што эксьперты БДІПЧ/АБСЕ і Венецыянскай камісіі ня будуць разглядаць прапановы па зьменах Выбарчага кодэксу, якія падрыхтавалі эксьперты дэмакратычных партыяў ды НДА, а разгледзяць толькі прапановы ўлады. У выніку па тлумачэньні гэтага выказваньня да старшыні АБСЕ і дырэктара БДІПЧ/АБСЕ зьвярнуўся прэзідыум АДС.

У чэрвені Х.Шмідт даў інтэрвію інфаагенцтву БелаПАН, дзе дазволіў сабе некалькі неадназначных выказваньняў. Так, дыпламат заявіў: «Я абараняю тэзіс, што інтарэсам АБСЕ супярэчыць засяроджваньне ўвагі выключна, напрыклад, на парушэньнях правоў чалавека. Я прыхільнік прагматычнага падыходу…». Каментуючы стасункі Захаду з Беларусьсю, Х.Шмідт адзначыў, што «і з боку Захаду ёсьць сустрэчны рух, ёсьць разуменьне, што настаў час адмовіцца ад безвыніковай палітыкі ізаляцыі, якой мы прытрымліваліся дванаццаць гадоў… У апошнія месяцы наш офіс карыстаўся вялікай падтрымкай і разуменьнем і ў Беларусі — з боку як дзяржаўных структураў, так і некаторых грамадзкіх арганізацыяў».

Тады ж, у чэрвені, амбасадар Офісу АБСЕ стаў арганізатарам прыезду ў Менск нямецкага эксьперта — прафесара Марціна Фінке, сьпецыяліста ў галіне крымінальна-працэсуальнага права, які быў дапушчаны беларускімі ўладамі да вывучэньня маючай палітычны падтэкст справы ваўкавыскіх прадпрымальнікаў — Мікалая Аўтуховіча, Юрыя Лявонава і Уладзіміра Асіпенкі. Эксьперт сьцьвердзіў, што справа ў адносінах да прадпрымальнікаў расьследуецца без юрыдычных парушэньняў. Па ягоных словах, ён зрабіў высновы «абапіраючыся на думку маючых дачыненьне службовых асобаў, якая была імі выкладзена, і матэрыялы справы». Эксьперт адзначыў, што не чытаў усю справу, «але ўсё, што я хацеў убачыць, я бачыў». Падчас знаходжаньня ў Беларусі эксьперт не сустрэўся з ад-

вакатамі падсьледных, ні з імі самімі, і пра ягоны візіт стала вядома толькі пасьля яго заканчэньня. Адвакат М.Аўтуховіча Павел Сапелка заявіў, што гэта зьяўляецца «абуральным беззаконьнем»: «Нават мне, абаронцы, не прадстаўляюць ніякіх матэрыялаў, апроч прадугледжаных законам».

У жніўні, ацэньваючы працу Офісу АБСЕ у інтэрвію Радыё Рацыя, старшыня АГП Анатоль Лябедзька адзначыў: «На жаль, вымушаны канстатаваць, што офіс АБСЕ перастаў быць генератарам якіх-небудзь ідэяў, ініцыятываў, прапановаў. Ягоная дзейнасьць скурчылася да функцыі кулуарнага дарадцы беларускіх уладаў. Ня больш таго… Ён перастаў быць якім-небудзь важным фактарам. Нейкія дробныя ініцыятывы, нейкія дробныя скандалы. Гэта выраджэньне офісу АБСЕ у Беларусі». Палітык заявіў, што пасол Х.Шмідт амаль перастаў супрацоўнічаць з дэмакратычнай апазіцыяй.

У сваю чаргу, пасьля таго, як стала вядома пра адстаўку Х.Шмідта, кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі Уладзімір Макей заявіў, што «беларускі бок вымушаны сур’ёзна задумацца над перcьпектывамі далейшай дзейнасьці Офісу АБСЕ ў Менску, у тым ліку ў адносінах да прызначэньня яго новага кіраўніка».

30 сьнежня Беларусь падчас паседжаньня Пастаяннага Савету АБСЕ ў Вене беларускія ўлады пагадзіліся працягнуць мандат Офісу яшчэ на год, хаця і падкрэсьлілі, што «няма ніякіх аб’ектыўных падставаў для прысутнасьці ў Менску Офісу АБСЕ». У заяве МЗС вельмі жорстка была рэгламентаваная дзейнасьць Офісу, у прыватнасьці, падкрэсьлівалася, што праекты і праграмы ў Беларусі Офіс павінен рэалізоўваць толькі пасьля кансультацыяў і згоды беларускіх уладаў, а таксама у супрацоўніцтве з імі. Фінансаваньне праектаў з па-забюджэтных фондаў бяз згоды Менску, праекты, якія не адпавядаюць патрэбам Беларусі, — немагчымыя. «Офіс павінен адмовіцца ад палітычнай ацэнкі падзеяў і прагнозаў разьвіцьця сітуацыі ў краіне» і можа праводзіць маніторынг тых галінаў, дзе «аказвае падтрымку беларускаму ўраду». Аналіз асобных падзеяў і фактаў без афіцыйнага пункту погляду недапушчальны. У выпадку «парушэньня Офісам АБСЕ свайго мандата і ажыцьцяўленьні дзейнасьці, якая выходзіць за ўзгодненыя параметры, беларускі бок пакідае за свабой права спыніць яго дзейнасьць у Менску». Новым кіраўніком Офісу АБСЕ у Менску пасьля кансультацыяў кіраўніцтва АБСЕ з беларускім урадам быў прызначаны чарговы нямецкі дыпламат Бенедэкт Халер.





### *Зьмены ў выбарчым заканадаўстве*

Удасканаленьне выбарчага заканадаўства зьяўлялася адной з пяці ўмоваў ЕС для паляпшэньня стасункаў з Беларусьсю.

Яшчэ ў студзені Менск наведаў дырэктар БДІПЧ/АБСЕ Янез Ленарчыч для абмеркаваньня рэкамендацыяў АБСЕ па паляпшэньні выбарчай сістэмы ў Беларусі. Такія рэкамендацыі апошні раз ад АБСЕ беларускія ўлады атрымалі ў выніковай справаздачы БДІПЧ пасьля правядзеньня парламенцкіх выбараў у 2008 годзе. Падчас візіту Я.Ленарчыч сустрэўся з міністрам замежных справаў С.Мартынавым, кіраўніком Адміністрацыі прэзідэнта У.Макеем, главой Цэнтральнай камісіі Л.Ярмошынай. Выніковы прэс-рэліз быў даволі аптымістычны: «Бюро АБСЕ па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека (БДІПЧ) будзе працаваць з уладамі Беларусі над рэформай выбарчай сістэмы краіны. Дамоўленасьць пра гэта была дасягнута падчас двухдзённага візіту ў Менск дырэктара БДІПЧ Янеза Ленарчыча».

Па выніках у Беларусі была створаная працоўная эксьпертная група па ўдасканаленьні выбарчага заканадаўства на чале з дырэктарам Нацыянальнага цэнтру заканадаўства і прававых дасьледаваньняў, намесьнікам старшыні ЦВК Валерыем Міцкевічам. 10-11 лютага адбылася першая сустрэча паміж прадстаўнікамі беларускай эксьпертнай групы і эксьпертамі БДІПЧ. У сакавіку сакратар ЦВК М.Лазвік паведаміў: «Зараз эксьпертная група працуе над заўвагамі і прапановамі БДІПЧ/АБСЕ. Але сама група ня мае права ўносіць зьмены і дадаткі ў выбарчае заканадаўства. Таму яна вырашае юрыдычны бок пытаньня… Далей прэзідэнт і парламент будуць вырашаць, якія прапановы БДІПЧ прымаць, а якія пакінуць на дыскусійным узроўні». Беларускія дэмакратычныя партыі і няўрадавыя арганізацыі распрацавалі свой праект зьменаў і дадаткаў у Выбарчы кодэкс, які быў перададзены як беларускім уладам, так і прадстаўнікам міжнароднай супольнасьці.

Пасьля гэтага ў пытаньні зьменаў выбарчага заканадаўства настала даволі працяглая паўза. У чэрвені камісар ЕС Б.Ферэра-Вальднэр падчас візіту ў Беларусь заявіла, што ЕС чакае ад беларускіх уладаў станоўчых зьменаў выбарчага заканадаўства. Гэтую тэму ў чэрвені ў інтэрвію закранаў таксама і кіраўнік офісу АБСЕ ў Менску Х.Шмідт, які паведаміў, што праект зьменаў выбарчага заканадаўства яшчэ не перададзены ў АБСЕ: «Мы спадзяемся, што

ў бліжэйшы час атрымаем магчымасьць прааналізаваць і пракаментаваць гэтыя новаўвядзеньні з дапамогаю Венецыянскай камісіі. Паглядзім, ці змогуць беларускія ўлады адэкватна адказаць на рэкамендацыі БДІПЧ». Дыпламат таксама паведаміў, што «мы гатовыя арганізаваць круглы стол па гэтай праблеме з удзелам прадстаўнікоў дзяржструктураў і грамадзянскай супольнасьці, каб абмеркаваць гэтыя праблемы максімальна празрыстым чынам». У гэты ж час сакратар ЦВК М.Лазавік удакладніў, што прапановы БДІПЧ перададзеныя «на разгляд ў дзяржаўныя органы, у першую чаргу, у Адміністрацыю прэзідэнта».

У верасьні, падчас сустрэчы ў Варшаве кіраўнік БДІПЧ/АБСЕ Янез Ленарчыч паведаміў старшыні Праваабарончага цэнтру «Вясна» Алесю Бяляцкаму, што кантакты з беларускімі ўладамі наконт магчымых зьменаў выбарчага заканадаўства спыніліся фактычна з вясны. У кастрычніку тое самае пачулі ад Я.Ленарчыча старшыня АГП А.Лябедзька і С.Багданкевіч.

Сітуацыя была размарожаная ў кастрычніку, калі адбылася сустрэча А.Лукашэнкі са старшынём ЦВК Л.Ярмошынай. Зьмены ў заканадаўства Л.Ярмошынай былі выказаныя ў выглядзе «ідэяў Цэнтральнай камісіі». Сярод такіх «ідэяў» прагучалі прапановы вызначыць пэўныя параметры для прадстаўніцтва ў выбарчых камісіях палітычных партыяў і абмежаваць колькасьць дзяржаўных чыноўнікаў; спрасьціць парадак вылучэньня кандыдатаў у дэпутаты як ад палітычных партыяў, так і шляхам збору подпісаў; спрасьціць парадак сустрэчаў з выбаршчыкамі; зрабіць больш эфектыўнай судовую абарону выбарчых правоў; павялічыць магчымасьці для назіраньня за падлікам галасоў і г.д. На гэтыя прапановы А.Лукашэнка вельмі агульна адзначыў: «Калі ў рамках гэтых законаў можна зрабіць найбольшы ліберальны клімат (а мы маем вопыт), мы з вамі павінны гэта зрабіць, каб нас зноў жа не папракалі ў тым, што мы ўзурпавалі ўладу, што тут дыктатура і мы праводзім выбары так, як трэба нам. Гэтага быць не павінна, таму я прыхільнік самых ліберальных выбараў».

Пасьля гэтай сустрэчы Л.Ярмошына ўдакладніла, што «зьмены ў Выбарчы кодэкс, якія прапаноўваюцца, — гэта і ёсьць праца над памылкамі. Але пакуль што мы можам казаць толькі пра ідэю. Законапраект яшчэ неабходна распрацаваць і ўнесьці ў парламент. Пасьля яго зьяўленьня мы паглядзім, што засталося ад ідэяў Цэнтральнай камісіі».





У выніку такога хуткага і нечаканага разьвіцьця падзеяў не адбылося абмеркаваньня зьменаў выбарчага заканадаўства, як гэта планавалася раней, на Грамадзка-кансультацыйным Савеце пры Адміністрацыі прэзідэнта. 12 лістапада кіраўнік Савету У.Макей выступіў з заявай, што «нападкі на ГКС зьдзяйсьняліся і раней, аднак перад чарговым паседжаньнем па выбарчым заканадаўстве набылі асабліва нахабны характар. Некаторыя СМІ ўзяліся расьпісваць «некарыснасьць» і «непатрэбнасьць» Савету, абгрунтоўваючы гэта тым, што нібыта ўсе пытаньні, якія датычыліся рэфармаваньня выбарчага зканадаўства, ужо вырашаныя на нарадзе ў прэзідэнта. Але ўсім, хто хоць колькі ўважліва назіраў за асьвятленьнем у прэсе нарады ў кіраўніка дзяржавы, добра вядома, што там абмяркоўваліся канцэптуальныя, стратэгічныя падыходы да дадзенай праблемы, якія будуць напаўняцца неабходнай канкрэтыкай, таксама з улікам меркавньняў прадстаўнікоў грамадзкасьці». У выніку кіраўнік ГКС прыняў рашэньне «ўзяць тайм-аўт у працы Грамадзка-кансультацыйнага савету».

У лістападзе праект зьменаў выбарчага заканадаўства быў пададзены ў Палату прадстаўнікоў. Як адзначыла старшыня ЦВК Л.Ярмошына, зьмены ў выбарчае заканадаўства «на 90% улічваюць рэкамендацыі АБСЕ», і ўдакладніла, што «паўнамоцтвы назіральнікаў засталіся ў мінулай рэдакцыі: назіральнік мае права назіраць за падлікам галасоў. Фармулёўка аб умовах, якія дазваляюць назіраць бачнасьць падліку галасоў, выключаная як суб’ектыўная». Менавіта А.Лукашэнка выказаўся супраць гэтай папраўкі: «Я ня бачу тут праблемы. У нас старшыня выбарчай камісіі на месцы вырашае, каго дапускаць да падліку галасоў, а каго не дапускаць», — заявіў ён на нарадзе перад унясеньнем законапраекту ў парламент.

30 лістапада Палата прадстаўнікоў прыняла ў першым чытаньні законапраект «Аб унясеньні дадаткаў і зьменаў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаньнях правядзеньня выбараў і рэферэндумаў…» Праект зьменаў разглядаўся практычна без абмеркаваньняў, у закрытым рэжыме, і дэмакратычная грамадзкасьць ніякім чынам не магла паўплываць на гэты працэс.

У гэты ж дзень прэс-сакратар БДІПЧ/АБСЕ Енс Эшэнбехер паведаміў, што беларускі бок ня даў магчымасьці БДІПЧ азнаёміцца са зьменамі ў Выбарчы кодэкс. Старшыня ЦВК Л.Ярмошына пацьвердзіла гэта: «У АБСЕ праект на ўзгадненьне не накіроўвалі. На-

завіце мне хоць адну суверэнную дзяржаву, якая б накіроўвала свае законапраекты на ўзгадненьне ў міжнародныя арганізацыі. Гэта нейкае прыніжэньне атрымліваецца». Таксама Л.Ярмошына ацаніла супрацоўніцтва з грамадзянскай супольнасьцю Беларусі: «Апазіцыя наогул не праявіла актыўнасьці ў падрыхтоўцы новага заканадаўства. Калі я выступала на онлайн-лініі на сайце «Советской Белоруссии», то ад апазіцыі, акрамя асабістых зьнявагаў, я не пачула ніводнай канструктыўнай прапановы».

7 сьнежня А.Лукашэнка абвясьціў падзяку калектыву ЦВК «за высокапрафесійную арганізацыю правядзеньня выбараў і рэспубліканскіх рэферэндумаў, удасканаленьне нацыянальнай выбарчай сістэмы, значны ўклад у разьвіцьцё дэмакратычных асноваў фармаваньня дзяржаўнай улады». Нагадаем, што старшыня ЦВК Л.Ярмошына застаецца адной з пяці асобаў, якім забаронены ўезд у краіны ЕС і ЗША за фальсіфікацыю вынікаў выбараў, і візавыя санкцыі ў адносінах да яе працягваюцца.

11 сьнежня зьмены ў Выбарчы кодэкс былі прынятыя Палатай прадстаўнікоў у другім чытаньні, 17 сьнежня — ухваленыя Саветам Рэспублікі, а 6 студзеня 2010 году адпаведны Закон быў падпісаны А.Лукашэнкам.

### *Візавыя санкцыі ЕС*

З кастрычніка 2008 году працягваўся шасьцімесячны перыяд прыпыненьня санкцыяў супраць беларускіх чыноўнікаў (акрамя 5 асобаў), падчас якога праходзіла ацэнка сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі.

Улічваючы адсутнасьць рэальнага прагрэсу ў накірунку дэмакратызацыі Беларусі, 16 сакавіка кіраўнікі МЗС краінаў ЕС працягнулі на год санкцыі і адначасова мараторый на іх дзеяньне супраць беларускіх чыноўнікаў яшчэ на 9 месяцаў. Міністр замежных справаў Чэхіі Карл Шварцэнберг заявіў, што прынятае рашэньне сьведчыць аб «складанай сітуацыі ў Беларусі». У той жа час, па словах К. Шварцэнберга, «мы пагадзіліся, што Еўрасаюзу трэба працягваць сваю ангажаванасьць у Беларусі і падтрымку станоўчых падзеяў у краіне».

Гэтае рашэньне выклікала ярасьць у А.Лукашэнкі. Выступаючы 17 сакавіка, ён заявіў: «Калі еўрапейцы думаюць, што нас можна трымаць на кручку, атрымліваючы сігналы ад нашых «адмарожаных», і ўвесь час нас торгаць і панукаць бяз справы, дык мы на такой пазіцыі дыялог весьці ня будзем». А.Лукашэнка яшчэ раз пацьвердзіў поўнае нежаданьне наладжваць хоць нейкі дыялог з палітычнымі апанентамі ў Беларусі: «Вось гэтая пазіцыя нашай вашывай апазіцыі. Ніякая яна не апазіцыя. Гэта пятая калона, ворагі беларускага народу».

Да вырашэньня пытаньня з візавымі санкцыямі супраць беларускіх чыноўнікаў міністры замежных справаў краінаў ЕС вярнуліся 16-17 лістапада. Як перад гэтым заяўляў часовы паверaны ў справах Еўракамісіі ў Беларусі Жан-Эрык Хольцапфель, «мы хочам разьвіваць нашыя стасункі, але для гэтага нам патрэбны прагрэс ад Беларусі ў асноўных пытаньнях. І чым большы прагрэс мы ўбачым, тым большы будзе вынік з боку міністраў».

У выніку 17 лістапада Савет ЕС прыняў рашэньне «ў сувязі з адсутнасьцю істотнага прагрэсу ў сьферах, якія былі пазначаныя ў Рашэньнях Савету за 13 кастрычніка 2008 году, Савет ня можа адмяніць абмежавальныя меры супраць шэрагу беларускіх чыноўнікаў. Таму ён вырашае працягнуць да кастрычніка 2010 году абмежавальныя меры. Тым ня менш, каб заахвоціць прагрэс ў адзначаных ЕС сьферах, Савет вырашае адначасова працягнуць прыпыненьне ўжываньня абмежаваньняў на ўезд для шэрагу беларускіх чыноўнікаў… да кастрычніка 2010 году». У рэзалюцыі выказвалася шкадаваньне, што ў апошні час у Беларусі не было дастаткова заўважнага прагрэсу ў галіне правоў і свабодаў чалавека — ужываўся гвалт супраць удзельнікаў мірных вулічных пратэстаў, адмаўлялі ў рэгістрацыі палітычным партыям, грамадзкім арганізацыям і незалежным СМІ. ЕС заклікаў Менск правесьці рэформу выбарчага заканадаўства і спыніць ціск на палітычных актывістаў і незалежныя СМІ. ЕС выказаўся за ўвядзеньне ў Беларусі мараторыю на сьмяротнае пакараньне. У пастанове адзначалася, што санкцыі «могуць быць адмененыя ў любы момант у залежнасьці ад дзейнасьці беларускіх уладаў у сьферы дэмакратыі і правоў чалавека».

Міністр замежных справаў старшынюючай у ЕС Швецыі Карл Більдт такім чынам пракаментаваў прынятае рашэньне: «З тэксту рэзалюцыі бачна, што нашая пазіцыя празрыстая і цьвёрдая. Мы працягваем санкцыі, але адначасова іх замарожваем. Мы ўсё яшчэ зацікаўленыя ў тым, каб беларускія ўлады рухаліся далей у накірунку еўрапейскіх каштоўнасьцяў. Я магу проста сказаць: мы расчараваныя хуткасьцю прагрэсу. Але мы не здаемся». Старшыня

Еўрапарламенту, польскі дэпутат Ежы Бузек дадаў: «Калі пасьля гэтых 12 месяцаў ня будзе выразнага прагрэсу ў дэмакратызацыі, тады мы затрымаем працэс зьбліжэньня Еўрасаюзу і Беларусі».

У адказ беларускі МЗС заявіў: «З жалем прыходзіцца канстатаваць, што чарговае «падвешваньне», абмежавальныя меры, якія па-ранейшаму ўжывае Еўрасаюз у адносінах да нашай краіны, разыходзяцца з цяперашняй логікай дыялогу Беларусь — ЕС, маюць на сабе адбітак «двайных стандартаў» і не дазваляюць выйсьці на ўзровень супрацоўніцтва, які ў поўнай меры адпавядаў бы інтарэсам абодвух бакоў».

### *Мытны саюз Беларусі, Расіі і Казахстану*

У канцы 2009 году з нечаканай хуткасьцю пачалі разьвівацца падзеі па фармаваньні мытнага саюзу Беларусі, Расіі і Казахстану. Праводзячы 17 лістапада нараду з кіраўнікамі ўраду і Адміністрацыі прэзідэнта, А.Лукашэнка прыняў канчатковае рашэньне аб уваходжаньні Беларусі ў мытны саюз. Як падае агенцтва БЕЛТА, «Беларусь чакае, што гэтае якасна новае ўтварэньне будзе заснавана на прынцыпах раўнапраўя і ўзаемных выгадаў, забесьпячэньня свабоды перамяшчэньня тавараў і паслуг, універсальнага нетарыфнага рэгуляваньня, роўных магчымасьцяў гаспадараньня для прадпрыемстваў, зьняцьця неабгрунтаваных бар'ераў ва ўзаемным гандлі». Як меркавалі заснавальнікі мытнага саюзу, наступным крокам для эканамічнага зьбліжэньня трох краінаў павінна быць стварэньне адзінай эканамічнай прасторы (АЭП).

У адрозьненьне ад сумесных праектаў з ЕС, праекты Беларусі з усходнімі краінамі, у прыватнасьці з Расіяй і Казахстанам, ніколі не абумоўліваліся разьвіцьцём сітуацыі з правамі чалавека і дэмакратыяй. Як каментаваў гэтыя ўзаемаадносіны ў верасьні 2009 году А.Лукашэнка, «калі з Расіяй у нас няма практычна ніякіх глабальных праблемаў, дык з Захадам вы ведаеце якія нашыя адносіны». Такім чынам, геапалітычная арыентацыя Беларусі на ўсход аўтаматычна азначае паніжэньне стандартаў правоў чалавека, разьвіцьця дэмакратычных інстытутаў у краіне, паколькі і Расія, і Казахстан зьяўляюцца далёка не ўзорнымі ў гэтых галінах.

Беларусь бачыць гэты праект як чыста эканамічны, не абцяжараны дадатковымі абавязкамі ў грамадзка-палітычнай сьферы. Намесьнік прэм'ер-міністра Андрэй Кабякоў, выступаючы перад дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў, паведаміў: «Удзел Беларусі ў Мытным саюзе дазволіць закупляць расійскія энерганосьбіты па цэнах, ніжэйшых за рынычныя». Адначасова для Расіі гэты праект мае ня толькі эканамічнае, але і прыярытэтнае палітычнае значэньне. У.Пуцін 3 сьнежня заявіў: «Для нас галоўным прыярытэтам усё ж зьяўляецца інтэграцыя на постсавецкай прасторы, і таму мы вельмі радыя таму працэсу, які адбываецца зараз у сьферы фармаваньня Мытнага саюзу».





27 лістапада прэзідэнты Беларусі, Расіі і Казахстану сустрэліся ў Менску і падпісалі пакет дакументаў, які азначаў стварэньне мытнага саюзу, і адразу ж прэзідэнты закцэнтавалі ўвагу на наступным інтэграцыйным кроку. «Мытны саюз — гэта падрыхтоўка да пераходу да адзінай эканамічнай прасторы, гэта зусім новая форма інтэграцыі эканомік», — заявіў расійскі прэзідэнт Дз. Мядзьведзеў.

Можна сьцьвярджаць, што стварэньне мытнага саюзу трох краінаў паставіла перад беларускай грамадзкасьцю і дзяржаваю пытаньне адносна далейшага накірунку геапалітычнага, цывілізацыйнага разьвіцьця. І ад гэтага накірунку наўпрост залежыць сітуацыя з правамі чалавека і разьвіцьцём дэмакратычных інстытутаў у нашай краіне.

* * *

2009 год ня стаў для Беларусі часам незваротных станоўчых трансфармацыяў у галіне правоў чалавека і дэмакратызацыі. За гэты перыяд не спраўдзіліся надзеі на лібералізацыю ўнутранай сітуацыі ў краіне, якая заставалася нестабільнай і залежнай ад зьнешняй і ўнутранай палітычнай кан'юнктуры.

# 1. Сьмяротнае пакараньне



2009 год ня стаў для Беларусі вырашальным у пытаньні адмены ці ўвядзеньня мараторыю на сьмяротнае пакараньне. Беларусь па-ранейшаму застаецца адзінай дзяржавай на еўрапейскім кантыненце, а таксама на постсавецкай прасторы, дзе выносяцца і прыводзяцца ў выкананьне сьмяротныя прысуды.

Разам з тым упершыню за гады існаваньня незалежнай Беларусі тэма сьмяротнага пакараньня стала прадметам шырокай дыскусіі ў краіне. Калі ў папярэднія гады найперш міжнародныя структуры і праваабарончая супольнасьць актуалізавалі дадзеную праблему, то на працягу 2009 году і прадстаўнікі розных узроўняў беларускіх уладаў перыядычна заяўлялі пра неабходнасьць канкрэтных крокаў па адмене ці ўвядзеньні мараторыю на сьмяротнае пакараньне. Аднак неабходна прызнаць, што абмеркаваньне дадзенай праблемы беларускімі ўладамі вялося найперш у палітычнай плоскасьці і з абсалютна прагматычных пазіцыяў, зважаючы перш за ўсё на ціск міжнароднай супольнасьці. Пры гэтым такія важныя аспекты, як узаемасувязь наяўнасьці сьмяротнага пакараньня з узроўнем злачыннасьці ў дзяржаве, гуманізацыя крымінальнага заканадаўства, маральны бок праблемы, на жаль, не знайшлі належнага адлюстраваньня ў выкладзеных пазіцыях афіцыйных асобаў. Спробу не выключаць дадзеныя аспекты з агульнай дыскусіі больш прадпрымалі прадстаўнікі грамадзянскай супольнасьці.

Першая палова году давала ўстойлівую надзею на тое, што беларускія ўлады гатовыя разглядаць пытаньне аб адмене ці ўвядзеньні мараторыю на сьмяротнае пакараньне. Афіцыйны Менск разглядаў крокі ў дадзеным накірунку як дэманстрацыю абвешчанай лібералізацыі, адзін з палітычных аспектаў наладжваньня дыялогу з еўрапейскімі краінамі, а таксама зьвязваў з перспектывамі ўступленьня Беларусі ў Савет Еўропы. Дадзеная пазіцыя выразна праглядалася ў заявах афіцыйных асобаў.

Так, 21 студзеня на прэс-канферэнцыі Генеральны пракурор Беларусі Рыгор Васілевіч заявіў, што не выключае адмены сьмяротнага пакараньня пры ўступленьні ў Савет Еўропы: «Гэта патрабаваньне Савету Еўропы. Калі мы ідзем туды — трэба прымаць правілы, якія існуюць. Кажуць, у чужы манастыр са сваім статутам ня ходзяць». Аднак пры гэтым Генпракурор дадаў, што на дадзеным этапе лічыць існаваньне такой меры пакараньня абгрунтаванай «у першую чаргу ў прафілактычных мэтах».







Тое, што ўвядзеньне мараторыю на сьмяротнае пакараньне дазволіць «лягчэй наладжваць» дыялог з дзяржавамі Еўропы, адзначыў на прэс-канферэнцыі 20 траўня намесьнік старшыні камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ Палаты прадстаўнікоў Анатоль Глаз. Па яго́ных словах, Беларусь можа разглеДзець дадзенае пытаньне, і зараз «магчыма прапрацаваць заканадаўчыя асновы па ўвядзеньні мараторыю на сьмяротнае пакараньне». Старшыня камісіі па заканадаўству і судова-прававых пытаньнях Мікалай Самасейка ў інтэрвію «Комсомольской правде» (07.04.2009) сьцвярджаў, што «на дадзены момант Рэспубліка Беларусь фактычна падыйшла да пытаньня аб адмене сьмяротнага пакараньня. Разам з тым першапачаткова павінна абмяркоўвацца пытаньне аб увядзеньні мараторыю на сьмяротнае пакараньне. Афіцыйна яно пакуль у парламенце не падымалася. Але абмеркаваньне дадзенага пытаньня можа насьпець у бліжэйшай будучыні».

Пераканаўчыя заявы адносна працы ў дадзеным накірунку гучалі і з Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі. 11 чэрвеня намесьнік кіраўніка Адміністрацыі Валерый Міцкевіч заявіў: «Пытаньне аб сьмяротным пакараньні ўзьнікла ня зараз, яно абмяркоўваецца пастаянна і будзе абмяркоўвацца да таго часу, пакуль ня будзе прынята канчатковае рашэньне». Па яго́ным меркаваньні, прыняцьце рашэньня аб увядзеньні мараторыю магчымае: «Магчымыя любыя рашэньні і любое заканадаўчае рэгуляваньне. Для гэтага трэба прыняць або праект закону, або нарматыўны акт кіраўніка дзяржавы». У сваю чаргу 17 чэрвеня кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Уладзімір Макей падчас паседжаньня Грамадзка-кансультацыйнага Савету, прысьвечанага праблеме гуманізацыі пенітэнцыярнай сістэмы, адзначыў, што «пытаньне аб сьмяротным пакараньні ня трэба разглядаць як нешта застылае назаўсёды. Я таксама сустракаўся са спадаром Рыгоні (*спецдакладчык ПАСЕ па Беларусі. — рэд.*), і мы на гэтую тэму размаўлялі. У нас ужо паменшылася колькасьць артыкулаў у Крымінальным кодэксе, за якія давалі сьмяротнае пакараньне, і на практыцы такое пакараньне сталі прымяняць радзей. Тым больш што гэта (*пытанне адмены сьмяротнага пакараньня. — рэд.*) трэба разглядаць у

кантэксьце ўступленьня Беларусі ў Савет Еўропы. Пакуль мы гаворым толькі аб вяртаньні статусу запрошанага, але калі будзе дакладнае рашэньне аб уступленьні ў Савет Еўропы, то нам давядзецца пайсьці на гэты крок (*увесьці мараторый на сьмяротнае пакараньне. — рэд.*)».

Адначасова еўрапейскія структуры дэманстравалі выразнае жаданьне ісьці на збліжэньне з беларускімі ўладамі. Адзін з такіх крокаў быў зроблены 26 мая, калі паліткамісія ПАСЕ адзінагалосна прагаласавала за вяртаньне парламенту Беларусі статусу сьпецзапрошанага. Старшыня паліткамісіі Горан Ліндблад пракаментаваў гэтае рашэньне наступным чынам: «Мы лічым, што такім чынам мы можам садзейнічаць зьменам у краіне, якая адчувае недахоп дэмакратыі, краіне з рэпрэсіўным урадам, краіне, дзе да гэтага часу існуе сьмяротнае пакараньне...» Афіцыйны Менск лічыў пытаньне з вяртаньнем парламенту статусу сьпецзапрошанага практычна вырашаным. У гэтых абставінах тым больш нечакана і востра на сесіі Парламенцкай Асамблеі СЕ 23 чэрвеня ў Страсбургу загучала пытаньне аб наяўнасьці ў Беларусі сьмяротнага пакараньня. Выступаючы ў дыскусіі пасьля дакладу Андрэа Рыгоні, які прапанаваў вярнуць беларускаму парламенту статус сьпецзапрошанага, віцэ-старшыня камітэту ПАСЕ па юрыдычных пытаньнях і правах чалавека Хрыстас Пургурыдэс вылучыў прапанову зрабіць гэта толькі пасьля ўвядзеньня мараторыю на сьмяротнае пакараньне. Гаворачы аб важнасьці гэтай умовы, Х. Пургурыдэс эмацыйна падкрэсьліў: «У Беларусі расстрэльваюць людзей, а сем’ям пакараных не выдаюць целы і не паведамлююць, дзе іх пахавалі» (*у Беларусі прымяняецца такая працэдура прывядзеньня сьмяротнага прысуду ў выкананьне. — рэд.*) Па ягоных словах, «неабходна правесьці яшчэ вельмі вялікую працу», перш чым прадаставіць беларускаму парламенту статус сьпецзапрошанага. «У Беларусі адбываецца шмат няправільнага. Прадастаўляючы статус, нам неабходна вылучыць беларускім уладам пэўныя ўмовы», — выказаў перакананьне Х. Пургурыдэс. Пераважная большасьць дэпутатаў ПАСЕ падтрымалі гэтую прапанову і прагаласавалі за прыняцьце дадзенай папраўкі ў рэзалюцыю, прадэманстраваўшы такім чынам, што для дыялогу і саступак з боку еўраструктураў выключна рыторыкі беларускіх уладаў недастаткова — ад іх чакаюцца канкрэтныя і хуткія дзеяньні па прыняцьці юрыдычнага рашэньня па ўвядзеньні мараторыю на сьмяротнае пакараньне.







У гэты ж дзень, 23 чэрвеня, МЗС Беларусі выказаў засмучэньне, што ПАСЕ вылучае новыя папярэднія ўмовы для ўзнаўленьня статусу сьпецзапрошанага, «у прыватнасьці, адносна ўвядзеньня мараторыю на сьмяротнае пакараньне ў Беларусі». Пры гэтым МЗС адзначыў, што з разуменьнем ставіцца да пазіцыі Савету Еўропы адносна пытаньня сьмяротнага пакараньня: «Неабходнае абмеркаваньне і аналіз на гэтую тэму вядуцца ў парламенце Беларусі, у юрыдычнай супольнасьці нашай краіны, дзе, бясспрэчна, прымаюць да ўвагі ня толькі пазіцыю Савету Еўропы, але і важкае меркаваньне грамадзянаў Беларусі, якое было выказана на ўсенародным рэферэндуме (1996 году) па дадзеным пытаньні». Асобна ў паведамленьні МЗС адзначалася, што «наколькі нам вядома, адмена сьмяротнага пакараньня або ўвядзеньне мараторыю на яго ўжываньне згодна са статутнымі дакументамі Савету Еўропы зьяўляюцца ўмовамі для ўступленьня краіны ў Арганізацыю, а не для прадстаўленьня статусу «сьпецыяльнага запрошанага».

Віцэ-сьпікер Палаты прадстаўнікоў Валерый Іваноў, які прадстаўляў на сесіі ПАСЕ Нацыянальны сход Беларусі, пасьля галасаваньня па беларускім пытаньні заявіў, што «сёньня было прынята палітычнае рашэньне. Юрыдычнае рашэньне будзе прымацца Бюро ПАСЕ восеньню (*7 верасьня на паседжаньні Бюро ПАСЕ ў Парыжы. — рэд.*). За гэты час мы папрацуем над дадзеным пытаньнем».

Беларускія ўлады, атрымаўшы выразны і адназначны сігнал: калі яны сапраўды хочуць бачыць свой парламент у ПАСЕ, давядзецца выканаць умову адносна ўвядзеньня мараторыю на сьмяротнае пакараньне, неадкладна пачалі дэманстраваць бачнасьць актыўнай дзейнасьці ў дадзеным накірунку.

25 чэрвеня старшыня Вярхоўнага суда Валянцін Сукала заявіў журналістам, што судовая сістэма Беларусі гатова да ўвядзеньня мараторыю на сьмяротнае пакараньне. «Калі ў Канстытуцыі Беларусі гэты выключны від пакараньня пазначаны як часовы, то гэта норма непазьбежна пацягне за сабой яе адмену», — дадаў ён. В.Сукала таксама выказаў меркаваньне, што мараторый на сьмяротнае пакараньне можа стаць свайго роду прамежкавым этапам да яе адмены, і гэтую меру ён лічыць цалкам рэальнай і абгрунтаванай. Пры гэтым кіраўнік Вярхоўнага суда нагадаў, што ў Беларусі дзейнічае яшчэ адзін выключны від пакараньня — пажыцьцёвае зьняволеньне. «Па сваім цяжары і суровасьці яно мала чым састу-

пае сьмяротнаму пакараньню», — падкрэсьліў ён. У апошнія гады, па словах В.Сукалы, сьмяротнае пакараньне ў Беларусі ўжываецца вельмі рэдка, «таму ніякіх перашкодаў з пункту гледжаньня судовай сістэмы няма».

29 чэрвеня старшыня камісіі па нацыянальнай бясьпецы Палаты прадстаўнікоў Віктар Гумінскі зрабіў заяву, што ў беларускім парламенце ствараецца працоўная група па распрацоўцы прапановаў па ўвядзеньні мараторыю на сьмяротнае пакараньне. Пры гэтым дэпутат адзначыў: «Мая пазіцыя ў тым, што мы павінны наблізіцца да адмены сьмяротнага пакараньня. Не таму, што Эўропа паставіла нам умову, а мы самі ўжо падыйшлі да таго, што гэтае пытаньне можа быць пастаўлена на парадак дня. Да гэтага ўсё ідзе. Я думаю, што ў нас высьпее рашэньне аб адмене сьмяротнага пакараньня без усялякіх указак ды падказак». Чакалася, што працоўную парламенцкую групу ўзначаліць сам В. Гумінскі. У пачатку ліпеня старшыня камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах і сувязях з СНД Сяргей Маскевіч паведаміў, што зацікаўленыя ведамствы разглядаюць пытаньне аб неабходнасьці стварэньня працоўнай групы па распрацоўцы прапановаў аб увядзеньні мараторыю на сьмяротнае пакараньне. Па ягоных словах, па пытаньні стварэньня такой групы праводзяцца кансультацыі ў парламенце, МЗС, урадзе, Адміністрацыі прэзідэнта, органах суда і пракуратуры. «Калі гэта будзе міжведамасная група, то яна можа быць дастаткова вялікай, па некалькі чалавек ад кожнага ведамства. Пытаньне аб мараторыі можна ўзгадніць і да пачатку паседжаньня Бюро ПАСЕ ў верасьні. Тэарэтычна, можам і да гэтага часу зрабіць (*увесьці мараторый. — рэд.*)». Пры гэтым С. Маскевіч адзначыў, што «пакуль няма канкрэтыкі, ці патрэбна такая група».

Адначасова пачалася праца ў накірунку фармаваньня адпаведнай грамадзкай думкі адносна сьмяротнага пакараньня. У пачатку ліпеня дзяржаўны тэлеканал ОНТ правёў ток-шоў з удзелам прадстаўнікоў зацікаўленых дзяржаўных структураў і праваабаронцаў па дадзенай тэматыцы. 30 чэрвеня ў рэдакцыі газеты «Советская Белоруссия» адбыўся «круглы стол» па праблемах гуманізацыі пакараньняў і сьмяротнага пакараньня ў тым ліку, у якім бралі ўдзел дзяржаўныя службоўцы, сьвятары, праваабаронцы.

Актыўная рыторыка беларускіх уладаў у гэты перыяд не пакідала сумневу, што пытаньне ўвядзеньня мараторыю на сьмяротнае пакараньне стаіць на парадку дня і можа быць вырашана бліжэйшым часам. Аднак гэтыя чаканьні ня спраўдзіліся, больш за тое, на фоне гучных заяваў беларускія ўлады выразна прадэманстравалі значны адкат і нават выклік еўрапейскай супольнасьці: 29 чэрвеня і 17 ліпеня былі вынесеныя два новыя сьмяротныя прысуды. На некалькі месяцаў таксама былі фактычна згорнуты ўсе захады па вырашэньні праблемы, ніякай інфармацыі пра падрыхтоўку да ўвядзеньня мараторыю не агучвалася, зьвесткі пра стварэньне працоўных групаў — парламенцкай і міжведамаснай — не паступалі. Афіцыйны Менск у чарговы раз прадэманстраваў сваё нежаданьне ісьці на саступкі па любых пытаньнях, якія лічацца выключна палітычнымі. Агульную пазіцыю беларускіх уладаў акрэсьліў 19 кастрычніка Аляксандр Лукашэнка, прымаючы даверчыя граматы амбасадараў 11 дзяржаваў: «Беларусь ня будзе рабіць скарацечных захадаў, каб дагадзіць Еўропе перад прыняцьцем якіх-небудзь рашэньняў адносна краіны», а «націскаць на Беларусь бесьперсьпектыўна».

Нягледзячы на зацятую пазіцыю беларускіх уладаў, у гэты перыяд еўрапейская супольнасьць працягвала пасылаць станоўчыя, але адназначныя сігналы аб магчымасьці наладжваньня супрацоўніцтва. 11 верасьня старшыня паліткамітэту ПАСЕ Горан Ліндблад заявіў, што статус сьпецыяльнага запрошанага ў ПАСЕ можа быць вернуты парламенту Беларусі да канца году, калі ў краіне адменяць сьмяротнае пакараньне. «Я быў бы рады, калі б яны (*беларусы. — рэд.*) вярнуліся ў ПАСЕ да канца году, але ўсё залежыць ад іх».

20 кастрычніка кіраўнік прадстаўніцтва Еўрапейскай камісіі ў Менску Жан-Эрык Хольцапфель выказаў надзею, што Беларусь увядзе мараторый на сьмяротнае пакараньне як мага хутчэй. Пры гэтым дыпламат адзначыў, што гэта — адна з умоваў для далейшага разьвіцьця адносінаў краіны з Еўрасаюзам і нагадаў, што мараторый на ўжываньне сьмяротнага пакараньня застаецца адным з пунктаў 12 умоваў ЕС па нармалізацыі стасункаў з Беларусьсю, сфармуляваных яшчэ ў 2006 годзе.

Пасьля працяглага маўчаньня беларускае кіраўніцтва вярнулася да абмеркаваньня праблемы сьмяротнага пакараньня толькі ў канцы году.

29 лістапада, напярэдадні візіту ў Беларусь прэмьер-міністра Італіі Сільвіа Берлусконі, у інтэрвію газеце «Стампа» Аляксандр Лукашэнка заявіў, што ў Беларусі будзе праводзіцца інфармацыйная кампанія па адмене сьмяротнага пакараньня. «Мы тыдзень

таму вызначыліся, што пачынаем шэраг мерапрыемстваў у гэтым накірунку, пачынаючы з парламенцкіх слуханьняў і ўзьняцьця гэтай тэмы ў СМІ». А. Лукашэнка пры гэтым спаслаўся на тое, што на рэферэндуме 1996 году большасьць грамадзянаў выказалася за захаваньне дадзенай меры пакараньня, а рашэньне рэферэндуму, па ягоных словах, можа скасаваць толькі новы рэферэндум.

Кіраўнік Генеральнага дырэктарату Савету Еўропы па дэмакратыі і палітычных пытаньнях Жан-Луі Ларан, які знаходзіўся ў Менску 30 лістапада — 1 сьнежня, на прэс-канферэнцыі па выніках візіту адзначыў, што падчас сустрэчаў з кіраўніцтвам Беларусі «асноўнае пытаньне, якое дамінавала ў дыскусіях, — гэта пытаньне адмены сьмяротнага пакараньня. Сёньня адмена сьмяротнага пакараньня — гэта частка стандартаў і патрабаваньняў Савету Еўропы. Калі Беларусь хоча ўступіць у Савет Еўропы, стаць часткай гэтай дэмакратычнай сям'і, то гэтага пытаньня ня ўдасца пазьбегнуць». Тое, што сьмяротнае пакараньне застаецца таксама ўмовай вяртаньня беларускаму парламенту статусу сьпецыяльна запрошанага ў ПАСЕ, Жан-Люі Ларан пракаментаваў наступным чынам: «Як бы мы ні ставіліся да гэтага, рашэньне ўжо прынята. Неабходныя інфармацыйныя кампаніі і іншыя дзеяньні. І ўрэшце павінна быць прынята рашэньне на палітычным узроўні».

2 кастрычніка старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка на адкрыцьці трэцяй сесіі паведаміў, што пытаньне аб магчымасьці ўвядзеньня мараторыю на сьмяротнае пакараньне ці яго адмене плануецца разгледзець на «круглым стале» пад эгідай Савету Еўропы. Па ягоных словах, вядзецца падрыхтоўка да правядзеньня гэтага паседжаньня. «Меркаваньне беларускага народу скрайне важнае для выпрацоўкі ўзважаных падыходаў да такіх складаных пытаньняў, як увядзеньне мараторыю на сьмяротнае пакараньне ці яго адмена і прызнаньне Беларусьсю Абхазіі і Паўднёвай Асеціі. Дэпутаты павінны працягнуць працу па вывучэньні меркаваньня сваіх выбаршчыкаў», — сказаў сьпікер парламенту. На жаль, да канца году намеры беларускіх парламентароў так і засталіся нязьдзейсьненымі, «круглы стол» не праведзены, а пра вывучэньне меркаваньня выбаршчыкаў па гэтым вострым пытаньні нічога невядома грамадзкасьці.

Увогуле спасылка на «меркаваньне народу» і вынікі рэферэндуму 1996 году вельмі часта прысутнічалі ў выказваньнях вышэйшых дзяржаўных чыноўнікаў, калі ішла гаворка пра праблему сьмяротнага пакараньня і магчымасьці ўвядзеньня мараторыю на яго ці адмены. Так, міністр юстыцыі Віктар Галаванаў 20 кастрычніка, выступаючы на прэзентацыі вынікаў праекту «Садзеяньне больш шырокаму прымяненьню міжнародных стандартаў у галіне правоў чалавека ў працэсе адпраўленьня правасудзьдзя ў Рэспубліцы Беларусь», заявіў, што пытаньне аб увядзеньні ў краіне мараторыю на сьмяротнае пакараньне «знаходзіцца ў кампетэнцыі беларускага народу». Міністр адзначыў: «У 1996 годзе гэтае пытаньне выносілася на референдум. Падаўляючая воля народа вядомая — увядзеньне мараторыю заўчасна. На сёньня сьмяротнае пакараньне ўжываецца ў 86 краінах сьвету, у тым ліку ў Японіі, большасьці штатаў Амерыкі. Але ніхто ня кажа, што гэтыя краіны нецывілізаваныя». Тым ня менш, паведаміў В. Галаванаў, згодна з заключэньнем Канстытуцыйнага суда, у краіне існуюць прававыя механізмы, якія дазваляюць увесьці мараторый на прымяненьне сьмяротнага пакараньня. «А ці будзе яна адмененая, трэба спытаць у народа, у родных забітых: ці даравалі яны пакуты сваіх блізкіх злачынцу. Я думаю, да гэтага пытаньня кожная краіна павінна прыйсьці самастойна, перш за ўсё, абапіраючыся на волю народу», — дадаў міністр. Чыноўнік у сваім выступе апелюе да ахвяраў злачынстваў, і гэтая тэндэнцыя павышаць эмацыйны складнік праблемы была характэрная для многіх выказваньняў беларускіх службоўцаў на працягу году.

Неадназначныя меркаваньні выказваліся кіраўніцтвам краіны і адносна магчымых прававых механізмаў увядзеньня мараторыю. Большасьць прадстаўнікоў юрыдычнай супольнасьці апелявалі ў гэтым пытаньні да Заключэньня Канстытуцыйнага суда РБ ад 11 сакавіка 2004 году «Аб адпаведнасьці Канстытуцыі РБ і міжнародным дамовам РБ палажэньняў Крымінальнага кодэксу РБ, якія прадугледжваюць ужываньне ў якасьці пакараньня сьмяротнае пакараньне», паводле якога абвесьціць мараторый, прынамсі ў якасьці першага кроку, можа ці кіраўнік дзяржавы, прэзідэнт, ці парламент, і, адпаведна, не патрабуецца правядзеньня рэферэндуму. У Заключэньні адназначана сказана, што ч. 3 арт. 24 Канстытуцыі, якая ўсталёўвае магчымасьць ужываньня сьмяротнага пакараньня ў якасьці выключнай меры пакараньня толькі да яе адмены, дазваляе прыняць рашэньне аб абвяшчэньні мараторыю на ўжываньне сьмяротнага пакараньня ці аб поўнай адмене гэтага віду пакараньня. Таксама ў гэтым Заключэньні адзначана, што вынікі рэ-

ферэндуму 1996 году, падчас якога за захаваньне сьмяротнага пакараньня выказалася 80, 44% грамадзянаў, не мелі абавязковага характару.

Таму асаблівае непаразуменьне выклікалі выказваньні старшыні Канстытуцыйнага суда Беларусі Пятра Міклашэвіча (займае гэтую пасаду з 8 лютага 2008 году), які на прэс-канферэнцыі 11 сакавіка заявіў, што прэзідэнт і парламент могуць толькі ініцыяваць адмену сьмяротнага пакараньня. «Норма аб сьмяротным пакараньні разьмешчана ў першым разьдзеле Канстытуцыі, які мае асаблівую абарону. Унясеньне зьменаў і дапаўненьняў у гэты разьдзел магчыма толькі шляхам рэферэндуму», — адзначыў П. Міклашэвіч. Ён спаслаўся на тое, што ў 1996 годзе пытаньне аб сьмяротным пакараньні выносілася менавіта на рэферэндум, і за захаваньне гэтага інстытуту прагаласавала больш за 80% насельніцтва краіны. Пазіцыя П. Міклашэвіча адназначна супярэчыць прынятаму ў 2004 годзе і дзеючаму на дадзены момант Заключэньню Канстытуцыйнага суда, старшынём якога ён зьяўляецца.

Упэўненасьць у тым, што для ўвядзеньня мараторыю на сьмяротнае пакараньне ў Беларусі рэферэндуму не патрабуецца, выказаў 1 сьнежня, падчас візіту ў Менск, кіраўнік Генеральнага дырэктарату Савету Эўропы па дэмакратыі і палітычных пытаньнях Жан-Луі Ларан: «Тут трэба палітычная воля лідэраў краіны. Для мяне гэта найперш пытаньне маралі. Я найперш кіруюся тым, што сьмяротнае пакараньне — гэта адзіная форма пакараньня, якое не можа быць выпраўлена. Беларусь не павінна адмяняць сьмяротнае пакараньне дзеля інтарэсаў Страсбургу, а дзеля інтарэсу краіны. Рэферэндум па гэтай справе зусім не абавязковы».

Незалежныя эксьперты таксама ўпэўненыя, што праводзіць рэферэндум па пытаньні ўвядзеньня мараторыю не патрабуецца: дастаткова парламенту ўнесьці зьмены ў заканадаўства Рэспублікі Беларусь, выключыўшы з Крымінальнага кодэксу такі від пакараньня, або ўвесьці мараторый указам прэзідэнта.

У грамадзкім меркаваньні да гэтага часу пераважае, хаця і нязначна, падтрымка захаваньня сьмяротнага пакараньня. Так, згодна з дадзенымі нацыянальнага апытаньня, праведзенага ў чэрвені 2009 году Незалежным інстытутам сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў, адказы на пытаньне «Вы за ці супраць адмены сьмяротнага пакараньня ў Рэспубліцы Беларусь» разьмеркаваліся наступным чынам: «за адмену» — 41,7%, «супраць адмены» — 48,4%. Сацыялагічная перавага прыхільнікаў сьмяротнага пакараньня тлумачыцца эксьпертамі найперш недастатковай інфармаванасьцю грамадства. Цікава адзначыць, што ў параўнаньні з верасьнёўскім апытаньнем 2008 году колькасьць прыхільнікаў сьмяротнага пакараньня хаця і не на шмат, але ўзрасла: тады за адмену сьмяротнага пакараньня выказаліся 44,2% рэспандэнтаў і 47,8% — супраць. Не выключана, што прычына палягае ў выключнай палітызаванасьці праблемы, а таксама ў тым, што ў дзяржаўных СМІ праблема сьмяротнага пакараньня асьвятлялася найперш з пункту гледжаньня жорсткасьці зьдзейсьненых злачынстваў асуджанымі да вышэйшай меры пакараньня і вельмі часта ў эмацыйным ключы. Разам з тым дадзеныя сацыялагічныя дасьледваньні сьведчаць пра значную гуманізацыю поглядаў грамадзянаў Беларусі па пытаньні сьмяротнага пакараньня і даюць падставу сьцьвярджаць, што спасылкі на дадзеныя рэферэндуму 1996 году састарэлі і не адпавядаюць рэальнаму стану грамадзкай думкі.





1

Артыкул 24 Канстытуцыі гарантуе кожнаму права на жыцьцё, у ім жа замацаваны часовы характар сьмяротнага пакараньня: «Сьмяротнае пакараньне да яго адмены можа ўжывацца ў адпаведнасьці з законам як выключная мера пакараньня за асабліва цяжкія злачынствы і толькі згодна прысуду суда». Крымінальны кодэкс прадугледжвае прымяненьне сьмяротнага пакараньня за 12 складаў злачынстваў ва ўмовах мірнага часу і 2 склады — ва ўмовах ваеннага. Асуджаныя да сьмяротнага пакараньня могуць зьвярнуцца з хадайніцтвам аб памілаваньні да прэзідэнта. Акрамя хадайніцтваў аб памілаваньні прэзідэнт разглядае матэрыялы асуджаных да сьмяротнага пакараньня, якія не хадайнічаюць аб памілаваньні. Хадайніцтва аб памілаваньні асуджаныя могуць падаць на працягу 10 сутак з моманту атрыманьня копіі прысуду ці касацыйнага азначэньня. Калі асуджаны не падасьць у вызначаны тэрмін хадайніцтва аб памілаваньні ці заявіць аб сваім нежаданьні зьвяртацца з такім хадайніцтвам, пра гэта складаецца адпаведны акт. Хадайніцтва ці акт накіроўваюцца прэзідэнту не пазьней трохдзённага тэрміну з дня прыёму хадайніцтва ад асуджанага ці складаньня акту. Выкананьне прысуду прыпыняецца да разгляду хадайніцтва аб памілаваньні ці матэрыялаў аб адмове ад падачы хадайніцтва. Хадайніцтвы аб памілаваньні, а таксама матэрыялы асу-

джаных, якія не хадайнічаюць аб памілаваньні, да вынясеньня на разгляд прэзідэнта папярэдне разглядае Камісія па пытаньнях памілаваньня пры прэзідэнце, якая зьбіраецца на свае паседжаньні не радзей за адзін раз у квартал. Хадайніцтвы аб памілаваньні асобаў, асуджаных да сьмяротнага пакараньня, ці матэрыялы аб адмове гэтых асобаў ад памілаваньня да вынясеньня на разгляд Камісіі высылаюцца Вярхоўнаму суду і Пракуратуры, якія на працягу двух тыдняў прадстаўляюць заключэньні, што ўтрымліваюць апісаньне зьместу прынятых рашэньняў суда, абставінаў зьдзейсьненых злачынстваў, дадзеныя пра асуджаных, а таксама свае прапановы па сутнасьці кожнага хадайніцтва ці матэрыялаў аб адмове ад падачы хадайніцтва. Пасьля разгляду ў Камісіі ўсе матэрыялы разам з прапановамі Камісіі ўносяцца на разгляд прэзідэнта. Рашэньні аб памілаваньні ці аб адхіленьні хадайніцтваў аб памілаваньні прымаюцца ў форме ўказаў прэзідэнта і накіроўваюцца для выкананьня ў Вярхоўны суд. Паведамленьні аб выкананьні ўказаў прэзідэнта ў адносінах да асуджаных да сьмяротнага пакараньня накіроўваюцца прэзідэнту Вярхоўным судом.

Нягледзячы на тое, што «Палажэньне аб парадку ажыцьцяўленьня ў Рэспубліцы Беларусь памілаваньня асуджаных» прадугледжвае магчымасьць запрашэньня на паседжаньні Камісіі прадстаўнікоў грамадзкіх арганізацыяў і сродкаў масавай інфармацыі (пункт 9) і асвятленьне ў СМІ інфармацыі аб працы Камісіі і рашэньняў кіраўніка дзяржавы аб памілаваньні асуджаных (пункт 24), іх дзейнасьць па-ранейшаму застаецца закрытай ад грамадзкасьці, і найперш гэта датычыць справаў асуджаных да сьмяротнага пакараньня. Прадметам галоснасьці стала толькі інфармацыя, што ў 2003 годзе Камісія адхіліла хадайніцтвы аб памілаваньні двух асуджаных да сьмяротнага пакараньня, а адна справа была вернута ў Вярхоўны суд для праверкі ў парадку нагляду, у выніку чаго сьмяротнае пакараньне асуджанаму было заменена на 15 гадоў пазбаўленьня волі. Іншай інфармацыі пра вынікі дзейнасьці Камісіі і рашэньняў прэзідэнта па справах асуджаных да сьмяротнага пакараньня не распраўсюджвалася.

У 2009 годзе ў Беларусі былі вынесеныя 2 сьмяротныя прысуды (у 2008 — 1, 2007 — 4, 2006 — 9, 2005 — 2, 2004 — 2). 29 чэрвеня Брэсцкі абласны суд асудзіў да сьмяротнага пакараньня 30-гадовага жыхара Драгічынскага раёну Васіля Юзэпчука, які быў прызнаны вінаватым ва ўчыненьні серыі забойстваў пажылых жанчын. 17 ліпеня суд Менскай вобласьці прызнаў вінаватым у забойстве двух чалавек 25-гадовага жыхара г. Салігорска Андрэя Жука і вынес яму сьмяротнае пакараньне. 2 кастрычніка Вярхоўны суд пакінуў бяз зьменаў прысуд В. Юзэпчуку, 27 кастрычніка — А. Жуку. Цалкам абгрунтаванымі назваў у гутарцы з журналістамі 19 жніўня Генеральны пракурор Рыгор Васілевіч вынесеныя сьмяротныя прысуды: «Гэтая мера адказнасьці суровая, але справядлівая. Пакуль наш Крымінальны кодэкс ня зьменены ў гэтай частцы і Канстытуцыя дапускае прымяненьне сьмяротнага пакараньня».

Асуджаныя В. Юзэпчук і А. Жук накіравалі хадайніцтвы аб памілаваньні прэзідэнту. В. Юзэпчук прасіў захаваць яму жыцьцё, настойваючы на тым, што ў будучым могуць зьявіцца абставіны, якія пацьвердзяць яго невінаватасьць. Калі ж прысуд будзе выкананы, то ў выпадку выяўленьня памылкі выправіць яе будзе немагчыма. Па словах адвакатаў, што выступалі ў судовым паседжаньні па справе В. Юзэпчука, прысуд Брэсцкага абласнога суда пабудаваны на здагадках, прамых доказаў няма, у аснову абвінаваўчага прысуду былі пакладзеныя галоўным чынам сьведчаньні супрацоўнікаў міліцыі. Ёсьць факты таго, што В.Юзэпчуку падчас знаходжаньня ў сьледчым ізалятары наносіліся цялесныя пашкоджаньні, што было зафіксавана. Таксама, паводле заключэньня камісіі экспертаў, у асуджанага лёгкая ступень разумовай адсталасьці, ён кепска арыентуецца ў навакольлі, непісьменны. Таму існуе вельмі сур’ёзная заклапочанасьць наконт таго, што віна асуджанага да сьмяротнага пакараньня не даказаная належным чынам. У справе Андрэя Жука адвакаты таксама адзначаюць, што сьмяротны прысуд — занадта жорсткае і неабгрунтаванае пакараньне, паколькі ёсьць зьмякчаючыя віну абставіны: ён прызнаў сваю віну, добраахвотна супрацоўнічаў са сьледзтвам і раскаяўся ва ўчыненым злачынстве.

Пры дапамозе праваабаронцаў Васіль Юзэпчук накіраваў індывідуальны зварот аб парушэньні яго правоў, у тым ліку права на справядлівае судовае разьбіральніцтва і права на жыцьцё, у Камітэт па правах чалавека ААН. 12 кастрычніка Камітэт зарэгістраваў ягоны зварот пад нумарам 1906/2009 і запатрабаваў ад Беларусі не выконваць сьмяротны прысуд да разгляду скаргі па сутнасьці. Маці Андрэя Жука таксама зьвярнулася ў Камітэт па правах чалавека ААН, і 30 кастрычніка зварот быў зарэгістраваны ў неадкладным парадку

пад нумарам 1910/2009. У адпаведнасьці са сьпецыяльнай працэдурай, Жэнеўскі офіс Вярхоўнага камісара па правах чалавека накіраваў Рэспубліцы Беларусь паведамленьне пра рэгістрацыю звароту і патрабаваньне не прыводзіць у выкананьне сьмяротны прысуд, пакуль справа знаходзіцца на разглядзе Камітэту.

Еўрасаюз і Савет Еўропы выступілі з рэзкай крытыкай вынясеньня чарговых сьмяротных прысудаў. «Вынясеньне яшчэ аднаго сьмяротнага прысуду ў Беларусі сьведчыць пра неадкладную неабходнасьць увядзеньня мараторыю на сьмяротнае пакараньне», — заявіў 4 ліпеня старшыня ПАСЕ Луіс Марыя дэ Пуч у сувязі з асуджэньнем В. Юзэпчука. «Я заклікаю ўлады Беларусі не прыводзіць гэты прысуд у выкананьне, прыняць усе неабходныя меры для ўвядзеньня мараторыю і такім чынам прадэманстраваць сваю гатоўнасьць ісьці насустрач каштоўнасьцям і стандартам Савету Еўропы і тым самым яшчэ крыху наблізіць усіх нас да канчатковай адмовы ад сьмяротнага пакараньня на еўрапейкім кантыненце», — сказаў кіраўнік ПАСЕ. 3 жніўня прэс-службай прадстаўніцтва Еўракамісіі ў Менску была распаўсюджана заява, у якой адзначалася, што Еўрапейскі Саюз выказвае сур'ёзную занепакоенасьць вынясеньнем двух сьмяротных прысудаў у Беларусі. У дакуменце падкрэсьлівалася, што Еўрасаюз «выступае супраць прымяненьня вышэйшай меры пакараньня ў любых справах і пры любых абставінах і пасьлядоўна заклікае да яго адмены ва ўсім сьвеце. ЕС пераканаены, што забарона сьмяротнага пакараньня — гэта галоўны элемент абароны чалавечай годнасьці і прагрэсіўнага разьвіцьця правоў чалавека». Пасьля таго, як Вярхоўны суд пакінуў у сіле сьмяротныя прысуды, з сумеснай заявай выступілі старшыня Камітэту міністраў Савету Еўропы Самуэль Жбогар і Генеральны сакратар СЕ Турбьерн Ягланд, у якой заклікалі прэзідэнта Беларусі памілаваць асуджаных і замяніць вынесеныя прысуды да сьмяротнага пакараньня турэмным зьняволеньнем. «Акт міласэрнасьці з боку прэзідэнта Беларусі будзе недвухсэнсоўным сігналам аб намеры Беларусі далучыцца да 47 дзяржаваў — членаў Савету Еўропы, якія прыпынілі ці адмянілі сьмяротнае пакараньне», — падкрэсьлівалася ў заяве.

У 2009 годзе праблема сьмяротнага пакараньня была ў цэнтры ўвагі праваабарончай супольнасьці. Праваабарончы цэнтр «Вясна» і Беларускі Хельсінскі камітэт ініцыявалі кампанію «Праваабаронцы супраць сьмяротнага пакараньня», якая стартавала ў студзені пры падтрымцы «Міжнароднай Амністыі». На працягу году аказвалася найперш прававая дапамога асуджаным да сьмяротнага пакараньня, была праведзена шырокая інфармацыйная кампанія (наколькі гэта магчыма ў Беларусі з улікам фактычнай манапалізацыі медыйнай прасторы дзяржавай), арганізоўваліся прэс-канферэнцыі, дыскусіі, конкурсы творчых прац, масавыя акцыі і г.д. Прадстаўленьне аб'ектыўнай інфармацыі, вядзеньне вольнай і адкрытай грамадзкай дыскусіі па сутнасьці праблемы сьмяротнага пакараньня з пункту гледжаньня каштоўнаснага, гуманістычнага, цывілізацыйнага, каб грамадзяне маглі зрабіць сьвядома свой уласны выбар адносна гэтай балючай праблемы — такая канцэпцыя была абрана праваабаронцамі ў працы з насельніцтвам.







У межах кампаніі была падрыхтаваная адмысловая петыцыя з заклікам да ўладаў адмяніць у Беларусі сьмяротнае пакараньне, пад якой падпісаліся больш за 30 чалавек — вядомыя культурныя і грамадзкія дзеячы, праваабаронцы, юрысты і навукоўцы; 10 сьнежня петыцыя была перададзеная ў Адміністрацыю прэзідэнта і адначасова яе копія — у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. 24 сьнежня праваабаронцы атрымалі адказ на свой зварот ад старшыні камісіі па нацыянальнай бясьпецы Палаты прадстаўнікоў Віктара Гумінскага. «Як вам вядома, — піша ў лісьце дэпутат, — *летам гэтага году Нацыянальнаму сходу Рэспублікі Беларусь вярнулі статус сьпецыяльнага запрошанага ў ПАСЕ на адзін год, але пры ўмове ўвядзеньня мараторыю на пакараньне сьмерцю*». Выкладзеныя ў лісьце зьвесткі адназначна не адпавядаюць рэчаіснасьці, і відавочна, што старшыня парламенцкай камісіі не валодае сітуацыяй. Разам з тым з ліста дэпутата прасочваецца ступень гатоўнасьці заканадаўчай галіны ўлады да вырашэньня праблемы сьмяротнага пакараньня: «Беларусь непасрэдна *падыйшла да таго, каб пачаць падрабязна, празрыста і шырока абмяркоўваць* у грамадзтве пытаньне аб адмене пакараньня сьмерцю. А для гэтага нам, дэпутатам, неабходны дыялог з народам. Ён можа праходзіць у розных формах. Але мы найперш вывучым магчымасьць правядзеньня парламенцкіх слуханьняў па гэтай тэме». Праваабаронцы віталі намер дэпутатаў абмеркаваць дадзенае пытаньне, наладзіць дыялог з народам і ў сваю чаргу заклікалі іх правесьці парламенцкія слуханьні па дадзенай праблеме з удзелам як  мага шырэйшага кола зацікаўленых бакоў, у тым

ліку — беларускіх праваабаронцаў і прадстаўнікоў міжнародных праваабарончых арганізацыяў.

У асноўным беларускія ўлады не аказвалі супрацьдзеяньня праваабаронцам у правядзеньні грамадзкіх акцыяў, зьвязаных з інфармаваньнем грамадзянаў аб праблеме сьмяротнага пакараньня, аднак некаторыя з іх завяршаліся затрыманьнямі ўдзельнікаў. Так, 5 чэрвеня ў Менску на вуліцы Няміга падчас правядзеньня перформансу, які суправаджаўся раздачай інфармацыйных матэрыялаў, удзельнікі мастацкай пастаноўкі былі затрыманыя нібыта «за ўдзел у масавым мерапрыемстве» (пазьней былі адпушчаныя без складаньня пратаколаў адміністрацыйнага правапарушэньня). 10 кастрычніка ў Наваполацку падчас інфармацыйнай акцыі, прымеркаванай да Сусьветнага дня барацьбы супраць сьмяротнага пакараньня, супрацоўнікі міліцыі затрымалі праваабаронцу Зьміцера Салаўёва, а таксама двух моладзевых актывістаў. Затрыманыя былі дастаўленыя ў дзяжурную частку для разьбіральніцтваў, адкуль праз гадзіну былі адпушчаны без складаньня пратаколаў. Да кампаніі праваабаронцаў у многіх рэгіёнах далучыліліся іншыя грамадзкія актывісты і арганізацыі, найперш моладзевыя. У Брэсьце акцыю па распаўсюдзе матэрыялаў супраць сьмяротнага пакараньня 10 жніўня правялі актывісты «Маладога Фронту», у Гродна да праваабаронцаў далучыліся моладзевыя актывісты БСДГ, АГП, «Маладых дэмакратаў» і «Грамадзянскага форуму».

Праваабаронцы віталі цьвёрдую пазіцыю еўрапейскіх стуктураў адносна недапушчальнасьці прымяненьня сьмяротнага пакараньня і ўмову Парламенцкай Асамблеі Савету Еўропы аб ўвядзеньні мараторыю на сьмяротнае пакараньне дзеля вяртаньня парламенту Беларусі статусу сьпецзапрошанага ў ПАСЕ, лічачы гэты крок вельмі сімвалічным і адпавядаючым духу правоў чалавека і еўрапейскіх каштоўнасьцяў.

Вялікі ўнёсак у кампанію супраць сьмяротнага пакараньня ў Беларусі зрабіла сусьветная праваабарончая арганізацыя «Міжнародная Амністыя», прадстаўнікі якой на працягу году двойчы наведалі краіну. 24 сакавіка на прэс-канферэнцыі ў Менску праграмны дырэктар арганізацыі па Еўропе і Цэнтральнай Азіі Нікала Дакворт і эксьперт Хэза Макгіл прэзентавалі даклад «Спынім сьмяротныя пакараньні ў Еўропе: на шляху да адмены сьмяротнай кары ў Беларусі» і заклікалі беларускія ўлады неадкладна ўвесьці мараторый на вынясеньне і выкананьне сьмяротных прысудаў у якасьці першага кроку да поўнай адмены дадзенага віду пакараньня. Праваабаронцы выказалі ўпэўненасьць, што грамадзтва краіны мае права на інфармацыю пра выпадкі ўжываньня сьмяротнага пакараньня і на дыскусію пра тое, ці варта яго захоўваць. Падчас візіту прадстаўнікоў «Міжнароднай Амністыі» ў Беларусь з імі знайшлі час сустрэцца толькі чыноўнікі Міністэрства юстыцыі, ад міністра ўнутраных справаў і з Адміністрацыі прэзідэнта былі атрыманыя адмовы. Падчас візіту ў Беларусь у лістападзе Хэза Макгіл прыняла ўдзел у «круглым стале», які праводзіўся ў офісе АБСЕ па праблеме сьмяротнага пакараньня. Як станоўчыя зрухі ў стаўленьні беларускіх уладаў яна расцаніла гатоўнасьць прадстаўнікоў беларускага парламенту, міністэрстваў і Вярхоўнага суда абмяркоўваць гэтае пытаньне. «Гэта ўжо ёсьць важны крок наперад. Канечне, мы лічым, што гэтага недастаткова. Мы хочам бачыць пэўныя захады, што абвешчаны мараторый. Але ўсё ж ёсьць надзея», — адзначыла эксьперт «Міжнароднай Амністыі».

Такім чынам, у 2009 годзе Беларусь не прадэманстравала палітычную волю і не прадпрыняла рашучых крокаў па адмене сьмяротнага пакараньня ці ўвядзеньні мараторыю. Сьмяротнае пакараньне дзяржаўнымі ўладамі Беларусі па-ранейшаму выкарыстоўваецца як прадмет палітычнага гандлю, жыцьцё чалавека не разглядаецца як вышэйшая каштоўнасьць, на якую ня можа замахвацца ніхто, у тым ліку і дзяржава.

## 2. Праблема палітычна матываваных зьнікненьняў

2

У 2009 годзе споўнілася 10 гадоў з часу гвалтоўнага зьнікненьня вядомых палітычных дзеячаў Юрыя Захаранкі (экс-міністр унутраных справаў, выкрадзены 7 траўня 1999 году), Віктара Ганчара (віцэ-прэм'ер, віцэ-сьпікер Вярхоўнага Савету 13-га скліканьня, выкрадзены 16 верасьня 1999 году), бізнэсоўцы Анатоля Красоўскага (выкрадзены 16 верасьня 1999 году разам з В. Ганчаром) і 9 гадоў з часу зьнікненьня журналіста Дзьмітрыя Завадзкага (аператар ОРТ, выкрадзены 7 ліпеня 2000 году). За гэты час лёс вядомых людзей так і застаўся нявысьветленым, не былі выяўленыя і пакараныя асобы, датычныя да арганізацыі і ўчыненьня дадзеных злачынстваў.

Афіцыйнае расьследаваньне справы аб зьнікненьні Дзьмітрыя Завадзкага было прыпыненае яшчэ 31 сакавіка 2006 году «ў сувязі з неўстанаўленьнем бясьследна зьніклай асобы» і з тых часоў не ўзнаўлялася. Апошняе афіцыйнае паведамленьне пра стан справы па пошуку журналіста было атрымана маці Дзьмітрыя Завадзкага Вольгай Рыгораўнай у лістападзе 2007 году. Пракурор аддзелу па наглядзе за сьледзтвам у органах пракуратуры А.В. Сыцько паведаміў, што «працягваецца аператыўная праца па ўстанаўленьні месцазнаходжаньня Завадзкага Дз.А. ці ягонага цела; *асобаў, якія ўчынілі злачынства*. У выпадку атрыманьня станоўчай інфармацыі вытворчасьць па крымінальнай справе будзе неадкладна ўзноўленая». Па-ранейшаму не было дадзенае тлумачэньне адносна таго, якіх асобаў меў на ўвазе пракурор А.В. Сыцько, паколькі па абвінавачаньні ў выкраданьні Дз. Завадзкага і ўчыненьні шэрагу іншых злачынстваў яшчэ ў 2002 годзе да розных тэрмінаў пазбаўленьня волі былі асуджаныя члены так званай «банды Ігнатовіча» — былога супрацоўніка сьпецпадразьдзяленьня «Алмаз» (у тым ліку В. Ігнатовіч і М. Малік — да пажыцьцёвага зьняволеньня).

Сьледзтва па справах аб зьнікненьні Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара і Анатоля Красоўскага афіцыйна працягвалася, пра што кожныя тры месяцы пракуратурай гораду Менску родным зьніклых





2

і прадстаўніку сям'і Ю. Захаранкі дасылаліся адпаведныя паведамленьні. Аднак акрамя таго, што сьледзтва працягнутае і пра вынікі расьсьледаваньня будзе паведамлена дадаткова, ніякай інфармацыі не прадстаўлялася, хаця родныя неаднойчы зьвярталіся ў сьледчыя органы з просьбай аб гэтым. Так, Зінаіда Ганчар, жонка зьніклага Віктара Ганчара, у канцы 2008 году даведалася пра зьмену сьледчага па справе мужа (ім стаў сьледчы па найважнейшых справах пракуратуры Менску, малодшы дарадца юстыцыі Юрый Вараўка) і 12 студзеня зьвярнулася да яго з просьбай аб сустрэчы, паколькі яна як пацярпелая мае права на атрыманьне зьвестак пра прыняцьце рашэньняў, якія закранаюць яе правы і інтарэсы, а таксама атрымліваць копіі гэтых рашэньняў. У тэлефоннай размове Ю. Вараўка сказаў, што ня бачыць падставаў для сустрэчы і прапанаваў накіраваць па гэтым пытаньні пісьмовае хадайніцтва. Адпаведнае хадайніцтва было накіравана ў пракуратуру г.Менску, у якім утрымлівалася просьба да новага следчага пра выдачу Зінаідзе Ганчар «на падставе п.14 арт. 50 Крымінальна-працэсуальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь пастановаў пра аднаўленьне і падаўжэньне тэрміна папярэдняга расьсьледаваньня, вынесеных сьледчымі ў перыяд папярэдняга расьсьледаваньня па крымінальнай справе па факце зьнікнення Ганчара В.І.». У задавальненьні пісьмовага хадайніцтва таксама было адмоўлена — сьледчы па справе не пажадаў сустрэцца з Зінаідай Ганчар і даць адказы на хвалюючыя яе пытаньні. Трэба адзначыць, што гэта стала нязьменнай традыцыяй сьледчых органаў: папярэдні сьледчы Сяргей Кухаронак таксама не задаволіў ніводнага хадайніцтва, хаця яму неаднаразова дасылаліся адпаведныя запыты з тым, каб пры асабістай сустрэчы даведацца інфармацыю пра папярэднія вынікі расьсьледаваньня.

Адсутнасць інфармацыі, фармальныя адпіскі, а таксама поўнае ігнараваньне хадайніцтваў аб прадастаўленьні зьвестак пра ход справаў на працягу многіх гадоў вымушала родных зьніклых зьвяртацца асабіста да Генеральнага пракурора Беларусі Рыгора Васілевіча.

6 лютага Генпракурору быў перададзены ліст ад жонкі Юрыя Захаранкі Вольгі з просьбай асабіста адказаць на пытаньні адносна ходу расьсьледаваньня справы аб зьнікненьні яе мужа. «За час працы на пасадзе Генеральнага пракурора Вы не прынялі мераў, каб хоць неяк разьвеяць слухі, што да зьнікненьня майго мужа

датычныя вышэйшыя службовыя асобы нашай дзяржавы. Кожныя тры месяцы я атрымліваю адказы, што сьледзтва ідзе, і па завяршэньні сьледзтва я буду праінфармаваная пра ход расьсьледаваньня. Дзесяць гадоў я атрымліваю адну і тую ж адпіску», — адзначыла ў сваім звароце Вольга Захаранка. Яна таксама прасіла Генпракурора адказаць: хто з супрацоўнікаў сьпецслужбаў адпрацоўваўся на прадмет датычнасьці да зьнікненьня Юрыя Захаранкі; супрацоўнікі якіх падразьдзяленьняў падазраваліся ў гвалтоўным выкраданьні яе мужа; ці былі дапытаныя ў якасьці падазраваных Віктар Шэйман (*1995-2000 гг. — дзяржсакратар Савету бясьпекі. — рэд.*), Юрый Сівакоў (*1999-2000 гг. — міністр унутраных справаў. — рэд.*), Уладзімір Навумаў (*1999-2000 гг. — начальнік службы бясьпекі прэзідэнта. — рэд.*) і Дзьмітрый Паўлічэнка (*палкоўнік, у 1999 годзе — камандзір сьпецыяльнага атраду хуткага рэагаваньня. — рэд.*). Адказаў на канкрэтна сфармуляваныя пытаньні В. Захаранка так і не атрымала, зноўку з пракуратуры ёй была дасланая фармальная адпіска.

У жніўні зварот да Генпракурора Рыгора Васілевіча накіравалі жонка В. Ганчара, маці Дз. Завадзкага і Ю. Захаранкі, дзе адзначылі: «Дзесяць гадоў ведамства, якое Вы ўзначальваеце, вядзе расьсьледаваньне таго, што адбылося з нашымі мужамі і сынамі. Увесь гэты час органы расьсьледаваньня і пракуроры па наглядзе дэманстравалі сваю няздольнасьць эфектыўна расьсьледаваць гэтыя злачынствы. Бязьдзейнасьць уладаў, магчымая некампетэнтнасьць сьледчых органаў працягваюць трымаць нас у невядомасьці адносна лёсаў блізкіх нам людзей, што наносіць нам вялікія маральныя і фізічныя пакуты. Тэрміны па справах шматразова працягваюцца без якіх-небудзь канкрэтных вынікаў. Улады яўна цягнуць час. У бліжэйшы час гэта прывядзе да таго, што справы будуць спынены ў сувязі з заканчэньнем тэрмінаў даўнасьці прыцягненьня вінаватых да крымінальнай адказнасьці. Мы хочам ведаць, якія вынікі расьсьледаваньня, якое цягнецца ўжо дзесяць гадоў. Мы настойваем і патрабуем азнаёміць нас з працэсуальнымі дакументамі, у якіх адлюстраваны вынікі расьсьледаваньня справаў з прававымі ацэнкамі і высновамі, указанымі ў іх. Мы патрабуем, каб цягам бліжэйшага месяца — да 16 верасьня — Вы зрабілі публічную справаздачу аб выніках расьсьледаваньня. Вы можаце выбраць любую зручную для Вас форму (напрыклад, асабістую сустрэчу, інтэрвію беларускім СМІ і гэтак далей), аднак хаваць ад нас праўду, прыкрываючыся разнастайнымі фармальнымі адгаворкамі і адпіскамі, недазваляльна. Калі беларускія праваахоўныя органы ня ў сілах расьсьледаваць гэтыя злачынствы, мы гатовы дапамагчы ў прыцягненьні да расьсьледаваньня сьпецыялістаў з іншых краінаў. Мы хочам, каб былі пакараны вінаватыя ў гэтых злачынствах». Аднак і на гэты зварот Генпракуратура адрэагавала адпіскай: ён быў перанакіраваны ў пракуратуру Менску, адкуль па-ранейшаму працягвалі прыходзіць толькі фармальныя паведамленьні аб працягненьні тэрмінаў сьледзтва.





Такім чынам, супрацоўнікі пракуратуры ўсіх узроўняў па-ранейшаму займалі пазіцыю відавочнага зацягваньня і імітацыі сьледчых дзеяньняў, замоўчваньня інфармацыі пра ход расьсьледаваньня і ігнараваньня законных патрабаваньняў пацярпелых. За 2009 год не зьявілася ніводнага фактару, які б сьведчыў пра імкненьне пракуратуры да правядзеньня аб'ектыўнага расьсьледаваньня, выяўленьня і далейшага прыцягненьня да адказнасьці асобаў, датычных да дадзеных злачынстваў. Пры гэтым адсутнасьць вынікаў шматгадовай працы сьледчых пракуратуры па справах зьнікненьня вядомых у Беларусі людзей толькі ўмацоўвала ў меркаваньні, што афіцыйнае расьсьледаваньне ў поўным аб'ёме не вядзецца, паколькі прафесійная дзейнасьць сьледчых блакуецца вышэйшымі службовымі асобамі Беларусі. Безвыніковасьць афіцыйнага расьсьледаваньня таксама падмацоўвала версію аб датычнасьці да дадзеных злачынстваў асобаў, якія займалі або займаюць высокія дзяржаўныя пасады. Нагадаем, беларуская і міжнародная дэмакратычная грамадзкасьць не выключаюць дачыненьня да гвалтоўных выкраданьняў і пазасудовых пакараньняў былога дзяржсакратара Савету бясьпекі і Генеральнага пракурора Віктара Шэймана, экс-міністраў МУС Уладзіміра Навумава і Юрыя Сівакова, экскамандзіра вайсковай часткі 3214 Дзьмітрыя Паўлічэнкі. Пры тым, што шмат гадоў афіцыйнае сьледзтва ігнаруе гэтую інфармацыю, але яна і не абвяргаецца, а неабходныя крокі дзеля высьвятленьня яе праўдзівасьці не прадпрымаюцца.

У той час, як прадстаўнікі афіцыйнага сьледзтва цалкам ухіляліся ад каментароў па справах аб зьнікненьні вядомых у Беларусі людзей, Аляксандр Лукашэнка ўдзяліў гэтай праблеме шмат увагі. У інтэрвію расійскай газеце «Завтра» (№24 (812) ад 10 чэрвеня 2009 г.) А. Лукашэнка заявіў, што «шмат прычынаў і палітычных, і псіхалагічных, і сацыяльных, якія перашкаджаюць нашаму Саюзу. Аднак усё гэта падаецца пад соўсам таго, што нібыта ў Беларусі не

хапае дэмакратыі, Лукашэнка — дыктатар, у Беларусі бясьсьледна зьнікаюць людзі. Загінулі тры чалавекі, а СМІ круцяць гэта да гэтага часу. Лукашэнка іх забіў як праціўнікаў рэжыму. На самой справе, у двух выпадках — гэта забойствы на камерцыйнай глебе, — абяцалі купіць, прадаць, не стрымалі абяцаньне і былі забітыя, як гэта адбываецца ў напаўбандыцкім асяродку. Сьлед забойцаў нядаўна выяўлены ў Германіі» (*не зразумела, каго са зьніклых меў на ўвазе А. Лукашэнка. — рэд.*). Такім чынам, кіраўнік дзяржавы, не з’яўляючыся органам, які вядзе крымінальны працэс, або органам, якому прадастаўлена права ажыцьцяўляць нагляд і кантроль за вядзеньнем крымінальнага працэсу, выявіў дасьведчанасьць у выніках расьсьледаваньня і публічна заявіў пра іх. Пры гэтым ні родныя, ні іх адвакаты не валодаюць ніякай інфармацыяй пра ход расьсьледаваньня  і  іх не дапускаюць да азнаямленьня з тымі дакументамі, выдача якіх па запатрабаваньні пацярпелых прадугледжаная нацыянальным заканадаўствам. Таму для іх стала поўнай нечаканасьцю зьяўленьне інфармацыі пра нібыта ўжо раскрытае злачынства і даказанасьць факту забойства іх блізкіх. Паколькі на нацыянальным узроўні высьветліць праўдзівасьць выкладзенай прэзідэнтам краіны інфармацыі аказалася немагчымым, жонка Віктара Ганчара Зінаіда, якая ўспрыняла агучаную інфармацыю як датычную яе мужа, накіравала зварот да сакратара Працоўнай групы па гвалтоўных зьнікненьнях ААН Джаваны Цукелі, у якім папрасіла зрабіць запыт да ўраду Беларусі наконт інфармацыі, пададзенай А. Лукашэнкам. Ці быў такі запыт зроблены Працоўнай групай і якія яго вынікі — да канца году так і заставалася невядомым.

У гэтым жа інтэрвію А. Лукашэнка даў тлумачэньне і прычынаў зьнікненьня журналіста Дзьмітрыя Завадзкага, адзначыўшы: «Або Дзьмітрый Завадзкі з Першага канала. Які ён мне супернік, чалавек з сярэдняй адукацыяй. Чаму я павінен быў яго зьнішчыць? Вы хочаце ведаць аб гэтым праўду? Была ваенізаваная група ў Беларусі, узначаленая нейкім Ігнатовічам, вельмі падрыхтаваныя хлопцы са сьпецназу СССР. Яны паехалі ў Чачню падчас вайны і ваявалі на баку Масквы. Паваявалі і вярнуліся дадому. Прыяжджаюць да іх Шарамет (*журналіст ОРТ, калега і сябра Дз. Завадзкага. — рэд.*) і Завадзкі здымаць сюжэт для расійскага тэлебачаньня. У гэтым сюжэце было сказана, што вось гэтыя беларускія грамадзяне ваююць на баку чачэнскіх сепаратыстаў супраць федэральных войскаў. Узялі інтэрвію ў гэтага Ігнатовіча, а потым сказалі, што ён ваяваў супраць рускіх. Шарамет выкруціўся, а Завадзкага злавілі. Пачалі з мужчынскіх разборак: «Навошта жа ты нас абгаварыў»? І забілі Завадзкага. Ігнатовіч атрымаў пажыцьцёвае зьняволеньне і знаходзіцца ў нашай калоніі. Загінуў аператар, а гэты правакатар Шарамет сядзіць у Маскве і піша ўсякія гадасьці аб Беларусі». Варта адзначыць, што А.Лукашэнка назваў В.Ігнатовіча і яго банду «вельмі падрыхтаванымі хлопцамі са сьпецназу СССР», тым самым дыстанцуючыся ад іх. На самой справе В.Ігнатовіч зьяўляўся афіцэрам сьпецпадразьдзяленьня «Алмаз» пры беларускім МУС, і ў ягоную групу ўваходзілі яшчэ некалькі дзеючых і былых супрацоўнікаў «Алмазу» і іншых беларускіх сьпецпадразьдзяленьняў. Таксама зьвяртае ўвагу і той факт, што А. Лукашэнка выказаў упэўненасьць у тым, што Дз. Завадзкі быў забіты, хаця В. Ігнатовіч і ягоныя паплечнікі былі асуджаныя па абвінавачаньні ў выкраданьні, а не забойстве журналіста, а аператыўная праца па ўстанаўленьні месцазнаходжаньня журналіста ці ягонага цела працягваецца і да гэтага часу. Пры гэтым выкладзенымі кіраўніком дзяржавы дадатковымі зьвесткамі, якія б маглі праліць сьвятло на лёсы зьніклых людзей, адпаведныя сьледчыя органы не зацікавіліся.

Пасьля зьяўленьня інтэрвію А. Лукашэнкі з указаньнем на «нямецкі сьлед» у справах аб зьнікненьнях, старшыня Аб’яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька накіраваў у канцылярыю канцлера ФРГ Ангелы Меркель зварот, у якім прасіў даць адказ на два пытаньні: ці вядома праваахоўным органам Германіі, што мяркуемыя забойцы Ганчара і Захаранкі знаходзяцца на тэрыторыі краіны і ці зьвярталіся беларускія ўлады да ўладаў ФРГ з просьбай выдаць кагосьці як магчымых удзельнікаў ці арганізатараў забойстваў гэтых людзей. Вядома, што з канцылярыі А. Меркель запыт быў перададзены ў МУС Германіі, адкуль быў атрыманы адназначны адказ, што такія асобы на тэрыторыі краіны не знаходзіліся, а таксама ніякіх афіцыйных запытаў з боку беларускіх уладаў па такіх асобах у МУС ФРГ не паступала. Такім чынам, агучаная А. Лукашэнкам версія пра крымінальны «нямецкі сьлед» у зьнікненьнях і магчымых забойствах беларускіх палітыкаў была абвергнутая нямецкімі ўладамі.

Наступны раз шырокую трактоўку свайго бачаньня праблемы зьніклых А. Лукашэнка агучыў перад журналістамі падчас свайго працоўнага візіту ў Літву. Візіт адбыўся 16 верасьня, якраз у дзяся-

тую гадавіну выкраданьня Віктара Ганчара і Анатоля Красоўскага, і афіцыйнай прычынай яго стала адкрыцьцё літоўска-беларускага форуму «Беларусь і дзяржавы Балтыйскага мора: новыя магчымасьці для пашырэньня супрацоўніцтва». Трэба адзначыць, што гэта быў першы візіт А. Лукашэнкі па запрашэньні краіны Эўрасаюзу пасьля многіх гадоў палітычнай ізаляцыі. А. Лукашэнка, бясспрэчна, ведаў, што журналісты будуць задаваць яму пытаньні, датычныя гучных справаў аб зьнікненьнях, таму спрабаваў спачатку перавесьці размову ў рэчышча звычайных зьнікненьняў. Ён добра падрыхтаваўся і агучыў наступныя лічбы: «Вось ведаючы тое, што вы такія дэмакраты ў нас, я запытаў вось такую інфармацыю. Колькасьць зьніклых бяз вестак у Беларусі — 2289 чалавек з 1991 году. (…) За восем месяцаў гэтага году знойдзена 718 чалавек. У год у росшук у нас абвяшчаецца 1600 чалавек. За год знаходзіцца 900 чалавек, гэта значыць, меней, на жаль». Аднак усё ж кіраўніку дзяржавы давялося адказаць на вострыя пытаньні літоўскіх СМІ, і ім была агучаная наступная трактоўка праблемы (цытуем «Lietuvos Rytas»): «Вы іх называеце высокапастаўленымі палітыкамі. Я так не лічу. Гэта што, па пасадзе: дык яны ніякія пасады не займалі. Яны былі ў маім урадзе. І Віктар Ганчар займаў пасаду віцэ-прэм’ера, потым махнуў рукой і сыйшоў. Ня ведаю, праўда, пры чым тут, як вы сказалі, Красоўскі? Красоўскі ніякім пастаўленым ня быў. Дзіма Завадзкі — гэта аператар, які са мной працаваў. Я не разумею зусім, якія ён мае адносіны да палітыкі. (…) Захаранка, былы міністр. У гэтага Захаранкі быў бізнэс з Украінай. Вы вось гэтае пытаньне вывучыце, калі вам цікава. Камусьці запазычаў, папярэджвалі яго, глядзі, будзь больш уважлівым. Не я папярэджваў, а людзі, з якімі ён у МУС працаваў. Не, у мяне бізнэс! Запазычыў мільёны. Мы гэтую версію разглядаем. Мы ні адну з версій не адкідаем. І самае галоўна, вам, верагодна, гэта вядома, у адной з краінаў мы кагосьці пабачылі. І хутка далі запыт — дайце інфармацыю. Вось ён у нас зьніклы, а там ходзіць. Фотаздымкі былі і артыкулы ў газетах, у іх, ня ў нас. Да гэтага часу нам інфармацыю не прадставілі. Разумееце, і цэлы кангламерат пытаньняў. І самае галоўнае, што ні родныя, ні блізкія не спрабуюць аказаць падтрымку, каб устанавіць ісьціну. Усё палітызавана. (…) Усё гэта выкарыстоўваецца мэтанакіравана — супраць Лукашэнкі.(…) І, дарэчы, яны не былі апазіцыянерамі. (…) Віктар Ганчар? Ну які ён быў апазіцыянер?! Хто грошай заплаціць, на таго і працаваў, ну што вы кажаце.





Ну я Віктара ведаю лепш, чым вы. І далей, прад’яўленьне прэтэнзіяў з боку родных: дзе мой муж, дзе мой сын і гэтак далей. Гэта я, перш за ўсё, павінен спытаць у сям’і, дзе ваш муж, дзе ваш сын? Чаму вы не глядзелі, калі ён не быў зьніклым? Чаму ўвагі не зьвярталі? Як яго ня стала, гэта стала палітыкай і заробкам для іх. Мы гэта таксама добра ведаем. Таму ня трэба на гэтым рабіць палітыку. Таму ня трэба на людзкім горы будаваць палітыку супраць Лукашэнкі, супраць краіны. Ня трэба, гэта выгады не прынясе. Паверце, перад вамі сядзіць чалавек больш-менш дасьведчаны ў тым, што адбываецца сёньня вакол гэтага працэсу. Я ня буду канкрэтызаваць, але я ведаю вельмі добра, што адбываецца. (…) Вы хочаце ведаць, на якім узроўні гэты працэс? Калі ласка, да Генеральнага пракурора — ён у нас гэтай справай займаецца. Гэтае пытаньне знаходзіцца на кантролі ў прэзідэнта, яны мне рэгулярна дакладаюць, што зроблена за апошні час, як і па многіх іншых важных пытаньнях, калі яго палітызавана». А. Лукашэнка выступіў таксама ў абарону беларускіх службоўцаў, якія падазраюцца беларускай і міжнароднай супольнасьцю ў датычнасьці да арганізацыі і зьдзяйсьненьня выкраданьняў: «Чаму вы без суда залічылі кагосьці ў злачынцы? Вы прадстаўнік дэмакратычнага грамадзтва, таму павінны разумець, што злачынца — гэта тады, калі суд прыняў рашэньне. Ні ваш суд, ні наш, а гэта павінен быць наш суд, не прымаў такога рашэньня».

Вялікая цікавасьць да візіту А. Лукашэнкі і да праблемы зьнікненьня людзей у Беларусі ў прыватнасьці, была выклікана рознымі фактарамі, сярод якіх — зварот родных В. Ганчара, Ю. Захаранкі і Дз. Завадзкага асабіста да прэзідэнта Літвы Далі Грыбаўскайтэ з просьбай не дапусьціць гэтага візіту. «Візіт Лукашэнкі, з нашага пункту погляду, будзе азначаць адно — прызнаньне Літоўскай Рэспублікай легітымнасьці цяперашняга правячага рэжыму, які да гэтага часу падазраецца ў страшных злачынствах. (…) Нам, родным выкрадзеных, хочацца спадзявацца, што Вы, спадарыня Прэзідэнт, у стане зразумець нашы пачуцьці. Для нас выкрадзеныя правячым рэжымам — ня проста палітыкі, а родныя людзі, — таму мы вымушаныя стукацца ва ўсе інстанцыі ў надзеі, што нас пачуюць, хоць нешта зробяць для таго, каб нашыя сем’і змаглі даведацца праўду пра лёс нашых любімых і блізкіх. Лічым, што ў праблеме палітычных выкраданьняў у Беларусі існуе вялікі маральны, чалавечы аспект». Таксама Зінаіда Ганчар і Вольга Завадзкая напярэдадні візіту

А. Лукашэнкі ў Вільню правялі прэс-канферэнцыю ў Сейме Літвы, якая выклікала вялікі інтарэс у літоўскай прэсы. Падчас сустрэчы з журналістамі родныя зьніклых выказалі пратэст у сувязі з запрашэньнем А. Лукашэнкі літоўскімі ўладамі. «Мы да гэтага часу ня ведаем, чым абумоўлены гэты візіт. Ніводнае патрабаваньне Еўрасаюзу беларускімі ўладамі ня выканана. Нам не зразумелая пазіцыя Еўрасаюзу і для нас, родных выкрадзеных апазіцыянераў, усё гэта зьневажальна», — адзначыла З. Ганчар. Аднак, нягледзячы ні на што, візіт А. Лукашэнкі адбыўся, і падчас яго прэзідэнт Літвы Даля Грыбаўскайтэ сустрэлася з беларускім лідэрам, абазначыўшы такім чынам намер праводзіць далейшае супрацоўніцтва з беларускімі ўладамі. Дарэчы, на зварот родных зьніклых палітыкаў з Адміністрацыі прэзідэнта Літвы ніякай рэакцыі не пасьледавала.

Відавочна, што візіт А. Лукашэнкі ў краіну ЕС і фактычнае зьняцьце палітычнай ізаляцыі беларускага рэжыму былі ўзгодненыя кіраўніцтвам Літвы з Еўрапейскім Саюзам, які настойліва працягваў палітыку ўцягваньня беларускіх уладаў у дыялог. Пры гэтым ЕС фактычна адыйшоў ад сваіх ранейшых патрабаваньняў, сфармуляваных ў 2006 годзе ў дакуменце «Што Еўрасаюз можа даць Беларусі», дзе адзначалася, што «дзеля пабудовы глыбокіх адносінаў, якія мы хацелі б мець паміж ЕС і народам Беларусі, дзеля спыненьня палітыкі самаізаляцыі, якую беларускі ўрад навязвае сваім грамадзянам, мы гаворым, што беларускім уладам патрэбна, па-першае, належным чынам і незалежна расьсьледаваць ці перагледзець выпадкі зьнікненьня людзей(…)». На працягу году ў перамовах кіраўніцтва ЕС з уладамі Беларусі гэтае пытаньне публічна не ўздымалася, а праблема зьніклых не знайшла свайго гучаньня ў пераліку асноўных патрабаваньняў да ўладаў Беларусі дзеля вядзеньня далейшага перамоўнага працэсу і ўключэньня краіны ў праграмы ЕС. Аднак праблема гэта негалосна прысутнічала ў стасунках ЕС і Беларусі.

У сваю чаргу, беларускія ўлады пасылалі выразныя сігналы Захаду, працягваючы адхіленьне ад высокіх дзяржаўных пасадаў службоўцаў, з чыімі імёнамі зьвязваюцца выкраданьні і магчымыя пазасудовыя пакараньні Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара, Анатоля Красоўскага і Дзьмітрыя Завадзкага. 6 красавіка 2009 году прэзідэнт Беларусі прыняў адстаўку міністра ўнутраных справаў Уладзіміра Навумава: па афіцыйнай версіі міністр сам папрасіў вызваліць яго ад пасады па стане здароўя. За У. Навумавым засталася толькі грамадзкая пасада старшыні Федэрацыі хакею, аднак ужо ў сьнежні экс-міністр заявіў пра сыход і з Федэрацыі, хаця незадоўга да гэтага заяўляў пра намер заняцца падрыхтоўкай інфраструктуры Беларусі да чэмпіянату сьвету па хакеі 2014 году ў Менску. У хуткім часе стала вядома, што Уладзімір Навумаў пакідае Беларусь і працаўладкоўваецца ў Маскве ў адным з буйнейшых расійскіх банкаў «Внешторгбанк». У сакавіку сышоў у адстаўку палкоўнік Дзьмітрый Паўлічэнка: прэс-служба ўнутраных войскаў паведаміла, што ён звольнены з вайсковай службы «па хваробе». Апошняя пасада, якую займаў Дз. Паўлічэнка — намесьнік камандзіра корпусу аховы грамадзкага парадку ўнутраных войскаў МУС па баявой падрыхтоўцы (быў прызначаны ў лістападзе 2008 году), а да гэтага камандаваў сьпецыяльным атрадам хуткага рэагаваньня ўнутраных войскаў (в/ч 3214). Нагадаем, што першым з адыёзных асобаў дзяржпасаду пакінуў былы міністр унутраных справаў, а затым міністр спорту і турызму Юрый Сівакоў, які займаецца выкладаньнем у Акадэміі МУС. Затым у чэрвені 2008 году з пасады дзржсакратара Савету бясьпекі быў зьняты Віктар Шэйман: афіцыйнай прычынай адстаўкі называлася незабесьпячэньне належнага ўзроўню бясьпекі падчас сьвяткаваньня Дня Рэспублікі, у выніку чаго ў цэнтры Менску адбыўся выбух. Пасьля адстаўкі ў В. Шэймана заставалася пасада кіраўніка сумеснай беларуска-венесуэльскай камісіі высокага ўзроўню, на якую ён быў прызначаны прэзідэнтам яшчэ ў верасьні 2006 году, аднак у студзені стала вядома, што былы дзяржсакратар прызначаны памочнікам прэзідэнта, і ў ягоныя задачы ўваходзіць выкананьне асобых даручэньняў кіраўніка дзяржавы. Эксьперты не выключаюць, што А. Лукашэнка не палічыў магчымым парываць сувязі з чалавекам, які падчас знаходжаньня на дзяржпасадах выконваў кантралюючыя функцыі па шэрагу схаваных ад староньніх вачэй накірункаў дзейнасьці беларускіх уладаў.

Нягледзячы на відавочна кампрамісны варыянт стасункаў па праблеме зьніклых, абраны паміж Захадам і ўладамі Беларусі, родныя выкрадзеных працягвалі настойліва падымаць гэтую тэму на ўсіх узроўнях. 17 жніўня З. Ганчар, В. Завадзкая і У. Захаранка накіравалі звароты прэм'ер-міністру Швецыі, якая на той час старшынствавала ў Еўрапейскім Саюзе, канцлеру Германіі, у Парламенцкую асамблею Савету Еўропы, а таксама прэзідэнтам ЗША і Расіі, дзе адзначылі: «Мы вымушаны прасіць вас выкарыстаць усе

магчымыя сродкі ўзьдзеяньня на беларускія ўлады, каб тыя выканалі абавязацельствы перад грамадзянамі сваёй краіны і міжнародныя абавязацельствы, узятыя на сябе Рэспублікай Беларусь па правядзеньні ўсебаковага і аб'ектыўнага расьсьледаваньня зьнікненьняў нашых родных. (…) У выпадку адсутнасьці рэальных дзеяньняў па расьсьледаваньні гучных справаў, просім вас ініцыяваць міжнароднае расьсьледаваньне гэтых злачынстваў. (…) Беларускія афіцыйныя асобы ў розныя перыяды агучвалі версіі то пра расійскі, то пра нямецкі сьлед, то пра камерцыйны характар учыненых злачынстваў. Аднак даўно зразумела, што ўсё гэта — толькі спроба адцянуць увагу ад сапраўдных прычынаў выкраданьня вядомых у Беларусі людзей».

У сваю чаргу ЕС, займаючы даволі стрыманую пазіцыю і не абвастраючы дыялог з беларускімі ўладамі праблемай палітычна матываваных зьнікненьняў, заставаўся цьвёрдым у рашэньні абмежаваньня доступу на тэрыторыю краінаў Еўрапейскага Саюзу асобаў, якія падазраюцца ў датычнасьці да гэтых злачынстваў. Нагадаем, яшчэ 13 кастрычніка 2008 году міністры замежных справаў краінаў Еўрасаюзу прынялі рашэньне аб прыпыненьні на 6 месяцаў забароны на ўезд у краіны ЕС 36 вышэйшых службовых асобаў Беларусі, і толькі ў адносінах да 5 чалавек дадзеная санкцыя была захаваная, сярод іх — Віктар Шэйман, Уладзімір Навумаў, Юрый Сівакоў, Дзьмітрый Паўлічэнка і старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына (візавыя санкцыі адносна гэтых асобаў былі ўведзеныя ЕС у 2004 годзе). Праз вызначаныя 6 месяцаў, 16 сакавіка 2009 году, кіраўнікі МЗС краінаў ЕС працягнулі дадзеныя візавыя абмежаваньні яшчэ на 9 месяцаў: для 36 чыноўнікаў яны былі зноўку прыпыненыя, для 5 тых жа асобаў уезд на тэрыторыю краінаў ЕС зноў быў забаронены. Тая ж сітуацыя паўтарылася ў лістападзе, калі дзеяньне санкцыяў было працягнута да кастрычніка 2010 году.

Тэма палітычных зьнікненьняў у Беларусі была ўпершыню закранутая прэзідэнтам Расіі Дзьмітрыем Мядзьведзевым. Падчас прэс-канферэнцыі для прадстаўнікоў беларускіх СМІ 23 лістапада ён заявіў, што Беларусь не зьвярталася да Расіі па дапамогу ў расьсьледаваньні гучных злачынстваў, у тым ліку выкраданьня тэлеаператара расійскага каналу ОРТ Дзьмітрыя Завадзкага (нагадаем, што асобы, прызнаныя вінаватымі ў выкраданьні журналіста, былі затрыманыя на тэрыторыі Расіі, а таксама яны ваявалі на расійскім баку падчас вайны ў Чачні). «Я ня ведаю, якія звароты







былі да таго, але ў маё прэзідэнцтва такіх зваротаў не было», — адзначыў Дз. Мядзьведзеў. Пры гэтым ён падкрэсьліў, што ўсе злачынствы, учыненыя на тэрыторыі Беларусі, як і на тэрыторыі Расіі, «павінны быць расьсьледаваныя, пакуль у іх ня будзе пастаўленая кропка, ня знойдзеныя вінаватыя, не ўстаноўлена, што адбылося. Бясспрэчна, і па дадзеных злачынствах павінна быць пастаўленая кропка». Родныя зьніклых выказалі гатоўнасьць падрыхтаваць такія звароты да расійскага кіраўніцтва, перш за ўсё каб аспрэчыць расійскі сьлед у выкраданьнях сваіх блізкіх.

На працягу году праблема палітычных зьнікненьняў заставалася ў цэнтры ўвагі беларускай дэмакратычнай супольнасьці. Кожны месяц 16 чысла (*16 верасьня 1999 году былі выкарадзеныя Віктар Ганчар і Анатоль Красоўскі. — рэд.*) у розных гарадах Беларусі традыцыйна праводзіліся акцыі салідарнасьці з сем'ямі зьніклых і рэпрэсаванымі. У большасьці выпадкаў акцыі насілі несанкцыянаваны характар, паколькі ўлады не давалі дазволу на іх правядзеньне. Так, Брэсцкі гарвыканкам у пачатку траўня не задаволіў заяўку, пададзеную актывістамі мясцовай арганізацыі АГП, на правядзеньне пікету, прымеркаванага да 10 гадавіны зьнікненьня Юрыя Захаранкі. І хаця заяўка падавалася на вызначанае гарвыканкамам месца для правядзеньня масавых мерапрыемстваў — стадыён «Лакаматыў», пікетаваньне было забароненае. Матывіроўка адмовы: у гэты час на стадыёне будзе праходзіць футбольны турнір, пры гэтым, іншага месца і часу правядзеньня акацыі брэсцкія ўлады не прапанавалі. Пікетаваньне адбылося ў несанкцыянаваным парадку, і ў выніку быў затрыманы адзін з яго ўдзельнікаў Мікалай Коўш. У Менску ў 10-ю гадавіну выкраданьня Юрыя Захаранкі былі затрыманыя каля 30 чалавек: яны былі дастаўленыя ў РУУС Цэнтральнага раёну і падвергнутыя прымусовай дактыласкапіі, пасьля чаго адпушчаныя без складаньня пратаколаў. У Гомелі на пяцёх удзельнікаў аналагічнай акцыі былі складзеныя пратаколы адміністрацыйнага правапарушэньня, і яны былі пакараныя арыштам (Уладзімір Кацора, як арганізатар несанкцыянаванага масавага мерапрыемства) і штрафамі ў 10 базавых велічыняў. Не была дазволеная Менгарвыканкамам і заяўка на правядзеньне пікету на месцы выкраданьня Віктара Ганчара і Анатоля Красоўскага (перасячэньне вуліцы Фабрычная і завулка Рабочы ў Менску) у 10-ю гадавіну іх зьнікненьня, пададзеная сябрамі АГП. Калі ж актывісты 16 верасьня выйшлі з партрэтамі зьніклых на Кастрычніцкую плош-

чу, акцыя была вельмі жорстка падаўленая з ужываньнем сілы, каля 20 яе ўдзельнікаў затрыманыя і дастаўленыя ў аддзяленьне міліцыі — пратаколы правапарушэньняў зноў жа не складаліся. У Гомелі на ўдзельнікаў акцыі памяці пратаколы адміністрацыйнага прапавапушэньня былі складзеныя, і сямёра з іх былі прыцягнутыя да адміністрацыйнай адказнасьці ў выглядзе штрафаў на агульную суму 7 млн. 525 тысяч рублёў (каля 2 700 даляраў ЗША). Практыка сілавога падаўленьня акцыяў салідарнасьці была працягнутая і надалей, чаго не назіралася ў першай палове году.



Усяляк блакаваўся ўладамі і распаўсюд інфармацыі па праблеме гвалтоўных зьнікненьняў у Беларусі. Найбольш паказальны выпадак — дэпартацыя журналістаў расійскага тэлеканалу НТВ Аляксея Малкава і Юрыя Бабенкі з Беларусі пасьля іх інтэрвію з жонкай Віктара Ганчара і маці Дзьмітрыя Завадзкага. Журналісты завяршылі сваю камандзіроўку ў Менск і зьбіраліся вярнуцца ў Маскву, аднак увечары 14 жніўня супрацоўнікі сьпецслужбаў у цывільным вывелі іх з нумару гатэлю Міжнароднага адукацыйнага цэнтру, дзе яны спыніліся. Спачатку яны былі дастаўленыя ва ўпраўленьне ўнутраных справаў Маскоўскага раёну Менску, затым адвезеныя ў аэрапорт, дзе іх пратрымалі ўсю ноч, а першым ранішнім рэйсам адправілі ў Маскву. Афіцыйна журналістаў абвінавацілі ў працы без акрэдытацыі МЗС Беларусі.

Такім чынам, у 2009 годзе так і ня быў высьветлены лёс зьніклых Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара, Анатоля Красоўскага і Дзьмітрыя Завадзкага. Афіцыйнае расьсьледаваньне фактычна не вялося, вынікі яго так і ня сталі вядомымі родным выкрадзеных і грамадзкасьці, вінаватыя ў злачынствах так і не былі выяўленыя і пакараныя.

Важнай асаблівасьцю году стала фактычнае замоўчваньне праблемы зьніклых еўрапейскімі структурамі дзеля наладжваньня палітычнага дыялогу з беларускімі ўладамі, адыход ад ранейшай прынцыповай пазіцыі ў гэтым пытаньні.





# 3. Крымінальны перасьлед па палітычных матывах



У 2009 годзе ня спраўдзіліся спадзяваньні беларускай грамадзянскай супольнасьці на дэкрыміналізацыю грамадзкай і палітычнай дзейнасьці. Так, ня быў адменены арт. 193.1 КК Рэспублікі Беларусь (незаконная арганізацыя дзейнасьці грамадзкага аб'яднаньня, рэлігійнай арганізацыі ці фонду альбо ўдзел у іх дзейнасьці), адносна якога прадстаўнікі ўладаў неаднаразова заяўлялі аб разглядзе магчымасьці яго адмены і перамяшчэньня адказнасьці за падобныя дзеяньні ў сьферу адміністрацыйнага заканадаўства (замену крымінальнай адказнасьці за дзейнасьць незарэгістраваных арганізацыяў адміністрацыйнай). У Крымінальным кодэксе засталіся і іншыя артыкулы, на адмене якіх настойваюць беларускія праваабаронцы, і найперш гэта дыфамацыйныя: 368 — «абраза прэзідэнта РБ», 367 — «паклёп у дачыненьні да прэзідэнта РБ», 368 — «абраза прадстаўніка ўлады», 369.1 — «дыскрэдытацыя Рэспублікі Беларусь».

Для 2009 году характэрнай зьявілася тэндэнцыя да зьніжэньня крымінальнага перасьледу па палітытычных матывах. Аднак зафіксаваныя на працягу году факты сьведчаць, што ўлады Беларусі ня здолелі забясьпечыць мараторый на выкарыстаньне дадзенага віду перасьледу грамадзянаў Беларусі.

На працягу году працягвалі адбываць пакараньне ў выглядзе абмежаваньня волі без накіраваньня ва ўстановы адкрытага тыпу 11 удзельнікаў так званай «справы 14-ці», асуджаных у 2008 годзе па арт. 342 Крымінальнага кодэксу за ўдзел у мірнай дэманстрацыі пратэсту прадпрымальнікаў (адбылася 10 студзеня таго ж году): Арцём Дубскі, Максім Дашук, Тацяна Цішкевіч, Аляксей Бондар, Алесь Стральцоў, Міхаіл Пашкевіч, Алесь Чарнышоў, Міхаіл Крываў, Міхаіл Субач, Павел Вінаградаў і Аляксандр Баразенка. На працягу году шасьцёра асуджаных былі амніставаныя, аднак пытаньне амністыі Тацяны Цішкевіч, Аляксея Бондара і Міхаіла Крывава, якія зьехалі за мяжу, дагэтуль застаецца актуальным — дадзеныя асобы знаходзяцца пад пагрозай крымінальнага перасьледу за ўхіленьне ад адбыцьця пакараньня. Два ўдзельнікі справы

«14-ці» — Арцём Дубскі і непаўнагадовы Максім Дашук былі паўторна прыцягнутыя да крымінальнай адказнасьці за ўхіленьне ад адбыцьця пакараньня. Максім Дашук паводле новага прысуду быў асуджаны да 1,5 гадоў абмежаваньня волі без накіраваньня ва ўстановы адкрытага тыпу; Арцём Дубскі быў асуджаны да 1 году пазбаўленьня волі з адбыцьцём пакараньня ў калоніі агульнага рэжыму. Беларускія праваабарончыя арганізацыі лічаць удзельнікаў «справы 14-ці» палітычнымі зьняволенымі, «Міжнародная Амністыя» прызнала ўсіх асуджаных, якія адбывалі пакараньне ў выглядзе абмежаваньня волі, вязьнямі сумленьня.

3

На працягу 2009 году ў Беларусі было ўзбуджана некалькі крымінальных справаў, якія хаця і не былі наўпрост зьвязаныя з палітычнай ці грамадзкай дзейнасьцю грамадзянаў, але груба парушаюць асноўныя прынцыпы правоў чалавека. Гэта найперш крымінальныя справы, узбуджаныя ў дачыненьні да вернікаў пэўных рэлігійных групаў. Да гэтай катэгорыі адносіцца справа, узбуджаная ў дачыненьні да Яўгена Волкава па арт. 193.1 Крымінальнага кодэксу за ўдзел і арганізацыю дзейнасьці незарэгістраванай рэлігійнай арганізацыі «Рух яднаньня» (Царква Муна), справа па арт. 435 Крымінальнага кодэксу — «ухіленьне ад мерапрыемстваў прызыву на вайсковую службу» ў дачыненьні да Зьміцера Смыка, які зьяўляецца вернікам царквы «Сьведкі Іеговы» і аналагічная справа, узбуджаная ў дачыненні да Івана Міхайлава, верніка габрэйска-місіянерскай рэлігійнай канфесіі. Варта падкрэсліць, што Зьміцер Смык і Іван Міхайлаў у сувязі з іх рэлігійнымі перакананьнямі прасілі забясьпечыць ім магчымасьць праходжаньня альтэрнатыўнай грамадзянскай службы, гарантаванай Канстытуцыяй Беларусі.

Як спроба дыскрэдытацыі беларускага праваабарончага руху краіны расцэньваецца прыцягненьне да крымінальнай адказнасьці нібыта за распальваньне нацыянальнай варожасьці вядомага віцебскага праваабаронцы Леаніда Сьвеціка. Ён зьяўляўся адным з заснавальнікаў Грамадзкага праваабарончага аб’яднаньня «Наша Вясна» (пераемніка ліквідаванага ўладамі ў 2003 годзе Праваабарончага цэнтру «Вясна»), і ў двух адмовах у рэгістрацыі Міністэрствам юстыцыі выкарыстоўваўся прыклад крымінальнай справы супраць Л. Сьвеціка як доказ «законанепаслухмянасьці» заснавальнікаў аб’яднаньня.

Асобнае месца займае крымінальная справа, узбуджаная па арт.арт. 13 Крымінальнага кодэксу (падрыхтоўка злачынства), 359 (тэрарыстычны акт), 295 (незаконныя дзеяньні ў адносінах да агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў), 218 (наўмыснае зьнішчэньне альбо пашкоджаньне маёмасьці) у дачыненьні да прадпрымальнікаў з г. Ваўкавыску. Мікалай Аўтуховіч, Юры Лявонаў і Уладзімір Асіпенка былі затрыманы 8 лютага з санкцыі пракурора Гарадзенскай вобласьці, і 18 лютага ім было прад’яўлена абвінавачаньне па арт. 218 Крымінальнага кодэксу (наўмыснае зьнішчэньне або пашкоджаньне маёмасьці). Перад гэтым, 31 студзеня, быў затрыманы Аляксандр Ларын. Першапачаткова затрыманыя падазраваліся ў арганізацыі падпалаў дамоў ваўкавыскіх чыноўнікаў, якія мелі месца ў 2005 годзе. 25 верасьня з СІЗА быў вызвалены Юры Лявонаў, у адносінах да якога былі зьнятыя ўсе абвінавачаньні і спыненая крымінальная справа. У кастрычніку крымінальны перасьлед быў спынены яшчэ ў дачыненьні да некалькіх чалавек, якія праходзілі па справе. 20 лістапада М. Аўтуховічу, У. Асіпенку і А. Ларыну былі вылучаныя абвінавачаньні ў падрыхтоўцы тэрарыстычнага акту — замаху на намесьніка міністра па падатках і зборах Васіля Каменку і старшыню Гарадзенскага аблвыканкаму Уладзіміра Саўчанку. З самага пачатку крымінальны перасьлед ваўкавыскіх прадпрымальнікаў набыў значны грамадзкі рэзананс. Яшчэ раней, у 2006 годзе, Мікалай Аўтуховіч і Юры Лявонаў былі асуджаныя па фінансавых артыкулах Крымінальнага кодэксу, і іх пакараньне многія прадстаўнікі палітычнай апазіцыі і міжнароднай супольнасьці лічылі палітычна матываваным перасьледам у сувязі з грамадзка-палітычнай дзейнасьцю. Улады дэ-факта прызналі гэта, вызваліўшы ў 2008 годзе М. Аўтуховіча разам з іншымі палітвязьнямі Беларусі. Новая крымінальная справа мела закрыты ад грамадзкасьці характар: адвакаты падпісалі пісьмовыя абавязацельствы аб неразгалошваньні матэрыялаў сьледзтва. На знак пратэсту супраць свайго зьняволеньня М. Аўтуховіч праводзіў доўгатэрміновую галадоўку. Праваабарончы цэнтр «Вясна», не выключаючы палітычнай матывацыі зьняволеньня М. Аўтуховіча і У. Асіпенкі, лічыць, што толькі справядлівае судовае разбіральніцтва ў адкрытым судовым працэсе з магчымасьцю прысутнасьці на ім праваабаронцаў, прадстаўнікоў СМІ, міжнародных арганізацыяў і замежных амбасадаў зможа дакладна праясьніць сапраўдныя прычыны крымінальнага перасьледу прадпрымальнікаў.





3

***1. Крымінальная справа супраць Арцёма Дубскага***

7 ліпеня суд Асіповіцкага раёну Магілёўскай вобласьці прыгаварыў актывіста «Маладога Фронту» Арцёма Дубскага да 1 году пазбаўленьня волі з адбываньнем пакараньня ў выпраўленчай калоніі агульнага рэжыму. А. Дубскі быў абвінавачаны ў парушэньні арт. 415 Крымінальнага кодэксу (ухіленьне ад адбыцьця пакараньня ў выглядзе абмежаваньня волі). Адразу пасьля абвяшчэньня прысуду А.Дубскі быў узяты пад варту і зьмешчаны ў СІЗА.

Папярэдняе пакараньне ў выглядзе 2 гадоў абмежаваньня волі было вынесена моладзеваму актывісту 23 красавіка 2008 году судом Цэнтральнага раёну Менску па арт. 342 Крымінальнага кодэксу (групавыя дзеяньні, якія груба парушаюць грамадзкі парадак) за ўдзел у мірнай акцыі пратэсту прадпрымальнікаў, якая адбылася ў Менску 10 студзеня 2008 году («справа 14-ці»). Праз пэўны час пасьля вынесенага прысуду з-за ціску, які аказваўся на А.Дубскага з боку міліцыі па месцы ягонага жыхарства ў г. Асіповічы, ён вымушаны быў зьехаць ва Украіну. Калі А. Дубскі вярнуўся ў Беларусь, супраць была ўзбуджаная крымінальная справа.

Да канца году моладзевы актывіст адбываў пакараньне ў выпраўленчай калоніі агульнага рэжыму ў Магілёве.

***2. Крымінальная справа супраць Максіма Дашука***

23 лютага моладзевы актывіст Максім Дашук быў выкліканы ў РУУС Маскоўскага раёну Менску, дзе яму было прад'яўлена абвінавачаньне па арт. 415 Крымінальнага кодэксу (ухіленьне ад адбыцьця пакараньня ў выглядзе абмежаваньня волі). У выглядзе меры стрыманьня было абранае ўтрыманьне пад вартай, аднак праз суткі малады чалавек быў вызвалены з ІЧУ пад падпіску аб нявыезьдзе. Пакараньне (1,5 году абмежаваньня волі без накіраваньня ва ўстановы адкрытага тыпу), рэжым адбыцьця якога быў парушаны М. Дашуком, было вынесена 28 мая 2008 году судом Цэнтральнага раёну Менску па арт. 342 Крымінальнага кодэксу — «групавыя дзеяньні, якія груба парушаюць грамадзкі парадак». М. Дашук быў асуджаны за ўдзел у мірнай акцыі пратэсту прадпрымальнікаў, якая адбылася ў Менску 10 студзеня 2008 году. На момант разгляду справы ў судзе М. Дашук быў непаўнагадовым.





15 чэрвеня 2009 году суд Маскоўскага раёну Менску прыгаварыў М.Дашука да 1 году і трох месяцаў абмежаваньня волі без накіраваньня ва ўстановы адкрытага тыпу. Пры тым, што санкцыя арт. 415 КК прадугледжвае выключна пазбаўленьне волі, суд палічыў магчымым выкарыстаць у дачыненьні да М. Дашука арт. 70 Крымінальнага кодэксу — «прызначэньне больш мяккага пакараньня, чым прадугледжана за дадзенае злачынства». Судзьдзя палічыла, што цяжкія абставіны ў сям'і М.Дашука і ягоны непаўнагадовы ўзрост зьяўляюцца выключнымі абставінамі, якія дазваляюць зьмякчыць пакараньне.

***3. Крымінальная справа супраць Юрыя Казака***

У ноч з 6 на 7 лістапада ў горадзе Навагрудку быў абліты фарбай помнік Леніну. Па дадзеным факце была ўзбуджаная крымінальная справа, і па падазрэньні ва ўчыненьні дадзенага злачынства затрыманы мясцовы актывіст незарэгістраванай Партыі БХД Юрый Казак. Паводле пастановы сьледчага, дзеяньні Ю. Казака характарызаваліся, як «наўмысныя, парушаючыя грамадзкі парадак і вызначаныя асаблівым цынізмам». Урон, які нанёс актывіст «з мэтай зьнявагі грамадзкіх інтарэсаў і гістарычных традыцый, выкарыстоўваючы лакафарбавы матэрыял», склаў 3 740 рублёў.

7 сьнежня Ю.Казаку было прад'яўлена абвінавачаньне ў ва ўчыненьні злачынства па ч.1 арт. 339 Крымінальнага кодэксу — «хуліганства». Судовы разгляд справы пачаўся 29 сьнежня, але да канца 2009 году ня быў завершаны. У якасьці меры стрыманьня ў дачыненьні да Ю. Казака абрана падпіска аб нявыезьдзе.

***4. Крымінальная справа супраць Леаніда Сьвеціка***

20 траўня 2008 году УКДБ па Віцебскай вобласьці была распачатая крымінальная справа па фактах пагрозаў з боку РНЕ на адрас некаторых грамадзкіх дзеячоў Віцебску па арт. 131 Крымінальнага кодэксу «распальваньне расавай, нацыяльнай, рэлігійнай варожасьці».

23 траўня 2008 году быў праведзены 9-гадзінныператрус у віцебскага праваабаронцы Леаніда Сьвеціка ў адпаведнасьці з пастановай, дзе ён згадваўся ў якасьці сьведкі па справе, аднак на бліжэйшым допыце праваабаронцы паведамілі, што ён зьяўляец-

ца падазраваным. У верасьні 2008 году крымінальная справа супраць Л.Сьвеціка была прыпыненая, а ў сакавіку 2009 году ўзноўленая.

У 2006-2007 гадах Л.Сьвецік аказваў прававую дапамогу віцебскім актывістам, якія атрымлівалі лісты з пагрозамі ад Віцебскай філіі рускай неанацысцкай арганізацыі «Русское Национальное Единство» (РНЕ). Такія лісты, у прыватнасьці, атрымалі рэдактар газеты «Витебский курьер» і бюлетэню «Курьер из Витебска» Уладзімір Базан, былая старшыня абласной арганізацыі АГП Алена Залеская, вядомы віцебскі апазіцыянер Барыс Хамайда, а таксама некалькі актывістаў з КХП БНФ. Праваабронца разам з мясцовымі актывістамі неаднаразова патрабавалі ўзбуджэньня крымінальнай справы па факце зьяўленьня лістоў з пагрозамі, выступаў на гэтую тэму ў друку, аднак на працягу двух гадоў і міліцыя, і ўпраўленьне Камітэту дзяржбясьпекі па Віцебскай вобласьці адмаўляліся рабіць гэта, аргументуючы сваю пазіцыю тым, што РНЕ — незарэгістраваная арганізацыя.

31 сакавіка 2009 году Л.Сьвеціку было прад’яўленае абвінавачаньне адразу па двух артыкулах Крымінальнага кодэксу: «распальваньне міжнацыянальнай і расавай варожасьці» (арт.131 КК) і «паклёп на прэзідэнта Беларусі» (ч. 2 арт. 367 КК). У далейшым абласная пракуратура зьняла абвінавачаньне па арт. 367 КК за адсутнасьцю доказаў учыненьня злачынства.

16 ліпеня судзьдзя Віцебскага абласнога суда Галіна Урбановіч прызнала Л.Сьвеціка вінаватым ва ўчыненьні злачынства, прадугледжанага арт. 131 Крымінальнага кодэксу, і пакарала штрафам у памеры 900 базавых велічыняў. Суд таксама абавязаў Л.Сьвеціка кампенсаваць маральную шкоду старшыні віцебскай філіі праўладнага «Саюзу пісьменьнікаў Беларусі» Тамары Красновай-Гусачэнка ў памеры 1 мільёну рублёў (яна прасіла суд спагнаць з праваабаронцы 7 мільёнаў рублёў у якасьці кампенсацыі за маральныя пакуты). Іншыя пацярпелыя па справе неаднаразова заяўлялі аб недаверы суду і аб тым, што ня лічаць Л. Сьвеціка вінаватым. У ходзе судовага працэсу Л.Сьвецік не прызнаў сваёй віны і заявіў, што стаў ахвярай правакацыі з боку КДБ у сувязі з актыўнай праваабарончай дзейнасьцю. Прысуд Віцебскага абласнога суда быў абскарджаны Л. Сьвеціка у касацыйным парадку ў калегію па крымінальных справах Вярхоўнага суда, аднак скарга была пакінутая без задавальненьня.





### *5. Крымінальная справа супраць Яўгена Волкава*

У чэрвені ў дачыненьні да актывіста незарэгістраванага аб’яднаньня «Рух яднаньня» (Царква Муна) Яўгена Волкава пракуратурай Менску была ўзбуджаная крымінальная справа паводле арт. 193.1 Крымінальнага кодэксу (арганізацыя дзейнасьці палітычнай партыі, грамадзкага, рэлігійнага аб’яднаньня ці фонду, якія не прайшлі дзяржаўнай рэгістрацыі ва ўстаноўленым законам парадку, альбо ўдзел у такой дзейнасьці). Гэта стала першай у Беларусі крымінальнай справай, узбуджанай за дзейнасьць незарэгістраванай рэлігійнай арганізацыі з 2006 году, калі ўступіў у сілу дадзены артыкул.

У жніўні крымінальная справа была спыненая. У лісьце, атрыманым Я. Волкавым, за подпісам старэйшэга сьледчага па найважнейшых справах малодшага дарадцы юстыцыі С.В. Грахоўскага, паведамлялася: «па выніках сьледзтва вынесена пастанова пра спыненьне вытворчасьці па крымінальнай справе на падставе арт. 29 ч.1 п.2, 250 — 251 КПК Рэспублікі Беларусь — у сувязі з адсутнасьцю складу злачынства ў Вашых дзеяньнях».

У хуткім часе вытворчасьць па справе супраць Я.Волкава зноў была адноўлена, а 30 сьнежня ў другі раз спыненая. У адпаведным паведамленьні С. Грахоўскі адзначыў, што «ў ходзе расьсьледаваньня прааналізаваны пералік рэчавых доказаў па крымінальнай справе, па выніках чаго складзены акт аб зьнішчэньні той часткі прадметаў і дакументаў, якія ўтрымліваюць негатыўную інфармацыю, якая дэманструе недавер і непавагу да хрысьціянскага і мусульманскага веравызнаньня». Пры гэтым ніякай эксьпертызы па дадзенай справе, якая б пацьвердзіла наяўнасьць распальваньня рэлігійнай варожасьці ў канфіскаваных у Я. Волкава друкаваных матэрыялах, праведзена не было.

### *6. Крымінальная справа супраць Дзьмітрыя Смыка*

6 лістапада суд Цэнтральнага раёну Гомелю прызнаў Дзьмітрыя Смыка вінаватым ва ўхіленьні ад прызыву ў войска (арт. 435 Крымінальнага кодэксу) і пакараў штрафам у памеры 100 базавых велічыняў. Паводле абвінавачаньня, Дз.Смык «імкнуўся захаваць камфортнасьць свайго штодзённага жыцьця… і, злоўжываючы сваімі правамі, ухіліўся ад вайсковай службы, чым парушыў парадак камплектаваньня ўзброеных сілаў РБ». Разам з тым, Дз. Смык,

зьяўляючыся вернікам царквы «Сьведкі Іеговы», адмаўляўся ад службы ў войску па рэлігійных перакананьнях і патрабаваў магчымасьці праходзіць альтэрнатыўную грамадзянскую службу.

Прысуд быў абскарджаны ў калегію па крымінальных справах Гомельскага абласнога суда. У касацыйнай скарзе Дз. Смык прасіў апраўдаць яго з прычыны адсутнасьці складу злачынства, спасылаючыся на артыкул 57 Канстытуцыі, другая частка якога гарантуе прызыўнікам права на праходжаньне альтэрнатыўнай службы. 9 сьнежня калегія па крымінальных справах Гомельскага абласнога суда пад старшынствам Алены Ткачук адхіліла касацыйную скаргу Дз. Смыка і пакінула прысуд у сіле.



### *7. Крымінальная справа супраць Івана Міхайлава*

20 сьнежня быў затрыманы 21-гадовы вернік яўрэйска-месіянскай суполкі «Новы Запавет» Іван Міхайлаў. Ён быў абвінавачаны ва ўхіленьні ад прызыву ў войска па арт. 435 Крымінальнага кодэксу і зьмешчаны пад варту ў Жодзінскім сьледчым ізалятары. Да гэтага сам І.Міхайлаў і ягоныя бацькі неаднаразова зьярталіся ў ваенкамат з просьбай забясьпечыць магымасьць праходжаньня альтэрнатыўнай службы ў войску ў сувязі з рэлігійнымі пераканаьнямі. 31 сьнежня справа была перададзеная на разгляд у суд Менскага раёну.

Права грамадзянаў на альтэрнатыўную службу вынікае з арт. 57 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. У дадзеным артыкуле сказана, што «абарона Рэспублікі Беларусь зьяўляецца абавязкам і свяшчэнным доўгам яе грамадзяніна. Парадак прахаджоньня вайсковай службы, падставы і ўмовы яе замены на альтэрнатыўную службу вызначаюцца законам». Такім чынам, Канстытуцыя не разглядае вайсковую службу ў якасьці адзінай і безумоўнай, паколькі прадугледжвае магчымасьць вызваленьня ад вайсковай службы альбо замену яе на альтэрнатыўную. Адпаведна, прадугледжваецца права грамадзяніна на выкананьне свайго абавязку і свяшчэннага доўгу па абароне Радзімы ў формах, прадугледжаных Канстытуцыяй, у тым ліку і шляхам праходжаньня альтэрнатыўнай службы.

У адпаведнасьці з арт. 4 Закону ад 15 сакавіка 1994 году «Аб парадку ўступленьня ў сілу Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь», законы, указаныя ў Канстытуцыі, неабходна было прыняць на працягу двух гадоў пасьля ўступленьня яе ў сілу, гэта значыць да 30 сакавіка 1996 году, аднак, ні Вярхоўны Савет 12 скліканьня, ні Вярхоўны Савет 13 скліканьня ня выканалі гэтага патрабаваньня і не вырашылі пытаньня аб падставах і ўмовах замены вайсковай службы альтэрантыўнай і парадку яе праходжаньня шляхам прыняцьця сьпецыяльнага закону. Варта адзначыць, што арт. 57 Канстытуцыі захаваўся ў першаснай рэдакцыі 1994 году і пасьля прынятых на рэферэндумах 1996 і 2004 г.г. зьменаў. Ніякіх нормаў, якія дазвалялі б парламенту адтэрмінаваць на заканадаўчым узроўні рэалізацыю арт. 57 у частцы замены праходжаньня вайсковай службы альтэрнатыўнай, у Канстытуцыі няма. Нягледзячы на гэта, Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь дагэтуль не прыняў Закону, скіраванага на рэалізацыю дадзенага артыкулу Асноўнага закону.



Адмаўленьне ад праходжаньня вайсковай службы па матывах сумленьня (рэлігійных і іншых пераканьнях) закранае і іншыя правы асобы, гарантаваныя Канстытуцыяй і міжнароднымі нормамі ў галіне правоў чалавека, ратыфікаванымі Беларусьсю. Так, у адпаведнасці з арт. 31 Канстытуцыі, кожны мае права самастойна вызначаць сваё стаўленьне да рэлігіі, адзінаасобна ці сумесна з іншымі спавядаць любую рэлігію ці не спавядаць ніякай, выказваць ці распаўсюджваць свае перакананьні, зьвязаныя з адносінамі да рэлігіі, удзельнічаць у адпраўленьні рэлігійных культаў, рытуалаў, абрадаў, не забароненых законам. Гэтыя правы гарантаваныя і нормамі міжнароднага права, прыярытэт якіх прызнае Рэспубліка Беларусь: Усеагульнай дэкларацыяй правоў чалавека і Міжнародным пактам аб грамадзянскіх і палітычных правах. Права кожнага на адмову ад вайсковай службы па перакананьнях сумленьня было прызнана і Саветам па правах чалавека ААН.

Разам з тым права грамадзянаў Беларусі на замену тэрміновай вайсковай службы альтэрнатыўнай было прызнана ў рашэньні Канстытуцыйнага суда ад 26 траўня 2000 году «Аб некаторых пытаньнях рэалізацыі артыкулу 57 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь», дзе сказана:

1. Адзначыць, што грамадзяне Рэспублікі Беларусь у адпаведнасьці с Канстытуцыяй маюць права, у прыватнасьці, па рэлігійных перакананьнях на замену вайсковай службы альтэрнатыўнай, якое павінна быць забясьпечана дзейсным механізмам яго рэалізацыі. У сувязі з гэтым лічыць неадкладным прыняцьце закону аб альтэрнатыўнай службе ці ўнясеньні неабходных зьменаў і дапаў-

неньняў у Закон «Аб усеагульным вайсковым абавязку і вайсковай службе» з мэтай вызначэньня механізму рэалізацыі права на альтэрнатыўную службу. На перыяд да рашэньня на заканадаўчым узроўні пытаньняў аб падставах і ўмовах замены вайсковай службы альтэрнатыўнай і парадку яе праходжаньня пагадзіцца, з улікам выключнасьці абставінаў, з практыкай стварэньня кампетэнтнымі дзяржаўнымі органамі ў адпаведнасьці з арт.арт. 31, 57, 59 і іншымі артыкуламі Канстытуцыі ўмоваў для выкананьня грамадзянамі Рэспублікі Беларусь ускладзеных на іх абавязкаў па абароне Рэспублікі Белаурсь у тых формах, якія не парушаюць іх рэлігійных пераканананьняў.

2. Пры вырашэньні кампетэнтнымі дзяржаўнымі органамі пытаньняў аб адказнасьці за ўхіленьне ад праходжаньня вайсковай службы неабходна вызначаць, у якой ступені тыя ці іншыя дзеяньні грамадзяніна зьвязаныя з рэалізацыяй ім свайго канстытуцыйнага права на праходжаньне вайсковай службы альтэрнатыўна альбо з адмовай ад праходжаньня вайсковай службы ў такіх умовах, якія не забясьпечваюць павагу яго рэлігійных пераканьняў. У кожным канкрэтным выпадку гэтымі органамі павінны быць прынятыя меры для ўсебаковага і належнага вывучэньня ўсіх абставінаў справы як ў мэтах забесьпячэньня правоў і свабодаў грамадзянаў, якія жадаюць выканаць свой абавязак па абароне Рэспублікі Беларусь у іншых дазволеных формах, так і ў мэтах выключэньня злоўжываньняў з боку некаторых асобаў, якія такім чынам маюць намер ухіліцца ад вайсковай службы.





# 4. Выкананьне правоў грамадзянаў на свабоду выказваньня меркаваньняў, атрыманьне і распаўсюд інфармацыі

У 2009 годзе ў галіне свабоды выказваньня меркаваньняў і распаўсюду інфармацыі ў Беларусі сістэмных зьменаў не адбылося, праблемы і абмежаваньні, характэрныя для папярэдніх гадоў, захаваліся. Спадзяваньні на лібералізацыю медыясьферы не апраўдаліся: дзяржава па-ранейшаму захавала татальны кантроль над інфармацыйнай прасторай.

Пачатак году адзначаўся асьцярожным аптымізмам, які зьявіўся пасьля кропкавых саступак беларускіх уладаў у галіне свабоды слова ў канцы 2008 году, калі ў дзяржаўныя сеткі распаўсюду «Белсаюздрук» і «Белпошта» пасьля трохгадовага перапынку былі вернутыя газеты «Народная Воля» і «Наша Ніва», а «Народнай волі» было дазволена выдавацца ў беларускай друкарні. Гэтыя крокі былі найперш зьвязаныя з абвешчаным курсам на лібералізацыю ў сувязі з пачаткам перамоўнага працэсу беларускіх уладаў з еўрапейскімі краінамі, і чакалася, што яны будуць працягнутыя і распаўсюджаныя на іншыя недзяржаўныя медыя.

Яшчэ адным крокам уладаў у накірунку выпраўленьня сітуацыі ў галіне свабоды слова было ўспрынята стварэньне Каардынацыйнай рады ў сьферы масавай інфармацыі (згодна з Пастановай Савету міністраў ад 29 кастрычніка 2008 году), у склад якой былі запрошаныя старшыня «Беларускай асацыяцыі журналістаў» Жана Літвіна і два прадстаўнікі недзяржаўных газет — галоўны рэдактар «Комсомольской правды в Белоруссии» Алена Міронава і галоўны рэдактар «Народнай волі» Іосіф Сярэдзіч (астатнія сябры Рады — прадстаўнікі дзяржаўных органаў, дзяржаўных установаў і дзяржаўных СМІ; старшыня — галоўны рэдактар газеты прэзідэнцкай адміністрацыі «Советская Белоруссия» Павел Якубовіч). Асноўнымі задачамі Рады, паводле пастановы Саўміну, былі абвешчаныя: каардынацыя ўзаемадзеяньня органаў дзяржаўнага кіраваньня, грамадзкіх аб'яднаньняў і іншых арганізацый, якія ажыцьцяўляюць сваю дзейнасьць у сьферы масавай інфармацыі; забесьпячэньне правільнага прымяненьня нормаў Закону «Аб СМІ»; разгляд спрэч-

ных пытаньняў, датычных прымяненьня гэтага закону і іншага заканадаўства ў сьферы СМІ. Зыходзячы з вызначаных задачаў, чакалася, што Рада можа стаць рэальнай пляцоўкай для абмеркаваньня і пошукаў рашэньняў адносна набалелых пытаньняў медыясупольнасьці, таму прадстаўнікі недзяржаўных газет і журналісцкай арганізацыі пазітыўна ўспрынялі прапанову аб удзеле ў яе працы. Першае паседжаньне Рады адбылося 26 сакавіка; на ім вырашаліся «працэдурныя» пытаньні і быў вызначаны парадак дня наступнай сустрэчы: падрыхтоўка агульнага кодэксу журналісцкай этыкі і праблема распаўсюду шэрагу недзяржаўных грамадзка-палітычных выданьняў (першае пытаньне ініцыяваў Павел Якубовіч, другое — Жана Літвіна). Другое паседжаньне Рады адбылося 4 чэрвеня; на ім быў заслуханы выступ дацэнта інстытуту журналістыкі Белдзяржуніверсітэту Наталі Доўнар, якая ўзначаліла працоўную групу па падрыхтоўцы тэксту кодэксу журналісцкай этыкі. Па другім пытаньні было вырашана, што сябры Рады зьвернуцца да кіраўнікоў дзяржаўных прадпрыемстваў «Белпошта» і «Белсаюздрук» з рэкамендацыямі ўзнавіць супрацоўніцтва з рэдакцыямі недзяржаўных грамадзка-палітычных выданьняў, у якіх існуюць праблемы з распаўсюдам. Наступнае паседжаньне Каардынацыйнай рады па СМІ было запланаванае на сярэдзіну ліпеня, але ні ў вызначаны тэрмін, ні пазьней да канца году ніводнага паседжаньня болей не адбылося — фактычна яна перастала дзейнічаць, хаця пра спыненьне, прыпыненьне ці роспуск Рады афіцыйна не паведамлялася.

Што датычыць уплыву, які спрабавала аказаць Рада дзеля вырашэньня праблемы распаўсюду шэрагу недзяржаўных выданьняў, то ён аказаўся мінімальным. Пасьля таго, як Каардынацыйная рада вырашыла рэкамедаваць «Белсаюздруку» і «Белпошце» ўзнавіць супрацоўніцтва з выданьнямі, пазбаўленымі магчымасьці распаўсюду праз дзяржаўныя сеткі, рэдакцыямі былі накіраваныя адпаведныя прапановы гэтым прадпрыемствам, але вялікага плёну гэта не прынесла. Цалкам вырашыла праблему з распаўсюдам толькі газета «Бобруйский курьер» — яна была ўключаная ў падпісны каталог і атрымала магчымасьць прадавацца праз кіёскі «Белсаюздруку». Газеты «Вольнае Глыбокае» і «СНплюс. Свободные новости плюс» атрымалі магчымасьць распаўсюджвацца праз кіёскі, але ім адмоўлена ў распаўсюдзе праз падпіску; «Нясвіжскі час» — можа распаўсюджвацца толькі праз падпіску, як і часопіс «ARCHE». «Рэгіянальная газета» была вернута ў продаж, але ў падпісцы толькі па Менскай вобласьці, хаця выданьне спрабавала ўвайсьці ў рэспубліканскі каталог, але ў кастрычніку атрымала адмову ад РУП «Белпошта» са спасылкай на «немэтазгоднасьць» супрацоўніцтва. Вярнулася ў кіёскі і «Газета для вас», але таксама не змагла пашырыць геаграфію распаўсюду праз падпіску (акрамя Івацэвіцкага раёну хоча распаўсюджвацца ў Бярозаўскім, Пружанскім і Драгічынскім раёнах Брэсцкай вобласьці). Да канца году не было вырашана пытаньне з распаўсюдам газеты «Ганцавіцкі час», хаця папярэдне была атрыманая згода на распаўсюд як праз падпіску, так і праз кіёскі. Цалкам нявырашанымі засталіся праблемы распаўсюду ў грамадзка-палітычных выданьняў «Борисовские новости», «Газета Слонімская», «Intex-press», «Новы час», «Отдушина» і «Товарищ» — яны па-ранейшаму не распаўсюджваюцца ні «Белпоштай», ні «Белсаюздрукам» (газета «Товарищ» да гэтага часу вымушана друкавацца за мяжой у Смаленску і ў лістападзе ўжо другі раз на працягу году прыпыніла выхад). Адмову ў распаўсюдзе праз дзяржаўныя сеткі атрымала і газета «Витебский курьер», зарэгістраваная ў Расійскай Федэрацыі — спадкаемца газеты «Витебский курьер М», якая прыпыніла выхад на пачатку году ў сувязі з эканамічнымі прычынамі.

Адмовы ў заключэньні дамоваў на распаўсюд недзяржаўных выданьняў традыцыйна зьвязваліся прадпрыемствамі-манапалістамі з «немэтазгоднасьцю» такога супрацоўніцтва. Рэдакцыі па ўсёй краіне атрымлівалі амаль аднолькавыя адказы: «Паколькі абавязак па ўключэньні друкаванага выданьня ў каталог не прадугледжаны заканадаўствам, выбар друкаваных выданьняў для фармаваньня каталогу з мэтай наступнага іх распаўсюду праз падпіску зьяўляецца правам РУП «Белпошта». На падставе выкладзенага, РУП «Белпошта» лічыць немэтазгодным уключэньне ў падпісны каталог газеты «СНплюс. Свободные новости плюс» (з ліста гендырэктара «Белпошты» Юрыя Комара да галоўнага рэдактара газеты Васіля Зданюка).

У той час, як недзяржаўным выданьням ствараліся цяжкасьці і перашкоды ў магчымасьці дайсьці да чытача, для арганізацыі падпісной кампаніі на дзяржаўныя СМІ па ўсёй краіне быў задзейнічаны магутны адміністрацыйны рэсурс. Напрыклад, у сакавіку адмову на распаўсюд праз падпіску атрымалі слонімскія рэгіянальныя не-

залежныя выданьні «Газета Слонімская» і «Отдушина», і адначасова стала вядома, якім чынам праводзіцца падпіска на раённую дзяржаўную газету «Слонімскі веснік». Так, кіраўнікі дзяржаўных установаў і прадпрыемстваў Слоніму атрымалі ліст за подпісам галоўнага рэдактара дзяржвыданьня Марыі Данюк з просьбай аформіць кожнаму супрацоўніку індывідуальную падпіску на газету «з мэтай выкананьня распараджэньня кіраўніка раёну Іосіфа Паўлюкевіча і рэалізацыі рэспубліканскай і раённай праграмаў разьвіцьця дзяржаўнай газеты «Слонімскі веснік» па забесьпячэньні падпіснога накладу на 2 квартал 2009 году». Пры гэтым кожнаму кіраўніку даручалася да 25 сакавіка падрыхтаваць справаздачу — пісьмова праінфармаваць ідэалагічны аддзел райвыканкаму аб колькасьці супрацоўнікаў у калектыве і колькі з іх падпісалася на «Слонімскі веснік» (па паведамленьні галоўнага рэдактара дзяржвыданьня, дадзеныя лічбы будуць прадстаўленыя кіраўніку раёну). Разам з тым у канцы году выявілася цікавая рэч: некаторыя кіраўнікі раёну, супрацоўнікі выканкаму самі не падпісваюцца на дзяржвыданьні, і начальніку ідэалагічнага аддзелу Слонімскага райвыканкаму Ігару Лапікаву давялося пісьмова патрабаваць ад кіраўнікоў упраўленьняў і аддзелаў прадаставіць зьвесткі аб падпісцы работнікаў на «Советскую Белоруссию» і «Слонімскі веснік» — «для далейшай праверкі дадзеных праз вузел сувязі і прадастаўленьня інфармацыі старшыні Слонімскага райвыканкаму»; у асобны сьпіс павінны быць унесены прозьвішчы супрацоўнікаў выканкаму, якія не падпісаліся на гэтыя газеты.

Зацікаўленасьць ідэалагічных аддзелаў у як мага больш шырокім распаўсюдзе дзяржаўных СМІ тлумачыцца тым, што на гэтыя выданьні ўладамі ўскладзеная функцыя прапагандыстаў адзінай дзяржаўнай ідэалогіі, якая фактычна замяніла асноўнае прызначэньне медыя — інфармаваньне насельніцтва. «Складана падзяліць ідэолагаў і работнікаў сродкаў масавай інфармацыі, паколькі яны робяць агульную справу. Прадстаўнікі СМІ — найбліжэйшыя паплечнікі і саюзьнікі ідэалагічных работнікаў, чыя роля з кожным днём узрастае», — заявіў намесьнік старшыні Гомельскага аблвыканкаму Пётр Кірычэнка ў чэрвені падчас цырымоніі ўзнагароджаньня пераможцаў абласнога спаборніцтва журналістаў і конкурсу на лепшую арганізацыю ідэалагічнай працы на прадпрыемствах Гомельшчыны. Сьціраньне межаў паміж прафесіямі журналіста і ідэолага праявілася і ў прызначэньні ў сьнежні на пасаду міністра інфармацыі былога начальніка Галоўнага ідэалагічнага ўпраўленьня Адміністрацыі прэзідэнта Алега Праляскоўскага.





Дзяржаўная замова ў галіне СМІ працягвала аплочвацца з дзяржаўнага бюджэту. Так, у 2009 годзе фінансаваньне дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі, згодна з Законам «Аб бюджэце Рэспублікі Беларусь на 2009 год», складала больш за 193 млрд. рублёў: з іх больш за 146 млрд. былі выдаткаваныя на патрэбы тэлебачаньня і радыёвяшчаньня, 20 млрд. рублёў — на патрэбы перыядычнага друку і выдавецтваў і больш за 25 млрд. — «на іншыя выдаткі сродкаў масавай інфармацыі». Дадаткова для дзяржаўных медыя ствараліся спрыяльныя ўмовы для эканамічнага існаваньня. Так, А.Лукашэнка сваім указам №478 ад 25 верасня 2009 г. працягнуў да 31 сьнежня 2012 году падаткавыя ільготы двум беларускім тэлеканалам — ОНТ (ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал») і СТВ (ЗАТ «Сталічнае тэлебачанне») — гэтыя медыяпрадпрыемствы былі вызваленыя ад выплаты падаткаў на прыбытак і ПДВ (падатак на дададзеную вартасьць) ад рэкламнай і прадпрымальніцкай дзейнасьці. Таксама паводле прэзідэнцкага ўказу №523 ад 23 кастрычніка 2009 году «Аб некаторых пытаньнях падаткаабкладаньня Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі» сама тэлекампанія, а таксама арганізацыі, якія ўваходзяць у яе склад (абласныя тэлерадыёкампаніі «Гомель», «Віцебск», «Гродна», «Брэст», «Магілёў»), з 1 кастрычніка 2009 г. да 31 снежня 2012 г. былі вызваленыя ад уплаты падаткаў на прыбытак і на дададзеную вартасьць (за выключэньнем падатку на дададзеную вартасьць, які бярэцца пры ўвозе тавараў на мытную тэрыторыю РБ). Паводле ўказаў, сродкі, вызваленыя ў выніку прадастаўленьня згаданых ільготаў, павінны накіроўвацца на разьвіцьцё вытворчай базы, набыцьцё правоў трансьляцыі аўдыёвізуальных твораў, стварэньне ўласных перадачаў. На няроўныя эканамічныя ўмовы дзейнасьці СМІ дзяржаўнай і недзяржаўнай формаў уласнасьці і дыскрымінацыйныя падыходы да гэтага пытаньня з боку дзяржавы нязьменна зьвяртала ўвагу журналісцкая супольнасьць.

8 лютага 2009 году ўступіў у сілу новы Закон Рэспублікі Беларусь «Аб сродках масавай інфармацыі», прыняты ўлетку 2008 году амаль у тэрміновым парадку, без папярэдняга абмеркаваньня з журналісцкімі арганізацыямі, нацыянальнымі і міжнароднымі меды-

яэксьпертамі. Некаторыя палажэньні Закону адразу пасьля прыняцьцья выклікалі крытыку і занепакоенасьць у прафесійным асяродку, у прыватнасьці, «Беларуская асацыяцыя журналістаў» вызначыла найбольш рэпрэсіўна-абмежавальныя з іх: рэгістрацыя інтэрнэт-выданьняў і кантроль за інтэрнэтам з боку Міністэрства інфармацыі і пракуратуры; абавязковая перарэгістрацыя ўсіх медыя пасьля ўступленьня Закону ў сілу; значнае пашырэньне магчымасьці закрыцьця ўладамі СМІ; заканадаўчае замацаваньне патрабаваньня акрэдытацыі для журналістаў замежных СМІ і абвяшчэньне дзейнасьці без акрэдытацыі незаконнай. Разам з тым, адзначаліся і станоўчыя зьмены ў новым Законе, у прыватнасьці, спрашчэньне працэдуры рэгістрацыі новых друкаваных СМІ.



На працягу году аналізавалася правапрымяняльная практыка, адзначаліся як станоўчыя, так і адмоўныя ўплывы новага Закону на дзейнасьць СМІ. Як станоўчы момант варта адзначыць, што перарэгістрацыя існуючых сродкаў масавай інфармацыі прайшла фактычна без перашкодаў, і ўсе СМІ, якія своечасова прадставілі неабходныя дакументы, былі перарэгістраваныя.

Першую палову году назіраўся прагрэс у сьферы рэгістрацыі новых друкаваных сродкаў масавай інфармацыі: увесну легалізавалася недзяржаўная газета «Узгорак» (г. Горкі, Магілёўская вобласьць), улетку былі зарэгістраваныя «Піўная» газета і «Брестский калейдоскоп» (Брэст), шэраг рэкламных газет і выданьняў. Але з пачатку восені сітуацыя зьмянілася, і грамадзка-палітычныя выданьні пачалі сутыкацца з цяжкасьцямі пры рэгістрацыі. Найперш гэта зьвязвалася не з дзеяньнем самога Закону, а з тым, што зьмянілася палітычная каньюнктура, перамоўны працэс беларускіх уладаў з еўрапейскімі інстытуцыямі быў прыпынены, і ўлады не былі больш зацікаўленыя дэманстраваць «ліберальныя зьмены» ў галіне выкананьня свабоды слова. У выніку гэтых акалічнасьцяў адмовы ў рэгістрацыі па розных падставах атрымалі «Магілёўскі час», «Салігорск плюс», «Новая газета Бобруйска», «Мар'інагорская», «Прэфект плюс» (Глыбокае, Віцебская вобласьць), «Химик. Два города» (Наваполацк) і іншыя. Так, у кастрычніку Міністэрства інфармацыі адмовіла ў рэгістрацыі недзяржаўнай рэгіянальнай газеце «Магілёўскі час» з прычыны адсутнасьці вышэйшай адукацыі ў галоўнай рэдактаркі Ганны Ільіной («Магілёўскі час» планаваўся як выданьне грамадзка-палітычнай тэматыкі; дагэтуль газета некалькі гадоў выходзіла як малафарматнае выданьне накладам





да 299 асобнікаў), але нягледзячы на тое, што рэдакцыя зьмяніла рэдактара, у рэгістрацыі выданьня ўсё роўна зноў было адмоўлена — ужо была названая іншая падстава. Двойчы былі вернутыя з Міністэрства інфармацыі дакументы на рэгістрацыю недзяржаўнай газеты «Салігорск плюс»: першы раз падставай для адмовы стала разьмяшчэньне юрыдычнай асобы ў жылым памяшканьні, другі раз Міністэрства не задаволіла заяўленая тэматыка газеты («Салігорск-плюс» хацела зарэгістравацца як грамадзка-палітычная газета і выданьне для вольнага часу, пазначыўшы пры гэтым тэматыкай «дзяржаву», «адукацыю», «прадпрымальніцтва», але Мінінфармацыі палічыла, што такая тэматыка супярэчыць нормам дзяржаўнага стандарту, паводле якога «пад выданьнем для вольнага часу трэба разумець выданьне, якое ўтрымлівае агульнадаступныя зьвесткі па арганізацыі побыту, розных формах самадзейнай творчасьці, розных відах захапленьняў»).



Нягледзячы на наяўнасьць у новым Законе «Аб сродках масавай інфармацыі» адпаведнага палажэньня, як пазітыўны факт на працягу году ўспрымалася прыпыненьне працы над пастановай ураду аб рэгуляваньні дзейнасьці інтэрнэт-СМІ, але ў канцы году дзяржава вярнулася да намеру кантраляваць беларускі сегмент сусьветнай сеткі. 14 сьнежня ў рэдакцыю газеты «Наша Ніва» трапіў праект указу кіраўніка дзяржавы, датычны дзейнасьці нацыянальных інтэрнэт-рэсурсаў. Паводле гэтага дакументу, кантроль павінен ажыцьцяўляцца Саветам Міністраў пасьля ўзгадненьня з адмысловым Аператыўна-аналітычным цэнтрам пры Адміністрацыі кіраўніка дзяржавы. Пад кантроль Аператыўна-аналітычнага цэнтру, згодна з праектам указу, трапляюць інтэрнэт-правайдэры краіны, а менавіта — будуць ім вызначацца пасьля кансультацыяў з кіраўніком краіны; дзейнасьць правайдэра можа быць спынена паводле пастановы Савету Міністраў. Паводле праекту, Аператыўна-аналітычны цэнтр таксама павінен адказваць за абмежаваньне доступу да інфармацыі, распаўсюд якой знаходзіцца пад забаронай паводле беларускага заканадаўства; аперацыі ў галіне рэгістрацыі даменных імёнаў у нацыянальным сегменце Сеціва; ажыцьцяўленьне кантролю за выкананьнем патрабаваньняў нацыянальнага заканадаўства кампаніямі, якія займаюцца прадастаўленьнем інтэрнэт-паслугаў; ажыцьцяўленьне іншых паўнамоцтваў у адпаведнасьці з заканадаўчымі актамі. Праект указу ўтрымліваў план

мерапрыемстваў на бліжэйшы год, якія павінны ажыцьцяўляцца Саветам Міністраў і Аператыўна-аналітычным цэнтрам. Так, прапанавана вызначыць парадак рэгістрацыі сродкаў масавай інфармацыі, якія распаўсюджваюцца праз сеціва, а таксама парадак ідэнтыфікацыі карыстальнікаў інтэрнэту ў месцах калектыўнага карыстаньня. 21 і 22 сьнежня Савет Міністраў абмяркоўваў праект указу і заўвагі да яго, прапанаваныя незалежнымі эксьпертамі, у выніку чаго былі прыбраныя ці зьмененыя самыя адыёзныя фармулёўкі, аднак у большасьці сваёй указ захаваў падыходы, накіраваныя на жорсткі кантроль нацыянальнага сегменту інтэрнэту. Былі захаваныя палажэньні аб рэгістрацыі інтэрнэт-рэсурсаў, якія аказваюць інтэрнэт-паслугі ў Беларусі, аб ідэнтыфікацыі падключаных да інтэрнэту кампутараў, аб уліку і захоўваньні персанальных дадзеных карыстальнікаў інтэрнэт-паслугаў і зьвестак пра інтэрнэт-паслугі, аказаныя пунктамі калектыўнага карыстаньня. Нягледзячы на тое, што інтэрнэт-СМІ ва ўказе не ўзгадваліся, яго дзеяньне распаўсюджваецца і на іх, паколькі прадугледжвае магчымасьць блакаваньня сайтаў, якія распаўсюджваюць забароненую ці непажаданую інфармацыю. Праект указу быў перададзены на подпіс кіраўніку дзяржавы.

4

У 2009 годзе была згорнутая практыка ўзбуджэньня грамадзянскіх справаў аб прызнаньні інфармацыйных матэрыялаў экстрэмісцкімі, якая актыўна ўжывалася ў 2008 годзе па ініцыятыве Упраўленьняў КДБ Гарадзенскай і Брэсцкай абласьцей. Інфармацыйныя матэрыялы, якія фігуравалі ў дадзеных справах, беларускія мытнікі вымалі ў грамадзянаў пры перасячэньні імі мяжы на працягу апошніх трох гадоў. Большасьць справаў так і не былі разгледжаныя судом або спыненыя, а папярэднія судовыя рашэньні аб прызнаньні матэрыялаў экстрэмісцкімі адмененыя; толькі адно рашэньне суда засталося нязьменным (згодна з якім экстрэмісцкімі прызнаныя тры дыскі з запісам варшаўскага канцэрту 2006 году «Салідарныя з Беларусьсю», 6 дыскаў з запісам польскага дакументальнага фільму «Урок беларускай мовы» і 7 дыскаў з фотаздымкамі з Кастрычніцкай плошчы 2006 году). На 2009 год быў перанесены судовы разгляд адной грамадзянскай справы — аб прызнаньні экстрэмісцкімі шэрагу матэрыялаў зарэгістраванага навукова-папулярнага і грамадзка-палітычнага часопіса «ARCHE», дзесяць асобнікаў якога былі канфіскаваныя 24 кастрычніка 2008 году





на мяжы ў Брэсьце. 30 сьнежня таго ж году УКДБ па Брэсцкай вобласці накіравала ў суд заяву за подпісам начальніка УКДБ па Брэсцкай вобласьці палкоўніка Леаніда Дзядкова, у якой сьцьвярджала: «Праведзеным аналізам устаноўлена, што ў часопісах утрымліваюцца зьвесткі, якія дыскрэдытуюць дзейнасьць органаў улады і праўленьня Рэспублікі Беларусь, узмацняюць сацыяльна-палітычную напружанасьць і супрацьстаяньне ў грамадзтве, стымулююць зьдзяйсьненьне дзеяньняў, накіраваных на арганізацыю і ажыцьцяўленьне масавых беспарадкаў, і тым самым ствараюць пагрозу бясьпецы Рэспублікі Беларусь». Такія зьвесткі, паводле зыску, утрымліваліся ў чатырох публікацыях № 7—8 «ARCHE», а менавіта: у артыкуле В. Сіліцкага «Парламенцкія выбары: беларуская нуда, еўрапейская інтрыга?»; у матэрыяле «Выбух і шмон: беларускі міні-Асьвенцім», падрыхтаваным па выніках «круглага стала ў рэдакцыі часопісу; у артыкуле «Менскія манеўры. Лукашэнка выкарыстоўвае выбары, каб здабыць рычагі ў перамовах з ЕС» (аўтары Б. Ярабік і А. Рабальяці); у публікацыі «Памяць ахвяраў і памяць катаў» (рэцэнзія А. Расінскага на фільм Анджэя Вайды «Катынь»). 25 лютага 2009 году судзьдзя суда Маскоўскага раёну Брэсту Тацяна Міранюк прызнала пералічаныя публікацыі «экстрэмісцкімі матэрыяламі, якія падлягаюць зьнішчэньню», але 7 траўня касацыйная інстанцыя — судовая калегія па грамадзянскіх справах Брэсцкага абласнога суда вярнула справу на перагляд у той жа суд. 28 траўня падчас сустрэчы бакоў на пачатку паўторнага працэсу КДБ запатрабавала правядзеньня «эксьпертнай ацэнкі» зьместу спрэчных публікацый «ARCHE», а ў сярэдзіне чэрвеня, атрымаўшы вынікі ацэнкі, УКДБ па Брэсцкай вобласьці адмовілася ад сваіх патрабаваньняў. 25 чэрвеня суд Маскоўскага раёну Брэсту спыніў справу «ў сувязі з адмовай заяўніка ад заяўленых патрабаваньняў», — адзначалася ў вызначэньні аб спыненьні вытворчасьці па справе. Больш на працягу году справаў аб прызнаньні друкаваных выданьняў, сродкаў масавай інфармацыі і іншых інфармацыйных носьбітаў не ўзбуджалася.

4

20 кастрычніка споўнілася 5 гадоў з дня сьмерці журналісткі Веранікі Чаркасавай (апошнія гады свайго жыцьця працавала ў недзяржаўнай газеце «Салідарнасць»), якая загінула ад шматлікіх нажавых раненьняў у 2004 годзе ва ўласнай кватэры. За гэты перыяд расьследаваньне, якое праводзіць пракуратура Менску, не

выявіла забойцаў журналісткі, а справа, прыпыненая ў лютым 2007 году «ў сувязі з невыяўленьнем асобы, якая падлягае прыцягненьню ў якасьці абвінавачваемай», болей не ўзнаўлялася. Сьледчыя разглядалі ў якасьці асноўнай бытавую версію забойства, аднак праведзеныя калегамі Веранікі журналісцкія расьсьледаваньні даюць падставы меркаваць, што забойства журналісткі зьдзейсьніў прафесійны кілер, які інсцэніраваў забойства на бытавой глебе. У кастрычніку «Беларуская асацыяцыя журналістаў» абвясьціла аб правядзеньні творчага конкурсу для журналістаў імя Веранікі Чаркасавай.

Не ўзнаўлялася і расьсьледаваньне справы аб зьнікненьні апэратара ОРТ Дзьмітрыя Завадзкага (выкрадзенены 7 ліпеня 2000 году), якое было прыпыненае яшчэ 31 сакавіка 2006 году «ў сувязі з неўстанаўленьнем бясьсьледна зьніклай асобы». У лістападзе 2007 году пракурор аддзелу па наглядзе за сьледзтвам у органах пракуратуры А.В. Сыцько паведаміў маці журналіста, што «працягваецца аперататыўная праца па ўстанаўленьні месцазнаходжаньня Завадзкага Дз.А. ці ягонага цела; асобаў, якія ўчынілі злачынства. У выпадку атрыманьня станоўчай інфармацыі вытворчасьць па крымінальнай справе будзе неадкладна ўзноўленая». Сваю версію прычынаў і абставінаў зьнікненьня Дзьмітрыя Завадзкага ў інтэрвію расійскай газеце «Завтра» (№24 ад 10 чэрвеня 2009 г.) выклаў А. Лукашэнка: «Вы хочаце ведаць аб гэтым праўду? Была ваенізаваная група ў Беларусі, узначаленая нейкім Ігнатовічам, вельмі падрыхтаваныя хлопцы са сьпецназу СССР. Яны паехалі ў Чачню падчас вайны і ваявалі на баку Масквы. Паваявалі і вярнуліся дадому. Прыяжджаюць да іх Шарамет (*журналіст ОРТ, калега і сябра Дз. Завадзкага. — рэд.*) і Завадзкі здымаць сюжэт для расійскага тэлебачаньня. У гэтым сюжэце было сказана, што вось гэтыя беларускія грамадзяне ваююць на баку чачэнскіх сепаратыстаў супраць федэральных войскаў. Узялі інтэрвію ў гэтага Ігнатовіча, а потым сказалі, што ён ваяваў супраць рускіх. Шарамет выкруціўся, а Завадзкага злавілі. Пачалі з мужчынскіх разборак: «Навошта ж ты нас абгаварыў»? І забілі Завадзкага. Ігнатовіч атрымаў пажыцьцёвае зьняволеньне і знаходзіцца ў нашай калоніі». Нагадаем, што па абвінавачаньні ў выкраданьні Дз. Завадзкага і ўчыненьні шэрагу іншых злачынстваў яшчэ ў 2002 годзе да розных тэрмінаў пазбаўленьня волі былі асуджаныя члены так званай «банды Ігнатовіча», у тым ліку В. Ігнатовіч і М. Малік — да пажыцьцёвага зьняволень-





ня. Разам з тым А. Лукашэнка выказаў упэўненасьць у тым, што Дз. Завадзкі быў забіты, хаця В. Ігнатовіч і ягоныя паплечнікі былі асуджаныя па абвінавачаньні ў выкраданьні, а не забойстве журналіста, а аператыўная праца па ўстанаўленьні яго месцазнаходжаньня ці цела працягваецца.

На працягу году фіксаваліся факты сістэматычнага і мэтанакіраванага перасьледу і абмежаваньня дзейнасьці журналістаў, перашкодаў у ажыцьцяўленьні імі сваіх прафесійных абавязкаў, затрыманьняў, зьбіцьця, вынясеньня штрафаў і іншых пакараньняў.

Адной з формаў перасьледу журналістаў зьяўлялася выкарыстаньне артыкулаў Крымінальнага кодэксу за прафесійную дзейнасьць і выказваньне меркаваньняў. 29 красавіка Гарадзенскае абласное ўпраўленьне КДБ вынесла папярэджаньне журналісту Яну Роману аб недапушчальнасьці парушэньня арт. 369-1 Крымінальнага кодэксу РБ — «дыскрэдытацыя Рэспублікі Беларусь». На думку КДБ, шэраг матэрыялаў журналіста ў часопісе «Magazyn Polski na uchodzstwie» і на Радыё «Рацыя», якія тычыліся эканамічнага становішча прадпрыемстваў рэгіёну, дыскрэдытуюць краіну. У дакуменце таксама адзначалася, што ў выпадку працягу «парушэньняў» супраць журналіста можа быць распачатая крымінальная справа.

24 лютага судзьдзя Цэнтральнага раёну Гомелю Марына Дамненка пакарала штрафамі ў памеры 20 базавых велічыняў журналістаў Дзьмітрыя Кармазіна і Алега Ражкова, якія былі прызнаныя вінаватымі ў «парушэньні парадку правядзеньня масавых мерапрыемстваў», хаця яны займаліся толькі зборам інфармацыі пра акцыю ў абарону роднай мовы, якая адбылася 21 лютага.

29 траўня суд Бярозаўскага раёну (Брэсцкая вобласьць) вынес адміністрацыйнае пакараньне ў выглядзе вуснага папярэджаньня за «парушэньне парадку правядзеньня масавага мерапрыемства» карэспандэнтцы Радыё «Рацыя» Тамары Шчапёткінай. Журналістка была затрыманая 26 красавіка па дарозе з акцыі «Сьвечка памяці», прымеркаванай да гадавіны Чарнобыльскай аварыі, дзе яна выконвала свае прафесійныя абавязкі.

17 красавіка ў Клецку супрацоўнікі міліцыі затрымалі журналістаў Настасьсю Краўчук і Кацярыну Ткачэнка, якія рыхтавалі сюжэт пра прыпыненьне рамонтных работ у мясцовым праваслаўным храме, а разам з імі выдаўца рэгіянальнага бюлетэню «Бойкі

Клецк» Сяргея Панамарова і ягонага сына Уладзіміра. Затрыманых пратрымалі ў пастарунку некалькі гадзінаў, пасьля чаго забралі ў журналістаў відэаапаратуру і касеты з адзьнятым матэрыялам. Пасьля скаргі ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» у Клецкую раённую пракуратуру відэаапаратура была вернута журналістам.

Супрацоўнікі Аршанскага РАУС затрымлівалі журналістаў, якія 5 верасьня асьвятлялі бардаўскі фестываль «Аршанская бітва-2009». Аднымі з першых былі затрыманыя Паліна Сьцепаненка і Віктар Трацьцякоў, якіх даставілі ў Аршанскае РАУС і склалі пратаколы за адсутнасьць флікераў. Ларысу Шчыракову разам з некаторымі іншымі затрыманымі вывезьлі і высадзілі на станцыі Коханава (у паўгадзіне язды ад Воршы). Супрацоўнік ДАІ спыніў аўтамашыну, у якой ехалі журналісты Алена Сьцяпанава і Іван Шульга, і паведаміў, што да заўсёднага месца фестывалю машыны загадана не прапускаць, бо на Крапівенскім полі нібыта знайшлі міну (зьвесткі пра міну ня спраўдзіліся). Міліцыя затрымала таксама машыну, у якой знаходзіўся каардынатар бардаўскага фестывалю Юрый Копцік. Іван Шульга і Юрый Копцік былі дастаўленыя ў пастарунак, дзе яны правялі тры гадзіны.

16 сьнежня супрацоўніцу газеты «Наша Ніва» Настасьсю Шамрэй затрымалі каля пасольства Ірана ў Менску падчас асьвятленьня акцыі ў абарону дзесяці геяў Ірана, якіх у гэтай краіне асудзілі да сьмяротнага пакараньня. Разам з затрыманымі ўдзельнікамі акцыі журналістка была дастаўленая ў апорны пункт каля РУУС Савецкага раёну, дзе супрацоўнікі міліцыі перапісалі яе пашпартныя зьвесткі і нумар пасьведчаньня сябра БАЖ і адпусьцілі без складаньня пратаколу.

З найбольш грубымі парушэньнямі сваіх прафесійных правоў журналісты сутыкнуліся падчас асьвятленьня масавых акцыяў, якія адбыліся ў Менску 9, 16 верасьня і 16 кастрычніка. 9 верасьня на Кастрычніцкай плошчы сталіцы праходзіла акцыя пратэсту некаторых дэмакратычных арганізацый, якія выступалі супраць расійска-беларускіх вайсковых вучэньняў «Захад-2009» і ўводу расійскіх войскаў на тэрыторыю Беларусі. Нягледзячы на тое, што ўсе журналісты мелі пасьведчаньні, некаторыя супрацоўнікі праваахоўных органаў у цывільным літаральна атакавалі фота- і тэлекарэспандэнтаў. Адзін з іх пашкодзіў тэлекамеру тэлеаператара Уладзіміра Косьціна, былі спробы адабраць фотаапараты ў фотакарэспандэнтаў Васіля Сямашкі і Арцёма Лявы, на зямлю была паваленая фотакарэспандэнтка «Нашай Нівы» Юлія Дарашкевіч. 16 верасьня сілавому ўзьдзеяньню з боку праваахоўных органаў падвергліся журналісты, якія асьвятлялі акцыю салідарнасьці, прымеркаваную да 10-й гадавіны зьнікненьня Віктара Ганчара і Анатоля Красоўскага, сярод іх: карэспандэнты «Associated Press», Рускай службы BBC, «Reuters», «France Presse», Радыё «Свабода», сайта «Хартыя-97», «Нашай Нівы», «Белгазеты», агенцтва БелаПАН і іншых СМІ. Людзі ў цывільным, спрабуючы перашкодзіць здымкам брутальных затрыманьняў удзельнікаў мірнай акцыі, па два чалавекі на кожнага журналіста, груба, з пагрозай пашкодзіць тэхніку і траўміраваць рэпарцёраў, закрывалі іх відэа- і фотакамеры, адштурхоўвалі ад аб'ектаў падзеяў, нягледзячы на наяўнасьць у журналістаў рэдакцыйных пасьведчаньняў. Яшчэ больш жорстка паводзілі сябе супрацоўнікі праваахоўных органаў з журналістамі падчас акцыі салідарнасьці 16 кастрычніка: весьці здымкі было практычна немагчыма, за кожным фотакарэспандэнтам і тэлеаператарам былі «замацаваныя» людзі, якія не давалі здымаць разгон масавага мерапрыемства, захінаючы тэхніку, журналістаў штурхалі і прымянялі ў адносінах да іх грубую сілу.

У сувязі са стварэньнем перашкодаў прафесійнай дзейнасьці журналістаў і ўжываньнем супраць іх сілы праваахоўнымі органамі падчас акцыяў 9 і 16 верасьня ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» 23 верасьня накіравала звароты ў пракуратуру Менску, Міністэрства ўнутраных справаў і ГУУС Мінгарвыканкаму з патрабаваньнем высьветліць асобы і прыцягнуць да адказнасьці тых, хто аддаваў і выконваў незаконныя загады. Разабрацца з сітуацыяй было даручана Галоўнаму ўпраўленьню ўласнай бясьпекі (ГУУБ) Міністэрства ўнутраных справаў (сьпецыяльнай службе, якая закліканая папярэджваць, выяўляць і спыняць праваапарушэньні, якія ўчыняюць супрацоўнікі органаў унутраных справаў і ваеннаслужачыя ўнутраных войскаў). «Накіроўваецца на Ваш адрас матэрыял праверкі па заяве Бастунца А. Л. для высьвятленьня асобаў супрацоўнікаў міліцыі, на якіх указана ў заяве, і правядзеньня ў дачыненьні да дадзеных супрацоўнікаў службовай праверкі», — указвалася ў лісьце пракурора Цэнтральнага раёну Мікалая Якіменкі (да ліста ў ГУУБ прыкладаліся таксама 14 фотаздымкаў, дзе відаць, як людзі ў цывільным захінаюць камеры журналістаў). Далей казалася, што калі падчас расьсьледаваньня высьветліцца «факт учыненьня неправамоцных дзеяньняў», «нанясеньня грамадзянам

цялесных пашкоджаньняў дадзенымі супрацоўнікамі», матэрыялы праверкі павінны быць дасланыя ў пракуратуру Цэнтральнага раёну для «прававой ацэнкі дзеяньняў супрацоўнікаў міліцыі». Аднак пра вынікі праведзенай праверкі журналісцкая арганізацыя так і не была праінфармаваная. 30 кастрычніка БАЖ атрымаў ліст за подпісам начальніка трэцяга ўпраўлення ГУУБ МУС Віталя Кісьцернага, у якім коратка паведамлялася, што зварот арганізацыі ў пракуратуру г. Менску «разгледжаны трэцім упраўленьнем ГУУБ МУС… Устаноўлена, што па аналагічнай Вашай заяве праведзена вычарпальная праверка ГУУС Менгарвыканкаму, пра вынікі якой Вас паінфармавалі ў вызначаным законам парадку». Але ніякага ліста з ГУУС Менгарвыканкаму журналісцкая арганізацыя не атрымлівала, хаця там запэўнівалі, што адказ быў накіраваны па пошце яшчэ 9 кастрычніка. Да канца году так і засталося невядомым, ці праводзілася сапраўды праверка законнасьці дзеяньняў супрацоўнікаў міліцыі падчас акцыяў, якія яе вынікі і ці дасылаўся адпаведны адказ заяўнікам.

Разам з тым своеасаблівы адказ на зварот журналісцкай арганізацыі ўсё ж быў атрыманы. 22 кастрычніка намесьнік міністра ўнутраных справаў Яўген Палудзень заявіў, што фармат стасункаў паміж супрацоўнікамі міліцыі і журналістамі будзе зьменены падчас асьвятленьня вулічных мерапрыемстваў. Ён паведаміў, што бліжэйшым часам на акцыях будуць прысутнічаць прэс-афіцэры, супрацоўнікі МУС у сініх камізэльках, да якіх мусяць зьвяртацца прадстаўнікі СМІ па розных пытаньнях. У чырвоныя камізэлькі будуць апранутыя міліцыянты, якія будуць весьці перамовы з удзельнікамі несанкцыянаваных акцый. Пры гэтым намесьнік міністра запэўніў, што з боку кіраўніцтва МУС прынятыя захады, каб супрацоўнікі міліцыі не перашкаджалі працы журналістаў. Таксама Я. Палудзень спаслаўся на заканадаўства Германіі, якое не дазваляе журналістам здымаць паліцэйскіх і ўдзельнікаў акцый буйным планам, а толькі здалёк.

На працягу году журналісты недзяржаўных выданьняў сістэматычна сутыкаліся з адмовамі ў прадастаўленьні інфармацыі, пры гэтым нярэдка гэтае пытаньне вызначалася не існуючымі палажэньнямі закону, а пазіцыяй ідэолагаў. Праблемай заставалася практыка абмежавальнага выкарыстаньня інстытуту акрэдытацыі.

З восені 2007 году без тлумачэньня прычынаў была пазбаўленая акрэдытацыі пры Палаце прадстаўнікоў карэспандэнт недзяржаўнай газеты «Народная воля» Марына Коктыш, і на працягу больш чым двух гадоў яна не змагла дабіцца яе ўзнаўленьня. У 2008 годзе журналістка спрабавала адстойваць свае прафесійныя інтарэсы ў судзе, але суд двойчы адмаўляўся разглядаць справу. На пачатку 2009 году Марына Коктыш атрымала чарговую адмову. У лісьце з сакратарыяту ПП НС гаварылася, што заяўку наконт акрэдытацыі журналісткі перадалі «адпаведным службам», якія вырашылі адмовіць ёй у доступе «на тэрыторыю адміністрацыйнага комплексу «Савецкая, 11» (адрас Дому ўраду). Адмову ў акрэдытацыі Марына Коктыш зноў спрабавала аспрэчыць у судовым парадку. 13 лютага судзьдзя суда Маскоўскага раёну Менску Алена Рудніцкая адмовілася ўзбуджаць справу «ў сувязі з адсутнасьцю ў заяўніка права на зварот у суд». Пазьней Вярхоўны суд адхіліў скаргу галоўнага рэдактара «Народнай волі» Іосіфа Сярэдзіча і Марыны Коктыш на рашэньне суда першай інстанцыі. «Паколькі пытаньні акрэдытацыі журналістаў у кампетэнцыю суда не ўваходзяць і заканадаўства, якое дзейнічае ў Рэспубліцы Беларусь, не прадугледжвае вырашэньня судамі скаргаў на адмову ў такой акрэдытацыі, судзьдзя абгрунтавана адмовіўся ўзбуджаць справу», — сказана ў лісьце ад 30 лістапада за подпісам намесьніка старшыні Вярхоўнага суда А. Федарцова. Нагадаем, што яшчэ ў 2007 годзе на запыт адносна матываў пазбаўленьня акрэдытацыі з ПП НС журналістцы паведамілі, што за гэтым рашэньнем стаіць Служба бясьпекі прэзідэнта.

У чэрвені ў чарговы раз без тлумачэньня прычынаў Ганцавіцкі райвыканкам адмовіў у акрэдытацыі журналістам недзяржаўнай рэгіянальнай газеты «Ганцавіцкі час». У кастрычніку ў акрэдытацыі пры Горацкім райвыканкаме было адмоўлена рэдактару горацкай недзяржаўнай газеты «Узгорак» Эдуарду Брокараву: у адказе за подпісам старшыні раённай вертыкалі Міхаіла Анікеева было сказана, што акрэдытаванымі пры райвыканкаме сродкамі масавай інфармацыі зьяўляюцца газета «Ленінскі шлях» і радыёпраграма «Голас Горацкага краю», таму акрэдытаваньне іншых СМІ немэтазгоднае.

У верасьні Баранавіцкі аб’яднаны ваенны камісарыят адмовіўся акрэдытаваць карэспандэнтаў недзяржаўнай газеты «Intex-press». У лісьце ад 10 верасьня ваенны камісар палкоўнік Міхаіл Соц паведаміў рэдакцыі, што, паводле арт. 173 «Інструкцыі аб парадку арганізацыі ідэалагічнай працы ва Ўзброеных Сілах», зацьа

верджанай загадам Міністра абароны 03.01.2006 году, раённымі ваеннымі камісарыятамі ажыцьцяўляюцца… ўсе віды акрэдытацыі дзяржаўных СМІ адпаведных раёнаў. На падставе гэтага ў акрэдытацыі Вашых прадстаўнікоў адмоўлена». Выданьне зьвярнулася з просьбай акрэдытаваць сваіх журналістаў пасьля інцыдэнту з фотакарэспандэнткай газеты Людмілай Пракопавай, якую нібыта з-за адсутнасьці акрэдытацыі пры Мінабароны не пусьцілі на авіябазу на цырымонію разьвітаньня з загінуўшымі ў Польшчы лётчыкамі. Неаднаразова газета сутыкалася і з адмовамі ў прадастаўленьні інфармацыі. 10 сакавіка галоўны інжынер Упраўленьня капітальнага будаўніцтва Баранавічаў Уладзімір Весялоў заявіў карэспандэнтцы Зінаідзе Дрозд, якая рыхтавала матэрыял па скарзе ўрачоў і педагогаў гораду, ня згодных будаваць шматкватэрны дом на балоцістай мясцовасьці, што з недзяржаўнымі СМІ ён не супрацоўнічае. Адмоўны вынік мела спроба журналісткі Іны Ганчар праясьніць сітуацыю з беспрацоўем у горадзе. Начальніца ўпраўленьня па працы, занятасьці і сацыяльнай абароне гарвыканкаму Тацяна Латышава 13 сакавіка адмовілася даць такія зьвесткі, заявіўшы, што ўсю неабходную інфармацыю са сваёй справаздачы напаседжаньні гарвыканкаму яна ўжо даслала ў рэдакцыю па факсе. Не дапамаглі і звароты карэспандэнткі да кіраўніцы аддзелу ідэалагічнай працы Тацяны Жытко. Не атрымала адказу і карэспандэнтка Людміла Пракопава, якая накіравала 24 лютага запыт ва Упраўленьне гандлю праз аддзел ідэалогіі Баранавіцкага гарвыканкаму, у якім спрабавала высьветліць, колькі гандлёвых прадпрыемстваў у Баранавічах былі пазбаўленыя ліцэнзій за неабгрунтаванае завышэньне гандлёвых надбавак на тавары.

З адмовамі ў прадастаўленьні інфармацыі сутыкаліся большасьць рэгіянальных недзяржаўных выданьняў. Начальнік Слонімскага раённага аддзелу па надзвычайных сітуацыях Віталь Русілевіч 24 лютага адмовіўся даць інфармацыю карэспандэнту мясцовага выданьня «Газета Слонімская» датычна дзейнасьці падначаленай яму ўстановы, патлумачыўшы сваю адмову «вусным распараджэньнем уладаў». 21 траўня карэспандэнта гэтага ж выданьня Сяргея Чыгрына не пусьцілі на сустрэчу мясцовых прадпрымальнікаў з намесьнікам старшыні Слонімскага райвыканкаму Анатолем Фідрыкам. Карэспандэнта лунінецкай газеты «Информ-прогулка» Марыю Юрко не пусьцілі на сход, дзе губернатар вобласьці Канстанцін Сумар павінен быў прадставіць выканаўцу абавязкаў





кіраўніка мясцовай адміністрацыі. Загадчык ідэалагічнага аддзелу спаслаўся на тое, што «Информ-прогулка» ня мае акрэдытацыі пры райвыканкаме. Карэспандэнтку газеты «Ганцавіцкі час» Кацярыну Курловіч не пусьцілі на сьвяточны прыём, які ладзіў на Дзень маці, 14 кастрычніка, старшыня Ганцавіцкага райвыканкаму Уладзімір Столяр. На ўваходзе ў малую залу райвыканкаму яе не прапусьціла дырэктарка мясцовага Дому культуры Ірына Гурская, а затым і супрацоўніца ідэалагічнага аддзелу Марына Муха. Загад выправадзіць карэспандэнтку паступіў ад кіраўніка справамі Ганцавіцкага райвыканкаму Мікалая Зажэкі. Начальнік Загараднага аддзелу міліцыі Барысаўскага РУУС Сяргей Гара адмовіўся 14 ліпеня прадаставіць інфармацыю карэспандэнту недзяржаўнай газеты «Борисовские новости» Алесю Мікалайчанку. Гэта адбылося нягледзячы на папярэднюю дамоўленасьць, ініцыяваную самімі міліцыянтамі. Начальнік упраўленьня заявіў, што ідэолагі не далі санкцыі на прадастаўленьне любой інфармацыі гэтай недзяржаўнай газеце. Аналагічны выпадак адбыўся 15 чэрвеня, калі супрацоўніку выданьня ў Цэнтры прапаганды і навучаньня Барысаўскага гарадзкога аддзелу па надзвычайных сітуацыях адмовіліся прадаставіць штотыднёвую зводку пра пажары.

У чэрвені некаторыя журналісты не былі дапушчныя на справаздачна-выбарчы сход гарадзенскай гарадзкой арганізацыі «Саюзу палякаў на Беларусі» пад кіраўніцтвам Юзэфа Лучніка. Старшыня гарадзкой арганізацыі праўладнага Саюзу Казімір Знайдзінскі загадаў супрацоўнікам міліцыі не пускаць у будынак мясцовага Дому культуры прадстаўнікоў «Gazety Wyborczej», «Rzeczpospolita», «Радыё Рацыя» і тэлеканалу «Белсат». А 12 верасьня не дазволілі прысутнічаць на чарговым зьезьдзе гэтай арганізацыі карэспандэнтцы «Газеты Слонімскай» Хрысьціне Марчук, радыёжурналісту Яну Роману, журналісту Радыё «Свабода» Сяргею Астраўцову, а таксама карэспандэнту польскай «Rzeczpospolita» Пятру Касьціньскаму. Неакрэдытаваных карэспандэнтаў супрацоўнікі міліцыі не ўпусьцілі ў будынак прадпрыемства «Гродна Азот», дзе адбывалася мерапрыемства. Некаторым з іх таксама не дазвалялі размаўляць з удзельнікамі зьезду на вуліцы. Кіраваў дзеяньнямі міліцыі начальнік Кастрычніцкага РАУС палкоўнік Леанід Бет.

30 чэрвеня прэс-сакратар МУС Сьвятлана Бароўская адмовілася прадаставіць інфармацыю карэспандэнту «Еўрапейскага радыё для Беларусі» Дзьмітрыю Панямонаву. Зварот журналіста ў МУС

быў зьвязаны з інфармацыяй, якую агучыў Аляксандр Лукашэнка 28 чэрвеня на нарадзе з кіраўнікамі сілавых ведамстваў. Крытыкуючы працу беларускай міліцыі, ён паведаміў пра 78 выпадкаў, калі супрацоўнікі міліцыі самі правакавалі грамадзян на правапарушэньні. Журналіст папрасіў прэс-сакратара міністэрства падрабязьней распавесьці пра некалькі такіх выпадкаў, але С. Бароўская адмовілася ня толькі прадаставіць такую інфармацыю, але і наогул размаўляць з ім, спаслаўшыся на занятасьць.

Тэндэнцыя закрыцьця дзяржаўнымі органамі інфармацыі ад журналістаў, а значыць — ад грамадзтва, найбольш відавочна была прадэманстравана ўвосень, калі ў канцы кастрычніка — пачатку лістапада краіну літаральна захлыналі чуткі, зьвязаныя з хваляй сьвінога грыпу, а афіцыйныя кіраўнікі органаў аховы здароўя адмаўлялі наяўнасьць любых праблем. Ад пачатку масавага захворваньня жыхары краіны абураліся адсутнасьцю афіцыйнай інфармацыі. Нараджаліся чуткі, складаліся неверагодныя прагнозы. Чыноўнікі ваганіся між традыцыяй замоўчваньня выпадкаў захворваньня на свіны грып і абавязкам агучваць падобныя факты. Прэса ў гэтай сітуацыі дамаглася хаця б таго, што ўлады прызналі: сьвіны грып у Беларусі існуе і людзі ад яго паміраюць. Дзяржаўныя чыноўнікі ў сваю чаргу абвінавачвалі СМІ ў абвастрэньні праблемы. Першая намесьніца міністра інфармацыі Лілія Ананіч заявіла: «Сапраўды, у суседніх краінах абвешчана жорсткая эпідэміялагічная сітуацыя, але ў Беларусі нічога не адбываецца такога, што было б непадуладна нашай медыцыне. Так, ёсьць захварэлыя, ёсць перабоі з лекавымі сродкамі, але калі сёньня СМІ выклічуць усіх грамадзян нашай краіны ў аптэкі, то можна сабе ўявіць, што будзе з гэтымі аптэкамі. Трэба весьці здаровы лад жыцьця, звычайна гадаваць дзяцей і хадзіць на працу, а медыкі будуць рабіць сваю справу». Лілія Ананіч, каментуючы «ажыятаж, які разьдзімаецца некаторымі СМІ ў зьвязку з захворваньнямі на грып і вірусныя інфекцыі», заявіла, што Міністэрства інфармацыі будзе «ў адпаведнасьці з заканадаўствам спыняць любыя спробы дэзінфармаваць насельніцтва краіны». Па словах Л.Ананіч, Мінінфармацыі «ўважліва аналізуе» працу СМІ, зьвяртаючы ўвагу ня толькі на друкаваныя і электроныя медыя, але і на інтэрнэт-версіі зарэгістраваных СМІ.

У выніку «ўважлівага аналізу» публікацыяў Міністэрства інфармацыі 16 лістапада вынесла афіцыйнае папярэджаньне газеце





«Наша Ніва», а 17 лістапада — газеце «Комсомольская правда» в Белоруссии». Падставай для вынясеньня папярэджаньня «Нашай Ніве» стаў артыкул «Замоўчваньне грыпу выклікала эпідэмію панікі», які быў надрукаваны ў нумары ад 4 лістапада. На думку чыноўнікаў Міністэрства інфармацыі, статыстыка колькасьці захварэлых і памерлых ад пнеўманіі ў Менску, якая прыводзіцца ў артыкуле, «не адпавядае рэчаіснасьці» — аб гэтым 12 лістапада Міністэрству інфармацыі паведаміла Міністэрства аховы здароўя. Папярэджаньне газеце «Комсомольская правда» в Белоруссии» было вынесена за матэрыял «Родныя захварэлай гамяльчанкі: Зараз дачка на штучнай вентыляцыі лёгкіх, а лекаў у бальніцы няма», апублікаваны 14 лістапада. Міністэрства палічыла недакладнай інфармацыю пра тое, што ў Гомельскай абласной туберкулёзнай бальніцы адсутнічаў прэпарат «Таміфлю».

Пісьмовыя папярэджаньні Міністэрства інфармацыі заставаліся фактарам ціску на СМІ і дзейсным сродкам уплыву на іх рэдакцыйную палітыку. Часта падставамі для вынясеньня папярэджаньняў зьяўлялася крытычная інфармацыя, якая закранала грамадзка значныя праблемы, пра што сьведчаць у тым ліку вышэйзгаданыя прыклады.

Выказваньне непажаданага меркаваньня стала таксама падставай для вынясеньня 17 лістапада папярэджаньня недзяржаўнай газеце «Народная воля» (паводле арт. 38 — «інфармацыя, распаўсюд якой у СМІ забаронены»). Міністэрства інфармацыі ўгледзела ў артыкуле «Не мешай другим отстаивать свободу» (рубрыка «Пункт гледжання», № № 169—70 ад 30 кастрычніка — 2 лістапада) прапаганду экстрэмісцкай дзейнасьці. Публікацыя была падпісаная «Ігарам Драко, жыхаром Менску», які дзяліўся ўласным меркаваньнем адносна таго, як варта дзейнічаць апазіцыі на наступных прэзідэнцкіх выбарах. Крыху болей чым праз месяц, 24 сьнежня, «Народная воля» атрымала другое папярэджаньне. На гэты раз падставай для яго стала стала нататка ў нумары ад 11-14 сьнежня, у якой рэдакцыя прапаноўвала чытачам пералік гандлёвых кропак «Белсаюздруку» ў Менску, дзе можна на больш выгадных умовах аформіць падпіску на газету. Такая падпіска атрымліваецца таньней, чым, напрыклад, праз паштовыя аддзяленьні, што газета назвала «ільготным тарыфам». Мінінфармацыі палічыла ўжываньне гэтага словазлучэньня парушэньнем. Між тым павод-

ле арт. 51 п. 2.2. закону «Аб СМІ», вынясеньне рэдакцыі альбо заснавальніку СМІ на працягу году двух і больш папярэджаньняў можа пацягнуць за сабой прыпыненьне выпуску гэтага СМІ.

30 верасьня кіраўніцтва беларускай FM-радыёстанцыі «Аўтарадыё» атрымала пісьмовае папярэджаньне ад Мінінфармацыі за «невыкананьне творчай канцэпцыі вяшчаньня ў частцы аб'ёму перадач уласнай вытворчасьці і тэматычнага напаўненьня». Падставай для папярэджаньня стала зьяўленьне на хвалях радыёстанцыі праграмы «ЕўраZOOM» — сумеснага праекту «Еўрарадыё» і «Аўтарадыё», які рэалізоўваўся з лета пад патранажам Еўракамісіі.

Распаўсюджанымі прычынамі вынясеньня папярэджаньняў недзяржаўным СМІ зьяўляліся і арганізацыйна-тэхнічныя. Так, Міністэрства інфармацыі 30 кастрычніка папярэдзіла заснавальніка недзяржаўнай рэгіянальнай газеты «Вольнае Глыбокае» за публікацыі на рускай мове і непаведамленьне ў належны тэрмін інфармацыі пра зьмену мовы выданьня. «Вольнае Глыбокае» зарэгістравана як беларускамоўная газета, але ў двух нумарах (ад 3 і 17 верасьня) былі апублікаваныя рэкламныя тэксты на рускай мове, што і стала падставай для вынясеньня папярэджаньня.

4

Атрыманьне акрэдытацыі МЗС для замежных СМІ і журналістаў, якія з імі супрацоўнічаюць, на працягу году заставалася вялікай праблемай, якая межавала з забаронай на прафесію. Асабліва гэтая праблема абвастрылася пасьля ўступленьня ў сілу новага Закону «Аб сродках масавай інфармацыі», у якім заканадаўча было замацаванае патрабаваньне аб неабходнасьці атрыманьня акрэдытацыі для журналістаў замежных СМІ і абвяшчэньне дзейнасьці без акрэдытацыі незаконнай.

Як станоўчы крок беларускіх уладаў быў расцэнены дазвол на адкрыцьцё ў Беларусі карэспандэнцкага пункту «Еўрапейскага радыё для Беларусі» тэрмінам на адзін год, пра што 11 лістапада прэмьер-міністрам Сяргеем Сідорскім была падпісаная адпаведная пастанова Савету міністраў № 1463. Міністэрства замежных спраў Беларусі акрэдытавала 12 журналістаў і тэхнічных супрацоўнікоў радыё.

Разам з тым улады Беларусі тройчы на працягу году адмовілі ў рэгістрацыі спадарожнікавага тэлеканалу «Белсат». Першы раз дакументы ў МЗС былі пададзены 20 сьнежня 2008 году на рэгістрацыю прадстаўніцтва тэлеканалу як часткі Польскага тэлебачаньня (TVP) у Беларусі. У лютым Міністэрства замежных справаў прыпыніла іх разгляд, спаслаўшыся на тое, што яны аформленыя неналежным чынам. «Разгляд пытаньня пра адкрыцьцё ў Рэспубліцы Беларусь карэспандэнцкага пункту тэлеканалу «Белсат» можа быць адноўлены пасьля выпраўленьня пералічаных заўвагаў», — гаварылася ў паведамленьні за подпісам намесьніка міністра Валерыя Варанецкага ад 16 лютага. У ліпені МЗС Беларусі другі раз адхіліла зварот «Белсат», сьцьвярджаючы, што не хапае аднаго з патрэбных дакументаў. Кіраўніцтва тэлеканалу не адступілася і падало дакументы чарговы раз 9 кастрычніка. Праз два месяцы, 8 сьнежня, МЗС зноў вынес рашэньне адмовіць «Белсату» ў адкрыцьці карпункту. У дакуменце за подпісам намесьніка міністра В. Варанецкага адзначалася, што згодна з інфармацыяй, якой валодае міністэрства, на працягу 2009 году беларускія органы пракуратуры вынесьлі папярэджаньні шэрагу грамадзянаў за працу ад імя тэлеканалу «Белсат» без акрэдытацыі. Тым самым, казалася ў адмове, былі парушаныя патрабаваньні закону «Аб СМІ», і па гэтай прычыне МЗС адмаўляе тэлеканалу ў адкрыцьці карпункту. Склалася абсурдная сітуацыя: тэлеканалу ўпарта адмаўлялі ў рэгістрацыі, за дзейнасьць без акрэдытацыі журналістам выносіліся папярэджаньні, і гэта зьяўлялася прычынай адмовы яму ў рэгістрацыі. Сярод журналістаў, якія атрымалі папярэджаньні пракуратуры за дзейнасьць без акрэдытацыі на карысьць спадарожнікавага тэлеканалу «Белсат», гомельскія журналісты Тацяна Бублікава (папярэджаньне вынесена 24 лютага) і Алег Ражкоў (папярэджаньні атрымаў двойчы — у канцы лютага і 22 верасьня), магілёўскія журналістка Вольга Шарапкіна і тэлеаператар і фотамастак Вадзім Аршынскі (папяэджаньні былі вынесены адпаведна 21 жніўня і 28 верасьня Чавускай раённай пракуратурай). 4 лістапада дырэктару «Беласату» Агнешцы Рамашэўскай, якая была запрошаная ў якасьці ганаровай госьці на Менскі форум XII, у апошні дзень адмовілі ў беларускай візе.

З адмовамі ў акрэдытацыі сутыкаліся журналісты, якія супрацоўнічалі і з іншымі замежнымі СМІ. У канцы студзеня Міністэрства замежных справаў Беларусі адмовіла ў акрэдытацыі дваім карэспандэнтам Радыё «Рацыя», тлумачачы такое рашэньне тым, што яны раней працавалі без акрэдытацыі. Гэтая ж прычына стала падставай для адмовы ў акрэдытацыі як карэспандэнтаў Радыё «Рацыя» журналістам з Гародні Івану Роману (3 сакавіка) і Віктару Парфёненку (25 верасьня). 25 лістапада афіцыйнае пракурорскае па-

пярэджаньне за працу без акрэдытацыі на Радыё «Рацыя» атрымала журналістка з Бярозы (Брэсцкая вобл.) Тамара Шчапёткіна. Журналіст Дзьмітрый Кісель з Берасьця атрымліваў з пракуратуры тэлефонныя пагрозы з папярэджаньнямі, што будзе мець непрыемнасьці, калі ня спыніць супрацоўнічаць з Радыё «Рацыя» без акрэдытацыі. 3 сакавіка Міністэрства замежных справаў анулявала акрэдытацыю гродзенскага журналіста Андрэя Пачобута на працу ў якасьці карэспандэнта «Gazety Wyborczej» на падставе таго, што, на меркаваньні МЗС, той тэндэнцыйна асьвятляе падзеі ў Рэспубліцы Беларусь і негатыўна піша пра кіраўніка дзяржавы; журналіст апынуўся пад пагрозай перасьледу за дзейнасьць без акрэдытацыі. 15 жніўня па прычыне адсутнасьці акрэдытацыі МЗС былі дэпартаваныя з Беларусі маскоўскія журналісты тэлеканалу НТВ Аляксей Малкаў і Юрый Бабенка, якія здымалі фільм пра зьніклых беларускіх дзеячаў.



Усяго, па падліках ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў», за восем месяцаў пасьля ўступленьня закону «Аб сродках масавай інфармацыі» ў сілу органы пракуратуры вынесьлі 15 вусных і пісьмовых папярэджаньняў на адрас журналістаў за парушэньне закону ў частцы працы без акрэдытацыі на замежныя СМІ. Журналісцкая арганізацыя, занепакоеная «абмежавальным тлумачэньнем» заканадаўства аб СМІ, 9 кастрычніка накіравала зварот да Генеральнага пракурора Беларусі Рыгора Васілевіча, у якім заклікала пракуратуру перагледзець дачыненьні з журналістамі. У звароце падкрэсьлівалася, што ні закон «Аб СМІ», ні «Палажэньне аб парадку акрэдытацыі ў Беларусі журналістаў замежных СМІ» не абмяжоўваюць права любога беларускага грамадзяніна зьбіраць і распаўсюджваць інфармацыю, рыхтаваць матэрыялы і прапаноўваць іх СМІ, у тым ліку і замежным. У канцы лістапада БАЖ атрымала адказ на свой зварот, сутнасьць якога зводзілася да таго, што абскарджваць папярэджаньні могуць толькі тыя асобы, якім яны вынесеныя, а пракурорскі нагляд за выкананьнем заканадаўства аб СМІ арганізаваны ў адпаведнасьці з патрабаваньнямі законаў «Аб пракуратуры РБ» і «Аб СМІ» (ліст падпісаны начальнікам аддзелу па наглядзе за выкананьнем правоў і свабодаў грамадзянаў Паўлам Радзівонавым).

Тэма свабоды выказваньня меркаваньняў і свабоды СМІ ў Беларусі на працягу году знаходзілася ў цэнтры ўвагі еўрапейскай





супольнасьці і зьяўлялася адным з крэтырыяў ацэнкі прагрэсу ў дзеяньнях беларускіх уладаў з боку Еўрапейскага Саюзу. Як адзначыў кіраўнік дэлегацыі Еўрапарламенту па сувязях з Беларусьсю Яцак Пратасевіч падчас візіту ў Менск 20 лютага, «гэта наш прыярытэт, і мы ніколі ад яго не адмовімся».

20-24 верасьня Беларусь наведала місія, сфармаваная з прадстаўнікоў міжнародных арганізацый, якія займаюцца пытаньнямі СМІ і свабоды прэсы. Падчас візіту эксперты сустрэліся з медыяарганізацыямі і ўладамі Беларусі для абмену думкамі і ацэнкі становішча са СМІ, свабодай прэсы, свабодай выказваньня і доступам да інфармацыі. Па выніках арганізацыі, якія ўдзельнічалі ў місіі, падпісалі адмысловую заяву, у якой сфармулявалі шэраг рэкамендацыяў да беларускіх уладаў, скіраваных на паляпшэньне і аздараўленьне сітуацыі са сродкамі масавай інфармацыі ў краіне і для дзяржаўных, і для недзяржаўных СМІ, а таксама на павышэньне прафесіяналізму, плюралізму і ролі СМІ ў дэмакратычным грамадзтве. Сярод рэкамендацыяў наступныя:

4

1. Рэдакцыйная незалежнасьць дзяржаўных і недзяржаўных СМІ павінна паважацца, а самі яны ня мусяць цярпець перасьлед за сваю прафесійную дзейнасьць;
2. Недзяржаўныя СМІ павінны мець права і магчымасьць дзейнічаць і разьвівацца ў роўных эканамічных умовах, у тым ліку мець права распаўсюджвацца без усялякіх абмежаваньняў і дыскрымінацыі;
3. Правілы і ўмовы акрэдытацыі журналістаў павінны быць зацьверджаныя. Яны павінны быць празрыстымі, зразумела выкладзенымі і справядлівымі, а таксама скіраванымі на доступ усіх журналістаў да грамадзка важнай інфармацыі;
4. Журналістам не павінны перашкаджаць рабіць рэпартажы з грамадзка важных падзеяў і дэманстрацый;
5. Выдаткаваньне частотаў і ліцэнзій на тэле- і радыёвяшчаньне павінна быць вызначана заканадаўствам у адпаведнасьці з міжнароднымі стандартамі, а за самой працэдурай павінен наглядаць цалкам незалежны рэгулюючы орган, каб забясьпечыць плюралізм ў галіне электронных СМІ;
6. Закон «Аб СМІ», Закон «Аб супрацьдзеяньні экстрэмізму» і артыкулы Крымінальнага кодэксу, якія тычацца дыфамацыі,

павінны быць прыведзеныя ў адпаведнасьць з міжнароднымі стандартамі ў галіне свабоды прэсы і свабоды выказваньняў;

7. Улады павінны забясьпечыць роўнае стаўленьне да арганізацый, якія прадстаўляюць журналістаў;
8. Сродкі масавай інфармацыі, улады і грамадзянская супольнасьць павінны працягваць дыялог наконт паляпшэньня палітыкі і практыкі ў галіне СМІ.

Заяву падпісалі наступныя арганізацыі: Article 19, Committee to Protect Journalists, Danish Union of Journalists, Index on Censorship, International/European Federation of Journalists, International Media Support, International Publishers' Association, International Pen, International Press Institute, Open Society Institute, PressNow, Reporters without Borders, World Association of Newspapers and News Publishers. Да заявы далучылася таксама Civil Rights Defenders, нягледзячы на тое, што яе прадстаўнік ня змог прыняць удзел у працы місіі: сябру арганізацыі Яханьне Кураш было адмоўлена ў атрыманьні беларускай візы, і яна не змагла ўехаць у Беларусь.

Такім чынам, у 2009 годзе, нягледзячы на нязначныя станоўчыя зрухі ў галіне забесьпячэньня свабоды выказваньня меркаваньня і свабоды слова, чаканых рэальных і незваротных зьменаў так і не адбылося. Інфармацыйная прастора па-ранейшаму кантралявалася ўладай, яе палітыка ў дачыненьні да незалежных СМІ і журналістаў заставалася жорсткай і дыскрымінацыйнай.









Вязень сумленьня Арцём Дубскі. 7 ліпеня прыгавораны судом Асіповіцкага раёну да 1 году пазбаўленьня волі.




Вязень сумленьня Максім Дашук. 15 чэрвеня судом Маскоўскага раёну Менску асуджаны да 1 года і 3 месяцаў абмежаваньня волі без накіраваньня ва ўстановы адкрытага тыпу.



Праваабаронца Леанід Сьвецік. 16 ліпеня судзьдзёй Віцебскага абласнога суда пакараны штрафам у памеры 900 базавых велічыняў.



Праваабаронцы Алесь Бяляцкі і Леанід Сьвецік выходзяць з будынку суда пасьля вынясеньня прысуду.








Праблема палітычна матываваных зьнікненьняў была ў цэнтры ўвагі беларускай грамадзкасьці на працягу году. Акцыя салідарнасьці. 7 траўня, Кастрычніцкая плошача Менску.




Акцыя салідарнасьці ў 10 гадавіну зьнікненьня Юрыя Захаранкі.
7 траўня, Кастрычніцкая плошча Менску.



«Палітычны прызыўнік» Іван Шыла прымае прысягу ў вайсковай частцы в. Межыца Лепельскага раёну Віцебскай вобласьці, 7 лютага.



Маладафронтавец, «палітычны прызыўнік»
Зьміцер Федарук падчас прысягі. Жодзіна.







«Палітпрызыўнік» Франак Вячорка ў Менскім міжгарнізонным судзе абскарджвае незаконны прызыў у войска.



Моладзевыя актывісты праводзяць акцыю пратэсту супраць гвалтоўных прызываў у войска. Менск, плошча Незалежнасьці.



Актывісты БРСМ адзначаюць 89-годзьдзе камсамолу перфомансам у скверы на вул. Камсамольскай у Менску. 24 верасьня.




Парад у Менску з нагоды сьвяткаваньня Дня Рэспублікі. 3 ліпеня.








«Акцыя Любові», арганізаваная актывістамі «Маладога Фронту». Менск, 14 лютага.



14 лютага. Дзень сьвятога Валянціна ў Менску. Разгон акцыі «Маладога Фронту».



Дзень Волі ў Менску. 25 сакавіка.
Пляцоўка перад Нацыянальнай акадэміяй навук.










«Чарнобыльскі шлях», прымеркаваны да 23-й гадавіны аварыі
на Чарнобыльскай АЭС. Менск, 26 красавіка.





Прыхільнікі камунізму каля помніка У. Леніну ў чарговую гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі. Менск, плошча Незалежнасьці, 7 лістапада.



Акцыя ў гадавіну правядзеньня рэферэндуму па замене нацыянальнай сімволікі. Менск, 14 траўня. ↘









Разгон акцыі пратэсту «Не — расійскай акупацыі!» супраць уводу расійскіх войскаў на тэрыторыю Беларусі. Менск, Кастрычніцкая плошча, 9 верасьня.





16 верасьня. Пасьля
многіх гадоў ізаляцыі
А. Лукашэнка ўпершыню
запрошаны ў краіну
Еўрасаюзу.
Сустрэча з прэзідэнтам
Літвы Даляй Грыбаўскайтэ.



Акцыя ў 10-ю гадавіну зьнікненьня В.Ганчара і А. Красоўскага.
Менск, Кастрычніцкая плошча, 16 верасьня.







Супрацоўнікі праваахоўных органаў перашкаджаюць журналістам
здымаць разгон акцыі салідарнасьці і затрыманьні ўдзельнікаў.
Менск, верасень-кастрычнік.





Прэс-канферэнцыя прадстаўніцы «Міжнароднай Амністыі» Хэзы Макгіл (у цэнтры) з удзелам праваабаронцы Валянціна Стэфановіча і маці асуджанага да сьмяротнага пакараньня Андрэя Жука. 10 лістапада.




Праваабаронцы перад перадачай петыцыі супраць сьмяротнага пакараньня ў Беларусі. Адміністрацыя прэзідэнта ў Менску. 10 сьнежня.







Праваабаронцы А. Бяляцкі, У. Лабковіч і В. Стэфановіч у Вярхоўным судзе падчас абскарджання адмовы ў рэгістрацыі «Нашай Вясны». 12 жніўня.



Акцыя ў межах кампаніі «Стоп 193.1» супраць ужываньня крымінальнай адказнасьці за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі. «Дзяды Марозы» выходзяць з будынку Генеральнай пракуратуры. Менск, 14 кастрычніка.



Нацыянальны сьцяг на фоне Палацу прафсаюзаў у Менску. Кастрычніцкая плошча, 14 траўня.



Дзяржаўны сьцяг на фоне Фарнага касьцёлу. Гародня, сакавік.





# 5. Дыскрымінацыя

***— па палітычных матывах***

Нягледзячы на тое, што ў Беларусі, у адпаведнасьці з Канстытуцыяй і іншымі заканадаўчымі актамі, міжнароднымі пагадненьнямі, забаронена дыскрымінацыя па палітычных матывах, беларускія ўлады ў 2009 годзе працягвалі палітыку дыскрымінацыі палітычных апанентаў: сяброў апазіцыйных палітычных партыяў, незалежных прафсаюзаў, дэмакратычных моладзевых арганізацыяў.

Згодна з арт. 14 Працоўнага кодэксу Рэспублікі Беларусь, «дыскрымінацыя, гэта значыць абмежаваньне ў працоўных правах ці атрыманьне якіх-небудзь перавагаў у залежнасьці ад полу, расы, нацыянальнага паходжаньня, мовы, рэлігійных ці палітычных перакананьняў, удзелу ці няўдзелу ў прафсаюзах ці іншых грамадзкіх аб'яднаньнях, маёмаснага ці службовага становішча, недахопаў фізічнага ці псіхічнага характару, якія не перашкаджаюць выкананьню адпаведных працоўных абавязкаў, забараняецца». Варта нагадаць, што адной з прычынаў выключэньня Беларусі з Генеральнай сістэмы гандлёвых прэферэнцыяў ЕС (чэрвень 2007 году) стала дыскрымінацыя сяброў незалежных прафсаюзаў. Для вяртаньня гандлёвых прэферэнцыяў урад павінен выканаць 12 рэкамендацыяў Міжнароднай арганізацыі працы (МАП), у прыватнасьці, спыніць перасьлед грамадзянаў па прафсаюзнай прыналежнасьці.

Ціск з боку наймальнікаў і адміністрацыі прадпрыемстваў адчувалі сябры незалежных, свабодных прафсаюзных арганізацыяў па ўсёй краіне. Так, у Мазыры дырэктар Палацу культуры нафтаперапрацоўчага заводу А.Буры і ягоны намесьнік Чарнягоў Н. выклікалі работнікаў палацу — сяброў незалежнага прафсаюзу, і настойліва прапанавалі ім запоўніць заявы выхаду з незлежнага прафсаюзу і ўступленьня ў праўладны прафсаюз хімікаў. Такім чынам было «перааформлена» 6 працаўнікоў.

Па сьведчаньні старшыні аддзяленьня Свабоднага прафсаюзу Беларускага (СПБ) у Брэсцкім дзяржаўным універсітэце В.Лазарэнкава, у 2009 годзе адбылася чарговая атака адміністрацыі ўніверсітэту на незалежную прафсаюзную суполку. У жніўні сяброў незалежнага прафсаюзу выклікалі з адпачынку і пад пагрозаю непра-

цягненьня кантракту, немагчымасьці абароны кандыдацкіх дысертацыяў, прымушалі выйсьці з прафсаюзу. Па словах выкладчыка музыкі Алега Галенкі, яго выклікаў рэктар унівэрсітэту М.Часноўскі і сказаў: «альбо выходзіце з прафсаюзу, і мы супрацоўнічаем, альбо мы не супрацоўнічаем». Аказвала на яго ціск і прарэктар унівэрсітэту Г.Сендзер. Выкладчык быў вымушаны пакінуць унівэрсітэт. Раней незалежны прафсаюз ва ўнівэрсітэце налічваў каля ста чалавек, зараз засталося толькі восем.

3 верасьня рада Беларускага кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў заявіла пра тое, што ціск на сяброў незалежных прафсаюзаў працягваецца: сябры прафсаюзаў БКДП «у шэрагу месцаў па-ранейшаму церпяць уціск, не ліквідоўваецца дыскрымінацыя па прыкмеце прыналежнасьці да прафсаюзаў». У заяве прыводзіўся прыклад звальненьня з працы лідэра першаснай арганізацыі СПБ Аляксея Габрыеля, які працаваў на Лукомльскай ГРЭС і з якім дырэктар прадпрыемства не працягнуў кантракт. За месяц да звальненьня дырэктар ГРЭС наўпрост сказаў прафсаюзнаму актывісту, што «з табой ня будзе працягвацца кантракт, таму што ты вельмі бурную прафсаюзную дзейнасьць разьвіў». У кастрычніку па выпадку звальненьня А.Габрыеля БКДП падаў пазоў у суд Чашніцкага раёну Віцебскай вобласьці з патрабаваньнем аднавіць з ім працоўныя адносіны на падставе артыкулу 14 Працоўнага кодэксу.

На пачатку сьнежня 2009 году адзін з лідэраў прафсаюзнага руху ў Беларусі Аляксандр Бухвостаў паведаміў пра акцыю ў падтрымку працоўнага Лобана Юрыя, якога звольнілі з Беларускага аўтамабільнага заводу ў г.Жодзіна за сяброўства ў незалежным прафсаюзе радыёэлектроннай прамысловасьці. Па гэтым выпадку быў пададзены пазоў у жодзінскі гарадзкі суд.

Такім чынам, кантрактная сістэма, калі амаль усе працоўныя дзяржаўных прадпрыемстваў знаходзяцца на кароткачасовых кантрактах, дазваляе кіраўнікам «на законнай падставе» пазбаўляцца ад няўгодных грамадзкіх актывістаў. У сакавіку ня быў працягнуты кантракт з сябрам свабоднага прафсаюзу, грамадзкім актывістам у г.Полацку Уладзімірам Губскім, які працаваў апэратарам кацельні. Ён быў адзіным апэратарам з вышэйшай адукацыяй, прапрацаваў на гэтым месцы больш за 17 гадоў. Тым ня менш, дырэктар полацкага аддзелу ЖКГ сказаў, што прадпрыемству не патрэбныя такія працаўнікі. Прычынай канфлікту паслужыла тое, што ў ліпені 2008 г. У.Губскі падаў заяўку на пікет за вяртаньне вуліцам Полацку гістарычных назваў. Ідэолаг прадпрыемства С.Капітан і начальнік цепласетак А.Макарэвіч тады настойвалі, каб У.Губскі забраў заяўку на пікет, але ён не пагадзіўся.

Асабліва балюча дыскрымінацыя па палітычных матывах б'е па палітычных і грамадзкіх актывістах у рэгіёнах, па жыхарах невялікіх населеных пунктаў, дзе мясцовыя выканаўчыя ўлады кантралююць усе дзяржаўныя прадпрыемствы і ствараюць для палітычных апанентаў невыносныя ўмовы існаваньня. Перасьледуючы грамадзкіх актывістаў праз суд, пракуратуру, ваенкамат, міліцыю, не даючы ім магчымасьць уладкавацца на працу, маргіналізуючы іх, мясцовыя выканаўчыя ўлады па ўказцы зьверху зьдзяйсьняюць кантроль за грамадзка-палітычнай сітуацыяй у рэгіёнах.

Больш за год старшыня Гарадоцкай раённай арганізацыі Партыі БНФ Леанід Аўтухоў ня мог знайсьці працу (ён быў звольнены ў 2008 годзе за ўдзел у парламенцкіх выбарах). Электрык-механік па сьпецыяльнасьці, праз цэнтр занятасьці ён спрабаваў уладкавацца ў тыя прадпрыемствы, дзе патрэбны электрыкі, аднак калі сьпецыяліст зьвяртаўся да прадпрыемстваў, якія падавалі заяўкі, вакансіі зьнікалі. Так, у лютым у апошнюю хвіліну ня стала вольнага месца электрыка на прадпрыемстве па раззбраеньні авіябоезапасаў, а ў красавіку — у раённай бальніцы. Безвыходная сітуацыя прывяла да таго, што 30 чэрвеня Л.Аўтухоў і Аляксандр Жыткевіч (сябра Партыі БНФ, былы фельдшар-стаматолаг, у якога ўзьніклі праблемы на працы пасьля таго, як быў падчас парламенцкіх выбараў назіральнікам; атрымаў чатыры адмовы ва ўладкаваньні на працу ў сельгаспрадпрыемства, хаця быў згодны на самую нізкааплочваемую пасаду) абвясьцілі галадоўку.

Улетку не працягнулі працоўны кантракт з сябрам Партыі БНФ з Кобрыну Аляксандрам Страчуком. Падставаю стала ягоная адмова ўступіць у праўладную няўрадавую арганізацыю «Белая Русь». Па словах А.Страчука, «калі кіраўнік майго аддзелу давала заявы, яна сказала, што ўступаць у «Белую Русь» трэба абавязкова, ледзь не пад пагрозаю звальненьня. Я адразу заявіў, што ўступаць ня буду, бо гэта пярэчыць маім палітычным поглядам». А.Страчук вярнуў кіраўніцы пустыя бланкі, неўзабаве яму паведамілі, што кантракт з ім працягнуты ня будзе.

З грамадзкім актывістам з Мазыра Паўлам Наздрой, назіральнікам на парламенцкіх выбарах 2008 году, педагагічны ўнівэрсітэт не працягнуў кантракт. Пасьля таго, як ён уладкаўваўся на працу

на іншае прадпрыемства, па пазове ваенкамату суд узбудзіў супраць яго адміністрацыйную справу на падставе таго, што ён не паведаміў пра сваё новае месца працы. «Вайсковы пракурор, які прыяжджаў правяраць ваенкамат, пры мне сказаў: ты проста патрапіў у поле зроку, і гэта вынік тваёй грамадзкай дзейнасьці», — адзначыў П. Наздра.

У Магілёве быў пазбаўлены працы сябра Беларускай сацыялдэмакратычнай партыі (Грамада) Ігар Барысаў. Кіраўніцтва ТАА «Служба камплектацыі трубаправодаў» прычынай звальненьня назвала тое, што ён нібыта не спраўляецца са сваімі абавязкамі. Гэта ўжо ня першае звальненьне І.Барысава: у У 2006 годзе яго звольнілі з заводу «Магілёўліфтмаш» за ўдзел у мітынгу пратэсту.

Актывіст руху «За свабоду» і ствараемай Партыі Беларуская хрысьціянская дэмакратыя (БХД) Аляксей Александровіч з Чашнікаў доўгі час ня можа ўладкавацца на працу. Ён выдае незалежную газету, утрымлівае незалежны гарадзкі сайт, і, па ягоных словах, «усе спробы ўладкавацца на працу сканчаюцца тым, што мне нават не дазваляюць зайсьці на тэрыторыю прадпрыемства. Адміністрацыя гораду баіцца, што я іду на працу, каб «баламуціць народ».

Асабліва масава перасьледаваліся за свае палітычныя перакананьні ў 2009 годзе стваральнікі Партыі БХД. На працягу году актывісты партыі рабілі некалькі спробаў рэгістрацыі, і кожны раз яны суправаджаліся масавымі праверкамі заяўнікаў з боку мясцовых органаў улады і беспрэцэдэнтным ціскам па месцы працы. Напярэдадні ўстаноўчага зьезду ў лютым каардынатару БХД у гарадзкім пасёлку Бешанковічы Георгію Станкевічу адміністрацыя школы, у якой ён працуе, паведаміла, што ў выпадку ягонай прысутнасьці на зьезьдзе ён будзе звольнены са школы. Пасьля ўстаноўчага зьезду ў ягоных удзельнікаў са Сьветлагорску зьявіліся праблемы на працы. Так, 2 сакавіка Вадзіму Беламу, які працуе грузчыкам, прапанавалі звольніцца «па ўласным жаданьні», а Аляксею Жасана, які працуе электрыкам, прыгразілі звальненьнем з працы. У абодвух актывістаў раней не было ніякіх праблемаў з адміністрацыямі прадпрыемстваў. Па словах сустаршыні Партыі БХД П.Севярынца, «праз паўтара-два месяцы пасьля правядзеньня ўстаноўчага зьезду партыі, які адбыўся 28 лютага, заснавальнікаў партыі выклікалі ў Мінюст, у мясцовыя выканкамы, у ідэалагічныя аддзелы, запалохваючы іх звальненьнем з працы ці выключэньнем з навучальных





установаў». Сустаршыня аргкамітэту па стварэньні Партыі БХД Аляксей Шэін паведаміў: «Актывістаў БХД запалохвалі, ставілі перад жосткім выбарам: ці подпіс у якасьці заснавальніка партыі, ці праца. Адной жанчыне нават пагражалі забраць прыёмных дзяцей. Перасьлед ішоў з боку супрацоўнікаў КДБ, органаў унутраных справаў, ідэалагічных супрацоўнікаў райвыканкамаў». У чэрвені з Сяргеем Трыфанавым, адным з заснавальнікаў Партыі БХД, доктарам гомельскай абласной псіхіятрычнай бальніцы, ня быў працягнуты працоўны кантракт. «З размовы з галоўным доктарам В.Маторанкам я зразумеў, што на яго аказвалі ціск, спрабуючы дабіцца майго звальненьня», — паведаміў актывіст. Па падліках кіраўніцтва БХД, перасьледу падверглiся больш за 500 актывістаў партыі. Па выніках некалькіх фактаў дыскрымінацыі за палітычныя погляды былі пададзеныя скаргі ў пракуратуру, а таксама ў Генеральную пракуратуру на масавы перасьлед сяброў партыі. Па ўсіх скаргах пракуратура «не знайшла» якіх-небудзь парушэньняў з боку выканаўчых уладаў і кіраўнікоў прадпрыемстваў.

Пасьля таго, 31 кастрычніка адбыўся паўторны ўстаноўчы зьезд Партыі БХД, ізноў хваля перасьледу пракацілася па яе заснавальніках. Як паведаміў адзін з сустаршыняў партыі В.Рымашэўскі, працаўніцы Бабруйскага мясакамбінату Тамары Фёдаравай пагражалі звальненьнем з працы. Алене Чужак, якая жыве ў доме, прадастаўленым дзяржавай, прыгразілі высяленьнем з жытла, калі яна не адмовіцца ад подпісу заснавальніцы. У Пінску, Брэсьце, Бабруйску з заснавальнікамі партыі размаўлялі супрацоўнікі КДБ і патрабавалі адазваць подпісы са сьпісу заснавальнікаў. Па гэтых фактах сустаршыні БХД П.Севярынец і В.Рымашэўскі падалі заяву ў Генеральную пракуратуру, аднак адтуль яна была перанакіраваная ў Мінюст, на які, уласна, скарга і падавалася. Па словах А.Шэіна, арганізатары партыі зафіксавалі больш за 30 выпадкаў ціску на людзей, якія паставілі свае подпісы пад устаноўчымі дакументамі. «Гэта масавая кампанія. З розных прычынаў заснавальнікаў выклікаюць па месцы працы і патрабуюць адмовіцца ад сваіх подпісаў, пагражаючы звальненьнем. Калі не атрымліваецца гэта зрабіць на працы ці па месцы вучобы, заснавальнікаў БХД выклікаюць у выканкамы, праводзяць гутаркі з удзелам ідэалагічных супрацоўнікаў і працаўнікоў сьпецслужбаў, бяруць з іх тлумачэньні па факце подпісаў у якасьці заснавальнікаў БХД, пагражаюць сур'ёзнымі непрыемнасьцямі», — паведаміў А.Шэін. У выніку пяць асобаў напісалі

заявы аб адкліканьні сваіх подпісаў пад заснавальнымі дакументамі БХД. Адна з заснавальніц БХД з Баранавічаў Галіна Ярашэвіч распавяла: «Я працавала ў адной з медыцынскіх установаў. Кіраўніцтва было задаволена маёй працай і са мной ужо працягнулі кантракт на наступны год. Аднак, як толькі стала вядома, што я падпісалася пад дакументамі аб стварэньні БХД, быў сабраны агульны сход кіраўніцтва ўстановы, на якім мяне «кляймілі ганьбаю», як у сталінскія часы… Мяне звольнілі яшчэ да сканчэньня кантракту, пры гэтым было наўпрост заяўлена, што я «была заўважаная ў апазіцыйных колах».

Падобная сітуацыя ўціску была ў дачыненьні да заснавальнікаў Беларускай партыі працоўных, устаноўчы сход якой адбыўся 26 ліпеня. Абраны старшыня партыі Аляксандр Бухвостаў адзначыў: «На заснавальнікаў партыі аказваецца ціск. Мінюст дзейнічае сваім звычайным спосабам, з дапамогай мясцовых адміністрацыяў і аддзелаў унутраных справаў, правяраючы абставіны правядзеньня ўстаноўчага зьезду. Гэтыя праверкі маюць форму псіхалагічнага ціску з патрабаваньнем адмовіцца ад удзелу ў стварэньні партыі».

Перасьледу падвяргаліся сябры незарэгістраванай моладзевай арганізацыі «Малады Фронт». Пасьля ўдзелу ў акцыі 14 лютага непаўнагадовай Алене Палішчук тэлефанавала супрацоўніца Камітэту адукацыі і папярэдзіла яе, што яна будзе праводзіць праверку па факце яе ўдзелу ў акцыі і зробіць на яе запыт у школу. Бацькам Яраслава Лыскаўца, які таксама браў удзел у моладзевай акцыі, тэлефанавалі з аддзелу адукацыі і параілі заняцца выхаваньнем сына, а таксама паведамілі, што зараз за ягонымі паводзінамі будзе назіраць адміністрацыя школы. Марыі Мароз прыгразілі выключэньнем са школы за «ганебныя паводзіны».

28 траўня ў Баранавічах быў выключаны з фінансава-прававога факультэту мясцовага ўніверсітэту «за парушэньне ўнутранай дысцыпліны» актывіст «Маладога Фронту» Пётр Рузаў. «З пачатку году ўніверсітэт неаднаразова наведвалі супрацоўнікі КДБ і міліцыі, якія пагражалі адлічэньнем за грамадзкую дзейнасьць. Суд за графіці, відаць, стаў апошняй кропляй», — адзначаў П.Рузаў. Анак у выніку рэзанансу ў СМІ літаральна назаўтра студэнт быў адноўлены ва ўніверсітэце. «Рэктар быў незадаволены тым, што гэты выпадак асьвятлялі СМІ, журналісты тэлефанавалі ў дэканат і г.д. Ён сказаў, што я дыскрэдытую і прыніжаю ўніверсітэт», — сказаў П.Рузаў.





Адным з найбольш гучных стаў выпадак, калі за ўдзел у Форуме грамадзянскай супольнасьці праграмы «Усходняе партнёрства», які адбыўся ў Брусэлі 16-17 лістапада, з юрыдычнага факультэту Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэту была адлічаная пасьпяховая студэнтка Тацяна Шапуцька, прэс-сакратар «Маладога Фронту». На ўдзел беларускіх студэнтаў у міжнародных мерапрыемствах патрэбны дазвол Міністэрства адукацыі, якога студэнтка ня мела, таму яе адлічылі «за парушэньне правілаў унутранага распарадку». Як паведаміла Т.Шапуцька, «напярэдадні майго адлічэньня намесьнік дэкана казаў, што мной зацікавіліся адпаведныя дзяржаўныя структуры». Кіраўнік прадстаўніцтва Еўракамісіі ў Беларусі і Украіне Жозэ Мануэль Пінту Тэйшэйра 15 сьнежня заявіў, што на паседжаньні міністраў замежных справаў ЕС па праграме «Усходняга партнёрства» да гэтага выпадку была прыцягнутая ўвага: «Мы ўпэўненыя, што гэтыя факты будуць узятыя пад увагу пры разгледжаньні структурамі Еўрасаюзу сітуацыі ў Беларусі». 17 сьнежня парламент ЕС прыняў рэзалюцыю, у якой заклікаў беларускія ўлады «гарантаваць палітычныя правы і свабоды шляхам спыненьня практыкі палітычна матываваных актаў перасьледу, асабліва шляхам звальненьняў з працы і адлічэньняў з навучальных установаў».

### *— па моўнай прыкмеце*

Палітыка абмежаваньня выкарыстаньня беларускай мовы ў розных сьферах грамадзкага, культурнага жыцьця, у адукацыі мела яўны дзяржаўны характар. Міністэрства адукацыі, па словах старшыні Таварыства беларускай мовы Алега Трусава, толькі праз пяць месяцаў пасьля пачатку навучальнага году, пасьля неаднаразовых зваротаў грамадзкіх актывістаў прадставіла статыстыку па беларускамоўным навучаньні ў краіне. «Гэта, магчыма, зьвязана з тым, што статыстыка, якую яны нам прадставілі, вельмі трывожная. Працэсы зьмяншэньня колькасьці дзяцей, якія навучаюцца па-беларуску, зараз паскорыліся нашмат хутчэй, чым у папярэднія гады. Было па поўпрацэнта за год, а зараз — амаль два працэнты. Спад вельмі вялікі і найвялікшы ён у гарадах». У краіне навучаюцца 18,4 % дзяцей у беларускамоўных школах (у мінулым годзе — 20,9%), у 2008-2009 навучальным годзе ў першыя беларускамоўныя класы пайшлі толькі 16,7% дзяцей, а ў гарадах

гэты працэнт складае ўсяго толькі 1,9%. «У перспектыве, калі нічога ня зьменіцца, гэта поўнае выміраньне навучаньня», — адзначае А.Трусаў.

У красавіку старшыня ТБМ Алег Трусаў ад імя арганізацыі зьвярнуўся да кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта У.Макея с просьбаю стварыць беларускамоўны дзяржаўны тэлеканал, абгрунтоўваючы гэта тым, што ягоная адсутнасьць пазбаўляе беларускамоўных грамадзянаў цэльнай інфармацыйнай прасторы. Гэты зварот быў пераадрасаваны ў Міністрэства інфармацыі, адкуль 24 красавіка прыйшоў адказ. Міністр У.Русакевіч паведаміў, што ў краіне існуюць пяць агульнанацыянальных каналаў, кожны з якіх «мае сваю адрозную ад іншых канцэпцыю вяшчаньня і глядацкую аўдыторыю». Стварэньне новага каналу на базе аднаго з дзеючых «непазьбежна прывядзе да зьменаў на інфармацыйным полі краіны, а таксама стане прычынаю немалых фінансавых выдаткаў».

У 2009 годзе таксама зьявілася статыстыка па наклады кніг, выдадзеных на беларускай мове ў 2008 годзе. У параўнаньні з 2007 годам, колькасьць беларускамоўных кніг зьменшылася на 7%. Беларускамоўныя кнігі складаюць 5,5% ад агульнай колькасьці выдадзеных у 2008 годзе ў Беларусі.

У студзені ў Пінску ўсе шыльды з назвамі вуліцаў на беларускай мове былі замененыя на рускія. У Баранавічах праваабаронца Сяргей Гоўша доўгі час ня мог атрымаць дакументы на зямельны ўчастак на беларускай мове. Толькі пасьля некалькіх скаргаў у вышэйстаячыя органы праектны інстытут «Брэстгіпразем» урэшце выдаў яму дакументы на зямлю, афармленыя па-беларуску.

21 лютага ў Гомелі былі арыштаваныя ўдзельнікі акцыі, праведзенай у Міжнародны дзень роднай мовы. Пяцёра дэманстрантаў выйшлі на галоўную вуліцу гораду, каб прайсьці да помніку беларускаму асьветніку Кірылу Тураўскаму і ўскласьці да яго кветкі. Апрача гвазьдзікоў у руках яны трымалі аркушы паперы з надпісамі «Родная мова» з штампам па-руску: «Запрещено», а раты ў іх былі завязаныя чырвона-зялёнымі стужкамі. Удзельнікі акцыі і два журналісты былі затрыманыя людзьмі ў штацкім і завезеныя ў аддзяленне міліцыі, дзе на ўсіх, уключаючы журналістаў, былі складзеныя пратаколы за «парушэньне парадку правядзеньня вулічных акцыяў» паводле ч.1, артыкулу 23.34 КаАП. Актывіста Кастуся Жукоўскага суд пакараў 7 суткамі арышту, астатнім удзельнікам акцыі і журналістам былі прысуджаныя буйныя штрафы.





Асобная праблема ўзьнікла ў палітычных беларускамоўных прызыўнікоў у войска Зьміцера Федарука і Франака Вячоркі. Нягледзячы на тое, што беларуская мова зьяўляецца адной з дзьвюх дзяржаўных моваў, вольнае карыстаньне якой замацавана ў артыкуле 17 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, у войску фактычна не было практыкі яе ўжываньня ў паўсядзённым жыцьці. Разам з тым, згодна з артыкулам 20 Закону «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь», «ва Ўзброеных сілах, іншых вайсковых фармаваньнях Рэспублікі Беларусь ужываюцца беларуская і (ці) руская мова». Беларускамоўныя моладзевыя актывісты пасьлядоўна пачалі адстойваць свае права на карыстаньне роднай мовай. Гэта выклікала спробы іхняй дыскрымінацыі па моўнай прыкмеце.

У траўні быў абсьледаваны наконт прыдатнасьці да вайсковай службы Дз.Федарук: «Самы першы лекар, які правяраў маю прыдатнасьць да службы ў войску, быў псіхіятар, палкоўнік медычнай службы. Размаўлялі з ім: я па-беларуску, ён па-руску. Раптам у яго зьмяніўся настрой. Ён амаль пачаў крычаць на мяне, што я яго не паважаю, бо ён палкоўнік, а я толькі шараговы, што ён размаўляе са мной па-руску, а я нібыта зьдзекуюся з яго, размаўляючы па-беларуску… Пагражаў мне, што напіша заключэньне, што я дэбіл, бо ня змог вывучыць рускую мову». У чэрвені Дз.Федарук паведаміў, што на яго ціснуць з-за таго, што ён аддае каманды, заступаючы ў нарады, па-беларуску. Афіцэры тлумачылі, што гэта не стасуецца са статутам, і пагражалі перадаць справу ў пракуратуру.

Яшчэ больш трывожная сітуацыя склалася па месцы службы былога старшыні Моладзі БНФ Ф.Вячоркі. У ліпені, па словах ягонага бацькі Вінцука Вячоркі, «вайсковы псіхолаг часткі, ён жа штатны дазнавальнік, старэйшы лейтэнант Дзяніс Казак пачаў патрабаваць ад Франака дубляваць каманды і адказваць на іх па-расейску… Пры гэтым і ён, і прапаршчык Піскун, ды іншыя прапаршчыкі пачалі ўжываць у дачыненьні да нашай мовы розныя абразьлівыя азначэньні: «говори нормально», «говори на нормальном языке». Прэтэнзіі наконт беларускамоўнасьці да Франака кіраўніцтва вайсковай часткі фармулявала ў форме загадаў. Яму загадвалі адказваць па-руску і ўжываць русізмы, а старэйшы лейтэнант Казак пры падтрымцы намесьніка камандзіра часткі па ідэалогіі Уладзіміра Ігнаціка пагражаў Франаку крымінальным перасьледам за нібыта непадпарадкаваньне і невыкананьне загадаў. У выніку канфлікту Ф.Вячорку вынесьлі дысцыплінарнае спагнаньне і скарацілі тэрмін

абавязковага адпачынку. Ф.Вячорка напісаў заяву ў пракуратуру на дзеяньні афіцэраў, якія забаранялі яму аддаваць каманды па-беларуску, але праверка з міжгарнізоннай і рэспубліканскай вайсковай пракуратуры такіх фактаў «не ўстанавіла», але ціск на актывіста з нагоды ўжываньня беларускай мовы спыніўся.

З нагоды дыскрымінацыі ў войску па моўнай прыкмеце Праваабарончым цэнтрам «Вясна» была прынятая адкрытая заява да Генеральнага пракурора і міністра абароны краіны з патрабаваньнем «спыніць незаконны перасьлед і ціск на ваеннаслужачага Ф. Вячорку ды іншых беларускамоўных служачых ў сувязі з выкарыстаньнем імі  беларускай мовы пры праходжаньні  вайсковай службы». Праваабаронцы зьвярнулі ўвагу міністра абароны краіны на тое, што за 18 гадоў незалежнасьці Беларусі ў беларускім войску не зьявіўся ніводзін пераклад статутаў ды іншых дакументаў на беларускую мову, а міністэрства абароны фактычна ігнаруе існаваньне другой дзяржаўнай мовы ў краіне.

5

Гарадзкія ўлады г.Жодзіна рашэньнем №928 ад 23.06.2009 г. спынілі існаваньне беларускага класу ў гімназіі №1, спаслаўшыся на недахоп матэрыяльных сродкаў. У выніку вучань гэтага класу Янка Лапіцкі аказаўся пазбаўленым магчымасьці працягваць навучаньне па-беларуску. У 2009 годзе Я.Лапіцкі правучыўся ў гімназіі крыху больш за тыдзень, пакуль дырэктар гімназіі Генадзь Каршун са спасылкаю на ананімны званок з Менску не забараніў Янку Лапіцкаму зьяўляцца ў гімназіі. Раённы аддзел адукацыі г.Жодзіна прапанаваў бацькам школьніка наступныя варыянты навучаньня іхняга сына па-беларуску: перавод у вясковую беларускую школу ці індывідуальна-самастойнае навучаньне з наступнай здачаю іспытаў. Бацькі А.Лапіцкага настойвалі на працягу беларускамоўнага навучаньня свайго сына ў гімназіі.

У верасьні моладзевая арганізацыя «Малады Фронт» распачала кампанію «За беларускую мову», мэта якой — прыцягнуць увагу грамадзтва да дыскрымінацыі беларускай мовы, збор 50 тысячаў подпісаў і перадача іх у органы ўлады з прапановаю падтрымліваць беларускамоўнае навучаньне ў школах і стварэньне хаця б аднаго беларускамоўнага ўніверсітэту. У розных месцах краіны актывісты кампаніі натыкнуліся на супраціў міліцыі ды іншых органаў улады. Так, у кастрычніку ў Баранавічах падчас збору подпісаў супрацоўнікі міліцыі затрымалі моладзевых актывістаў Яраслава Грышчэню і Алеся Паўлоўскага. «Супрацоўнікі праваахоўных органаў затрымалі нас за тое, што ў нас не было дазволу на збор подпісаў. Аднак у міліцыі нам прыпісалі нецэнзурную лаянку і склалі пратакол па адміністратыцыйным артыкуле за «дробнае хуліганства», — адзначыў Я.Грышчэня. Суд Цэнтральнага раёну Баранавічаў аштрафаваў Я.Грышчэню і А.Паўлоўскага на 10 базавых велічыняў кожнага, прычым асуджаным не былі вернутыя бланкі з трыма сотнямі подпісаў. Падчас збору подпісаў міліцыяй затрымліваліся актывісты ў Менску і Карэлічах. А ў Баранавічах 22 кастрычніка маладафронтаўцы Максім Ахрыменка і Юры Багдановіч падчас збору подпісаў былі зьбітыя невядомымі ў штацкім на вачах у нарада патрульна-паставой службы, які нічога не зрабіў для іх затрыманьня.





На пачатку верасьня Менскі гарвыканкам забараніў моладзеваму актывісту Ігару Чапігу правядзеньне пікету пад лозунгам «Беларускім дзецям — беларускую школу!» Хаця пікет і замаўляўся на выдзеленым уладамі Менску для гэтага месцы — плошчы Бангалор, аднак намесьнік старшыні Менгарвыканкаму Міхаіл Ціцянкоў адказаў заяўляльніку, што правядзеньне пікету як быццам бы будзе перашкаджаць транспартнаму руху на прылеглых вуліцах.

5

***— па нацыянальнай прыкмеце***

У 2009 годзе засталася неўрэгуляванай праблема стасункаў беларускіх уладаў з часткай актывістаў польскай меншасьці, якая не пагадзілася ўдзельнічаць у створаным пад кантролем беларускіх уладаў у 2005 годзе «Саюзе палякаў на Беларусі» (СПБ) і працягвала працаваць ў непрызнанай уладамі арганізацыі. Акрамя праблемы легальнага існаваньня арганізацыі, актывісты польскай нацыянальнай меншасьці вылучаюць наступныя: скарачэньне магчымасьцяў вывучаць у школах польскую мову як прадмет — пад ціскам мясцовай адміністрацыі польская мова пераводзіцца на факультатыўнае вывучэньне, што значна зьмяншае колькасьць ахвочых яе вывучаць; абмежаванае права на распаўсюд інфармацыі на польскай мове, бо амаль усе польскамоўныя выданьні ў Беларусі з-за складанасьцяў у рэгістрацыі яе ня маюць. Увосень пад падатковыя праверкі падпалі настаўнікі польскай мовы на Гарадзеншчыне. Анжаліка Арэхва, намесьнік старшыні непрызнанага ўладамі «Саюзу палякаў на Беларусі», паведаміла, што настаўнікаў польскай мовы падаткавая інспекцыя выклікае на гутаркі і

цікавіцца, ці атрымлівалі яны грошы з Польшчы, ці супрацоўнічалі з гродзенскай фірмай «Палоніка», якой кіруе старшыня непрызнанага СПБ Анжаліка Борыс, ці ўдзельнічалі ў метадычных семінарах, арганізаваных не беларускімі ўладамі.

Вялікі ціск адчулі на сабе прадстаўнікі польскай меншасьці, прыхільнікі і актывісты непрызнанага Саюзу падчас падрыхтоўкі да зьезду арганізацыі, запланаванага на 14-15 сакавіка: актывістаў СПБ выклікалі ў КДБ, міліцыю ці пракуратуру і пагражалі крымінальным перасьледам, каб прымусіць іх адмовіцца ўдзельнічаць у працы зьезду. Як паведаміў адзін з сяброў СПБ Станіслаў Муліца, да яго ў бальніцу прыходзіў супрацоўнік КДБ і распытваўся, ці зьбіраецца ён браць удзел у мяркуемым зьезьдзе. Ягонага сына Вітольда супрацоўнікі КДБ спрабавалі завербаваць, а калі той адмовіўся, пачалі запалохваць. Як сьведчылі сябры СПБ са Шчучыну, намесьнік старшыні райвыканкаму Іван Сакалоўскі папярэдзіў удзельнікаў зьезду, што яны будуць арыштаваныя, калі паспрабуюць паехаць у Гародню ў дзень правядзеньня зьезду. Устурбаваныя ўлады Польшчы зьвярнуліся да беларускага боку, спрабуючы паўплываць на сітуацыю. Як паведаміў у інтэрвію часопісу Wprost намесьнік міністра замежных спраў Польшчы Ян Баркоўскі, адносіны афіцыйнага Менску да зьезду «будуць мець уплыў і на нашую пазіцыю ў Беларусі на форуме Еўрасаюзу». Намесьнік старшыні камітэту па замежных справах польскага сейму Роберт Тышкевіч, дэпутат з Беластоку, заявіў, што «мірнае правядзеньне зьезду СПБ і спыненьне рэпрэсій супраць ягоных актывістаў павіннае стаць адной з умоваў для наступнага дыялогу з Менскам». Напярэдадні зьезду 13 сакавіка з лідэрамі непрызнанага СПБ, старшынёй Анжалікай Борыс і Анджэем Пачобутам сустрэўся прэзідэнт Польшчы Лех Качыньскі.

Зьезд адбыўся, і 165 дэлегатаў зноў абралі старшынёй непрызнанага СПБ Анжаліку Борыс. Удзельнікі зьезду прынялі зварот да А.Лукашэнкі з прапановаю наладзіць дыялог паміж непрызнаным «Саюзам палякаў на Беларусі» і дзяржаўнымі структурамі, якія могуць садзейнічаць рэгістрацыі арганізацыі. Адміністрацыя прэзідэнта вярнула гэты зварот з каментарам начальніка галоўнага ўпраўленьня па працы са зваротамі грамадзянаў і грамадзкіх аб’яднаньняў Ігара Букі, у якім было сказана, што афіцыйным Саюзам палякаў кіруе Юзэф Лучнік, а ўсе астатнія прысвойваюць сабе права гаварыць ад імя арганізацыі. І. Бука адзначыў, што зварот незарэгістраванай арганізацыі, падпісаны чалавекам, які надаў сабе статус яе кіраўніка, нават ня будзе разглядацца.





Пасьля зьезду першы канал беларускага дзяржаўнага тэлебачаньня выпусьціў тэлесюжэт, на які СПБ падаў у Генеральную пракуратуру Беларусі скаргу. У звароце да Генеральнага пракурора Р.Васілевіча было сказана:«У гэтым матэрыяле ўтрымліваюцца зьвесткі, якія ня толькі абражаюць гонар і годнасьць сяброў нашай арганізацыі, але таксама скіраваныя на распальваньне нацыянальнай варожасьці. У прыватнасьці, аўтары сьцьвярджаюць, што на зьездзе нашай арганізацыі было абвешчана, што «палякі — гэта вышэйшая раса». Тым часам на зьезьдзе падобнага выказваньня не было, таму распаўсюджаная дзяржаўным тэлебачаньнем інфармацыя не адпавядае рэчаіснасьці. Мэта гэтай хлусьлівай інфармацыі — пераканаць прадстаўнікоў іншых нацыянальнасьцяў, якія жывуць у Беларусі, у тым, што палякі лічаць сябе лепшымі за іх і такім чынам выклікаць у іх варожасьць у дачыненьні да польскай нацыянальнай меншасьці». У чэрвені падпісанта гэтай скаргі А.Пачобута выклікалі ў Гродзенскую абласную пракуратуру і афіцыйна папярэдзілі пра недапушчальнасьць парушэньня заканадаўства, у прыватнасьці, што ён ня мае права прадстаўляцца старшынём галоўнай Рады СПБ, а таксама карыстацца сімволікай СПБ. «Генеральная пракуратура не захацела разглядаць нашую скаргу, яе не цікавіць тое, што беларускае дзяржаўнае тэлебачаньне распальвае міжнацыянальную варажнечу, яе цікавіць наш Саюз палякаў і тое, што мы нелегальныя», — пракаментаваў сітуацыю А.Пачобут.

У жніўні Ленінскі раённы аддзел міліцыі ў Гародні праводзіў праверку па факце ананімнага ліста, у якім сьцьвярджалася, па словах А.Борыс, што яна «зьяўляецца нацыяналісткай, супрацоўнічае з нацыянальна настроенымі беларускімі партыямі, прадастаўляе ім памяшканьне, дазваляе нейкія фінансавыя парушэньні». У А.Борыс міліцыяй з гэтае нагоды былі ўзятыя тлумачэньні.

У кастрычніку ўзмацніўся ціск на старшыню СПБ у г. п. Івянец Тэрэзу Собаль. Яе наведалі прадстаўнікі мясцовых уладаў і прапанавалі далучыцца да праўладнага саюзу палякаў, удзельнічаць у ягоным верасьнёўскім зьезьдзе. Калі яна адмовілася, ён прыгразілі непрыемнасьцямі, зьвязанымі з дзейнасьцю Польскага дому ў Івянцы, кіраўніком якога яна зьяўляецца. Урэшце супрацоўнікі камітэту дзяржаўнага кантролю канфіскавалі дакументы Польскага дому ў Івянцы з мэтаю праверкі ягонай дзейнасьці, а сяброў арганізацыі

пачалі выклікаць на допыты ў дзяржкантроль. Т.Собаль неаднаразова выклікалі ў дэпартамент фінансавых расьсьледаваньняў, абвінавачваючы ў фінансавых парушэньнях, зьвязаных з дзейнасьцю Польскага Дому ў Івянцы.

У рэзалюцыі, прынятай парламентам ЕС 17 сьнежня 2009 году, беларускія ўлады былі закліканыя «паважаць правы нацыянальных меншасьцяў… прызнаць Саюз палякаў у Беларусі на чале з Анжалікай Борыс, якая была перавыбраная Кангрэсам палякаў на пост старшыні 15 сакавіка 2009 году».

Пра праблемы расізму і ксенафобіі ў адносінах да яўрэйскай нацыянальнай меншасьці ў 2009 годзе выказваўся дырэктар Бюро па правах чалавека і выкананьні законнасьці ў краінах былога СССР Аб'яднаньня камітэтаў у абарону яўрэяў у былым СССР Леанід Стонаў. На пачатку жніўня ён знаходзіўся ў Беларусі з мэтаю зарэгістраваць прадстаўніцтва Аб'яднаньня. Ён адзначыў, што «у Беларусі да гэтага часу адсутнічае дзржаўная канцэпцыя па разьвіцьці і ўзаемадзяньні этнасаў, па падтрымцы нацыянальных і рэлігійных меншасьцяў, што стварае небясьпеку іхняй поўнай асіміляцыі. Напрыклад, у Беларусі няма ніводнай фінансуемай дзяржаваю яўрэйскай агульнаадукацыйнай школы, газеты, культурнай установы (тэатру, клубу, музею), радыё- і тэлепраграмы». Л.Стонаў адзначыў, што «праваабаронцамі зарэгістравана мноства злачынстваў, якія маюць характар вандалізму (нацысцкія графіці на яўрэйскіх помніках і памятных знаках, разбурэньне могілак, будаўніцтва «на костках», адзначаецца разгул антысемітызму ды іншых відаў ксенафобіі ў інтэрнэце, імпарт неанацысцкай літаратуры з Расіі, «гастролі» расійскіх скінхэдаў, асабліва ў Віцебску і Магілёве. Адпаведная рэакцыя ўладаў на гэтыя факты пакуль што не наступіла». Таксама Л.Стонаў заявіў, што «ў шэрагу гарадоў (Менску, Барысаве, Брэсьце, Магілёве) востра стаіць пытаньне пра вяртаньне яўрэйскім рэлігійным і сьвецкім арганізацыям грамадзкіх будынкаў, якія належалі яўрэям да кастрычніка 1917 году». Таксама ён адзначыў, што некаторыя беларускія чыноўнікі «савецкага ўзору», працягваючы заставацца на важных пасадах, «вылучаюцца нянавісьцю да яўрэяў» і лічаць за лепшае не заўважаць фактаў праяваў антысемітызму.

Выказаныя заўвагі па прабелеме падмацоўваюцца фактамі. Так, у Віцебску 22 красавіка на сьцяне сінагогі зьявіліся антысеміцкія лозунгі і свастыка. Па словах віцебскага старшыні іўдзейскага таварыства «Дом Ізраіля» Хаіма Магаршака, гэта ўжо ня першы выпадак, і хаця ў мінулы раз праваахоўныя органы паведамілі, што знайсьці злачынцаў немагчыма, Х.Магаршак ізноў напісаў заяву ў міліцыю. У Брэсьце 9 траўня у цэнтры гораду быў апаганены помнік вязьням гета. Старшыня Брэсцкай яўрэйскай супольнасьці Барыс Брук паведаміў, што «вандалы спалілі ўсе вянкі і кветкі каля помніку, сам манумент чорны ад сажы і на ім нейкая смала». У Мазыры мясцовыя ўлады разбурылі мемарыял у выглядзе памятнага валуна і мемарыяльнага знаку ў памяць яўрэяў, якія восеньню 1941 году спалілі сябе. У 2008 годзе Беларускі рэспубліканскі навукова-метадычны савет па пытаньнях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры ўнесла месца самаспаленьня яўрэяў у Дзяржаўны сьпіс гісторыка-культурных каштоўнасьцяў і прапанавала ўладам аднавіць мемарыяльны знак і добраўпарадкаваць тэрыторыю мемарыялу, аднак гэтыя рэкамендацыі не былі выкананыя кіраўніцтвам Мазыра. Больш таго, у жніўні 2009 году пры рамонце цеплатрасы былі парушаныя магілы ахвяраў Халакосту. Па словах прэзідэнта Сусьветнай асацыяцыі беларускіх яўрэяў Якава Гутмана, «я сам бачыў перабітыя каўшом экскаватара труны, узьнятыя ім чалавечыя астанкі. Факты сьведчаць пра тое, што нацысты забівалі людзей, а сёньня ў Беларусі зьнішчаюць апошнія сьляды іх - памяці». У красавіку Я.Гутман зьвяртаўся да беларускіх уладаў са зваротам захаваць будынак яўрэйскай сінагогі ў Любані, які быў зьвязаны са знакамітымі асобамі культуры і гісторыі беларускіх яўрэяў, у прыватнасьці, вядомым рабінам XX стагодзьдзя Мошэ Файнштэйнам, у гонар якога на будынку сінагогі вісела памятная шыльда. Аднак будынак сінагогі па рашэньні мясцовых уладаў у красавіку быў разабраны.

У ліпені гісторык і грамадзкі яўрэйскі дзеяч Якаў Басін зьвярнуў ўвагу на фашыстоўскую сімволіку і антысеміцкія лозунгі на сьценах дамоў: «На вуліцах Менску і шэрагу іншых беларускіх гарадоў, у тым ліку і Гомеля, можна знайсьці выявы свастыкі і неанацысцкія надпісы пагражальнага зьместу».

9 лістапада пасол Ізраілю Эдуард Шапіра, выступаючы на міжнароднай каферэнцыі, прысьвечанай хрысьціянска-іюдэйскаму дыялогу, адзначыў, што беларуская дзяржава вярнула храмы, якія належалі хрысьціянскім супольнасьцям, але не вярнула многія будынкі сінагогаў і грамадзкія будынкі, якія некалі належалі яўрэйскім рэлігійным і грамадзкім супольнасьцям. Тое ж датычыцца дапамогі

па рэстаўрацыі гэтых будынкаў. Сярод іншых праблемаў Э.Шапіра назваў нежаданьне пракуратуры і міліцыі ўзбуджаць крымінальныя справы па артыкуле «распальваньне нацыянальнай варожасьці» «нават там, дзе гэта бачна няўзброеным вокам». Пасол прывёў прыклад калі ў Слуцку на будынку яўрэйскай супольнасьці зьявілася свастыка з антысеміцкім надпісам. «На мой погляд, гэта яркі прыклад расізму», — адзначыў пасол. Дададзім, што ў Слуцку ў ліпені на помніку ў памяць аб вязьнях гета таксама была намаляваная свастыка і іншыя надпісы антысеміцкага зьместу.

***— па рэлігійнай прыкмеце***

Працягваўся ціск з боку дзяржавы на вернікаў найперш пратэстанцкіх канфесіяў. Мела працяг гісторыя супрацьстаяньня Менгарвыканкаму і вернікаў царквы «Новае жыцьцё», якая распачалася яшчэ 2 гады таму, калі выканкам пазбавіў царкву права валоданьня зямельным участкам і культавым будынкам на яго тэрыторыі. Судовы працэс у Вышэйшым гаспадарчым судзе цягнуўся больш за год і на пачатку 2009 году суд пацьвердзіў законнасьць рашэньня Менгарвыканкаму аб адабраньні зямельнага ўчастку з наступным выкупам будынку царквы плошчаю 1700 кв.м. за 37,5 мільёнаў рублёў. Вернікі вырашылі змагацца за свой будынак, а прапановы гарадзкіх уладаў пабудаваць царкву ў іншым месцы былі адхілены з-за вялікіх коштаў новага буданіцтва і нізкай сумы кампенсацыі за існуючы будынак. У сваю чаргу ўпаўнаважаны па справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў у Беларусі Леанід Гуляка, выступаючы на прэсканферэнцыі, падтрымаў пазіцыю Менгарвыканкаму, спаслаўшыся на тое, што «будынак прадастаўляўся Менгарвыканкамам не як культавы і не для культавых мэтаў. Кіраўніцтва царквы самавольна прыстасавала гэты будынак пад храм, пад культавы будынак».

7 жніўня пастара царквы «Новае жыцьцё» Мікалая Ганчарэнку выклікалі ў пракуратуру Маскоўскага раёну і вынесьлі афіцыйнае папярэджаньне аб недапушчальнасьці парушэньня заканадаўства, якое заключалася ў тым, што 16 ліпеня ў будынак царквы не былі дапушчаныя супрацоўнікі МЧС. У адказ М.Ганчарэнка заявіў, што рашэньне пра нядопуск у будынак любых афіцыйных асобаў было прынятае не асабіста ім, а грамадою царквы ў адказ на спробы менскіх уладаў забраць будынак царквы. 13 жніўня туды ж спрабавалі ўвайсьці тры судовых выканаўцы, але яны не былі пушчаныя





ўсярэдзіну храму. Чарговы ўльтыматум менскімі ўладамі вернікам царквы быў паўстаўлены 20 жніўня — пакінуць будынак да 19 гадзінаў. У адказ вернікі наладзілі ў гэты дзень музычны марафон: музычныя калектывы з іншых пратэстанцкіх супольнасьцяў на знак салідарнасьці з вернікамі з «Новага жыцьця» выступалі на працягу 26 гадзінаў. У канцы месяца вернікі ізноў не пусьцілі ў будынак царквы супрацоўнікаў МЧС, і 9 верасьня з гэтай нагоды на пастара царквы М.Ганчарэнку ў пракуратуры Маскоўскага раёну быў складзены адміністрацыйны пратакол. 1 кастрычніка судзьдзя суда Маскоўскага раёну Менску Алена Шылько, разгледзеўшы гэты пратакол, аштрафавала пастара на 12 базавых велічыняў.

Чарговае рашэньне Вышэйшага гаспадарчага суда, вынесенае ў сьнежні па адмене судовага рашэньня аб перадачы будынку царквы гарадзкім уладам, было ізноў не на карысьць пратэстанцкай грамады. Пастар М.Ганчарэнка адзначыў: «Судовае рашэньне зьяўляецца прыкладам таго, што ў нашай краіне існуе сур'ёзная праблема са свабодай рэлігіяў. Улады перашкаджаюць рэлігійнай дзейнасьці, што датычыцца канкрэтна нашай царквы. Час ад часу зьяўляюцца праблемы і ў нашых пастыраў, якія ня могуць зарэгістраваць царкву ці пабудаваць храм. У большай ступені гэта датычыцца пратэстантаў, таму што рэлігійны закон больш закранае пратэстанцкі рух».

У жніўні Наваполацкія ўлады адмовіліся выдзеліць мясцовай супольнасьці пратэстантаў зямельны ўчастак. Пастар Антоні Бокун паведаміў: «Паколькі за апошнія 15 гадоў мясцовыя ўлады трэці раз адбіраюць у абшчыны выдзелены зямельны ўчастак, усе епіскапы Аб'яднанай царквы хрысьціян веры евангельскай у Рэспубліцы Беларусь накіравалі ліст прэзідэнту краіны з просьбай паспрыяць у вырашэньні гэтай сітуацыі. Аўтары ліста адзначаюць, што дзеяньні наваполацкіх уладаў неправамерныя, неабгрунтаваныя і істотна парушаюць правы і абароненыя законам інтарэсы вернікаў».

У Асіповічах у прыватным доме пратэстанты адзначалі Сьвята ўраджаю, калі нечакана туды прыйшлі супрацоўнікі райвыканкаму з міліцыянтамі. Пратэстанта, які ўзяў на сябе адказнасьць за арганізацыю сьвята, пакаралі штрафам. Людмілу Бацюк з Магілёву за стварэньне рэлігійнай арганізацыі суд Кастрычніцкага раёну Магілёву аштрафаваў на 140 тысяч рублёў. За пратэстанцкае набажэнства ў вёсцы Гарбачэвічы Чавускага раёну была аштрафаваная верніца Ірына Маршалкоўская-Грык, у яе была канфіскаваная рэ-

лігійная літаратура. Актывісту-пратэстанту з гораду Горкі Пятру Маланачкіну адмовілі ў рэгістрацыі пратэстанцкай грамады на той падставе, што ў іх няма ўласнага будынку, і ў той жа час ня выдзелілі тэрыторыю пад пабудову царквы. П.Маланачкіна пакаралі штрафам за тое, што пад вокнамі свайго дому ён устанавіў стэнд з рэлігійнай літаратурай, а сам стэнд быў зьнішчаны.

Верніку пратэстанцкай царквы «Новае пакаленьне» ў Менску Армену Каграманяну, які мае ў Беларусі сям'ю і від на жыхарства больш за 15 гадоў, супрацоўнікі РУУС Фрунзенскага раёну пагражалі дэпартацыяй, спрабавалі ўмяшацца ў рэлігійнае жыцьцё сям'і, распытваліся, якое ён мае дачыненьне да пратэстанцкай царквы. «У нас ёсьць праваслаўныя, каталікі і мусульмане — гэта рэлігіі. Астатнія — секты», — заявіў намесьнік начальніка Фрунзенскага РУУС па грамадзкай бясьпецы Д. Лінкус.

Такім чынам, у 2009 годзе дыскрымінацыйныя меры ў адносінах да палітычных апанентаў, носьбітаў беларускай мовы, прадстаўнікоў нацыянальных і рэлігійных меншасьцяў у Беларусі насілі сістэматычны характар і выкарыстоўваліся ўладамі як інструмент ціску на пэўныя групы грамадзянаў з мэтай іх поўнага кантролю.







# 6. Рэалізацыя свабоды асацыяцыяў

Становішча з выкананьнем свабоды асацыяцыяў у Беларусі на працягу 2009 году прынцыпова не зьмянілася; галоўныя праблемы ў стварэньні і дзейнасьці грамадзкіх аб'яднаньняў у Беларусі засталіся нязьменнымі. Была працягнутая практыка адмоваў ў рэгістрацыі грамадзкіх аб'яднаньняў і палітычных партыяў па сумнеўных падставах, у тым ліку ў сувязі з грамадзка-палітычнай пазіцыяй заснавальнікаў аб'яднаньняў. Захоўвалася забарона на дзейнасьць незарэгістраваных грамадзкіх аб'яднаньняў, фондаў, палітычных партыяў, рэлігійных арганізацыяў з крымінальным пакараньнем за такую дзейнасьць (артыкул 193-1 Крымінальнага кодэксу «Незаконныя арганізацыя дзейнасьці грамадзкага аб'яднаньня, рэлігійнай арганізацыі ці фонду альбо ўдзел у іх дзейнасьці»). Для многіх зарэгістраваных НДА і партыйных структураў праблемай засталася неабходнасьць мець юрыдычны адрас у нежылым памяшканьні (умовы для няўрадавых аб'яднаньняў і партыяў у гэтым плане горшыя ў параўнаньні з некаторымі формамі камерцыйных арганізацыяў, якія могуць рэгістравацца на прыватных кватэрах заснавальнікаў) і немагчымасьць без дазволу ўладаў арандаваць памяшканьні для правядзеньня сходаў. Па-ранейшаму складаным і неабгрунтавана абмежавальным заставаўся парадак атрыманьня замежнай бязвыплатнай дапамогі, а таксама айчыннай спонсарскай дапамогі для няўрадавых арганізацыяў.

Рэгістрацыя ў канцы 2008 і напачатку 2009 году некалькіх незалежных ад ураду НДА (асабліва Руху «За Свабоду») і мясцовых аддзяленьняў некаторых партыяў парадзілі спадзеў на лібералізацыю рэгістрацыйнай працэдуры, але гэтыя надзеі на практыцы ня спраўдзіліся.

За 2009 год было адмоўлена ў рэгістрацыі тром партыям — Партыі Беларуская Хрысьціянская Дэмакратыя (двойчы), Беларускай партыі працоўных (правапераемнік Беларускай партыі працы, ліквідаванай у 2004 годзе) і Партыі свабоды і прагрэсу (чацьвёртая адмова, пачынаючы з 2004 году). Увогуле, пачынаючы з 2000 году ў Беларусі не было зарэгістравана ніводнай палітычнай партыі.

З адмовамі сутыкнуліся і некаторыя мясцовыя аддзяленьні ўжо зарэгістраваных партыяў (напрыклад, Партыя БНФ).

Не зьмянілася практыка рэгіструючых органаў і ў адносінах да незалежных ад уладаў грамадзкіх аб'яднаньняў, і адмовы ў рэгістрацыі атрымлівалі найперш моладзевыя і праваабарончыя арганізацыі. Так, у 2009 годзе было двойчы адмоўлена ў рэгістрацыі Грамадзкаму праваабарончаму аб'яднаньню «Наша Вясна», чатыры разы — Праваабарончаму аб'яднаньню «Брэсцкая Вясна», Асамблеі няўрадавых дэмакратычных аб'яднаньняў, Маладзёжнаму грамадзкаму аб'яднаньню «Маладыя сацыял-дэмакраты», Маладзёжнаму грамадзкаму аб'яднаньню «Модэс» (Магілёў), Грамадзкаму аб'яднаньню «Маладзёжны Хрысьціянска-Сацыяльны Саюз», Грамадзкаму культурна-асьветніцкаму аб'яднаньню «Спадчына» (Гродна), Моладзеваму грамадзкаму аб'яднаньню «Новы Курс» (Менск), Культурна-асьветніцкаму грамадзкаму аб'яднаньню «Залаты Леў» (Слонім) ды іншым. У абсалютнай большасьці выпадкаў адмовы ў рэгістрацыі зьяўляліся сумнеўнымі з пункту гледжаньня права і былі відавочна абумоўленыя палітычнай воляй уладаў з мэтай не дапусьціць легальнага існаваньня гэтых НДА. Суды не задаволілі ніводнай скаргі на рашэньні Міністэрства і ўпраўленьняў юстыцыі аб адмовах у рэгістрацыі.

Падставы для адмовы ў рэгістрацыі сфармуляваныя ў заканадаўстве такім чынам, што дазваляюць дзяржаўным органам выносіць адмовы ў рэгістрацыі адвольна. На працягу 2009 году ўлады рабілі заявы аб магчымым спрашчэньні рэгістрацыі партыяў і грамадзкіх аб'яднаньняў праз унясеньне зьменаў у законы «Аб палітычных партыях» і «Аб грамадзкіх аб'яднаньнях». Дзяржаўныя медыя распаўсюдзілі інфармацыю, што такім чынам рэгістрацыя новых грамадзкіх аб'яднаньняў будзе спрошчаная, у прыватнасьці, зьнікне такая падстава для адмовы ў дзяржаўнай рэгістрацыі, як непрадстаўленьне ўсіх неабходных для яе дакументаў. Але ж аналіз прапанаваных зьменаў выклікае сур'ёзныя сумневы ў тым, што гэты закон сапраўды скіраваны на паляпшэньне сітуацыі з рэгістрацыяй новых грамадзкіх аб'яднаньняў і спрашчэньне гэтай працэдуры. Наадварот, зьмены скіраваныя на наданьне законнай формы сёньняшнім беспадстаўным адмовам у рэгістрацыі, яны значна пашыраюць пералік законных падставаў для адмоваў у рэгістрацыі: цяпер падставай для адмовы ў рэгістрацыі можа быць неадпаведнасьць статуту патрабаваньням заканадаўства ня толькі ў частцы мэтаў, задачаў, метадаў, тэрыторыі дзейнасьці, але і ў любых іншых палажэньнях статуту.



6



Прапанаваная рэдакцыя таксама фактычна пазбаўляе сэнсу паняцьце «выпраўленьне недахопаў» у пададзеных на рэгістрацыю дакументах. У цэлым агучаныя зьмены скіраваныя на прывядзеньне заканадаўства ў адпаведнасьць існуючай практыцы вынясеньня адвольных адмоваў у рэгістрацыі па нязначных падставах для тых аб'яднаньняў, легалізацыя якіх зьяўляецца непажаданай для ўладаў. Іншыя нязначныя зьмены ў законе маюць выключна тэхнічны характар, але нават яны ня могуць разглядацца як скіраваныя на спрашчэньне працэдуры рэгістрацыі. Напрыклад, ад ініцыятыўных групаў па стварэньні аб'яднаньняў прапануецца апроч статуту аб'яднаньня на паперы прадставіць і ягоную лічбавую версію. Нельга выключаць, што гэта палажэньне законапраекту можа выклікаць фактычную перарэгістрацыю існуючых аб'яднаньняў, паколькі лічбавая версія статуту імі раней не прадстаўлялася. Некаторыя з вынесеных вясной 2009 году адмоваў у рэгістрацыі фактычна ўжо адбываліся з выкарыстаньнем палажэньняў яшчэ не прынятага законапраекту. Гэта датычыцца пашырэньня падставаў для адмовы, а таксама выкарыстаньня ў дачыненьні да Партыі Беларуская Хрысьціянская Дэмакратыя працэдуры «прыпыненьня рашэньня аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі», якая не прадугледжаная дзеючай рэдакцыяй закону.

Акрамя грамадзкіх аб'яднаньняў, некаторая частка няўрадавых арганізацыяў існуе ў форме ўстановаў, на якія распаўсюджваецца парадак рэгістрацыі камерцыйных арганізацыяў, што быў уведзены на пачатку 2008 году і ўдасканалены Дэкрэтам прэзідэнта №1 ад 16 студзеня 2009 году. У 2009 годзе арганізацыйна-прававая форма ўстановы зрабілася надзвычай папулярнай сярод тых некамерцыйных арганізацыяў, якія ня могуць зарэгістравацца ў звыклых формах грамадзкага аб'яднаньня альбо фонду. У прыватнасьці, менавіта ў форме ўстановы (якая, аднак, не адносіцца па сваёй арганізацыйнай пабудове да асацыяцыяў) атрымала легальны статус маладзёжная арганізацыя «Правы Альянс» і моладзевы цэнтр «Модэс», якім да таго было адмоўлена ў рэгістрацыі, а таксама і некаторыя іншыя арганізацыі. Аднак ужо ўвосень 2009 году былі зафіксаваныя выпадкі, калі апанентам улады адмаўлялі ў рэгістрацыі і ў гэтай арганізацыйна-прававой форме (што не прадугледжана заканадаўствам і зьяўляецца грубым парушэньнем



6

устаноўленага заяўляльнага парадку рэгістрацыі). Напрыканцы 2009 году стала вядома, што па даручэньні прэзідэнта распачатая праца па падрыхтоўцы асобнага праекту закону «Аб некамерцыйных арганізацыях», які патэнцыйна можа ўскладніць рэгістрацыю і дзейнасьць тых формаў няўрадавых арганізацыяў, якія не падпадаюць пад дзеючыя на дадзены момант сьпецыяльныя нарматыўныя акты і рэгіструюцца па агульным заяўляльным прынцыпе.

У параўнаньні з папярэднімі гадамі агульная колькасьць зарэгістраваных арганізацыяў не зьмянілася. Па зьвестках Міністэрства юстыцыі, за 2009 год у краіне было зарэгістравана толькі 94 новых грамадзкіх аб’яднаньні (у тым ліку 3 міжнародныя, 16 рэспубліканскіх і 75 мясцовых) і 8 новых фондаў (сярод іх адзін міжнародны). Статыстыка сьведчыць, што органы юстыцыі штогод рэгіструюць тую колькасьць грамадзкіх аб’яднаньняў, якая дазваляе кампенсаваць іх памяншэньне ў выніку добраахвотных ліквідацыяў альбо праз прымусовую ліквідацыю судовым рашэньнем.

| | 30 кастрычніка 2003 г. | 1 студзеня 2004 г. | 1 студзеня 2005 г. | 1 студзеня 2006 г. | 1 сакавіка 2007 г. | 1 студзеня 2008 г. | 1 студзеня 2009 г. | 1 студзеня 2010 г. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Колькасьць новых зарэгістраваных грамадзкіх аб’яднаньняў (за адпаведны год) | 94 | 155 | 61 | 85 | 100 | 94 | — | 94 |
| Агульная колькасьць зарэгістраваных аб’яднаньняў (на пазначаную дату) | 2248 | 2214 | 2259 | 2247 | 2248 | 2255 | 2221 | 2225 |

Механізм падаўленьня свабоды асацыяцыяў у Беларусі і ўціску дзяржавай непадкантрольных уладзе аб’яднаньняў найбольш яскрава быў прадэманстраваны на прыкладзе адмоваў у рэгістрацыі





Грамадзкага праваабарончага аб’яднаньня «Наша Вясна». 26 студзеня 2009 году ў Міністэрства юстыцыі былі пададзеныя дакументы на рэгістрацыю аб’яднаньня, заснавальнікамі якога зьяўляліся праваабаронцы, журналісты і грамадзкія дзеячы з розных рэгіёнаў краіны, што раней уваходзілі ў Праваабарончы цэнтр «Вясна» (па рашэньні Вярхоўнага суда ПЦ «Вясна» быў ліквідаваны ў кастрычніку 2003 году). У 2007 годзе праваабаронцы ўжо спрабавалі легалізаваць сваю дзейнасьць, аднак Міністэрства юстыцыі, а затым і Вярхоўны суд адмовілі ім у рэгістрацыі, нягледзячы на прынятае Камітэтам па правах чалавека ААН рашэнне, згодна з якім факт ліквідацыі ПЦ «Вясна» быў расцэнены як парушэньне права на свабоду асацыяцыяў, і беларускім уладам было прапанавана выправіць сітуацыю.

11 сакавіка (гэта значыць, з парушэньнем устаноўленага тэрміну разгляду рэгістрацыйных дакументаў на працягу аднаго месяца) на афіцыйным сайце Міністэрства юстыцыі зьявілася інфармацыя «Аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі Грамадзкага праваабарончага аб’яднаньня «Наша Вясна». 19 сакавіка ў Вярхоўны суд была пададзена скарга на рашэньне Міністэрства юстыцыі аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі, аднак суд не прыслухаўся да аргументаў заснавальнікаў аб’яднаньня і пакінуў рашэньне аб адмове ў рэгістрацыі ў сіле. З заклікам перагледзець рашэньне па адмове ў рэгістрацыі «Нашай Вясны» да беларускіх уладаў 12 сакавіка звярнуліся Хельсінскія камітэты Швецыі, Нарвегіі, Нідэрландаў, Масквы і Беларусі. Паводле іх меркаваньня, прычыны нерэгістрацыі арганізацыі, прадстаўленыя Міністэрствам юстыцыі, зьяўляюцца неабгрунтаванымі. Таксама ў звароце было адзначана, што «стварэньне свабодных умоваў для законнай дзейнасьці праваабарончых груп засьведчыла б, што Беларусь гатовая да стварэньня прасторы для грамадзянскай супольнасьці і канкрэтных крокаў, скіраваных на паляпшэньне сітуацыі з правамі чалавека».

Паўторная на працягу 2009 году спроба заснавальнікаў аб’яднаньня «Наша Вясна» атрымаць рэгістрацыю таксама не прывяла да посьпеху. 28 траўня праваабаронцы атрымалі рашэньне Міністэрства юстыцыі аб адмове ў рэгістрацыі Грамадзкага праваабарончага аб’яднаньня «Наша Вясна». Падставамі для адмовы былі названы: прыцягненьне заснавальнікаў да адміністрацыйнай і крымінльнай адказнасьці (такая падстава для адмовы не прадугледжаная заканадаўствам) і тэхнічныя хібы ў прадстаўленых даку-

ментах (напрыклад, у спісах заснавальнікаў не ўсе асобы пазначылі стацыянарныя, а ня толькі мабільныя тэлефоны). 12 жніўня Вярхоўны суд пакінуў без задавальненьня скаргу заснавальнікаў ГПА «Наша Вясна» на адмову Міністэрства юстыцыі ў дзяржаўнай рэгістрацыі аб'яднаньня. Трэцяя спроба легалізацыі дзейнасьці на працягу апошніх двух гадоў завершылася нічым, нягледзячы на тое, што аргументы чыноўніка Міністэрства юстыцыі былі неабгрунтаванымі і надуманымі. Пасьля гэтага праваабаронцы прынялі рашэньне больш не прымаць захадаў дзеля рэгістрацыі, а зьвярнуцца ў Камітэт па правах чалавека ААН са скаргай на сістэмную дыскрымінацыю ў праве на свабоду асацыяцыяў.

Тэхнічныя прыдзіркі таксама зьяўляліся падставамі для сістэматычных адмоваў у рэгістрацыі Праваабарончага грамадзкага аб'яднаньня «Брэсцкая Вясна», якому тройчы на працягу 2009 году было адмоўлена ў рэгістрацыі ў якасьці асобнага мясцовага аб'яднаньня. Заснавальнікі «Брэсцкай Вясны» выпраўлялі недахопы, якія былі ўказаныя ў адмовах ў рэгістрацыі, але пры наступных спробах зарэгістравацца органы юстыцыі знаходзілі ўсё новыя і новыя падставы для адмоваў.

Палітычна матываванай расцанілі адмову ў рэгістрацыі ўвесну 2009 году заснавальнікі Асамблеі няўрадавых дэмакратычных аб'яднаньняў (гэта была ўжо другая адмова гэтаму саюзу грамадзкіх аб'яднаньняў). Міністэрства юстыцыі абгрунтавала сваё рашэньне аб адмове парушэньнямі парадку стварэньня асацыяцыі, нібыта дапушчанымі пры заснаваньні Асамблеі НДА. У прыватнасьці, сьцьвярджалася, што ўстаноўчая дамова зьяўляецца несапраўднай, бо кіраўнікі арганізацыяў-заснавальнікаў падпісалі яе бяз згоды кіруючых органаў гэтых грамадзкіх аб'яднаньняў. Насамрэч гэтая падстава не адпавядала рэчаіснасьці, паколькі дамова аб стварэньні Асамблеі падпісвалася кіраўнікамі арганізацыяў-заснавальнікаў толькі пасьля таго, як іх упаўнаважылі на тое сходы кожнай арганізацыі. Таксама Міністэрства палічыла, што назва арганізацыі не адпавядае патрабаваньням заканадаўства, бо ня ўтрымлівае ўказаньня на прадмет дзейнасьці яе сяброў. Заснавальнікамі Асамблеі НДА выступілі 7 грамадзкіх аб'яднаньняў, у тым ліку «Беларускі Хельсінскі камітэт», Цэнтр «Супольнасьць», БНФ «Адраджэньне», «Цэнтр па правах чалавека» і яшчэ тры грамадзкія арганізацыі з Верхнядзьвінску, Віцебску і Магілёву. 4 чэрвеня Вярхоўны суд Беларусі адмовіў у задавальненьні скаргі заснавальнікаў Асамблеі НДА да Міністэрства юстыцыі на адмову ў рэгістрацыі. У сьнежні 2009 году заснавальнікі Асамблеі правялі яшчэ адзін устаноўчы зьезд і падалі дакументы на новую рэгістрацыю ў пачатку студзеня 2010 году.





Для многіх арганізацыяў, якія сутыкнуліся з адмовамі ў рэгістрацыі, галоўнай перашкодай іх легальнаму існаваньню зьяўлялася наяўнасьць у шэрагах заснавальнікаў асобаў, якіх улады лічаць сваімі палітычнымі апанентамі. Гэтая тэндэнцыя закранула арганізацыі абсалютна розных накірункаў дзейнасьці. Так, у лістападзе галоўнае ўпраўленьне юстыцыі Гарадзенскага аблвыканкаму адмовіла ў рэгістрацыі Слонімскаму культурна-асьветніцкаму грамадзкаму аб'яднаньню «Залаты леў», заснавальнікі якога раней уваходзілі ў склад іншай няўрадавай арганізацыі — Слонімскага моладзевага аб'яднаньня «Ветразь» (некалькі год таму арганізацыя была прымусова ліквідаваная рашэньнем суда). Адзін з ініцыятараў стварэньня аб'яднаньня Алесь Масюк выказаў упэўненасьць: «Улады працягваюць палітыку нерэгістрацыі ў дачыненьні да асобаў, якіх яны залічылі ў апазіцыю. Усе недапрацоўкі статуту мы маглі б выправіць цягам дня, а нас проста вырашылі забараніць». 29 сьнежня Гарадзенскі абласны суд разгледзеў скаргу слонімскіх актывістаў да абласнога ўпраўленьня юстыцыі і пакінуў рашэньне ў сіле.

Нежаданьне ўладаў бачыць у прававым полі яшчэ адну легальную дэмакратычную арганізацыю, па меркаваньні занавальнікаў, стала падставай для адмовы ў рэгістрацыі Грамадзкага культурніцка-асьветніцкага аб'яднаньня «Спадчына» з Бярозаўкі, якому 25 чэрвеня галоўнае ўпраўленьне юстыцыі Гарадзенскага аблвыканкаму адмовіла ў дзяржаўнай рэгістрацыі. Афіцыйнай падставай было названа тое, што дакументы на рэгістрацыю нібыта не адпавядаюць дзеючаму заканадаўству. Сябры «Спадчыны» спрабавалі абскарджваць рашэньне ў судовым парадку, але і Гарадзенскі абласны суд, і Вярхоўны суд не задаволілі скаргаў.

Афіцыйная рэгістрацыя па-ранейшаму заставалася недасяжнай для незалежных моладзевых арганізацыяў. 2 ліпеня Вярхоўны суд Беларусі падтрымаў рашэньне Міністэрства юстыцыі аб адмове ў рэгістрацыі Грамадзкага аб'яднаньня «Моладзевы хрысьціянска-сацыяльны саюз «Маладыя дэмакраты». Пры гэтым сур'ёзныя падставы для адмовы ў рэгістрацыі адсутнічалі, а выяўленыя недакладнасьці ў дакументах (памылкі ў адрасах некаторых заснавальнікаў арганізацыі) можна было лёгка выправіць. 19 сакавіка рашэ-

ньем упраўленьня юстыцыі Магілёўскага аблвыканкаму было адмоўлена ў рэгістрацыі Грамадзкага аб'яднаньня «Цэнтр моладзевых ініцыятываў «Модэс». Падставай для адмовы былі названыя парушэньні заканадаўства, якія нібыта меліся ў статуце аб'яднаньня. Адмова ў рэгістрацыі таксама была пацьверджаная рашэньнямі судовых інстанцыяў (пазьней «Модэс» быў зарэгістраваны ў форме ўстановы).

На працягу 2009 году былі прыняты рашэньні па дзьвюх справах, датычных адмоваў у рэгістрацыі нацыянальных грамадзкіх аб'яднаньняў. У справе «Цэнтру падтрымкі чарнобыльскіх ініцыятываў» Міністэрства юстыцыі прызнала памылковасьць свайго ранейшага сьцьверджаньня пра фальсіфікацыю подпісаў заснавальнікаў, паколькі яно было абвергнута неаднаразовымі графалагічнымі экспэртызамі, і зарэгістравала гэтае аб'яднаньне, не чакаючы рашэньня Вярхоўнага суда (пры гэтым відавочна мела месца своеасаблівае пагадненьне чыноўнікаў і заснавальнікаў аб'яднаньня, якіх выклікалі ў міністэрства і распытвалі пра іх планы дзейнасьці). У іншай справе, датычнай Сацыяльна-патрыятычнага грамадзкага аб'яднаньня «Гарызанталь», нягледзячы на тое, што экспэртыза таксама не пацьвердзіла несапраўднасьць подпісу аднаго з заснавальнікаў арганізацыі, Вярхоўны суд 11 сакавіка адмовіў гэтаму аб'яднаньню ў рэгістрацыі.

15 красавіка кіраўніцтва Партыі Беларуская Хрысьціянская Дэмакратыя атрымала адказ з Міністэрства юстыцыі, у якім паведамлялася аб адмове ім у рэгістрацыі. Падставай паслужыла нібыта неадпаведнасьць дакументаў апытаньню заснавальнікаў, якое праводзіла міністэрства. Устаноўчы зьезд партыі адбыўся напрыканцы лютага, пасьля падачы дакументаў на рэгістрацыю амаль кожнаму з заснавальнікаў тэлефанавалі прадстаўнікі мясцовых ідэалагічных аддзелаў, КДБ і міліцыі. Некаторых выклікалі ў адміністрацыі па месцы працы і пад пагрозай звальненьня патрабавалі адмовіцца ад свайго подпісу. Праверку дакументаў заснавальнікаў БХД праводзіў намесьнік міністра юстыцыі Беларусі Алег Сьліжэўскі, за подпісам якога хрысьціянскія дэмакраты і атрымалі адмоўны адказ. Аднак ужо на наступны дзень, 16 красавіка, аднаму з сустаршыняў БХД Аляксею Шэіну патэлефанаваў супрацоўнік Міністэрства юстыцыі і паведаміў, што рашэньне аб нерэгістрацыі партыі прыпыненае. Афіцыйная прычына — у сувязі з шэрагам зваротаў заснавальнікаў БХД, атрыманьнем інфармацыі, якая ўплывае на





рашэньне аб дзяржаўнай рэгістрацыі дадзенай партыі. Канчатковае рашэньне было прынятае пасьля праверкі атрыманай інфармацыі і таксама было адмоўным — міністэрства вырашыла не рэгістраваць Партыю БХД. 22 ліпеня Вярхоўны суд не задаволіў скаргу партыі на рашэньне Міністэрства юстыцыі аб адмове ў рэгістрацыі (такое рашэньне прыняў судзьдзя Валерый Самалюк). Сустаршыня Партыі БХД Аляксей Шэін назваў прычыны адмовы ў дзяржаўнай рэгістрацыі палітычнымі. Кіраўніцтва партыі ў 2009 годзе зьдзейсьніла паўторную падачу дакументаў на рэгістрацыю, але таксама безвынікова. 9 сьнежня Міністэрства юстыцыі зноў адмовіла ў рэгістрацыі Партыі Беларуская Хрысьціянская Дэмакратыя. Прычына палягала нібыта ў недакладнасьцях у зьвестках аб рэгіянальных сходах заснавальнікаў. Паводле інфармацыі сустаршыні партыі Віталя Рымашэўскага, зноў мелі месца дзясяткі выпадкаў, калі заснавальнікаў Партыі БХД выклікалі ў ідэалагічныя аддзелы выканкамаў ці кіраўніцтва навучальных установаў, прадпрыемстваў і пагражалі. У выніку гэтага пад ціскам пяць чалавек былі вымушаны адклікаць свае подпісы.

15 чэрвеня Міністэрства юстыцыі ў чацьвёрты раз за апошнія гады адмовілася рэгістраваць Партыю свабоды і прагрэсу на падставе таго, што «пратаколы зьезду ўтрымліваюць супярэчлівыя зьвесткі» (у прыватнасьці, Міністэрства юстыцыі ўбачыла парушэньні ў вылучэньні дэлегатаў), а таксама «сьпіс заснавальнікаў мае несапраўдныя зьвесткі». Гэтая адмова была таксама пацьверджаная рашэньнем Вярхоўнага суда.

15 сьнежня Вярхоўны суд не задаволіў скаргу заснавальнікаў Беларускай партыі працоўных аб адмове ў рэгістрацыі. Старшыня партыйнага аргкамітэту Аляксандр Бухвостаў указаў на факты запалохваньня заснавальнікаў партыі, калі ад іх патрабавалі адклікаць свае подпісы ў дакументах. Таксама ён паведаміў, што заснавальнікі працягнуць дзейнасьць як аргкамітэт па стварэньні партыі і будуць рыхтавацца да новага зьезду.

Напрыканцы сакавіка Гарадзенскі аблвыканкам адмовіў у рэгістрацыі Гарадзенскага аддзяленьня Партыі БНФ і Гарадзенскага аддзяленьня Грамадзкага аб'яднаньня БНФ «Адраджэньне». Гэтая адмова была пацьверджаная і падчас яе абскарджваньня ў Вярхоўным судзе, нягледзячы на тое, што была абгрунтаваная выключна незаконнымі тэзісамі пра неадпаведнасьць шрыфта пададзеных дакументаў патрабаваньням справаводзтва.

У 2009 годзе ўлады працягвалі ўжываць артыкул 193-1 Крымінальнага кодэксу ў якасьці сродку застрашэньня грамадзкіх актывістаў з мэтай прымусіць іх спыніць дзейнасьць у складзе незарэгістраваных НДА. У жніўні актывіст брэсцкай філіі «Маладога Фронту» Міхась Ілын атрымаў папярэджаньне пракуратуры аб крымінальнай адказнасьці, калі ён ня спыніць свой удзел у незарэгістраванай арганізацыі. Яшчэ адно папярэджаньне пракуратуры было вынесенае кіраўніцы брэсцкай філіі «Маладога Фронту» Юліі Пашко ў сьнежні.

19 лютага пракуратура вынесла папярэджаньне аб магчымым прыцягненьні да адказнасьці па артыкуле 193-1 Крымінальнага кодэкса старшыні Баранавіцкага аддзяленьня «Саюзу палякаў на Беларусі» Тэрэзе Селівончык. Гэта адбылося напярэдадні зьезду той часткі гэтага аб’яднаньня, якая не прызнаецца ўладамі, і стала першым выпадкам, калі ўлады вырашылі скарыстаць сумнавядомы артыкул у дачыненьні да сяброў польскага аб’яднаньня. Адначасова на тэрыторыі ўсёй краіны адбываўся непрыхаваны ціск на актывістаў аб’яднаньня з мэтай прымусіць іх адмовіцца ад удзелу ў дзейнасьці арганізацыі: людзей запрашалі на размовы ў КДБ, МВД ці пракуратуру, дзе адкрыта казалі пра магчымы крымінальны перасьлед.

У траўні 2009 году ўпершыню з красавіка 2008 году быў вынесены новы абвінаваўчы прысуд па артыкуле 193-1 КК, аднак пакараньне не было прызначанае ў сувязі з амністыяй. Справа супраць Андрэя Несьцяровіча (Гомель) была ўзбуджаная яшчэ ў 2007 годзе, калі ў рэгіёне па артыкуле 193-1 прыцягвалі да адказнасьці актывістаў прарасейскай неафашысцкай арганізацыі РНЕ (з той пары А. Несьцяровіч хаваўся ў Расіі, аднак вярнуўся ў Беларусь, маючы на ўвазе верагодную амністыю).

У чэрвені пракуратура Менску ўзбудзіла крымінальную справу па артыкуле 193-1 КК супраць 25-гадовага жыхара сталіцы Яўгена Волкава, які зьяўляецца прадстаўніком незарэгістраванага «Руху яднаньня» (Царква Муна). Спава даволі хутка была спыненая, але ў сьнежні 2009 году стала вядома пра яе аднаўленьне. Трэба адзначыць, што з 2006 году, калі ўступіў у дзеяньне артыкул 193-1, гэта першая крымінальная справа супраць прадстаўніка незарэгістраванай рэлігійнай арганізацыі.

Агулам за перыяд 2006-2009 гг. праваабаронцам вядома пра 17 асобаў, асуджаных па артыкуле 193-1 за дзейнасьць незарэгістраваных аб’яднаньняў: 2006 — 6 асуджаных; 2007 — 9 асуджаных; 2008 — 1 асуджаны; 2009 — 1 асуджаны. Апраўдальных прысудаў праваабаронцамі не было зафіксавана.





На пачатку верасьня з адказу Міністэрства юстыцыі на запыт няўрадавай арганізацыі «Грамадзянская Беларусь» (Чэхія) стала вядома, што ўлады разглядаюць магчымасьць замяніць крымінальную адказнасьць за дзейнасьць ад імя незарэгістраваных аб’яднаньняў на адміністрацыйную. Гэта стала першым сігналам таго, што улады прызнаюць магчымасьць перагляду артыкулу 193-1 і памяншэньня адказнасьці, аднак аб практычных дзеяньнях у гэтым накірунку да канца году было невядома. Да таго ж, у дадзеным выпадку гаворка ідзе не пра скасаваньне забароны на дзейнасьць незарэгістраваных арганізацыяў і не пра скасаваньне артыкулу 193-1 КК, а толькі пра памяньшэньне адказнасьці за такія дзеяньні. Пра намер карэкцыі адказнасьці за дзейнасьць незарэгістраваных аб’яднаньняў заяўлялася таксама прадстаўнікамі Міністэрства юстыцыі (у тым ліку падчас штогадовай канферэнцыі па чалавечым вымярэньні АБСЭ) і Адміністрацыі прэзідэнта. Разам з тым ніякіх рэальных крокаў у напрамку перагляду артыкулу 193-1 Крымінальнага кодэксу не было зроблена, у тым ліку адпаведны законапраект не паступаў на разгляд парламенту.

На працягу году захоўвалася практыка вынясеньня пісьмовых папярэджаньняў грамадзкім аб’яднаньням з боку Міністэрства юстыцыі. 6 студзеня было вынесена папярэджаньне Рэспубліканскаму грамадзкаму аб’яднаньню «Беларускі ПЭН-цэнтр». Падставай сталі вынікі праверкі дзейнасьці грамадзкага аб’яднаньня, нягледзячы на абвешачны ўладамі ў канцы 2008 году шасьцімесячны мараторый на іх правядзеньне. Арганізацыю абвінавацілі ў адсутнасьці юрыдычнага адрасу, нягледзячы на наяўнасьць дзеючай дамовы арэнды памяшканьня, а таксама ў парушэньні правілаў справаводства, вядзеньні несанкцыянаванай перапіскі праз электронную пошту, а таксама ў неправамернай абароне сваіх сяброў (у сувязі з заявамі пратэсту, якія арганізацыя выказвала з нагоды канфіскацыі на беларуска-польскай мытні зарэгістраванага часопісу «ARCHE» у якасьці быццам бы экстрэмісцкага выданьня).

У лютым Гомельскае абласное ўпраўленьне юстыцыі вынесла папярэджаньне моладзевай краязнаўчай грамадзкай арганізацыі «Талака», якая існуе ў рэгіёне звыш дзесяці гадоў. У загадзе на-

чальніка ўпраўленьня Віталя Макарэвіча сказана, што пісьмовае папярэджаньне вынесена за выкарыстаньне незарэгістраванай сімволікі на сайце арганізацыі і ў абвестках, якія «Талака» распаўсюджвала ў абласным цэнтры.

Сур'ёзнай перашкодай для стварэньня новых аб'яднаньняў і ўжо зарэгістраваных НДА і партыйных структураў з'яўлялася неабходнасьць мець офіснае памяшканьне і юрыдычны адрас у нежылым памяшканьні, паколькі мясцовыя ўлады практыкуюць ціск на арэндадаўцаў, якія наважваюцца заключаць падобныя дамовы. Прававыя ўмовы для НДА і партыяў тут горшыя нават у параўнаньні з умовамі для камерцыйных арганізацыяў, якія могуць рэгістравацца на прыватных кватэрах заснавальнікаў. Пры гэтым вялікая колькасьць прыдатных для разьмяшчэньня НДА памяшканьняў знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасьці і маюць неапраўдана высокія арэндныя стаўкі. У перыяд 2009 году многія арганізацыі заяўлялі аб цяжкасьцях з аплатай адміністрацыйных офісаў, а ў асобных выпадках гэта служыла нават падставай для спыненьня іх дзейнасьці.

На пачатку лютага Грамадзкае аб'яднаньне «За еўрапейскую Мастоўшчыну» (горад Масты Гарадзенскай вобласьці) ня здолела знайсьці юрыдычны адрас у адміністрацыйным будынку, што стала непераадольнай перашкодай для рэгістрацыі аб'яднаньня. Мастоўскі райвыканкам адмовіў заснавальніку Алесю Зарэмбюку ў прадастаўленьні юрыдычнага адрасу для рэгістрацыі грамадзкай арганізацыі, спаслаўшыся на адсутнасьць свабодных памяшканьняў.

Больш чым у 30 гарадах па Беларусі былі пададзены заявы мясцовых аддзяленьняў «Маладога Фронту» ў мясцовыя выканкамы з просьбай прадаставіць памяшканьні для правядзеньня устаноўчых сходаў, неабходных для рэгістрацый мясцовых суполак аб'яднаньня і забясьпечыць юрыдычныя адрасы, але гэтая праца не прывяла да посьпеху. Напрыклад, у лютым улады горада Мазыра (Гомельская вобласьць) адмовіліся садзейнічаць у пошуку юрыдычнага адрасу для «Маладога Фронту», матывуючы гэта забаронай закону ўмешвацца ў дзейнасьць грамадзкіх арганізацыяў.

Барысаўскае аддзяленьне грамадзкага аб'яднаньня «Дзеці ў бядзе» ў красавіку было вымушанае спыніць сваю дзейнасьць з-за немагчымасьці аплочваць арэнду памяшканьня камунальнай уласнасьці. Шматлікія звароты дабрачыннай арганізацыі ў мясцовыя органы ўлады з просьбай прадаставіць ільготную стаўку арэнды не прывялі да посьпеху.

18 лютага Тарыства аховы помнікаў было вымушанае пакінуць памяшканьне ў цэнтры Менску, якое арганізацыя займала больш за дваццаць гадоў. Пры гэтым будынак быў адроджаны ў 1980-я гады на сродкі аб'яднаньня і належаў яму. У 2004 годзе дзяржава нацыяналізавала будынак, потым зрабіла былога інвестара арандатарам, а ў канцы 2008 году канчаткова выселіла адтуль таварыства. Старшыня арганізацыі Антон Астаповіч упэўнены, што тэрміновасьць патрабаваньняў аб высяленьні была выклікана найперш дзейнасьцю аб'яднаньня па выкрыцьці і абнародаваньні фактаў парушэньня заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны і яго жорсткай пазіцыяй у гэтай справе.

Структуры грамадзянскай супольнасьці па-ранейшаму мелі складанасьці з арэндай памяшканьняў ня толькі для штодзённай дзейнасьці і ўякасьці неабходнага юрыдычнага адрасу ў нежылым памяшканьні, але і для правядзеньня асобных мерапрыемстваў ці сходаў.

Заснавальнікі Партыі БХД сутыкнуліся з цяжкасьцямі ў пошуку памяшканьня ў Менску для правядзеньня ўстаноўчага сходу, запланаванага на 28 лютага: уладальнікі дзесяці памяшканьняў належнай умяшчальнасьці адмовілі ім у гэтым (адмоўныя адказы прыйшлі з Міжнароднага адукацыйнага цэнтру IBB, Моладзевага тэатру эстрады, кінатэатраў «Аўрора» і «Цэнтральны», Цэнтральнага Дому афіцэраў, палацаў культуры чыгуначнікаў, МАЗ, МТЗ, «Сукно» і Палацу Рэспублікі). Пасьля таго, як заснавальнікі новай партыі выказалі намер правесьці ўстаноўчы сход пад адкрытым небам у цэнтры Менску, памяшканьне для зьезду было выдзелена. Аднак пры гэтым мясцовыя ўлады ў рэгіёнах працягвалі чыніць перашкоды у правядзеньні лакальных сходаў сяброў гэтай партыі, неабходных для абраньня дэлегатаў на зьезд (усяго падчас падрыхтоўкі зьезду адбыліся 63 сходы па вылучэньні дэлегатаў).

Адміністрацыя Менскага міжнароднага адукацыйнага цэнтру IBB без перашкодаў выдзеліла памяшканьне для правядзеньня вялікага форуму грамадзкіх аб'яднаньняў — шостай Асамблеі няўрадавых арганізацыяў і ініцыятываў (6-7 сакавіка). Аднак, як і ў выпадку з Партыяй БХД, правядзеньне падрыхтоўчых мерапрыемстваў да гэтага сходу ў рэгіёнах адбывалася з цяжкасьцямі. Так,





6
6

Гомельскі абласны выканаўчы камітэт ня даў дазволу на правядзеньне сходу грамадзкіх арганізацыяў і ініцыятываў Гомельскай вобласьці. Сход планавалася правесьці ў Доме творчасьці дзяцей і моладзі «Юнацтва», і была дасягнутая папярэдняя вусная дамова з ягоным дырэктарам аб арэндзе памяшканьня. Дом творчасьці належыць упраўленьню культуры аблвыканкаму, таму, каб атрымаць афіцыйны дазвол на арганізацыю мерапрыемства ў гэтым памяшканьні, намесьнік старшыні Гомельскага гарадзкога аддзяленьня беларускага рэспубліканскага аб'яднаньня «Прававая ініцыятыва» Уладзімір Кацора зьвярнуўся да намесьніка старшыні аблвыканкаму па ідэалогіі Кірычэнкі. Праз некаторы час з У.Кацорам па тэлефоне зьвязаўся дырэктар Дому творчасьці і паведаміў, што ня можа прадаставіць памяшканьне, пры гэтым прычыны адмовы ён не назваў.

Аргкамітэт V зьезду беларусаў свету, што быў арганізаваны Згуртаваньнем беларусаў сьвету «Бацькаўшчына» (адбыўся 18-19 ліпеня), таксама меў цяжкасьці ў пошуку памяшканьня для мерапрыемства, але ўрэшце рэшт яно было прадастаўлена са згоды Мінскага гарвыканкаму.

У той жа час, многія зарэгістраваныя аб'яднаньні і групы па стварэньні новых аб'яднаньняў мелі цяжкасьці з пошукам дастаткова ўмяшчальных залаў для правядзеньня сходаў. Грамадзкае праваабарончае аб'яднаньне «Наша Вясна» сутыкнулася з цяжкасьцямі ў пошуку памяшканьня для свайго чарговага ўстаноўчага сходу напрыканцы красавіка: фактычна ўсе арганізацыі, да якіх зьвярнуліся заснавальнікі «Нашай Вясны» з просьбай прадаставіць у арэнду памяшканьне для правядзеньня ўстаноўчага сходу, праваабаронцам адмовілі. У выніку сваё ўстаноўчае мерапрыемства заснавальнікі аб'яднаньня былі вымушаныя правесьці ў офісе Партыі БНФ.

Беларускія ўлады ня выканалі рашэньняў Камітэту па правах чалавека ААН, згодна з якімі адмовы ў рэгістрацыі і ліквідацыі беларускіх грамадзкіх аб'яднаньняў прызнаныя парушаючымі Пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах. На дадзены момант у дачыненьні да Беларусі вынесеныя тры рашэньні Камітэту, датычныя парушэньня свабоды асацыяцыяў: адмова ў рэгістрацыі Праваабарончага грамадзкага аб'яднаньня «Хельсінкі — XXI»; ліквідацыя ў судовым парадку Гомельскага абласнога грамадзкага аб'яднаньня





«Грамадзянскія ініцыятывы»; ліквідацыя ў судовым парадку Грамадзкага аб'яднаньня «Праваабарончы цэнтр «Вясна». Шматлікія спробы дамагчыся выкананьня гэтых рашэньняў Камітэту праз абскарджваньне ў нацыянальных судовых і іншых інстанцыях не прынесьлі посьпеху сябрам гэтых арганізацыяў, і яны працягваюць працаваць у форме незарэгістраваных аб'яднаньняў, знаходзячыся пад рызыкай крымінальнага перасьледу за такую дзейнасьць.

23 сакавіка Менскі абласны суд у касацыйнай інстанцыі адмовіў сябрам ліквідаванага ў 2003 годзе Гомельскага абласнога грамадзкага аб'яднаньня «Грамадзянскія ініцыятывы» ў задавальненьні скаргі на дзеньні Міністэрства замежных справаў. Сутнасць прэтэнзіяў сяброў аб'яднаньня заключалася ў тым, што згодна з рашэньнем Камітэту па правах чалавека ААН, ліквідацыя іх аб'яднаньня зьяўляецца парушэньнем свабоды асацыяцыяў з боку беларускага ураду, аднак Міністэрства замежных справаў, як орган, адказны за выкананьне міжнародных абавязальніцтваў Беларусі, не прадпрымаў ніякіх дзеяньняў дзеля аднаўленьня іх парушанага права.

У красавіку праваабаронца Алесь Бяляцкі, які зьяўляецца старшынём ліквідаванага ў 2003 г. Грамадзкага аб'яднаньня «Праваабарончы цэнтр «Вясна», атрымаў адказ на свой зварот у Міністэрства замежных справаў, куды ён зьвяртаўся па тлумачэньні наконт таго, якія меры былі прынятыя міністэрствам па выкананьні Меркаваньня Камітэту па правах чалавека ААН у сувязі са скасаваньнем рэгістрацыі арганізацыі. У адказе за подпісам намесьніка міністра замежных справаў паведамлялася, што беларускі бок разглядае рашэньні Камітэту па правах чалавека ААН як рэкамендацыйныя і не абавязковыя для выкананьня. Такім чынам, беларускі бок пацьвердзіў, што не зьбіраецца выконваць рашэньні Камітэту па пытаньнях парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі.

Асобным фактарам, які абумовіў некаторыя крокі ўладаў па лібералізацыі ў сьферы дзейнасьці няўрадавых аб'яднаньняў, стаў дыялог паміж Беларусьсю і Еўрасаюзам. Менавіта пад ягоным уплывам адбывалася зьмякчэньне дзяржаўнай палітыкі ў некаторых напрамках, напрыклад, адмова ад шырокага выкарыстаньня артыкулу 193-1 Крымінальнага кодэксу. Але агулам з лютага 2009 году, калі адбылося падаўжэньне рэжыму прыпыненьня санкцыяў Еўрасаюзу супраць беларускіх чыноўнікаў, у сьферы свабоды асацыяцыяў не было прадпрынята незваротных зрухаў да лепшага: арты-

кул 193-1 так і ня быў скасаваны, не было зарэгістравана ніводнай новай палітычнай партыі і на практыцы ня быў спрошчаны парадак рэгістрацыі грамадзкіх аб’яднаньняў.

Першачарговымі мерамі па выпраўленьні складанай сітуацыі са свабодай асацыяцыяў у Беларусі павінныя быць: скасаваньне артыкулу 193-1 Крымінальнага кодэксу і выключэньне з усіх актаў заканадаўства забароны на дзейнасьць незарэгістраваных аб’яднаньняў; рэальнае спрашчэньне працэдуры рэгістрацыі грамадзкіх аб’яднаньняў прынамсі да ўзроўню, які цяпер існуе для рэгістрацыі камерцыйных арганізацыяў, пры гэтым такое спрашчэньне павінна быць пацьверджанае рэгістрацыяй тых грамадзкіх аб’яднаньняў і партыяў, якім раней было адмоўлена ў рэгістрацыі альбо якія былі ліквідаваныя судовымі рашэньнямі. Асобнае значэньне мае выкананьне беларускімі ўладамі рашэньяў Камітэту па правах чалавека ААН, датычных парушэньня свабоды асацыяцыяў праз прымусовую ліквідацыю і нерэгістрацыю грамадзкіх аб’яднаньняў.

6





# 7. Рэалізацыя свабоды мірных сходаў

Артыкул 35 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь гарантуе свабоду правядзеньня мітынгаў, вулічных шэсьцяў, сходаў, дэманстрацыяў і пікетаваньня, якія не парушаюць грамадзкі парадак і правы іншых грамадзянаў. Парадак іх арганізацыі і правядзеньня рэгулюецца дзеючым заканадаўствам, найперш Законам «Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь» (рэдакцыі 07.08.2003 г.), а таксама рашэньнямі мясцовых выканаўчых органаў улады.

Закон «Аб масавых мерапрыемствах» утрымлівае шэраг абмежаваньняў, якія не зьяўляюцца неабходнымі ў дэмакратычным грамадстве і сур’ёзна абмяжоўваюць свабоду мірных сходаў. Так, у адпаведнасьці з арт. 9 Закону, мясцовыя выканаўчыя органы ўлады надзеленыя правам вызначаць месцы для правядзеньня масавых мерапрыемстваў, а таксама месцы, дзе правядзеньне такіх мерапрыемстваў забаронена. На практыцы гэта прывяло да таго, што, згодна з адпаведнымі рашэньнямі, у большасьці гарадоў Беларусі правядзеньне масавых мерапрыемстваў на цэнтральных вуліцах і плошчах забаронена (акрамя мерапрыемстваў, якія праводзяцца па рашэньні дзяржаўных органаў у дні дзяржаўных сьвятаў, сьвяточных і памятных датаў, якія адзначаюцца ў Рэспубліцы Беларусь — арт. 3 Закону). Як правіла, для правядзеньня масавых мерапрыемстваў вызначаюцца аддаленыя ад цэнтраў паркі, скверы, стадыёны і іншыя малалюдныя часткі гарадоў, і з-за гэтага масавыя мерапрыемствы вельмі часта праходзяць у значным аддаленьні ад мэтавай аудыторыі, што робіць іх пазбаўленымі сэнсу. Падобны падыход цалкам не адпавядае міжнародным стандартам у дадзенай галіне правоў чалавека.

У Беларусі існуе заяўляльны характар арганізацыі і правядзеньня мірных сходаў. Заяўка аб намеры правядзеньня такога сходу павінна падавацца не пазьней за 15 дзён да мяркуемай даты ў мясцовы орган выканаўчай улады. Правядзеньне сходаў без адпаведнага дазволу забаронена і цягне за сабой адміністрацыйную адказнасьць. Пры гэтым мясцовыя органы выканаўчай улады надзеленыя шырокімі паўнамоцтвамі пры вырашэньні пытаньня аднос-

7

на дазволу ці забароны на правядзеньне таго ці іншага масавага мерапрыемства: яны маюць права зьмяняць дату, час і месца яго правядзеньня, а таксама забараняць яго. Нягледзячы на тое, што Закон патрабуе, каб адмова ў правядзеньні масавага мерапрыемства мела матываваны характар, на практыцы вельмі часта мясцовыя органы ўлады выносяць нематываваныя рашэньні, а іх абскарджаньне ў судзе не прыводзіць да іх адмены. На працягу 2009 году не было зафіксавана ніводнага судовага рашэньня, якое б адмяняла і прызнавала незаконным рашэньне мясцовага выканаўчага органу аб забароне правядзеньня масавага мерапрыемства.

У траўні Брэсцкі гарвыканкам не задаволіў заяўку на правядзеньне пікету, прымеркаванага да дзясятай гадавіны гвалтоўнага выкраданьня былога міністра ўнутраных справаў Юрыя Захаранкі, пра лёс якога да гэтага часу нічога невядома. Месцам правядзеньня мерапрыемства заяўнікі называлі стадыён «Лакаматыў» — адзінае месца ў горадзе, вызначанае гарвыканкамам для правядзеньня масавых мерапрыемстваў, аднак пікетаваньне было забаронена з матывіроўкай, што ў вызначаны час на стадыёне будзе праходзіць футбольны турнір.

18 жніўня менскія ўлады забаранілі пікет у абарону сацыяльных правоў грамадзянаў ва ўмовах эканамічнага крызісу, які на плошчы Якуба Коласа планавалі правесьці актывісты гарадзкой арганізацыі Партыі камуністаў Беларускай.

З забаронамі на правядзеньне мірных сходаў сутыкаліся арганізатары ня толькі мерапрыемстваў з выразна грамадзка-палітычным характарам, але і такіх непалітычных акцыяў, як у абарону жывёлаў. 6 ліпеня сталічныя ўлады не далі дазволу на правядзеньне пікету ў падтрымку бяздомных жывёл, які быў запланаваны каля Пункту адлову і часовага ўтрыманьня сабак і катоў «Фаўна гораду» на вуліцы Гурскага. Сваё рашэньне Менгарвыканкам патлумачыў неадпаведнасьцю заяўкі беларускім законам. Было прадпрынята яшчэ некалькі спробаў атрымаць дазвол на правядзеньне акцыі дзеля прыцягненьня ўвагі да праблемаў бяздомных жывёлаў, але ўсе яны аказаліся безвыніковымі. Так, у адказе, які атрымалі арганізатары 20 жніўня, прычына адмовы названа наступная: пікет «стварае перашкоды ў бесьперабойнай працы» «Фаўны гораду», ветэрынарных станцыяў Маскоўскага і Фрунзенскага раёнаў сталіцы».

Паказальным прыкладам немагчымасьці рэалізацыі свабоды мірных сходаў і выказваньня меркаваньня сталі пікеты, запланаваныя Праваабарончым цэнтрам «Вясна» на 10 сьнежня, у чарговую гадавіну прыняцьця Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. З дванаццаці пададзеных заяваў на правядзеньне пікетаў у розных гарадах Беларусі дазвол быў атрыманы толькі адзін — у Брэсьце. У Віцебску намесьнік кіраўніка адміністрацыі Кастрычніцкага раёну А. Кандратовіч прывёў наступныя прычыны адмовы: заяўнікі выбралі ня тое месца для правядзеньня мерапрыемства, якое вызначана ўладамі; няма дамовы з аддзелам унутраных справаў адміністрацыі раёну, камунальнальнікамі і Віцебскай гарадзкой цэнтральнай паліклінікай. У Смаргоні праваабаронцы планавалі правесці пікет на пляцоўцы насупраць кінатэатру «Космас», і ў заяве, пададзенай у Смаргонскі райвыканкам, яны ўказалі, што месца ў скверы на вул. Садовай, вызначанае райвыканкамам, не дазваляе дасягнуць мэты пікетаваньня ў сувязі з тым, што яно аддаленае ад асноўных шляхоў перамяшчэньня смаргонцаў. Тым ня менш, мерапрыемства не было дазволена ў Смаргоні ні ў месцы, пра якое прасілі праваабаронцы, ні ў вызначаным уладамі месцы. У адмове на правядзеньне пікету, атрыманай праваабаронцамі Барысам Бухелем і Аляксеем Колчыным з Магілёўскага гарвыканкаму, было сказана, што «дазволіць правядзеньне мерапрыемства не ўяўляецца магчымым», паколькі пастановай Магілёўскага гарвыканкаму вызначана іншае месца для правядзеньня падобных мерапрыемстваў. Праваабаронцы прасілі дазволіць правядзеньне пікету ў цэнтры гораду, на заўсёды люднай плошчы насупраць гарвыканкаму, а не ў вызначаным уладамі: бязьлюдным, што знаходзіцца ў двары Дома культуры. Правядзеньне пікету было забароненае і ў Мазыры: Мазырскі райвыканкам за подпісам намесьніка старшыні Фелікса Галюка ў сваім адказе нагадаў праваабаронцам, што пастаяннымі месцамі правядзеньня масавых мерапрыемстваў у горадзе вызначаны стадыён «Спартак» і стадыён «Палессе» ў населеным пункце Козенкі. Пры гэтым у названых месцах шмат часу не праводзіліся ня толькі масавыя, але і спартыўныя мерапрыемствы, а з-за нязручнасьці дабірацца да іх былі пабудаваны стадыён «Юнацтва» і гарналыжны спартыўна-аздараўленчы комплекс. Забарону на правядзеньне пікетаў атрымалі таксама праваабаронцы з Барысаву, Гомелю, Бярозы, Наваполацку.

Яшчэ адным палажэньнем, якое істотным чынам абмяжоўвае свабоду мірных сходаў, зьяўляецца патрабаваньне аб аплаце ар-

ганізатарамі сходаў выдаткаў, зьвязаных з іх правядзеньнем (ахова грамадзкага парадку, медыцынскае абслугоўваньне, прыборка тэрыторыі). Такім чынам, свабода мірных сходаў на практыцы пастаўленая ў прамую залежнасьць ад аплаты грамадзянамі выдаткаў пры яе рэалізацыі. Парадак і памеры аплаты ўстанаўліваюцца адпаведнымі рашэньнямі мясцовых выканаўчых органаў улады (арт. арт. 6, 10 Закону), прычым у шэрагу гарадоў такія рашэньні прадугледжваюць аплату выдаткаў яшчэ да пачатку масавых мерапрыемстваў.

У Баранавічах мясцовыя праваабаронцы абскардзілі ў судзе пастанову Баранавіцкага гарвыканкаму ад 17.01.2006 г. № 4 «Аб парадку правядзеньня масавых мерапрыемстваў у г. Баранавічы», палажэньні якой прадугледжвалі аплату выдаткаў да пачатку масавага мерапрыемства, а не пасьля яго, як гэтага патрабуе закон. У сваёй заяве праваабаронцы таксама патрабавалі наогул адмяніць практыку ўзыманьня грошай за правядзеньне масавых мерапрыемстваў. 30 красавіка судзьдзя суда г. Баранавічы і Баранавіцкага раёну Мікалай Сільмановіч адмовіў актывістам у задавальненьні скаргі, але пазьней гэтае рашэньне было абскарджанае заяўнікамі ў судовую калегію па грамадзянскіх справах Брэсцкага абласнога суда. Разгляду справы па сутнасьці скаргі не адбылося, паколькі выканкам г. Баранавічы сваім жа рашэньнем адмяніў рашэнне № 4, а новае ўжо не ўтрымлівала патрабаваньняў адносна папярэдняй аплаты выдаткаў па правядзеньні масавых мерапрыемстваў. Аднак такім рашэньнем праваабаронцы засталіся незадаволеныя, паколькі, як адзначыў праваабаронца Сяргей Гоўша, гэта па сутнасьці нічога не зьмяніла, аплата па-ранейшаму засталася: «Мы прасілі абласную калегію выйсьці з прапановамі па зьмене закону аб масавых мерапрыемствах. Гэты закон не адпавядае Канстытуцыі. Мы не павінны заключаць дамовы з міліцыяй, МНС і г.д. Гэта павінна рабіць улада. Таму што кожны грамадзянін, які працуе, плаціць падаткі, на якія ўтрымліваецца менавіта дзяржаўная ўлада і яе чыноўніцкі апарат».

На працягу году ў Беларусі мірныя сходы часта праходзілі без дазволу мясцовых выканаўчых органаў улады. У першай палове году ўлады ажыцьцяўлялі тактыку гвалтоўнага спыненьня такіх мерапрыемстваў шляхам выцісканьня ўдзельнікаў на прылеглыя вуліцы, расьсейваньня сіламі сьпецпадразьдзяленьняў міліцыі ці





затрыманьня ўдзельнікаў без далейшага прыцягненьня іх да адміністрацыйнай адказнасьці. Гэта стварала ўражаньне зьніжэньня ўзроўню рэпрэсіяў, хаця колькасьць затрыманых не зьмяншалася ў параўнаньні з адпаведным перыядам мінулага году. Такая тактыка найперш была зьвязаная з перамоўнымі працэсамі паміж кіраўніцтвам Беларусі і Еўрапейскім Саюзам і павышанай увагай ЕС да падзеяў у краіне. Сітуацыя зьмянілася ў другой палове году, калі ўлады пачалі прымяняць жорсткія сілавыя метады разгону мірных сходаў з далейшым прыцягненьнем іх удзельнікаў да адміністрацыйнай адказнасьці. Вельмі часта такія дзеяньні сьпецпадразьдзяленьняў мелі паказальны характар і суправаджаліся ўжываньнем фізічнай сілы і сьпецсродкаў, перашкодай у працы журналістаў, якія знаходзіліся ў месцах правядзеньня падобных мерапрыемстваў.

Жорсткім разгонам скончылася мірная акцыя, якая традыцыйна праводзіцца «Маладым Фронтам» 14 лютага. Дэманстранты, якія сабраліся на пл. Якуба Коласа, былі атакаваныя сьпецадзьдзеламі ПМСП з ужываньнем фізічнай сілы і сьпецсродкаў. Пры гэтым дзеяньні міліцыі мелі відавочна непрапарцыйны і жорсткі характар: фізічная сіла ўжывалася супраць дэманстрантаў, сярод якіх было шмат непаўнагадовых і дзяўчат. Трэба адзначыць, што супрацоўнікі міліцыі не затрымлівалі ўдзельнікаў акцыі, а выключна зьбівалі іх. У выніку некалькі дэманстрантаў зьвярнуліся па медыцынскую дапамогу: у Бараўлянскую абласную бальніцу трапілі Павел Кур'яновіч, Зьміцер Дашкевіч і Мікола Дземідзенка.

Жорстка ўлады рэагавалі на акцыі салідарнасьці з роднымі зьніклых, палітзьняволенымі і рэпрэсаванымі. 1 траўня супрацоўнікі ПМСП зьбілі ўдзельнікаў мірнай акцыі салідарнасці з арыштаванымі ваўкавыскімі прадпрымальнікамі Мікалаем Аўтуховічам, Уладзімірам Асіпенкам і Юрыем Лявонавым. Акцыя праходзіла каля СІЗА на вуліцы Валадарскага у г. Менску, дзе яны ўтрымліваліся пад вартай з лютага. Дэманстранты заявілі, што выйшлі падтрымаць арыштаваных і найперш Мікалая Аўтуховіча, які абвясьціў бестэрміновую галадоўку і жыцьцю якога пагражае рэальная небясьпека. Праз 10 хвілінаў пасьля пачатку акцыі да СІЗА пад'ехаў аўтазак, поўны супрацоўнікаў ПМСП. Дэманстрантаў узялі ў кола і паспрабавалі выціснуць. У знак пратэсту ўдзельнікі акцыі селі на зямлю, трымаючы ў руках партрэты арыштаваных. Супрацоўнікі міліцыі абступілі людзей, якія сядзелі на зямлі, не дазваляючы ім рухацца,

а затым сталі груба выцясьняць ад будынку ізалятару, пры гэтым зьбіваючы па нырках, сьпінах, нагах. Дэманстрантаў фактычна пад канвоем давялі да станцыі метро «Фрунзенская», сістэматычна наносячы ўдары і абражаючы.

7 траўня ў Менску прайшла акцыя з нагоды 10-годзьдзя зьнікненьня былога міністра ўнутраных справаў Юрыя Захаранкі. Каля 150 удзельнікаў акцыі стаялі ланцужком уздоўж прасьпекту Незалежнасьці, трымаючы ў руках партрэты Ю.Захаранкі і арыштаваных прадпрымальнікаў з Ваўкавыску. Удзельнікі акцыі скандавалі «Свабода!», «Свабоду палітвязьням!». Насупраць дэманстрантаў, таксама ланцугом, сталі байцы міліцэйскага сьпецназу. У хуткім часе было затрымана каля 30 удзельнікаў мірнай акцыі, якія былі дастаўленыя ў РУУС Цэнтральнага раёну, адкуль іх адпусьцілі без складаньня пратаколаў, у іх узялі адбіткі пальцаў і зьнялі на відэа. Яшчэ да пачатку акцыі прэвентыўна быў затрыманы старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька.

Асабліва жорска былі разагнаныя мірныя акцыі 9 і 16 верасьня, якія адбыліся ў Менску на Кастрычніцкай плошчы. 9 верасьня некалькі дзясяткаў чалавек выйшлі на плошчу з мэтай выказваньня пратэсту супраць прыбыцьця ў Беларусь вайсковага кантынгенту Расійскай Федэрацыі для ўдзелу ў сумесных беларуска-расійскіх вайсковых вучэньнях. Акцыя мела мірны характар, але праз некалькі хвілінаў прыбылі супрацоўнікі ПМСН і пачалі затрыманьне пратэстуючых з ужываньнем фізічнай сілы. Частка маладых актывістаў (у тым ліку лідэр «Маладога Фронту» Зьміцер Дашкевіч, сябра Моладзі БНФ Сяржук Карповіч і іншыя) былі затрыманыя прэвентыўна, яшчэ да пачатаку акцыі асобамі ў цывільным на падыходах да Кастрычніцкай плошчы. Затрыманыя былі дастаўленыя ў РУУС Цэнтральнага р-ну г. Менску, дзе на іх былі складзеныя пратаколы аб адміністрацыйным правапарушэньні па арт. 23.34 КаАП (парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў), а на Зьміцера Дашкевіча яшчэ і пратакол па арт. 17.1 КаАП (дробнае хуліганства). Усе адміністрацыйна затрыманыя (агулам 17 чалавек) былі этапаваныя ў Цэнтр ізаляцыі правапарушальнікаў, дзе яны правялі ноч, а з раніцы дастаўленыя ў суд Цэнтральнага р-ну сталіцы. Падчас суда над дэманстрантамі ўсе тры паверхі будынку суда былі запоўненыя амапаўцамі, туды не прапускалі ні прадстаўнікоў СМІ, ні сваякоў затрыманых. Немагчыма было зьвярнуцца са скаргай аб парушэньні працэсуальнага заканадаўства да старшыні суда: да яго не дапускалі нікога. Пасьля тэлефанаваньняў у прыёмную суда праваабаронцы Валянціну Стэфановічу дазволілі зрабіць запіс у Кнізе скаргаў і прапанаваў, дзе ён адзначыў, што ў судзе адсутнічае інфармацыя аб судзьдзях і адміністрацыйных справах, якія павінны разглядацца, што зьяўляецца парушэньнем дзеючага заканадаўства, згодна з якім судовыя працэсы павінны быць адкрытымі для грамадзкасьці.





16 верасня, у 10-ю гадавіну зьнікненьня палітыка Віктара Ганчара і бізнэсмена Анатоля Красоўскага, у Менску адбыўся пікет на Кастрычніцкай плошчы, які меў выключна мірны характар: некалькі дзясяткаў чалавек трымалі ў руках толькі партрэты зьніклых. Праз некалькі хвілінаў пасьля пачатку акцыі ўдзельнікаў пачалі затрымліваць асобы ў цывільным і ў форме супрацоўнікаў ПМСН. Быў затрыманы 31 удзельнік акцыі, усе яны былі дастаўленыя ў РУУС Цэнтральнага р-ну, адкуль праз тры гадзіны былі выпушчаныя без афармленьня пратаколаў аб адміністрацыйным правапарушэньні. Падчас затрыманьняў супрацоўнікі міліцыі ў цывільным перашкаджалі ажыцьцяўляць свае прафесійныя абавязкі журналістам: фактычна да кожнага з іх былі прыстаўленыя некалькі асобаў у цывільным, якія не давалі журналістам рабіць фота- і відэаздымкі падзеяў — закрывалі аб'ектывы камераў, штурхалі іх. З нагоды перашкодаў, якія міліцыя чыніла журналістам 16 верасьня, ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» накіравала звароты да пракурора г. Мінска Мікалая Куліка і міністра ўнутраных справаў Анатоля Куляшова. Журналісцкая арганізацыя заклікала пракурора забясьпечыць «прыцягненьне да адказнасьці асобаў, якія аддавалі і выконвалі загады на стварэньне перашкодаў журналісцкай дзейнасьці» і «патрабаваць ад ГУУС Менгарвыканкаму, іншых праваахоўных органаў безумоўнага выкананьня патрабаваньняў заканадаўства аб СМІ». БАЖ заклікала міністра ўнутраных справаў «яшчэ раз давесьці да службовых асобаў і іншых супрацоўнікаў органаў унутраных справаў, што журналісты падчас масавых акцый, як і супрацоўнікі міліцыі, выконваюць свае прафесійныя абавязкі». Аднак ні пракуратура, ні МУС ня ўгледзелі парушэньняў правоў журналістаў у дзеяньнях супрацоўнікаў міліцыі. У адказ на прэтэнзіі БАЖ намесьнік міністра ўнутраных справаў, начальнік міліцыі грамадзкай бясьпекі Яўген Палудзень заявіў, што распрацаваная адмысловая інструкцыя, якая павінна рэгуляваць стасункі прадстаўнікоў міліцыі і журналістаў «падчас мерапрыемстваў па навядзеньні грамадзкага

парадку падчас правядзеньня несанкцыянаваных масавых мерапрыемстваў». Паводле гэтай інструкцыі, журналістам забараняецца ажыцьцяўляць фота- і відэаздымкі супрацоўнікаў міліцыі буйным планам і ўдзельнікаў акцыі без іх дазволу, а ўсе акалічнасьці і пытаньні яны могуць высьветліць у прэс-афіцэра, які павінен адмыслова знаходзіцца на месцы апранутым у камізэльку сіняга колеру. Заява намесьніка міністра была падвергнута жорсткай крытыцы журналісцкай супольнасьцю і праваабаронцамі, якія адзначылі, што правы журналістаў вызначаюцца дзеючым Законам «Аб сродках масавай інфармацыі», а не інструкцыямі МУС.

Аналагічная сітуацыя з затрыманьнямі ўдзельнікаў мірных сходаў назіралася ня толькі ў сталіцы, але і іншых гарадах Беларусі. 25 красавіка ў Лідзе былі затрыманыя трое маладых людзей, якія праводзілі акцыю супраць будаўніцтва ў Беларусі АЭС. Двое з іх — мясцовыя актывісты Ганна Бунько і Яўген Рудой, трэці — Яўген Скрабец з Брэсту. Актывісты разгарнулі на цэнтральнай плошчы гораду расьцяжку «Не — новаму Чарнобылю», і ў хуткім часе на месца правядзеньня пікету прыбылі супрацоўнікі міліцыі.

У Віцебску 26 красавіка, у чарговую гадавіну аварыі на Чарнобыльскай АЭС, былі затрыманыя актывісты, якія меркавалі правесьці антыядзерныя акцыі, але нават не пасьпелі іх распачаць. Меркавалася зладзіць невялікае шэсьце ад Плошчы Свабоды па вуліцы Леніна, аднак на месцы збору актывістаў чакалі супрацоўнікі міліцыі на чале з начальнікам сьпецыяльнага аддзелу па ахове грамадзкай бясьпекі Кастрычніцкага РАУС Аляксандрам Каліноўскім. Супрацоўнікі праваахоўных органаў праверылі ў актывістаў дакументы і асабістыя рэчы, знайшоўшы ў сумках майкі з антыядзернай сімволікай — іх маладыя людзі меркавалі надзець, перш чым ісьці па горадзе. Пяцёра актывістаў былі затрыманыя і дастаўленыя ў Першамайскі райаддзьдзел міліцыі: ім патлумачылі, што неабходна праверыць, ці маюць яны дачыненьне да шэрагу злачынстваў, учыненых у горадзе апошнім часам. У апорны пункт міліцыі Кастрычніцкага раёну былі дастаўленыя сябра КХП БНФ Сяргей Каваленка і беспартыйны Валерый Місьнікаў — іх палічылі «падазронымі асобамі» — менавіта так сказалі супрацоўнікі міліцыі падчас затрыманьня. Сяргей Каваленка зьбіраўся прайсьці па вуліцы Леніна з бел-чырвона-белым сьцягам і трымаў у руках дзьве даўгія драўляныя рэйкі, каб яго прымацаваць, аднак сьцяга з кішэні ён не пасьпеў нават дастаць.







7 траўня ў Гомелі за ўдзел у акцыі памяці, прымеркаванай да 10-ай гадавіны выкраданьня экс-міністра МУС Юрыя Захаранкі былі затрыманыя мясцовыя актывісты Уладзімір Кацора, Васіль Палякоў, Пётр Кузьняцоў і Юрый Захаранка (стрыечны брат зьніклага). На ўсіх былі складзеныя пратаколы за ўдзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве па арт. 23.34 КаАП. Судзьдзя суда Цэнтральнага раёну Гомелю Марына Дамненка пакарала трох удзельнікаў акцыі штрафамі ў памеры 10 базавых велічыняў, а Уладзіміра Кацору — адміністрацыйным арыштам на 3 сутак.

Парушэньне правоў грамадзянаў Беларусі на свабоду мірных сходаў бывло падставай для індывідуальных зваротаў у Камітэт па правах чалавека ААН. Так, Ірына Лаўроўская, Раман Кісьляк і Дзяніс Турчыняк у студзені 2009 году падалі заявы ў Брэсцкі гарвыканкам, у якіх прасілі дазволу на правядзеньне пікетаў 15, 16 і 17 студзеня на пешаходнай частцы вуліцы Гогаля, непадалёку ад месца ўстаноўкі помніку да 1000-годзьдзя Брэсту. Тэмай акцыі была нязгода з канчатковым выглядам названага помніку і іншымі пытаньнямі, зьвязанымі з захаваньнем гістарычнай спадчыны. Заяўляльнікі атрымалі адмовы ў правядзеньні пікетаў за подпісам намесьніка старшыні гарвыканкаму Хафізава, у якіх адзначалася, што адзінае месца для правядзеньня масавых мерапрыемстваў у горадзе — стадыён «Лакаматыў». Нязгодныя з рашэньнем гарвыканкаму, заяўляльнікі зьвярнуліся ў судовыя інстанцыі, дзе спрабавалі абвергнуць мэтазгоднасьць вызначэньня стадыёну «Лакаматыў» як адзінага месца для правядзеньня сходаў. Судовыя інстанцыі падтрымалі бок гарадзкіх уладаў, і тады І. Лаўроўская, Р. Кісьляк і Дз. Турчыняк накіравалі скаргі ў Камітэт па правах чалавека ААН. Актывісты адзначылі, што былі парушаны іх правы на правядзеньне мірных сходаў, свабоднае выказваньне меркаваньняў, яны былі дыскрымінаваныя па прыкмеце перакананьняў, а таксама, што падчас суда было парушана права на справядлівае судовае разьбіральніцтва.

Адзіным станоўчым фактарам у галіне свабоды мірных сходаў стала ўнясеньне ў 2009 годзе зьменаў у палажэньні Выбарчага кодэксу, якія рэгулююць парадак правядзеньня масавых мерапрыемстваў, што арганізуюцца кандыдатамі ў прэзідэнты, дэпутаты, іх даверанымі асобамі. Так, Выбарчы кодэкс быў дапоўнены арт. 45.1,

які прадугледжвае спрошчаны, уведамляльны парадак арганізацыі такіх мерапрыемстваў. Згодна з новаўвядзеньнямі, для правядзеньня масавага мерапрыемства кандыдаты ў прэзідэнты, дэпутаты, іх давераныя асобы за два дні да пачатку павінны даслаць толькі ўведамленьне ў мясцовы выканаўчы орган улады, на тэрыторыі якога плануецца яго правядзеньне. Акрамя таго, для збору подпісаў выбаршчыкаў, які ажыцьцяўляецца ў форме пікетаваньня, таксама не патрэбен дазвол, калі ён праводзіцца ў месцах, не забароненых выканаўчымі і распарадчымі органамі.

Такім чынам, у 2009 годзе ў Беларусі свабода мірных сходаў заставалася вельмі абмежаванай: шырока ўжывалася практыка прывентыўных затрыманьняў і арыштаў, удзельнікі мірных сходаў падвяргаліся адміністрацыйнаму перасьледу, супраць іх нярэдка выкарыстоўвалася фізічная сіла і сьпецыяльныя сродкі.

Рэалізацыя свабоды сходаў магчымая толькі пры сістэмным падыходзе, унясеньні зьменаў у дзеючы Закон «Аб масавых мерапрыемствах» і прывядзеньні яго ў адпаведнасьць з міжнароднымі стандартамі ў галіне правоў чалавека.







# 8. Ціск сьпецслужбаў на грамадзянаў у сувязі з іх грамадзка-палітычнай дзейнасьцю

На працягу 2009 году сьпецслужбы Беларусі працягвалі ажыцьцяўляць мерапрыемствы, скіраваныя на збор інфармацыі, аказаньне ціску на грамадзянаў у сувязі з іх грамадзка-палітычнай дзейнасьцю. Найперш гэта датычылася Камітэту дзяржаўнай бясьпекі, які традыцыйна ажыцьцяўляў функцыі грамадзянскага дазнаньня адносна актывістаў апазіцыйных палітычных партыяў, моладзевых нефармальных групаў і грамадзкіх аб'яднаньняў, прадстаўнікоў незалежных СМІ. Дзейнасьць КДБ зводзілася ў асноўным да пошуку і вярбоўкі інфарматараў у грамадзка-палітычных асяродках, збору інфармацыі аб дзейнасьці апазіцыйных і грамадзкіх актывістаў, журналістаў незалежных СМІ, аказаньня на іх ціску. Пры гэтым грамадзка-палітычная дзейнасьць названых катэгорыяў грамадзянаў ажыцьцяўлялася імі ў адпаведнасьці з дзеючым заканадаўствам і ня мела ніякай пагрозы для бясьпекі дзяржавы (не зьяўлялася экстрэмісцкай, ня мела антыканстытуцыйных мэтаў і г.д.).

У большасьці выпадкаў прадстаўнікі КДБ ажыцьцяўлялі сваю дзейнасьць у форме неафіцыйных размоваў і сустрэчаў, якія мелі непрацэсуальны характар, грамадзянам не тлумачыліся іх правы, а таксама тое, што ў адпаведнасьці з арт. 9 Закону Рэспублікі Беларусь «Аб Камітэце дзяржаўнай бясьпекі», супрацоўніцтва органаў бясьпекі і грамадзянаў будуецца выключна на добраахвотнай аснове. Часта ў ходзе такіх размоваў на грамадзянаў аказваўся псіхалагічны ціск, ім пагражалі непрыемнасьцямі, звальненьнем з працы ці адлічэньнем з вучобы. Адпаведна, за згоду прадстаўляць інфармацыю аб дзейнасьці той ці іншай арганізацыі супрацоўнікі КДБ абяцалі спрыяць у вучобе, працы і вырашэньні пэўных жыцьцёвых праблемаў. Як правіла, падобнага кшталту «сустрэчы» адбываліся па адной і той жа схеме: у навучальных установах, дзе навучаюцца актывісты, ці па месцы іх працы. Адным з найбольш дзейсных сродкаў абароны ад прымусовага супрацоўніцтва са сьпецслужбамі зьяўлялася агучваньне падобных фактаў у СМІ ці паведамленьне пра іх у праваабарончыя арганізацыі.

15 студзеня два прадстаўнікі КДБ правялі гутарку з актывістам Руху «За свабоду» Алегам Пронскім у кабінеце намесьніка дэкана агранамічнага факультэту Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэту, падчас якой яму пагражалі і спрабавалі завербаваць. «Мы размаўлялі каля гадзіны. Спачатку яны казалі, што я сапсаваў сабе лёс: яны мелі намер пасласць мяне у сьпецназ, а потым узяць на працу ў КДБ. Затым сказалі, што мае калегі па Руху «За свабоду» нібыта купляюць машыны, дамы і гальштукі за 50 даляраў, дакладна распавялі пра маю дзейнасьць. Яны прапанавалі мне тры выбары: я спыняю актыўную грамадзкую дзейнасьць, мяне пакідаюць ў спакоі і не разьмяркоўваюць у Гомельскую вобласьць. Другі: я распавядаю СМІ пра размову і працягваю дзейнасьць — тады мяне разьмяркуюць на Гомельшчыну, і я наогул паламаю сабе жыцьцё. І трэці: я супрацоўнічаю з КДБ, і тады мяне чакае добрая жыцьцёвая кар'ера», — распавёў А. Пронскі «Еўрарадыё». Яшчэ да гэтай падзеі прарэктар універсітэту раіў актывісту спыніць грамадзка-палітычную дзейнасьць, пагражаючы разьмеркаваньнем у Чарнобыльскую зону.

19 студзеня супрацоўнікі КДБ спрабавалі завербаваць студэнта 1 курсу факультэту інфармацыйных тэхналогіяў і кіраваньня Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэту інфарматыкі і радыёэлектронікі Паўла Ляшкевіча. «Спачатку мне пазваніў дэкан і выклікаў да сябе ў кабінет. Калі я зайшоў, у кабінеце акрамя дэкана знаходзіліся яшчэ два чалавекі, а дыкан сыйшоў. Невядомыя спыталі мяне, ці ведаю я, хто яны такія. Потым яны спыталі, як я стаўлюся да палітыкі, а калі я сказаў, што не зьяўляюся сябрам ніякай палітычнай партыі, зайшлі на маю старонку ў Інтэрнэце, паказалі, што ў супольнасьцях, у якіх я ўдзельнічаю, шмат сяброў-апазіцыянераў, і паставілі ўмову: я працягваю вучыцца і працую на іх ці мяне выключаць з універсітэту. Яны прагледзелі мой пашпарт, асабліва іх цікавіла, што я рабіў за мяжой, а я з бацькамі езьдзіў адпачываць у Польшчу. Мне настойліва прапаноўвалі падпісаць паперу, дзе напісана, што я буду працаваць на сьпецслужбы пад псеўданімам «Арцём», каб яны маглі мяне кантраляваць. Прапанавалі нават «падтрымаць матэрыяльна» і «дапамагчы з вучобай», а калі я сказаў, што грошы мне не патрэбныя, яны адказалі: «няма такога чалавека, якому не патрэбныя грошы». Мяне спыталі, ці не хачу я ўступіць у «Малады Фронт»: я павінен быў даслаць паведамленьне на сайт арганізацыі, у якім прасіў бы аб уступленьні, пазваніўшы папярэдне супрацоўнікам сьпецслужбаў, і, зьяўляючыся сябрам МФ, працаваць на іх», — распавёў тэхналогію вярбоўкі малады чалавек. Падпісваць паперы Павел Ляшкевіч адмовіўся.

8 траўня на завод, дзе працуе актывіст «Маладога Фронту» Антон Русін, прыйшлі супрацоўнікі КДБ. На просьбу А.Русіна прадставіцца адзін з іх адказаў: «Зараз так прадстаўлюся, што вылеціш з працы і больш нікуды не ўладкуесься». Невядомыя распытвалі актывіста пра моладзевую арганізацыю, яе лідэраў і марш «За незалежнасьць!», які рыхтаваў МФ. Адказваць на пытаньні А.Русін адмовіўся.

24 красавіка ў Гомелі да актывіста «Маладога Фронту» Дзяніса Сяськова ў каледж прыйшоў супрацоўнік КДБ, які распытваў маладога чалавека аб ягонай палітычнай дзейнасьці і сувязях з Андрэем Цянютам (*актывіст МФ. — рэд.*). «Больш за ўсё яго цікавіў Андрэй Цянюта: з кім кантактуе і працуе, яго знаёмыя і сябры, чым ён займаецца ў вольны час і іншыя факты з жыцьця Андрэя», — распавёў Дз. Сяськоў.

25 красавіка супрацоўнікі КДБ прыйшлі на заняткі ў школу ў Менскім раёне, дзе працуе настаўнікам Раман Ханяўка — бацька актывіста «Маладога Фронту» Вадзіма Ханяўкі, і пачалі здымаць яго на відэакамеру пры вучнях. Супрацоўнікі КДБ задавалі пытаньні: як ён ставіцца да дзейнасьці свайго сына, прасілі сказаць, што ён незадаволены, што ягоны сын уступіў у гэтую арганізацыю. Калі Раман Ханяўка спытаў, навошта яны гэта робяць, людзі ў цывільным адказалі, што нібыта здымаюць дакументальны фільм пра «Малады Фронт» і бацькоў актывістаў арганізацыі, якія незадаволеныя тым, што іх дзяцей уцягваюць у гэтую структуру. Пазьней такога кшталту «здымачная група» ўварвалася ў кватэру бацькоў лідэра «Маладога Фронту» Зьмітра Дашкевіча. У хуткім часе па дзяржаўным тэлебачаньні трансьляваўся прапагандысцкі фільм «Малады Фронт. Кіднэпінг», падрыхтоўка якога ажыцьцяўлялася здымачнай групай у цесным супрацоўніцтве з КДБ, які забясьпечваў небходнай інфрамацыяй, а таксама аказваў садзеяньне ў пранікненьні ў прыватныя памяшканьні грамадзянаў.

Вялікую ўвагу сьпецслужбы Беларусі традыцыйна ўдзялялі дзейнасьці незалежных журналістаў, асабліва тых, якія супрацоўнічалі з замежнымі СМІ. Найперш пад такі ціск траплялі журналісты Радыё «Рацыя» і сатэлітнага тэлеканалу «Белсат».

29 красавіка супрацоўнікі УКДБ па Гродзенскай вобласці вынесьлі афіцыйнае папярэджаньне журналісту Яну Раману аб недапушчальнасьці супрацьпраўнай дзейнасьці. Асаблівую занепакоенасьць супрацоўнікаў КДБ выклікалі артыкулы журналіста аб эканамічным становішчы беларускіх прадпрыемстваў. «Мне сказалі, што я магу пісаць, але толькі станоўча, а калі буду даваць негатыўную інфармацыю, тады гэта будзе расцэньвацца як дыскрэдытацыя Рэспублікі Беларусь у замежных СМІ», — распавёў Я. Раман. Акрамя таго, журналісту паведамілі, што з 24 красавіка 2009 году ён знаходзіцца ў аператыўнай распрацоўцы, з чаго яму патрэбна зрабіць правільныя высновы. На пытаньне Я. Рамана, ці заведзена супраць яго крымінальная справа, яму адказалі, што не, але зрабіць гэта можна ў любы момант. Пасьля вынясеньня афіцыйнага папярэджаньня Ян Раман з дапамогай юрыстаў «Беларускай асацыяцыі журналістаў» зьвярнуўся да начальніка УКДБ па Гродзенскай вобласьці з патрабаваньнем растлумачыць, на якой падставе супраць яго праводзіліся аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы, і чаму супрацоўнікі КДБ лічаць, што ён прадстаўляе не адпавядаючую рэчаіснасьці інфармацыю замежным СМІ, «дыскрэдытуючы» такім чынам Рэспубліку Беларусь. Журналіст прасіў даць адказ на прыкладзе ягоных канкрэтных артыкулаў, але кіраўнік Гродзенскага КДБ праігнараваў гэтыя патрабаваньні і папярэдзіў, што працяг дзейнасьці журналіста можа прывесьці да зьдзяйсьненьня злачынства. «У адказе кіраўнік КДБ па Гродзенскай вобласьці паведаміў, што супраць мяне аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы не праводзіліся, аднак у тэксьце афіцыйнага папярэджаньня, зьмешчанага на Інтэрнэт-старонцы КДБ, сказана, што супрацоўнікамі дзяржаўнай бясьпекі, згодна з атрыманымі падчас аператыўна-вышуковых мерапрымстваў дадзенымі, выяўлена, што я супрацоўнічаю з замежнымі сродкамі масавай інфармацыі і прадастаўляю ім недакладныя зьвесткі», — адзначыў Я. Раман.

Атрымала разьвіцьцё справа, ініцыяваная ў канцы 2008 году па заяве УКДБ па Брэсцкай вобласьці аб прызнаньні экстрэмісцкімі шэрагу публікацыяў, прысьвечаных парламенцкім выбарам, размешчаных у № 7-8 часопісу «ARCHE». 25 лютага судзьдзя Маскоўскага р-ну Брэсту Тацяна Міранюк задаволіла заяву УКДБ і прызнала гэтыя матэрыялы «экстрэмісцкімі». Аднак 7 траўня касацыйная інстанцыя, калегія па грамадзянскіх справах Брэсцкага абласнога суда, адмяніла вынесенае рашэньне і накіравала справу на





новы разгляд. 25 чэрвеня суд Маскоўскага раёну г. Брэсту спыніў вытворчасьць па справе «ў сувязі з адмовай заяўніка ад заяўленых патрабаваньняў».

Сьпецслужбы аказвалі ціск на лідэраў моладзевых арганізацыяў. На працягу году было зафіксавана некалькі выпадкаў іх выкраданьняў і вывазу за межы Менску. Некаторыя падобныя акцыі былі праведзеныя напярэдадні запланаваных масавых акцыяў і відавочна мелі характар прэвентыўных адвольных затрыманьняў.

Характэрным для ўсіх гэтых выпадкаў было тое, што затрыманьні маладых людзей ажыцьцяўляліся некалькімі асобамі ў цывільным на вуліцы, часта каля непасрэднага месца пражываньня. Затрыманых з выкарыстаньнем фізічнай сілы запіхвалі ў машыну, нацягвалі на вочы шапку, пры гэтым большасьць моладзевых актывістаў пацьвердзілі тое, што яны чулі, як у выкрадальнікаў час ад часу спрацоўвала рацыя. У шэрагу выпадкаў невядомыя самі давалі зразумець, што затрыманьні адбываюцца менавіта з-за грамадзка-палітычнай дзейнасьці маладых людзей. Невядомыя вывозілі маладых актывістаў за Менск, заводзілі ў лес і пакідалі там, часам адбіраючы ў іх мабільныя тэлефоны, і людзі вымушаныя былі дабірацца ад гораду самастойна. Трэба адзначыць, што захоп невядомымі, выкраданьне, вываз у лес — усе гэтыя дзеяньні насілі паказальна запалохваючы характар, мелі на мэце аказаньне псіхалагічнага ціску на грамадзкіх актывістаў. Па скаргах выкрадзеных такім чынам людзей заводзіліся крымінальныя справы, але вінаватыя так і не былі ўстаноўленыя і пакараныя.

25 сакавіка, за некалькі гадзінаў да пачатку акцыі, прымеркаванай да Дня Волі, актывісты «Маладога Фронту» Наста Палажанка і Дзяніс Карноў былі схопленыя каля станцыі метро «Каменная горка» ў Менску невядомымі людзьмі ў цывільным і вывезены за горад. Пры гэтым Дз. Карнова зьбівалі, парэзалі ягоныя джынсы і забралі грошы. Пасьля гэтага інцыдэнту па заявах пацярпелых былі заведзеныя крымінальныя справы, аднак злачынцаў міліцыя не выявіла. Пра неэфектыўнасьць дзеяньняў сьледчых органаў і нежаданьне караць вінаватых сьведчыць той факт, што Наста Палажанка і Дзяніс Карноў па фотаздымку апазналі чалавека, які кіраваў іх выкраданьнем — ім аказаўся Аляксандр Леаненка, супрацоўнік сьпецпадразьдзяленьня па барацьбе з тэрарызмам МУС РБ «Алмаз».

27 лістапада, напярэдадні акцыі, прысьвечанай гадавіне Слуцкага збройнага чыну, актывіста грамадзянскай кампаніі «Еўрапейская Беларусь» Уладзіміра Лемеша схапілі невядомыя ў цэнтры Менску, надзелі на рукі кайданкі, а на галаву нацягнулі шапку, каб ён ня бачыў дарогі, і на аўтамабілі без нумарных знакаў вывезьлі за горад. У маладога чалавека адабралі пашпарт і мабільныя тэлефоны, бел-чырвона-белы сьцяг, партрэты кіраўнікоў Слуцкага паўстаньня. Недзе за 25 кіламетраў ад Слуцка актывіста адпусьцілі.

5 сьнежня на лідэра «Маладога Фронту» Зьмітра Дашкевіча каля ягонай кватэры напалі двое невядомых у цывільным і зацягнулі ў мікрааўтобус. На вочы яму нацягнулі дзьве шапкі і павезьлі за горад у невядомым накірунку. У лесе, куды быў завезены З. Дашкевіч, праз рукавы паліто яму працягнулі жэрдку, каб ён ня мог пэўны час нармальна рухацца, зьнялі з яго галавы шапкі і зьехалі. Высьветлілася, што моладзевы лідэр быў вывезены на адлегласьць каля 70 кіламетраў ад сталіцы.

6 сьнежня актывіст грамадзянскай кампаніі «Еўрапейская Беларусь» Яўген Афнагель быў схоплены людзьмі ў цывільным на вуліцы Бялінскага ў Менску. Яго пасадзілі ў машыну, загадалі нахіліць галаву на калені і так каля хвілінаў 20 вазілі па горадзе, а потым павезьлі ў бок Барысаўскай трасы. Праз некалькі кіламетраў аўтамабіль спыніўся, і выкрадальнікі загадалі Я. Афнагелю выйсьці. Перад тым як зьехаць, невядомыя забралі ў яго батарэю мабільнага тэлефону.

З аналізу дадзеных фактаў, сьведчаньняў пацярпелых, дэманстратыўнага характару і далейшай беспакаранасьці выканаўцаў злачынстваў вынікае, што гэта былі акцыі па запалохваньні моладзевых лідэраў, спланаваныя і праведзеныя сьпецслужбамі і сілавымі стуктурамі Беларусі.

8

На працягу году былі зафіксаваныя і іншыя выпадкі аказаньня ціску з боку сьпецслужбаў на грамадзка-палітычных актывістаў. Адным з відаў такога ціску зьяўляецца ажыцьцяўленьне аперацыяў мытнага кантролю пры перасячэньні дзяржаўнай мяжы прадстаўнікамі апазіцыйных партыяў і грамадзкіх аб’яднаньняў. Так, старшыня Праваабарончага цэнтру «Вясна» Алесь Бяляцкі і сябры Рады гэтай арганізацыі Валянцін Стэфановіч і Уладзімір Лабковіч на працягу больш чым году (з вясны 2008 па ліпень 2009) знаходзіліся ў сьпісах асобаў, адносна якіх павінны ажыцьцяўляцца аперацыі





мытнага кантролю пры кожным перасячэньні дзяржаўнай мяжы Беларусі. Дадзеныя аперацыі заключаліся ў даглядзе асабістых рэчаў і аўтамабільнага транспарту, якія праводзіліся прадстаўнікамі мытнай службы памежнага пераходу ці аэрапорту. Аб правядзеньні такога дагляду складаецца акт, копія якога выдаецца на рукі грамадзяніну. Падставай для правядзеньня такога дагляду ў актах, як правіла, пазначалася прадпісаньне начальніка зьмены памежнай службы, пры гэтым з самім прадпісаньнем грамадзянаў не знаёмілі, а таксама не паведамлялі, на якой падставе і ў сувязі з чым яны падвяргаюцца аперацыям мытнага кантролю. Не паведамлялася гэта і ў адказах на пісьмовыя звароты ў адпаведныя дзяржаўныя камітэты (мытны і памежны). Калі ж аднаму з сяброў Праваабарончага цэнтру «Вясна» ўдалося азнаёміцца з прадпісаньнем начальніка памежнай службы, там было ўказана, што аперацыі мытнага кантролю ў дачыненьні да гэтай асобы ажыцьцяўляюцца на прадмет перамяшчэньня праз дзяржаўную мяжу буйных грашовых сродкаў (болей за 1000 даляраў ЗША), а таксама друкаваных матэрыялаў, зьмест якіх накіраваны на нанясеньне шкоды канстытуцыйнаму ладу Рэспублікі Беларусь. Дагляд ажыцьцяўляўся па прадпісаньні Упраўленьня КДБ па Менску і Менскай вобласьці. Гэта значыць, што ў дачыненьні да прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасьці фактычна ажыцьцяўляліся аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы, пры гэтым ім не паведамлялася аб падставах правядзеньня падобных дзеяньняў.

8

# 9. Незаконны прызыў на тэрміновую вайсковую службу ў мэтах ізаляцыі грамадзка і палітычна актыўнай моладзі

Прызыў у войска як форма ізаляцыі ад грамадзтва і актыўнай грамадзка-палітычнай дзейнасьці практыкавалася ў часы СССР. У сучаснай Беларусі такая форма рэпрэсіяў супраць палітычна актыўнай моладзі пачала выкарыстоўвацца ў 2008 годзе і зьяўляецца вельмі зручнай для ўладаў, паколькі сам прызыў на тэрміновую службу — легітымнае законнае мерапрыемства паводле дзеючага заканадаўства Беларусі. Аднак шэраг акалічнасьцяў гэтых прызываў дазваляюць кваліфікаваць іх як менавіта палітычна матываваную форму палітычных рэпрэсіяў, скіраваных найперш на ізаляцыю моладзевых актывістаў.

Характэрныя рысы такіх прызываў:

— Усе прызыўнікі зьяўляліся актыўнымі ўдзельнікамі моладзевых палітычных арганізацыяў і неаднаразова падвяргаліся разнастайным формам перасьледу ў сувязі са сваёй дзейнасьцю (прыцягваліся да адміністрацыйнай ці крымінальнай адказнасьці).

— Большасьць прызыўнікоў напярэдадні прызыву ў войска была адлічаная з навучальных установаў. Дадзеныя адлічэньні, як правіла, не былі зьвязаныя з пасьпяховасьцю навучаньня, а адбываліся з прычыны «парушэньняў правілаў унутранага распарадку» (пропускі заняткаў, прыцягненьне да адміністрацыйнай адказнасьці і г.д.).

— Большасьць прызыўнікоў мелі адтэрміноўку ад службы ў войску па медыцынскіх супрацьпаказаньнях, якія былі пазьней перагледжаныя па ініцыятыве ваенкаматаў.

Медыцынскія камісіі праходзілі пад наглядам прадстаўнікоў КДБ, часта — у вайсковых шпіталях, якія непасрэдна ўваходзяць у сітсэму Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь, і мелі цалкам непразрысты характар.

— Мерапрыемствы па прызыве адбываліся пад кантролем альбо пры непасрэдным удзеле КДБ, суправаджаліся затрыманьнямі і гвалтоўнай дастаўкай маладых людзей у ваенкаматы і месцы дыслакацыі вайсковых частак.

— Разгляды скаргаў на мерапрыемствы па прызыве часта суправаджаліся парушэньнямі нормаў ГПК Рэспублікі Беларусь.





Асабліва абуральнымі зьяўляюцца факты перапісваньня і перагляду раней вынесеных некаторым моладзевым актывістам медыцынскіх заключэньняў аб непрыгоднасьці да вайсковай службы.

У 2009 годзе практыка палітычна матываваных прызываў ва ўзброеныя сілы атрымала далейшы працяг. Адметнасьцю іх стала суправаджэньне адпаведнай прапагандысцкай кампаніяй у дзяржаўных, у тым ліку электронных, СМІ. Усяго на працягу году падобным чынам былі прызваныя на тэрміновую вайсковую службу шэсьць актывістаў моладзевых апазіцыйных арганізацыяў: экс-старшыня Моладзі БНФ Франак Вячорка, актывісты «Маладога Фронту» Зьміцер Федарук, Іван Шыла, Яўген Скрабец і Андрэй Цянюта, актывіст моладзевай ініцыятывы «Бунт» Алесь Краўчэня.

Былы старшыня Моладзі БНФ Франак Вячорка ў ліпені 2008 году быў прызнаны непрыгодным для прахаджэньня вайсковай службы па стане здароўя паводле пастановы прызыўной камісіі Савецкага р-ну Менску; пазьней гэтая пастанова была адмененая абласной прызыўной камісіяй, якая адтэрмінавала прызыў на вайсковую службу Ф. Вячоркі да сакавіка 2009 году. Аднак 8 студзеня моладзевы лідэр быў затрыманы асобамі ў цывільным у мястэчку Ракаў у адным з прыватных дамоў. Ён быў дастаўлены ў ваенкамат Савецкага р-ну Менску, адкуль у суправаджэньні двух супрацоўнікаў міліцыі і невядомай асобы ў цывільным адвезены ў рэспубліканскі вайсковы шпіталь, які знаходзіцца ў ведамасным падпарадкаваньні Міністэрства абароны. У вайсковым шпіталі адносна Ф. Вячоркі было праведзена новае медыцынскае абсьледаваньне, пра вынікі якога ні яму, ні ягоным бацькам не было паведамлена.

16 студзеня, да завяршэньня медыцынскага абсьледаваньня, Ф. Вячорка з выкарыстаньнем фізічнай сілы і кайданкоў, быў дастаўлены некалькімі невядомымі асобамі ў цывільным у ваенкамат Савецкага р-ну сталіцы. Там яму паведамілі, што згодна з пастановай прызыўной камісіі, ён прызнаны годным да вайсковай службы і будзе неадкладна накіраваны ў войска. 19 студзеня Ф. Вячорка зьвярнуўся са скаргай на пастанову прызыўной камісіі ў суд. У сваёй скарзе актывіст прасіў прызнаць пастанову прызыўной камісіі ваенкамату Савецкага р-ну Менску аб ягоным прызыве на тэрміновую вайсковую службу неправамоцнай і ў мэтах забесьпячэньня скаргі прасіў прыпыніць яе выкананьне.

Варта адзначыць, што паводле арт. 36 Закону Рэспублікі Беларусь «Аб вайсковым абавязку і вайсковай службе» ад 22.07.2003 г., у выпадку судовага абскарджаньня пастановы прызыўной камісіі, гэтая пастанова прыпыняецца да ўступленьня рашэньня суда ў законную сілу. Таксама паводле арт. 340 ГПК Рэспублікі Беларусь, адным са сродкаў забесьпячэньня скаргі зьяўляецца абавязковае прыпыненьне выкананьня дзеяньняў, якія абскарджваюцца, у выпадках, прадугледжаных законам (у дадзеным выпадку — Законам «Аб вайсковым абавязку і вайсковай службе»).

Пасьля прыняцьця скаргі Ф.Вячоркі да вытворчасьці сваім вызначэньнем ад 20 студзеня судзьдзя суда Савецкага р-ну Менску Э. Якубоўскі прыпыніў выкананьне пастановы прызыўной камісіі. Аднак 23 студзеня, пасьля разгляду скаргі па сутнасці, судзьдзя адмовіў актывісту ў задавальненьні скаргі і вынес вызначэньне аб адмене меры па забесьпячэньні скаргі, прынятай ягоным жа вызначэньнем. Пры гэтым судзьдзя абгрунтаваў прынятае ім рашэньне арт. 257 ГПК (замена адной меры забесьпячэньня зыску іншай і адмена забесьпячэньня зыску). Аднак у дадзеным выпадку не ідзе гаворка аб зыскавой судавытворчасьці: судавытворчасьць па скарзе на пастанову прызыўной камісіі рэгулюецца артыкуламі главы 29 ГПК (вытворчасьць па справах, якія ўзьнікаюць з адміністрацыйна-прававых адносінаў), пры гэтым ні арт. 340 ГПК, ні арт. 36 Закона «Аб вайсковым абавязку і вайсковай службе» не прадугледжваюць адмену раней вынесенага судом прыпыненьня выкананьня дзеяньня, якое абскарджвалася ў судовым парадку.

У сувязі з гэтым вызначэньне суда мела незаконны характар, выкананьне рашэньня прызыўной камісіі Савецкага р-ну павінна было быць прыпынена да ўступленьня судовага рашэньня ў законную сілу, а ўлічваючы, што рашэньне суда было абскарджана ў касацыйным парадку — да разгляду дадзенай скаргі.

Акрамя таго, разгляд справы ў судзе адбываўся без удзелу самога Ф. Вячоркі і ягонага адваката, які ня быў належным чынам уведамлены пра час і месца разгляду скаргі. Гэтая акалічнасьць — сур'ёзнае парушэньне нормаў ГПК і зьяўляецца падставай для адмены вынесенага судовага рашэньня, аднак гэтага не было зроблена, і 26 лютага Менскі гарадзкі суд не задаволіў касацыйную скаргу на рашэньне суда Савецкага р-на.

28 студзеня Ф. Вячорка быў затрыманы на вуліцы асобамі ў цывільным, якія надзелі на яго кайданкі і з ужываньнем фізічнай сілы адвезьлі ў адну з вайсковых частак г. Баранавічы.





23 сакавіка Менскі міжгарнізонны вайсковы суд адмовіў Ф. Вячорку ў задавальненьні скаргі аб прызнаньні незаконнымі дзеяньняў вайскоўцаў і медыкаў падчас прызыву яго ў войска.

12 траўня было адмоўлена ў задавальненьні касацыйнай скаргі на рашэньне Менскага міжгарнізоннага суда. Да гэтага вайсковая пракуратура правяла расьсьледаваньне законнасьці дзеяньняў службовых асобаў падчас прызыву ў войска Ф. Вячоркі. Намесьнік Менскага міжгарнізоннага ваеннага пракурора падпалкоўнік юстыцыі А.Васілюк адмовіў ва ўзбуджэньні крымінальнай справы супраць службоўцаў ваенкамату Савецкана р-ну Менску і «432 Галоўнага ваеннага клінічнага медычнага цэнтру» з прычыны ўжываньня імі гвалту і перавышэньня ўлады. Адначасова ваенная пракуратура вылучыла з праверкі і накіравала паводле падсьледнасьці ў іншыя сьледчыя органы матэрыялы пра ўжываньне супраць актывіста гвалту «супрацоўнікамі міліцыі (у тым ліку неўстаноўленымі асобамі ў цывільным адзеньні)».

Ваенная пракуратура правяла эксьпертызу Ф.Вячоркі ў вайсковай частцы ў Баранавічах, якая выявіла: «Паводле заключэньня эксьперта № 263 ад 30.01.2009, пры асьведчаньні Вячоркі Ф.В. 29.01.2009 выяўлены кровападцёк на пярэднеўнутранай паверхні правага пляча, кровападцёк і ранка на задняй паверхні правага перадплечча ў праекцыі правага прамянёвазапясьцевага суставу, кровападцёкі на тыльнай паверхні правай пясьці ў праекцыі цела трэцяй пясьцевай косткі, на вонкавай паверхні левага пляча, на задняй паверхні левага перадплечча ў праекцыі левага прамянёвазапясьцевага суставу, на пярэдневонкавай паверхні правай галёнкі. Гэтыя цялесныя пашкоджаньні ў колькасьці 7 з улікам магчымасьці аднамомантавага ўтварэньня некаторых з іх утварыліся ў выніку ня менш як 6 траўматычных узьдзеяньняў тупымі прадметамі (…). Магчымасьць ўтварэньня вышэйзгаданых цялесных пашкоджаньняў у тэрмін і пры акалічнасьцях, указаных самім пацярпелым, не выключаецца».

Кіраўнік «Моладзі БНФ» Франак Вячорка ў 2008 годзе быў адлічаны з факультэту журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсітэту, нягледзячы на тое, што ён быў пасьпяховым студэнтам. Адлічэньне моладзевага лідэра з БДУ, парушэньні нормаў дзеючага ГПК пры разглядзе скаргі судом у сукупнасьці з іншымі фактамі прызыву сьведчаць аб загадзя спланаванай ягонай палітычна-матываванай ізаляцыі.

Актывіст «Маладога Фронту» Зьміцер Федарук быў затрыманы 28 студзеня супрацоўнікамі Першамайскага РУУС Менску ва ўласнай кватэры і дастаўлены ў Цэнтр ізаляцыі правапарушальнікаў. Падставай для затрыманьня і далейшай ізаляцыі З. Федарука стала тое, што ён не адбыў 15 сутак адміністрацыйнага арышту, які быў накладзены на яго паводле пастановы суда за ўдзел у мірным сходзе 8 месяцаў таму. Паколькі арт. 13.6 Працэсуальна-выканаўчага кодэксу аб адміністрацыйных правапарушэньнях дакладна вызначае тэрміны выкакананьня пакараньня па адміністрацыйных справах — 3 месяцы, арышт моладзевага актывіста быў незаконным. Арышт быў выкарыстаны супрацоўнікамі сьпецслужбаў дзеля дастаўкі З. Федарука на медыцынскую і прызыўную камісіі, якія былі закрытыя і праходзілі ў прысутнасьці асобаў у цывільным. Медыцынская камісія прыняла рашэньне аб годнасьці З. Федарука да службы ў войску, і ён быў адпраўлены ў вайсковую частку, дзе ўжо праз некалькі дзён апынуўся ў шпіталі ў сувязі з хранічнымі захворваньнямі. Усе спробы абскарджаньня рашэньня прызыўной камісіі былі марнымі — скаргі не былі задаволеныя судамі. Адзінае, што пракуратура Першамайскага р-ну сталіцы па выніках разгляду скаргі на незаконнае ўтрыманьне З. Федарука пад арыштам у Цэнтры ізаляцыі правапарушальнікаў накіравала інфармацыю начальніку Першамайскага РУУС, каб той прыняў адпаведныя меры, накіраваныя на недапушчэньне падобных парушэньняў у будучай працы. Пры гэтым «істотных парушэньняў заканадаўства» пры праверцы пракуратура ня выявіла і ніякіх мераў пракурорскага рэагаваньня прынята не было: вінаватыя ў незаконным арышце З. Федарука не былі ўстаноўленыя і не панесьлі адказнасьці.

У 2007 годзе Зьміцер Федарук быў прыцягнуты да крымінальнай адказнасьці за дзейнасьць у моладзевай арганізацыі «Малады Фронт» па арт. 193.1 КК Рэспублікі Беларусь (арганізацыя дзейнасьці палітычнай партыі, грамадзкага аб'яднаньня, фонду, якія не прайшлі дзяржаўнай рэгістрацыі ва ўстаноўленым законам парадку ці ўдзел у такой дзейнасьці) і падвергнуты штрафу. Ягоны прызыў у войска расцэньваецца як працяг перасьледу за актыўную грамадзкую пазіцыю.

Намесьнік старшыні «Маладога Фронту» з Салігорску Іван Шыла быў затрыманы позна ўвечары 28 студзеня супрацоўнікамі міліцыі і дастаўлены ў ваенкамат на прызыўную камісію, якая прызнала яго прыдатным да службы ў войску. Гэтай жа ноччу





І. Шыла ў суправаджэньні супрацоўнікаў міліцыі быў дастаўлены ў вайсковую частку ў Лепельскім раёне Віцебскай вобласьці. У лістападзе 2008 году прызыўная камісія прызнала моладзевага актывіста непрыдатным да службы ў войску па медыцынскіх паказаньнях, але ўжо ў студзені 2009 году дыягназ быў перагледжаны. Усе спробы абскардзіць рашэньне прызыўной камісіі ў судовым парадку плёну не далі. 3 сьнежня Іван Шыла быў камісаваны з войска паводле рашэньня медыцынскай камісіі, якая ўстанавіла ў маладога чалавека моцную алергію, несумяшчальную са службай у войску. Моладзевы актывіст праслужыў больш за 10 месяцаў.

У верасьні 2007 году Іван Шыла быў асуджаны па арт. 193.1 Крымінальнага кодэксу (арганізацыя дзейнасьці палітычнай партыі, грамадзкага аб'яднаньня, фонду, якія не прайшлі дзяржаўнай рэгістрацыі ва ўстаноўленым законам парадку, ці ўдзел у такой дзейнасьці) за дзейнасьць у арганізацыі «Малады Фронт». У чэрвені 2008 году ён быў адлічаны са школы № 4 перад апошнім выпускным іспытам, судовыя абскарджаньні былі безвыніковымі. У выніку І. Шыла быў пазбаўлены магчымасьці атрымаць сярэднюю адукацыю і паступіць у ВНУ (атрымаць адтэрміноўку ад службы ў войску ў сувязі з навучаньнем). Толькі ўлетку 2009 году пасьля шматлікіх зваротаў у Міністэрства абароны І. Шылу дазволілі здаць апошні іспыт і атрымаць атэстат аб сярэдняй адукацыі.

У студзені быў прызваны ў войска актывіст моладзевай арганізацыі «Бунт» з Баранавічаў Алесь Краўчэня. Падчас летняга прызыву 2008 году малады чалавек атрымаў адтэрміноўку ад войску на некалькі месяцаў па стане здароўя, але ў студзені 2009 году ў апошнія дні прызыву яго прымусілі праходзіць тэрміновы медагляд, дзе ўсе папярэднія дыягназы зьмянілі і за некалькі дзён накіравалі ў чыгуначныя войскі ў Асіповіцкі раён Магілёўскай вобласьці. Улетку 2008 году А. Краўчэня быў выключаны з чацьвёртага курсу інжынернага факультэту Баранавіцкага унівэрсітэту.

21 верасьня актывіст «Маладога Фронту» з Брэсту Яўген Скрабец быў прызваны на тэрміновую вайсковую службу і накіраваны ў чыгуначныя войскі (г. Жлобін, Гомельская вобласьць). Да гэтага Я. Скрабец меў адтэрміноўку ад прызыву па медыцынскіх паказаньнях на 6 месяцаў, але паўторная медыцынская і прызыўная камісіі перагледзелі ранейшыя дыягназы і прызналі яго годным да

службы ў войску. Яўген Скрабец неаднаразова падвяргаўся разнастайным формам ціску з боку сьпецслужбаў у сувязі са сваёй грамадзка-палітычнай дзейнасьцю, з 2009 году ён зьяўляўся карэспандэнтам незалежнага беларускага Радыё «Рацыя».

22 верасьня быў прызнаны годным да праходжаньня тэрміновай службы і адпраўлены ў войска актывіст «Маладога Фронту» з Гомелю Андрэй Цянюта. Моладзевы актывіст меў адтэрміноўку ад прызыву ў сувязі з навучаньнем у ВНУ — Бранскай сельскагаспадарчай акадэміі ў Расійскай Федэрацыі. У ліпені А. Цянюта быў выкліканы па позьве ў ваенкамат, дзе даведаўся, што ягоная адтэрміноўка ад прызывуануляваная ў сувязі з адлічэньнем з ВНУ, пра якое ён упершыню пачуў, паколькі па месцы вучобы ў яго не было ніякіх запазычанасьцяў і заўвагу з боку адміністрацыі. Загад аб адлічэньні з ВНУ быў абскарджаны ў Міністэрства адукацыі РФ, але безвынікова. У А. Цянюты спачатку былі выяўленыя шэраг захворваньняў, пры наўянасьці якіх асоба прызнаецца непрыдатнай для праходжаньня тэрміновай службы (зацьверджаныя пастановай Міністэрства аховы здароўя і Міністэрства абароны), аднак паўторная медыцынская і прызыўная камісіі перагледзелі гэтыя дыягназы. Малады чалавек быў адпраўлены ў мотастралковыя войскі ў г. Полацк (Віцебская вобл.), а адтуль праз пэўны час пераведзены ў паветрана-дэсантныя войскі ў Віцебск, што выклікае асаблівую занепакоенасьць, паколькі служба ў войсках сьпецыяльнага прызначэньня зьвязана з вялікімі фізічнымі нагрузкамі.

Андрэй Цянюта неаднаразова падвяргаўся затрыманьням, адміністрацыйным арыштам за ўдзел у мірных сходах і выказваньне свайго меркаваньня. На працягу 2007-2008 гг. ён знаходзіўся ў статусе падазраванага па крымінальнай справе, узбуджанай па арт. 193.1 КК РБ (арганізацыя дзейнасьці палітычнай партыі, грамадзкага аб'яднаньня, фонду, якія не прайшлі дзяржаўнай рэгістрацыі ва ўстаноўленым законам парадку ці ўдзел у такой дзейнасьці). Справа была ўзбуджаная Упраўленьнем КДБ па Гомельскай вобласьці.

Аналіз акалічнасьцяў, якія суправаджалі прызыў моладзевых актывістаў на тэрміновую службу, а таксама падзеяў, якія ім папярэднічалі (ціск, затрыманьні, адлічэньні з ВНУ, прыцягненьне да адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасьці), дазваляюць кваліфікаваць іх як палітычна матываваныя і арганізаваныя сьпецслужбамі ў мэтах ізаляцыі канкрэтных асобаў моладзевага руху.







# 10. Выкарыстаньне катаваньняў і іншых відаў жорсткага ці негуманнага абыходжаньня

Згодна з арт. 25 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, ніхто не павінен падвяргацца катаваньням, жосткаму, бесчалавечнаму ці прыніжаючаму гонар абыходжаньню ці пакараньню, а таксама бяз згоды падвяргацца медыцынскім і іншым эксьперыментам. Дадзенае палажэньне захоўвае сваю сілу пры любых выключных абставінах (вайсковае становішча ці пагроза вайны, унутраная палітычная нестабільнасьць і г.д.).

Недапушчальнасьць катаваньняў і адказнасьць за іх выкарыстаньне прадугледжваюць таксама законы і нарматыўныя акты Рэспублікі Беларусь. Так, п. 3 арт. 11 Крымінальна-працэсуальнага кодэксу (КПК) гарантуе недапушчальнасьць гвалту, іншых жорсткіх ці прыніжаючых чалавечы гонар відаў абыходжаньня ў адносінах да ўсіх удзельнікаў працэсу. Арт. 12 КПК забараняе пры вытворчасьці па крымінальнай справе дзеяньні і рашэньні, якія прыніжаюць гонар і годнасьць ці ствараюць небясьпеку для жыцьця і здароўя ўдзельнікаў крымінальнага працэсу. Наступствы і матэрыяльная кампенсацыя маральнай шкоды, прычыненай пры ўчыненьні злачынства ці незаконнымі дзеяньнямі службовых асобаў, якія вядуць крымінальны працэс, ліквідуюцца і ажыцьцяўляюцца ў парадку, прадугледжаным КПК. Разам з тым, нягледзячы на тое, што заканадаўства Рэспублікі Беларусь прадугледжвае адказнасьць за выкарыстаньне катаваньняў і іншых відаў жорсткага абыходжаньня з боку службовых асобаў, яно не ўтрымлівае раскрыцьця самога тэрміну «катаваньне».

Рэспубліка Беларусь (у той час — БССР) ратыфікавала Канвенцыю ААН супраць катаваньняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных ці прыніжаючых годнасьць відаў абыходжаньня і пакараньня 13 сакавіка 1987 году (уступіла ў дзеяньне 26 чэрвеня таго ж году), але пры падпісаньні зрабіла заяву, што не прызнае кампетэнцыю адпаведнага Камітэту, вызначаную арт. 20 дадзенай Канвенцыі (кампетэнцыю Камітэту ў правядзеньні расьследаваньняў фактаў катаваньняў, наведваньня ў гэтых мэтах краіны-ўдзельніцы і г.д.). Дадзеная агаворка была зьнятая Рэспублікай Беларусь 20 ліпеня 2000 году,

аднак дзяржава не заявіла асобна аб прызнаньні кампетэнцыяў Камітэту, прадугледжаных арт.арт. 21 і 22 Канвенцыі (дзяржаўная скарга, індывідуальныя звароты). Беларусь таксама не далучылася да Факультатыўнага пратаколу да Канвенцыі (быў прыняты Рэзалюцыяй 57/199 Генеральнай Асамблеі ААН ад 18 снежня 2002 г. і ўступіў у дзеяньне 22 чэрвеня 2006 г.), галоўнай мэтай якога зьяўляецца стварэньне сістэмы рэгулярных наведваньняў міжнароднымі і нацыянальнымі органамі месцаў, дзе знаходзяцца пазбаўленыя волі асобы, з мэтай папярэджаньня катаваньняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных ці прыніжаючых відаў абыходжаньня і пакараньня. Праваабарончыя арганізацыі Беларусі, у сваю чаргу, настойваюць на прызнаньні Беларусьсю кампетэнцыяў Камітэту супраць катаваньняў, прадугледжаных арт.арт. 21 і 22 Канвенцыі, і аб далучэньні да Факультатыўнага пратаколу да Канвенцыі.

На працягу 2009 году фіксаваліся шматлікія выпадкі катаваньняў у адносінах да ўдзельнікаў мірных сходаў, і асаблівай жорсткасьцю вызначыліся супрацоўнікі міліцыі ў дачыненьні да затрыманых 9 і 16 верасьня.

9 верасьня некалькі дзясяткаў чалавек на Кастрычніцкай плошчы Менску выказвалі пратэст з нагоды ўвядзеньня ў Беларусь вайсковага кантынгенту Расійскай Федэрацыі для ўдзелу ў сумесных беларуска-расійскіх вайсковых вучэньнях. Пратэстуючыя трымалі расьцяжку «Russian army go home». На месца правядзеньня пікету прыбылі служачыя палку міліцыі сьпецыяльнага прызначэньня і пачалі затрыманьні ўдзельнікаў акцыі з ужываньнем фізічнай сілы. Гвалт працягваўся і ў міліцэйскім аўтобусе, дзе некаторыя затрыманыя былі кінутыя на падлогу, зьбіваліся, у адносінах да іх гучалі пагрозы згвалтаваньня (аднаго з затрыманых абяцалі «адпетушыць» на вачах ва ўсіх), абразы, нецэнзурная лаянка. Зьбіцьцё працягвалася і ў будынку РУУС Цэнтральнага р-ну Менску, дзе ўсе затрыманыя каля трох гадзінаў па загадзе міліцыі стаялі тварам да сьцяны, а супрацоўнікі міліцыі адмаўляліся выклікаць хуткую медыцынскую дапамогу па іх просьбе. Калі на наступны дзень затрыманыя (17 чалавек) былі дастаўленыя з Цэнтру ізаляцыі правапарушальнікаў, дзе яны правялі ноч, у суд Цэнтральнага р-на Менску (усе абвінавачваліся ў парушэньні парадку правядзеньня масавых мерапрыемстваў), на тварах некаторых з іх былі выразныя сьляды пабояў: у прыватнасьці, у Зьміцера Бародкі быў разьбіты да крыві

10





нос, у Максіма Сяргейца расьсечанае брыво, на твары Віктара Івашкевіча была бачная гематома.

Сітуацыя паўтарылася 16 верасьня, падчас пікету з нагоды 10-й гадавіны зьнікненьня вядомага палітыка Віктара Ганчара і ягонага сябра Анатоля Красоўскага. Акцыя праводзілася на Кастрычніцкай плошчы Менску і мела мірны характар: удзельнікі ніякім чынам не перашкаджалі руху транспарту, грамадзянам і працы ўстановаў гандлю, трымалі ў руках толькі партрэты зьніклых. Нягледзячы на гэта, удзельнікі былі затрыманыя (усяго 31 чалавек) і дастаўленыя ў РУУС Цэнтральнага р-ну, дзе яны правялі каля трох гадзінаў і былі адпушчаныя без афармленьня пратаколаў аб адміністрацыйным правапарушэньні, некаторыя былі падвергнуты дактыласкапіі (незаконна, паколькі ў адносінах да іх не складаліся пратаколы аб адміністрацыйным правапарушэньні). Вызваленыя з РУУС паведамілі, што затрыманыя ўвесь час свайго знаходжаньня ў аддзяленьні міліцыі (каля трох гадзінаў) стаялі тварам да сьцяны, некаторых з іх зьбівалі: у прыватнасьці, палітыка Міколу Статкевіча супрацоўнікі міліцыі спрабавалі паставіць на расьцяжку і білі па нагах да таго моманту, пакуль той ня ўпаў на падлогу. Многія ўказвалі на факты пагрозаў згвалтаваньня ў дачыненьні да затрыманых дзяўчат, а таксама выказваньні ў іх адрас з боку супрацоўнікаў міліцыі, якія можна характарызаваць як сексуальныя дамагальніцтвы.

У сувязі з падзеямі 9 і 16 верасьня частка асобаў, якія пацярпелі ад гвалту міліцыі, падалі скаргі ў пракуратуру Цэнтральнага раёну сталіцы (усяго 6 скаргаў). Ніжэй прыводзім вытрымкі з некаторых скаргаў.

Са скаргі Аляксея Сянчылы па падзеях 9 верасьня: «Пасьля затрыманьня я быў дастаўлены у сьпецтранспарт (аўтобус ПАЗ), дзе супрацоўнікі ПМСП, якія там прысутнічалі, кінулі мяне на падлогу і загадалі ляжаць тварам уніз. Калі я паспрабаваў падняць галаву, адзін са стаяўшых побач супрацоўнікаў ПМСП нанёс мне моцны ўдар нагой у галаву. Ад гэтага ўдару я адчуў сабе вельмі кепска: у мяне кружылася галава, ванітавала. Нягледзячы на мае словы аб тым, што я пакутую на анкалагічнае захворваньне, мне не было дазволена падняцца і сесьці на сядзеньне салону аўтобусу. У такім становішчы я знаходзіўся на працягу ўсяго часу руху аўтобусу ў Цэнтральны РУУС г. Менску. Пры гэтым супрацоўнікі ПМСП абражалі мяне нецэнзурнай лаянкай, дапускалі ў мой адрас

10

выказваньні, якія прыніжаюць маю чалавечую годнасьць. У Цэнтральным РУУС мяне паставілі тварам да сьцяны. Ад нанесенага ўдару па галаве я адчуваў сябе зусім кепска, у сувязі з чым зьвярнуўся з просьбай, каб мне выклікалі хуткую дапамогу, але супрацоўнікі міліцыі адмовіліся. Практычна ўвесь час я сядзеў на падлозе каля сьцяны РУУС, паколькі мне было цяжка стаяць. Адзінае, што мне было дазволена зрабіць, гэта прайсьці ў актавую залу і сесьці там на крэсла. Там я паўторна папрасіў выклікаць мне хуткую дапамогу, аднак мне было зноў адмоўлена ў гэтым».

Са скаргі Максіма Сяргейца па падзеях 9 верасьня: «Пасьля таго, як я быў дастаўлены ў сьпецтранспарт (аўтобус ПАЗ), мяне кінулі на падлогу і некалькі чалавек у форме ПМСП пачалі зьбіваць нагамі па галаве і целе. Пры гэтым супрацоўнікі міліцыі патрабавалі, каб я ляжаў выключна тварам у падлогу, і пры любой спробе падняць галаву мне наносілі ўдары, выкарыстоўвалі балявыя прыёмы ў выглядзе захвату за горла і выціскання пальцамі вачэй. У выніку гэтых удараў у мяне было расьсечанае правае брыво і з раны цякла кроў, аднак супрацоўнікі ПМСП працягвалі трымаць мяне на падлозе, перыядычна ставячы свае ногі мне на цела і галаву. Пры гэтым супрацоўнікі ПМСП увесь час абражалі мяне нецэнзурнай лаянкай, усяляк прыніжалі маю чалавечую годнасьць. Пасьля маіх патрабаваньняў спыніць незаконныя дзеяньні ў адносінах да мяне былі выкарыстаныя кайданкі. Мне закруцілі рукі за сьпіну такім чынам, што гэта прычыняла мне моцны боль. Пры гэтым адзін з супрацоўнікаў ПМСП (як пазьней мне стала вядома, гэта быў супрацоўнік ПМСН Уладзімір Кручэня), паставіў мне на рукі сваю нагу. У такім становішчы — лежачы тварам у падлогу, з рукамі, заламанымі за сьпіну і ў кайданках на руках, я знаходзіўся ўсю дарогу да Цэнтральнага РУУС. (…) 10.09.2009 г. я быў дастаўлены ў суд Цэнтральнага р-ну г. Менску, для разгляду справы аб адміністрацыйным правапарушэньні па ч.1 арт. 23.34 КаАП Рэспублікі Беларусь. У чаканьні судовага разьбіральніцтва я і іншыя затрыманыя знаходзіліся ў адной з залаў суда. Калі ў зале засталіся я, А. Сянчыла, З. Дашкевіч і два супрацоўнікі міліцыі, адзін з іх у званьні ст. лейтэнанта пачаў зьбіваць З. Дашкевіча, нанёсшы яму некалькі ўдараў далонямі па твары. Пасьля маіх патрабаваньняў спыніць незаконныя дзеяньні ст. лейтэнант нанёс мне удар рацыяй па галаве, а таксама далоньню рукі ў вобласьць правага вуха, абражаючы пры гэтым мяне нецэнзурнай лаянкай».





Са скаргі Максіма Сяргейца па падзеях 16 верасьня: «У РУУС Цэнтральнага раёну мяне і іншых затрыманых паставілі тварам да сьцяны ў калідоры. Пасьля таго, як супрацоўнікі РУУС перапісалі нашыя пашпартныя дадзеныя і сышлі, у калідоры засталіся супрацоўнікі ПМСП. Некалькі з іх перыядычна падыходзілі да затрыманых і задвалі розныя пытаньні і ўсяляк абражалі іх, некаторых зьбівалі. Праходзячы каля мяне, некалькі супрацоўнікаў ПМСП схапілі мяне за пасмы валасоў і зьдзекліва пачалі запытвацца, што гэта, называючы мяне зьдзеклівым тонам Косьцем Дзю. Затым яны завялі мяне ў адзін з кабінетаў РУУС, дзе чацьвёра супрацоўнікаў ПМСП у форме прыціснулі мяне да сьцяны, а пяты адрэзаў мне нажніцамі пасму валасоў на патыліцы. Пасьля гэтага мне загадалі пакласьці рукі за галаву і адправілі стаяць назад у калідор. У калідоры я прыбраў адстрыжаныя валасы з-пад каўнера і паклаў у кішэню. Праз пэўны час да мяне зноў падыйшоў адзін з супрацоўнікаў ПМСП і сказаў: «Ну што, ужо абрэзалі, давай падкантую», пасьля чаго дастаў нейкі прадмет і паднёс да маёй галавы. Па гуку я зразумеў, што гэта электрабрытва. Пазьней Зьміцер Кудрыцкі, які бачыў тое, што адбывалася, патлумачыў мне, што гэта быў мабільны тэлефон, на які невядома навошта быў запісаны гук працуючай электрабрытвы».

Са скаргі Аляксандра Сьцепаненкі па падзеях 16 верасьня: «Калі я ўжо быў дастаўлены ў службовы аўтобус ПМСП, супрацоўнікі міліцыі ў цывільнай вопратцы сталі наносіць мне ўдары ў вобласьць галавы, тулава, рук і ног. Каля службовага аўтобусу адзін з супрацоўнікаў ПМСП загнуў мне руку за сьпіну, а іншы супрацоўнік міліцыі нанёс мне ўдар кулаком у вока. Па выніках абсьледаваньня ў прыёмным пакоі 2-й клінічнай бальніцы мне быў пастаўлены дыягназ: «параарбітальная гематома справа». У аўтобусе мяне паклалі на падлогу і ўвесь час зьбівалі нагамі. Удары наносіліся ў вобласьць галавы і сьпіны. Трэба адзначыць, што ні я, ні іншыя затрыманыя асобы не аказвалі супраціўленьня ні пры затрыманьні, ні пасьля яго, калі ўжо знаходзіліся ў аўтобусе і ў будынку РУУС Цэнтральнага раёну г. Менску».

Па зваротах пацярпелых Галоўным упраўленьнем уласнай бясьпекі МУС і пракуратуры Цэнтральнага р-ну былі праведзеныя праверкі, аднак яны не ўстанавілі парушэньня дзеючага заканадаўства з боку супрацоўнікаў міліцыі. Так, у адказе ад 8 кастрычніка за подпісам начальніка 3-га ўпраўленьня МУС Кісьцернага В.А., які

быў дасланы па скарзе А. Сьцепаненкі, сказана: «Пацьвердзіць альбо абвергнуць вашыя довады аб выкарыстаньні фізічнай сілы супрацоўнікамі ПМСН у межах службовай праверкі не ўяўляецца магчымым, а довады аб абразах затрыманых не знайшлі свайго аб'ектыўнага пацьверджаньня і абвяргаюцца тлумачэньнямі супрацоўнікаў міліцыі». Падобныя адказы былі атрыманыя і іншымі асобамі, якія падавалі скаргі на дзеяньні супрацоўнікаў міліцыі. Пракуратура Цэнтральнага р-ну Менску таксама не знайшла пацьверджаньня ўказаных у скаргах фактаў і адмовіла заяўляльнікам ва ўзбуджэньні крымінальных справаў у адносінах да супрацоўнікаў міліцыі за ўжываньне катаваньняў. Трэба адзначыць, што практыка адмаўленьня ва ўзбуджэньні крымінальных справаў па фактах катаваньняў у дачыненьні да ўдзельнікаў мірных сходаў носіць у Беларусі сістэматычны характар: дзяржаўныя органы адмаўляюцца праводзіць належнае расьсьледаваньне такіх выпадкаў і прыцягваць да адказнасьці супрацоўнікаў міліцыі, якія дапусьцілі перавышэньне сваіх службовых паўнамоцтваў.

Па дадзеных фактах Праваабарончы цэнтр «Вясна» сумесна з Міжнароднай федэрацыяй правоў чалавека (FIDH) накіравалі паведамленьне сьпецрэпарцёру Камітэту па катаваньнях і іншых жорсткіх відах абыходжаньня ААН Манфрэду Новаку. Да паведамленьня былі дададзеныя скаргі пацярпелых, а таксама паказаньні некалькіх непасрэдных сьведак катаваньняў і апісаньне адбыўшыхся падзеяў.

У сувязі з адсутнасьцю грамадзкага кантролю за дзейнасьцю сілавых структураў і сьпецслужбаў, праблема катаваньняў у Беларусі ў падаўляючай большасьці мае латэнтны характар: выкарыстаньне службовымі асобамі жорсткага абыходжаньня з затрыманымі і арыштаванымі зрэдку становіцца прадметам галоснасьці.

Занепакоенасьць таксама выклікае становішча асобаў, якія ўтрымліваюцца ў псіхіятрычных бальніцах, ЛПП і ва ўстановах, дзе адбываецца прымусовае лячэньне хворых на сухоты.

Праваабарончы цэнтр «Вясна» працягваў збор інфармацыі аб умовах утрыманьня хворых на алкагалізм «ізаляваных асобаў» у ЛПП, а таксама аб выкарыстаньні прымусовай працы адносна гэтай катэгорыі грамадзянаў. Варта адзначыць, што праваабаронцы лічаць практыку ізаляцыі грамадзянаў у ЛПП у межах грамадзянскага судовага працэсу (не ў сувязі з учыненьнем злачынства) на







1,5 гады парушэньнем права на асабістую свабоду, а выкарыстаньне іх працы — прымусовай працай.

Ніжэй прыводзім вынікі апытаньня былых ізаляваных у ЛПП (21.11.2009 г., запісана ў г. Чавусы Магілёўскай вобласьці. У размове ўдзельнічаюць праваабаронцы Барыс Бухель і Аляксей Колчын, а таксама: Іванова Аксана Рыгораўна, знаходзілася ў ЛПП з 19.06.2008 г. па 09.06.2009 г.; Казубоўская Таісія Аляксандраўна, знаходзілася ў ЛПП з 19.06.2008 па 12.05.2009 г.; Белянкоў Вячаслаў Іванавіч, сужыцель Ложнікавай Ірыны Міхайлаўны, якая знаходзіцца ў ЛПП з 10.06. 2009 г.):

Умовы ўтрыманьня: Ацэньваюцца як «жудасныя», «цяжкія». Усяго — два двухпавярховыя карпусы. У памяшканьнях для пражываньня вільгаць, зімой холадна (падчас сну вымушаныя накрывацца целагрэйкамі і спаць апранутымі). Працякае дах, у выніку чаго на верхнія ложкі (3-ці ярус) устанаўліваюцца тазы, і людзі сьпяць па 2-3 чалавекі на адным ложку. Летам — горача, задушна. Ацяпляльныя батарэі грэюць слаба. Вокны са шчылінамі, зьмешчаныя ў ЛПП самі абклейваюць іх. У санчастцы людзі сьпяць на падлозе, на матрасе.

Для пражываньня выкарыстоўваюцца непрыстасаваныя для гэтага памяшканьні: напрыклад, тамбурнае памяшканьне перад сушыльным пакоем (прахадны пакой плошчай каля 18 кв.м., у якім у 2008 г. адначасова разьмяшчалася ад 18 да 27 чалавек). Вокны ў гэтым памяшканьні забраныя кратамі (у астатніх памяшканьнях — няма). У звычайным памяшканьні (плошчай прыкладна да 80 кв.м.) пражывае да 60 чалавек. Там таксама ўстаноўленыя трох'ярусныя ложкі, праходы паміж імі менш за паўметра, двум чалавекам немагчыма разьмінуцца, падчас пад'ёму вялікая цесната.

Падчас наведваньня камісіямі ўсіх, хто ўтрымліваецца ў ЛПП, вывозяць на працы і зачыняюць у сушыльных памяшканьнях, каб схаваць іх сапраўдную колькасьць. У ЛПП ўтрымліваецца каля 1200 чалавек адначасова. У лістападзе 2009 — 850 чалавек (са слоў Ложнікавай).

Праводзяццаператрусы ў памяшканьні для пражываньня, у тым ліку афіцэрамі міліцыі — мужчынамі. Пасьля вяртаньня ўсе выстройваюцца на пляцы, пералічваюцца (звычайна ў 18-00). За парушэньні зьмяшчаюць у маленькі карцэр, які знаходзіцца ў падвальным памяшканьні. Карцэр ацеплены, але летам там холадна. Бялізна мяняецца два разы на месяц. Бялізна часта выдаецца недастаткова чыстай, у плямах. Вельмі малая колькасьць прыбі-

ральняў і рукамыйніц: на другім паверсе, на якім адначасова пражывае каля 300 чалавек, толькі тры ўнітазы і пяць рукамыйніц (з якіх у працоўным стане — тры). На ўвесь ЛПП — толькі чатыры душы (у працоўным стане былі тры з іх). Часта таксама не бывае вады, і людзям даводзіцца выходзіць на вуліцу па ваду. У рукамыйніку — толькі халодная вада. Мыла выдаецца.

Асьвятленьне дастатковае. Чытаць не дазваляецца. Акрамя таго, свабоднага асабістага часу ў ЛПП практычна няма, нават у выходныя дні. Адбой — у 22-00, пасьля чаго адключаецца асьвятленьне. Бібліятэка ёсьць, але літаратура толькі «ваенная». Прымушаюць за свой кошт выпісваць мясцовую дзяржаўную газету «Працоўны шлях». Радыё ў памяшканьні няма. У «вялікім» пакоі ёсьць адзін тэлевізар (рамонт ажыцьцяўляўся за кошт «пацыентаў»). Для прагулак выкарыстоўваецца «пляц», які знаходзіцца ўнутры тэрыторыі ЛПП. Тэрыторыя адгароджана калючым дротам. Сабак у ахове няма. Таксафон ў ЛПП толькі адзін — знаходзіцца на КПП, размовы чуваць, і таксама, са слоў К. і І., праслухоўваюцца. Лісты часта не даходзяць або даходзяць з вялікімі затрымкамі — да паўгода. Карэспандэнцыя падлягае цэнзуры: канверты з лістамі пры адпраўленьні з ЛПП не заклейваюцца, іх апускаюць у паштовую скрыню адкрытымі, аднак да адрасата прыходзяць ўжо ў запячатаным выглядзе. Спатканьне — да трох гадзінаў у прысутнасьці «кантралёра», які чуе гутарку. Па пасылках абмежаваньняў няма. Адзін раз на месяц прыяжджае аўталаўка, у якой можна набыць неабходныя тавары.

<u>Харчаваньне:</u> У залежнасьці ад часу выезду на аб’ект сьняданак можа выдавацца рана, у 4.30. На працягу ўсяго дня да вяртаньня ў ЛПП (17.00 — 19.00) людзей больш ня кормяць, таму многія ня сьнедаюць, а бяруць з сабой, каб паабедаць на аб’екце. Абед выдаюць пасьля вяртаньня з аб’екту ў ЛПП. Якасьць ежы «жахлівая»: пярлоўка, сечка, авёс, жудасная вараная рыба. Садавіны, гародніны не даюць, а таксама не дазваляюць з сабой прыносіць з працы ў ЛПП (адбіраюць на КПП). Не дазваляецца перадаваць цукар (варэньне можна).

<u>Праца:</u> Пад’ём на працу ў 3.00 — 3.30 раніцы (у залежнасьці ад аддаленасьці аб’екту для працы). Праца праходзіць пад аховай «кантралёраў». Сьпецадзеньнем не забясьпечваюцца, нават рукавіцамі. Выдаюць «халат, флікер і хустку» за кошт зьмешчаных у ЛПП (павінны аплаціць кошт, прычым у абавязковым парадку).





Сьпецадзеньне, абутак таксама выдаюць з наступным утрыманьнем кошту з заробку (у выпадку непагашэньня пазыкі не прымяняецца датэрміновае вызваленьне з ЛПП).

Выкарыстоўваюцца на будоўлях, часам здараюцца няшчасныя выпадкі. Каскі, рамяні бясьпекі не выдаюцца. Інструктаж па ТБ не праводзіцца, толькі зьбіраюцца подпісы аб нібыта праведзеных інструктажах. У асабістых мэтах у вызначаны перыяд працу не выкарыстоўвалі. Зімой не дазваляецца грэцца ў ацепленай машыне. У выпадку канфліктаў з кіраўніцтвам на працоўным месцы разгляды не праводзяцца, работнікі, якія ўтрымліваюцца ў ЛПП, проста пераводзяцца на іншую працу. Выбраць сабе працу нельга. Т. Казубоўская ні разу ня мела выходных на працягу паўгода (з моманту зьмяшчэньня ў ЛПП) — гэта звычайная практыка. Працоўны дзень можа працягвацца больш за 8 гадзінаў. Звышурочныя не аплочваюцца. Няма таксама ніякіх надбавак за працу ў выходныя дні, ніякіх прэмій. Пры гэтым табелі працоўнага часу афармляюцца майстрам у адпаведнасьці з заканадаўствам: такім чынам, ня ўлічваюцца фактычна адпрацаваныя працоўныя дні (гадзіны), якія перавышаюць устаноўленыя нарматывы. Дастаўляюць на працоўнае месца на аўтобусах і адкрытых машынах, у тым ліку ў зімовы час. Транспарт не ацяпляецца.

Часам на месцы працы працуюць разам жанчыны з ЛПП і гэтак званыя «хімікі»-мужчыны, у сувязі з гэтым ўзьнікаюць розныя эксцэсы.

<u>Медыцынскае абслугоўваньне:</u> Санітарна-гігіенічнымі сродкамі не забясьпечваюцца, трэба набываць за свае грошы. У ЛПП няма ўрача-нарколага, гінеколага. Ёсьць тэрапеўт, зубны ўрач, тры медсястры, часам псіхолаг. Урачэбная дапамога звычайна заключаецца ў выдачы таблеткі анальгіну. Лячэньня ад алкагалізму ніякага не праводзіцца, толькі ў першыя тры дні ўтрыманьня выдаюць адно дражэ аскарбінавай кіслаты і дзьве таблеткі валяр’яны. Пры паступленьні правяраюць на педыкулёз і каросту, ніякага іншага медыцынскага абсьледаваньня не праводзіцца. Зафіксаваны выпадак, калі зьмешчаная ў ЛПП у стане алкагольнага ап’яненьня пасьля страціла розум. Раз на год праводзіцца флюараграфічнае абсьледаваньне. Здараецца, што трох’ярусныя ложкі не дазваляюць аказваць неабходную медыцынскую дапамогу: зафіксаваны выпадак, калі ў адной з жанчын быў прыступ падучай хваробы, а медработнік не змагла дабрацца да яе на трэці ярус ложка.

Сродкі на жыцьцё: Фактычна існаваць можна толькі на ўласныя сродкі, якія паступаюць звонку (грашовыя пераводы, пасылкі і т.п.), паколькі заробкі надзвычай малыя. У месяц заробак складае ад 80000 да 130000 рублёў. Пры гэтым на «атаварку» выдзяляецца толькі 10% ад гэтай сумы, г. зн. ад 8000 да 13000 на месяц. Звычайныя рабочыя, якія працуюць на будоўлях і аб'ектах разам з тымі, хто ўтрымліваецца ў ЛПП, атрымліваюць значна большы заробак за тую ж самую працу: да 1 500 000 руб. Астатнія сродкі з заробку ідуць на аплату пражываньня ў інтэрнаце ЛПП, пагашэньне запазычанасьцяў — напрыклад, за ўтрыманьне дзяцей на апецы дзяржавы (у тых выпадках, калі яны былі пазбаўленыя бацькоўскіх правоў і мелі непаўнагадовых дзяцей). З-за маленькіх заробкаў запазычанасьці перад дзяржавай за ўтрыманьне дзяцей за час знаходжаньня ў ЛПП вырастаюць. Так, у Казубоўскай і Івановай пазыкі вырасьлі за час знаходжаньня ў ЛПП прыкладна з 3 да 4 млн. За ўтрыманьне дзяцей штомесяц Іванова павінна выплочваць 320 000 руб. У выніку яна за кастрычнік 2009 атрымала «на рукі» 43 000 руб. Казубоўская за кастрычнік атрымала каля 21 000 руб. пры заробку «на рукі» больш за 100 000 руб. У выніку запазычанасьць у асобаў, пазбаўленых бацькоўскіх правоў, перад дзяржавай пастаянна расьце.

Пры вызваленьні выдаюцца толькі тыя грошы, якія імі заробленыя. Пазыкі перад ЛПП павінны быць сплочаны, інакш не выпусьцяць. Часам людзі выходзяць з ЛПП бяз сродкаў. Іванова пры вызваленьні атрымала 15000. Казубоўская — 5000.

Трапляюць у ЛПП часта неабгрунтавана (напрыклад, Казубоўская). Міліцыя, ведаючы «кантынгент», затрымлівае патрэбную колькасьць людзей, афармляе адміністрацыйнае правапарушэньне, якога не было (часьцей — дробнае хуліганства), прымушае затрыманых падпісаць пратакол (часам сілай — да прыкладу, да Казубоўскай ужываліся катаваньні — «залілі за пазуху бутэльку вады», або пагражае іх прымяненьнем: «зробім зараз табе «ластаўку» — усё падпішаш»). Пасьля гэтага праводзіцца суд, на якім, па словах Казубоўскай і Івановай, рашэньні загадзя вынесены і гатовыя, і чалавек зьмяшчаецца ў ЛПП на год. Зьмячшчэньне ў ЛПП адбываецца пасьля заканчэньня тэрміну абскарджаньня пастановы суда. Часам, па сьцьверджаньнях І. і К., рашэньне суда знарок дасылаецца пазьней вызначанага дзесяцідзённага тэрміну яго абскарджаньня (у тых выпадках, калі «асуджаны» неадкладна





пасьля вынясеньня рашэньня зьмяшчаецца ў ЛПП), так што чалавек аказваецца ня ў стане абскардзіць рашэньне аб зьмяшчэньні яго ў ЛПП. Зафіксаваны выпадак, калі прывезьлі жанчыну без дакументаў. Яна знаходзілася ў ЛПП каля паўгода без адпаведнага рашэньня суда, без дакументаў, да таго часу, пакуль яе не знайшоў сын і не забраў адтуль.

Закрытасьць пенітэнцыярнай сістэмы і адсутнасьць грамадзкага кантролю фактычна не дазваляюць у дастатковай ступені дасьледаваць умовы ўтрыманьня зьняволеных, што зьяўляецца прадметам глыбокай занепакоенасьці праваабаронцаў. Хаця органамі Міністэрства юстыцыі былі створаныя грамадзкія камісіі па кантролі за пенітэнцыярнымі ўстановамі (у склад камісій праваабаронцы ўключаныя не былі), праца іх мае фармальны і неэфектыўны характар, а вынікі невядомыя грамадзтву.

ДАДАТАК 1

*(захаваны правапіс арыгіналу)*

## МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

02.03.2009

*Бяляцкаму А.В. і іншым*
*ініцыятарам стварэння*
*Грамадскага праваабарончага*
*аб'яднання «Наша Вясна»*

Аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі
грамадскага аб'яднання

У Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь (далей — Мінюст) 26.01.2009 паступілі матэрыялы, што маюць дачыненне да дзяржаўнай рэгістрацыі Грамадскага праваабарончага аб'яднання «Наша Вясна» (далей — ГПА). Пры іх вывучэнні ўстаноўлена наступнае.

Спіс членаў Рэвізійнай камісіі ГПА сведчыць, што ў гэтай арганізацыі не абраны Старшыня дадзенага органа, як таго патрабуе п.3.14 статута ГПА і адпаведная калонка азначанага спіса, якая ўстаноўлена дадаткам 3 да пастановы Мінюста ад 30.08.2005 №48 2«Аб зацвярджэнні нарматыўных прававых актаў па пытаннях афармлення і разгляду дакументаў, звязаных з дзяржаўнай рэгістрацыяй палітычных партый, прафесійных саюзаў, іншых грамадскіх аб'яднанняў, іх саюзаў (асацыяцый), а таксама дзяржаўнай рэгістрацыяй і выключэннем з журнала дзяржаўнай рэгістрацыі, пастаноўкай на ўлік і зняццем з уліку іх арганізацыйных структур» (далей — Пастанова).

Прадстаўленыя дакументы маюць шэраг узаемных неадпаведнасцяў у частцы звестак, якія ў гэтых дакументах маюцца, у тым ліку па назве форума, на якім быццам бы было прынята рашэнне аб стварэнні ГПА (далей — Сход).

Разам з тым, згодна з п.п.6 і 10 Інструкцыі аб парадку афармлення і разгляду дакументаў, звязаных з дзяржаўнай рэгістрацыяй палітычных партый, прафесійных саюзаў, іншых грамадскіх аб'яднанняў, іх саюзаў (асацыяцый), а таксама дзяржаўнай рэгістрацыяй і выключэннем з журнала дзяржаўнай рэгістрацыі, пастаноўкай на ўлік і зняццем з уліку іх арганізацыйных структур, зацверджанай пастановай Мінюста ад 30.08.2005 №48 з далейшымі змяненнямі і дапаўненнямі (далей — Інструкцыя), дадзенае мерапрыемства павінна мець назву ўстаноўчы з'езд, канферэнцыя, агульны сход або іншы ўстаноўчы сход.





Насуперак патрабаванню дадатка 2 да Пастановы ў спісе заснавальнікаў ГПА і спісе членаў Рады ГПА адсутнічае частка абавязковых звестак па шэрагу асобаў або выкладзены недакладныя звесткі.

Спіс заснавальнікаў, як бачна з ліста ГПА ад 07.02.2009, адначасова з'яўляецца спісам рэгістрацыі прыбываўшых удзельнікаў Схода. У сувязі з гэтым не паддаюцца тлумачэнню няправільныя ці няпоўныя звесткі аб заснавальніках ГПА, якія аказаліся незаўважанымі гэтымі ж заснавальнікамі пры ўчыненні імі сваіх подпісаў (калі яны сапраўды прысутнічалі на Сходзе) насупраць дадзеных звестак аб іх у працэсе сваёй рэгістрацыі перад пачаткам працы Схода.

Акрамя таго, спіс заснавальнікаў не адпавядае патрабаванням п.5 Інструкцыі.

У лісце ГПА ад 07.02.2009 паведамляецца, што Сход праходзіў у офісе №38 дома №22 па вул.В.Харужай у г.Мінску. Як бачна з пратакола Схода, на ім быццам бы прысутнічалі 67 чалавек.

З матэрыялаў рэгістрацыйнай справы ўласніка офіса бачна, што агульная плошча офіса складае 35 кв. м. Гэта азначае, што на аднаго ўдзельніка Схода прыходзілася 35:67 = 0,5 кв.м. агульнай плошчы.

Калі ж улічыць планіроўку офіса, наяўнасць у ім шэрагу абсталяваных працоўных месцаў з адпаведнымі мэбляй, аргтэхнікай і інш., то фактычна на аднаго ўдзельніка Схода прыйшлася істотна меншая карысная плошча ў параўнанні з разліковай агульнай, указанай вышэй. У сувязі з гэтым незразумела, як у такіх умовах можна было размясціць 67 чалавек, забяспечыўшы ім згодна з арт.4 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб грамадскіх аб'яднаннях» (далей — Закон) магчымасць самастойна ўчыніць сваё волевыяўленне і інш., а таксама размясціць прэзідыум Схода, арганізаваць працу Схода на працягу адной гадзіны з падлікам галасоў, весці пратакол Схода.

Акрамя таго, Мінюстам былі прааналізаваны атрыманыя ад асобаў, указаных у спісе заснавальнікаў, пісьмовыя адказы на адпаведныя запыты. У выніку гэтага аналіза ўстаноўлена, што:

— Буланава Т.В., Малей У.У., Маслюкова А.А. не змаглі назваць дакладную колькасць асобаў, якія прысутнічалі на Сходзе;
— Піванос А.А. аказалася не ў стане назваць колькасць удзельнікаў Схода, месца правядзення гэтага мерапрыемства і час пачатка працы Схода, а Каратыш І.М., акрамя пералічанага, не здолеў указаць дату Схода і інш.

Подпіс, які ўчыніў Ругайн В.Р. у дакуменце пошты аб уручэнні яму запыта Мінюста ад 06.02.2009 №06-18/84, істотна не адпавядае таму, што маецца ў спісе заснавальнікаў.

Вышэйазначанае сведчыць аб тым, што Сход альбо ўвогуле не праводзіўся, альбо склад асобаў, якія на ім прысутнічалі, не адпавядае прадстаўленаму ў Мінюст спісу заснавальнікаў.

Як сведчыць прадстаўлены пратакол Схода, у парушэнне патрабавання п.10 Інструкцыі не абіраліся старшыня і сакратар дадзенага форума. Такім чынам, парушаны парадак стварэння грамадскага аб'яднання, і гэтае парушэнне носіць непапраўны характар, што з'яўляецца падставай для адмовы ў дзяржаўнай рэгістрацыі ГПА.

З пералічанага таксама вынікае, што дакументы, якія паступілі ў Мінюст і маюць у складзе сваіх загалоўкаў словаспалучэнні «спіс заснавальнікаў», «спіс сяброў Рэвізійнай камісіі», «спіс сяброў Рады», «пратакол» Схода, змяшчаюць недакладныя, няпоўныя звесткі, альбо звесткі, якія не адпавядаюць рэчаіснасці, у сувязі з чым яны не могуць быць прызнаны юрыдычна значнымі. Такім чынам, неабходна лічыць, што ў Мінюст не прадстаўлены прадугледжаныя арт. 13 Закона як абавязковыя спіс заснавальнікаў грамадскага аб'яднання, спісы членаў выбарных органаў грамадскага аб'яднання, пратакол устаноўчага з'езда, канферэнцыі, агульнага схода альбо іншага ўстаноўчага схода.

Насуперак патрабаванню п.11 Інструкцыі плацёжны дакумент аб унясенні ў рэспубліканскі бюджэт адпаведнай сумы дзяржаўнай пошліны, атрыманы Мінюстам, не мае звестак аб назве грамадскага аб'яднання, за дзяржаўную рэгістрацыю якога заплачана азначаная пошліна. З гэтай нагоды дадзены дакумент не можа быць прызнаны юрыдычна значным, а таму яго таксама трэба лічыць непрадстаўленым.

Непрадстаўленне неабходных дакументаў з'яўляецца падставай для адмовы ў дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага аб'яднання.





Устаноўлена, што 35 заснавальнікаў ГПА прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці. З іх: Ваўранюк В.У., Вялічкін У.А., Лабковіч У.М., Міснікаў В.А., Мухіна Л.С. — 2 разы; Буланава Т.В., Сюдак А.В., Шыцікаў У.І. — 3 разы; Богдан І.С. — 4 разы; Валюк А.Л., Сазонаў В.П., Созінаў В.Я. — 5 разоў; Каваленка С.А., Салаўёў Д.С. — 11 разоў. Апрача таго, двое з заснавальнікаў ГПА (Міснікаў В.А. і Каратыш І.М.) прыцягваліся да крымінальнай адказнасці, пры гэтым Міснікаў В.А. быў асуджаны двойчы, яму таксама ў 2003 годзе была ўстаноўлена дадатковая мера крымінальнага пакарання ў якасці пазбаўлення права займацца педагагічнай дзейнасцю тэрмінам на 3 гады.

Такім чынам, 53,7% заснавальнікаў ГПА з'яўляюцца неправапаслухмянымі асобамі. Пры гэтым трэба ўлічыць, што шэраг з іх здзейснілі такія правапарушэнні як:

— парушэнне тэрмінаў рэгістрацыі (перарэгістрацыі) вогнестрэльнай зброі ці правілаў яе пастаноўкі на ўлік;
— распаўсюджванне друкаваных выданняў, якія выраблены з парушэннем устаноўленага парадка і не маюць выходных дадзеных, змест якіх накіраваны на прычыненне ўрону дзяржаўнаму і грамадскаму парадку, правам і законным інтарэсам грамадзян;
— парушэнне ўстаноўленага парадка арганізацыі ці правядзення схода, мітынга, вулічнага шэсця, дэманстрацыі, іншага масавага мерапрыемства ці пікетавання;
— парушэнне ўстаноўленага парадка карыстання сцягамі, вымпеламі, не зарэгістраванымі ва ўстаноўленым парадку, а таксама карыстанне эмблемамі, сімваламі, плакатамі, змест якіх накіраваны на прычыненне ўрону канстытуцыйнаму строю і грамадскаму парадку, правам і законным інтарэсам грамадзян, на рэлігійных, спартыўных, культурна-масавых, іншых відовішчных мерапрыемствах, а таксама карыстанне пералічаным вышэй на сходах, мітынгах, вулічных шэсцях, дэманстрацыях і пікетаванні;
— парушэнне заканадаўства аб выбарах, рэферэндуме, адкліканні дэпутата.

Устаноўлена таксама, што ў адносінах да яшчэ аднаго заснавальніка ГПА вынесена пастанова аб прызнанні яго падазроным па

крымінальнай справе, узбуджанай за здзяйсненне дзеянняў, прадугледжаных часткай першай арт.130 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (распальванне расавай, нацыянальнай альбо рэлігійнай варожасці ці розні).

Апрача гэтага, згодна з пратаколам Схода «Валянцін Стэфановіч ... распавёў пра асноўныя мэты грамадскага аб'яднання...». Гэтыя мэты ГПА не аспрэчваліся ўдзельнікамі Схода, а якраз наадварот — імі пасля выступлення Стэфановіча В.К. адразу было прынята рашэнне аб стварэнні грамадскага праваабарончага аб'яднання іменна з агучанымі Стэфановічам В.К. мэтамі.

Вышэйазначанае сведчыць, што ў прадстаўленым у Мінюст статуце ГПА не адлюстраваны ўсе зацверджаныя на Сходзе мэты ГПА, а толькі адна. Астатнія мэты ГПА з'яўляюцца ўтоенымі, што супярэчыць аднаму з прынцыпаў стварэння і дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў, прадугледжаных арт.4 Закона, — прынцыпу галоснасці.

Прымаючы да ўвагі выкладзенае, кіруючыся абзацамі другім і чацвёртым часткі трэцяй арт.15 Закона, а таксама абзацамі другім і чацвёртым п.30 Інструкцыі, Мінюстам 26.02.2009 прынята рашэнне аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі ГПА.

Гэтае рашэнне можа быць абскарджана ў месячны тэрмін у Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь. Аб змесце дадзенага ліста просьба персанальна праінфармаваць ініцыятараў стварэння ГПА Буланаву Т.В., Каратыша І.М., Малея У.У., Маслюкову А.А., Піванос А.А. як асобаў, што пісьмова звярталіся ў Мінюст у лютым 2009 года па пытанню дзяржаўнай рэгістрацыі ГПА.

Начальнік Упраўлення
грамадскіх аб'яднанняў — А. Л. Сліжэўскі

06Харытон 200 70 97
02.03.2009 Бяляцкаму і інш. аб адмове ў рэг.doc





ДАДАТАК 2

*(захаваны правапіс арыгіналу)*

Справа №03п-6/2009г.

## РАШЭННЕ
## ІМЕМ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

22 красавіка 2009 года Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь у складзе старшынствуючага Мільто І.Г., пры сакратары Івановай Т.У., з удзелам пракурора аддзела Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь Ляўданскага У.У., заяўнікоў Стэфановіча В.К., Лабковіча У.М., Бяляцкага А.В., прадстаўніка Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь Харытона А.П., разгледзеўшы ў зале судовых пасяджэнняў Вярхоўнага Суда грамадзянскую справу па скарзе Стэфановіча Валянціна Канстанцінавіча, Лабковіча Уладзіміра Мікалаевіча, Бяляцкага Аляксандра Віктаравіча на рашэнне Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі Грамадскага праваабарончага аб'яднання « Наша Вясна»,

устанавіў:

Стэфановіч В.К., Лабковіч У.М., Бяляцкі А.В. звярнуліся ў суд са скаргай, у якой зазначылі, што 26 студзеня 2009г. у Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь (далей — Міністэрства юстыцыі) былі пададзены дакументы аб дзяржаўнай рэгістрацыі Грамадскага праваабарончага аб'яднання «Наша Вясна».

2 сакавіка 2009 г. заснавальнікі атрымалі ліст Міністэрства юстыцыі, ў якім паведамлялася аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі дадзенага грамадскага аб'яднання.

Лічаць, што рашэнне з'яўляецца беспадстаўным і не адпавядае патрабаванням Закона Рэспублікі Беларусь «Аб грамадскіх аб'яднаннях». Просяць адмяніць гэта рашэнне і абавязаць Міністэрства юстыцыі правесці дзяржаўную рэгістрацыю Грамадскага праваабарончага аб'яднання «Наша Вясна».

У судовым пасяджэнні заяўнікі Стэфановіч В.К., Лабковіч У.М., Бяляцкі А.В. скаргу падтрымалі.

Прадстаўнік Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь Харытон А.П. са скаргай не пагадзіўся.

Заслухаўшы тлумачэнні заяўнікоў і прадстаўніка Міністэрства юстыцыі, сведак Малея У.У., Ругайна В.Г., даследаваўшы пісьмовыя доказы, заслухаўшы меркаванне пракурора Ляўданскага У.У., які лічыць, што скарга не падлягае задавальненню, суд прыходзіць да наступнага.

Паводле арт. 15 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб грамадскіх аб'яднаннях» рашэнне аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага аб'яднання прымаецца ў выпадку: парушэння ўстаноўленага парадку стварэння грамадскага аб'яднання, калі гэтае парушэнне носіць непапраўны характар; неадпаведнасці ўстаноўчых дакументаў грамадскага аб'яднання (мэт, задач, метадаў дзейнасці, тэрыторыі распаўсюджвання дзейнасці грамадскага аб'яднання) патрабаванням заканадаўства; непрадстаўлення грамадскім аб'яднаннем усіх прадугледжаных заканадаўчымі актамі дакументаў, неабходных для іх дзяржаўнай рэгістрацыі; неадпаведнасці назвы грамадскага аб'яднання, у тым ліку скарочанай, яго сімволікі, а таксама ўмоў членства ў грамадскім аб'яднанні патрабаванням заканадаўства і (ці) іх устаноўчым дакументам; невыкананне ў месячны тэрмін патрабаванняў, указаных у рашэнні аб адтэрміноўцы дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага аб'яднання; адмовы выканаць законную прапанову адпаведнага рэгіструючага органа аб змене назвы грамадскага аб'яднання.

Выяўлена, што 26 студзеня 2009 г. у Міністэрства юстыцыі былі пададзены дакументы аб дзяржаўнай рэгістрацыі рэспубліканскага Грамадскага праваабарончага аб'яднання «Наша Вясна».

2 сакавіка 2009 года Міністэрства юстыцыі накіравала заснавальнікам ліст, у якім зазначалася аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага аб'яднання.

Падставай да адмовы ў дзяржаўнай рэгістрацыі Грамадскага праваабарончага аб'яднання «Наша Вясна» з'явілася тое, што ў пратаколе ўстаноўчага агульнага сходу грамадскага аб'яднання адсутнічалі сведкі аб абранні старшыні і сакратара агульнага сходу. Таксама атсутнічылі сведкі аб абранні старшыні Рэвізійнай камісіі. У спісе заснавальнікаў аб'яднання і спісе членаў Рады па шэрагу асоб адсутнічала частка абавязковых звестак або былі выкладзены недакладныя звесткі. Плацежны дакумент аб унясенні ў рэспубліканскі бюджэт дзяржаўнай пошліны не меў абавязковых звестак аб назве грамадскага аб'яднання, за дзяржаўную рэгістрацыю якога была аплачана пошліна.





Наяўнасць вышэйпаказаных недахопаў пацвярджаецца пратаколам устаноўчага агульнага сходу Грамадскага праваабарончага аб'яднання «Наша Вясна», спісамі заснавальнікаў аб'яднання, а таксама сяброў Рэвізійнай камісіі, квітанцыяй аб аплаце дзяржаўнай пошліны. Шэраг недахопаў былі прызнаны і заяўнікамі.

З улікам зазначаннага у Міністэрства юстыцыі меліся падставы да адмовы ў рэгістрацыі Грамадскага праваабарончага аб'яднання «Наша Вясна», таму скарга не падлягае задавальненню.

Довады заяўнікаў аб тым, што пералічаныя недахопы маглі быць выпраўлены ў працэссе рэгістрацыі, з'яўляюцца неабгрунтаванымі. Прадстаўленне магчымасці для выпраўлення недахопаў з'яўляецца правам, а не абавязкам Міністэрства юстыцыі.

Доказаў таго, што ўстаноўчы сход альбо ўвогуле не праводзіўся, альбо склад асобаў, якія на ім прысутнічалі, не адпавядаў спісу заснавальнікаў, Міністэрствам юстыцыі не прадстаўлена. У сувязі з гэтым адказ у дзяржаўнай рэгістрацыі Грамадскага праваабарончага аб'яднання «Наша Вясна» па гэтай падставе з'яўляецца неабгрунтаваным.

Іншыя недахопы, пералічаныя ў лісце Міністэрства юстыцыі аб адмове ў дзяржаўнай регістрацыі Грамадскага праваабарончага аб'яднання «Наша Вясна», на погляд суда, не з'яўляюцца падставай для адмовы ў дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага аб'яднання.

З улікам выкладзенага, кіруючыся арт. 302 ГПК Рэспублікі Беларусь, суд

Вырашыў:

Адмовіць Стэфановічу Валянціну Канстанцінавічу, Лабковічу Уладзіміру Мікалаевічу, Бяляцкаму Аляксандру Віктаравічу ў задавальненні скаргі на рашэнне Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі Грамадскага праваабарончага аб'яднання «Наша Вясна».

Рашэнне ўступае ў законную сілу неадкладна пасля яго абвяшчэння; абскарджванню і апратэставанню ў касацыйным парадку не падлягае.

Суддзя І. Г. Мільто

Копія сапраўдна:
Суддзя І. Г. Мільто

ДАДАТАК 3

*(захаваны правапіс арыгіналу)*

## МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

12.05.2009

*Бяляцкаму А.В. і іншым*
*ініцыятарам стварэння*
*Грамадскага праваабарончага*
*аб'яднання «Наша Вясна»*

Аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі
грамадскага аб'яднання

У Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь (далей — Мінюст) 25.04.2009 паступілі матэрыялы, што маюць дачыненне да дзяржаўнай рэгістрацыі Грамадскага праваабарончага аб'яднання «Наша Вясна» (далей — ГПА). Пры іх вывучэнні ўстаноўлена наступнае.

Насуперак патрабаванню дадатка 2 да пастановы Мінюста ад 30.08.2005 №48 «Аб зацвярджэнні нарматыўных прававых актаў па пытаннях афармлення і разгляда дакументаў, звязаных з дзяржаўнай рэгістрацыяй палітычных партый, прафесійных саюзаў, іншых грамадскіх аб'яднанняў, іх саюзаў (асацыяцый), а таксама дзяржаўнай рэгістрацыяй і выключэннем з журнала дзяржаўнай рэгістрацыі, пастаноўкай на ўлік і зняццем з уліку іх арганізацыйных структур», ў спісе заснавальнікаў ГПА ўказаны звесткі, якія не адпавядаюць рэчаіснасці або з'яўляюцца скажонымі і тычацца шэрага асоб.

Прымаючы да ўвагі пералічанае, дасланы дакумент пад назваю «Спіс заснавальнікаў Грамадскага праваабарончага аб'яднання «Наша Вясна» нельга прызнаць юрыдычна значным. З гэтай нагоды неабходна лічыць, што ў Мінюст фактычна не прадстаўлены прадугледжаны арт.13 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб грамадскіх аб'яднаннях» (далей — Закон) як абавязковы спіс заснавальнікаў грамадскага аб'яднання.

Названая акалічнасць згодна з абзацам чацвёртым часткі трэцяй арт.15 Закона з'яўляецца падставай для адмовы ў дзяржаўнай рэгістрацыі ГПА.





Пералічаныя парушэнні маюць месца, нягледзячы на тое, што ў лісце аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі ГПА ад 02.03.2009 №06-12/145 ініцыятарам стварэння арганізацыі ўжо ўказвалася на аналагічныя парушэнні.

Другая частка назвы ГПА («Наша Вясна») не адпавядае статуту гэтай арганізацыі.

Неадпаведнасць назвы грамадскага аб'яднання яго статуту згодна з абзацам пятым часткі трэцяй арт.15 Закона з'яўляецца падставай для адмовы ў дзяржаўнай рэгістрацыі ГПА.

Згодна з часткай другой арт.14 Закона адпаведны рэгіструючы орган мае права ажыццяўляць праверку дакладнасці дакументаў, якія прадстаўлены для дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага аб'яднання, саюза грамадскіх аб'яднанняў. Гэта абавязвае прадстаўнікоў ствараемага грамадскага аб'яднання, саюза грамадскіх аб'яднанняў не ствараць перашкоды рэгіструючаму органу ў правядзенні такой праверкі.

Аднак прынятая на ўстаноўчым сходзе праграма ГПА, як і некаторая іншая інфармацыя, нягледзячы на афіцыйныя запыты Мінюста, кіраўніцтвам грамадскага аб'яднання не прадстаўлена рэгіструючаму органу. Акрамя таго, прадстаўнік ГПА таксама адмовіўся прадаставіць магчымасць правесці праверку дакладнасці дакумента, які тычыцца юрыдычнага адраса дадзенай арганізацыі.

Гарантыйны ліст адносна прадастаўлення памяшкання, дасланы ў Мінюст, не можа быць прызнаны ў якасці дакумента, што пацвярджае наяўнасць у ГПА юрыдычнага адраса. Таму трэба лічыць, што рэгіструючаму органу не прадстаўлены абавязковы дакумент, прадугледжаны арт.1.3 Закона, які б мог пацвердзіць наяўнасць у грамадскага аб'яднання юрыдычнага адраса. Гэтая акалічнасць згодна з абзацам чацвёртым часткі трэцяй арт.15 Закона з'яўляецца падставай для адмовы ў дзяржаўнай рэгістрацыі ГПА.

Учыненне вышэйназваных перашкодаў рэгіструючаму органу ў ажыццяўленні ім дзейнасці, прадугледжанай Законам, сведчыць аб ігнараванні норм заканадаўства з боку кіраўніцтва ГПА і іншых прадстаўнікоў арганізацыі.

Згодна са звесткамі, якія маюцца ў Мінюсце, многія з заснавальнікаў ГПА прыцягваліся да адмІністрацыйнай адказнасці, многія з іх неаднаразова, у тым ліку за правапарушэнні, звязаныя з парушэннем грамадскага парадка, а таксама правоў і свабод іншых асобаў.

На гэтыя акалічнасці звярталася ўвага кіраўніцтва ГПА ў лісце аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі гэтай арганізацыі (ліст ад 02.03.2009 №06-12/145). Тым не менш, прозвішчы асобаў-правапарушальнікаў амаль у поўным складзе зноў прысутнічаюць у спісе заснавальнікаў ГПА, які паступіў у Мінюст 25.04.2009.

Таксама маюцца прыклады ўзбуджэння крымінальных спраў у адносінах да пэўных заснавальнікаў ГПА.

Прымаючы да ўвагі выкладзенае, кіруючыся абзацамі чацвёртым і пятым часткі трэцяй арт.15 Закона, Мінюстам 25.05.2009 прынята рашэнне аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі ГПА.

Гэтае рашэнне можа быць абскарджана ў месячны тэрмін у Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь.

Намеснік Міністра А. М. Бодак

06 Харытон 200 70 97
25.05.2009 Бяляцкаму па адмове-2.doc





ДАДАТАК 4

*(захаваны правапіс арыгіналу)*

## Р А Ш Э Н Н Е
## ІМЕМ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

12 жніўня 2009 г. Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь у складзе старшынствуючага суддзі Цераха А.Р., пры сакратары Каралькова В.С., з удзелам пракурора аддзела Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь Кострыкавай Р.І., разгледзеўшы ў зале судовых пасяджэнняў Вярхоўнага Суда грамадзянскую справу па скарзе Бяляцкага Аляксандра Віктаравіча, Лабковіча Уладзіміра Мікалаевіча, Стэфановіча Валянціна Канстанцінавіча на рашэнне Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі Грамадскага праваабарончага аб'яднання «Наша Вясна»,

Устанавіў:

Бяляцкі А.В., Лабковіч У.М., Стэфановіч В.К. звярнуліся ў суд са скаргай, у якой зазначылі, што 25 красавіка 2009 г. у Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь былі пададзены дакументы для дзяржаўнай рэгістрацыі Грамадскага праваабарончага аб'яднання «Наша Вясна».

27 мая 2009 г. заснавальнікі атрымалі ліст Міністэрства юстыцыі, у якім паведамлялася аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі дадзенага грамадскага аб'яднання.

Лічаць, што рашэнне з'яўляецца неабгрунтаваным і супярэчыць патрабаванням заканадаўства Рэспублікі Беларусь. Просяць адмяніць гэта рашэнне і абавязаць Міністэрства юстыцыі правесці дзяржаўную рэгістрацыю Грамадскага праваабарончага аб'яднання «Наша Вясна».

У судовым пасяджэнні заяўнікі Бяляцкі А.В., Стэфановіч В.К., Лабковіч У.М. скаргу падтрымалі.

Прадстаўнік Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь Харытон А.П. са скаргай не пагадзіўся.

Заслухаўшы тлумачэнні заяўнікоў і прадстаўніка Міністэрства юстыцыі, меркаванне пракурора Кострыкавай Р.І., якая лічыць, што

скарга не падлягае задавальненню, суд прыходзіць да наступнага.

Згодна з арт. 15 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб грамадскіх аб'яднаннях» рашэнне аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага аб'яднання прымаецца ў выпадку:

парушэння ўстаноўленага парадку стварэння грамадскага аб'яднання, калі гэтае парушэнне носіць непапраўны характар;

неадпаведнасці ўстаноўчых дакументаў грамадскага аб'яднання (мэт, задач, метадаў дзейнасці, тэрыторыі распаўсюджвання дзейнасці грамадскага аб'яднання) патрабаванням заканадаўства;

непрадстаўлення грамадскім аб'яднаннем усіх прадугледжаных заканадаўчымі актамі дакументаў, неабходных для іх дзяржаўнай рэгістрацыі;

неадпаведнасці назвы грамадскага аб'яднання, у тым ліку скарочанай, яго сімволікі, а таксама ўмоў членства ў грамадскім аб'яднанні патрабаванням заканадаўства і (ці) іх устаноўчым дакументам;

невыканання ў месячны тэрмін патрабаванняў, указаных у рашэнні аб адтэрміноўцы дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага аб'яднання; адмовы выканаць законную прапанову адпаведнага рэгіструючага органа аб змене назвы грамадскага аб'яднання.

У судовым пасяджэнні выяўлена, што 25 красавіка 2009 г. у Міністэрства юстыцыі былі пададзены дакументы для дзяржаўнай рэгістрацыі Грамадскага праваабарончага аб'яднання «Наша Вясна».

25 мая 2009 г. Міністэрства юстыцыі накіравала заснавальнікам ліст аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага аб'яднання.

Падставай да адмовы ў дзяржаўнай рэгістрацыі Грамадскага праваабарончага аб'яднання «Наша Вясна» з'явілася тое, што ў спісе заснавальнікаў аб'яднання па шэрагу асоб указаны звесткі, якія не адпавядаюць рэчаіснасці або з'яўляюцца скажонымі. Акрамя таго, рэгіструючаму органу было адмоўлена ў магчымасці правесці праверку дакладнасці дакумента, які тычыцца юрыдычнага адраса дадзенай арганізацыі. Таму гарантыйны ліст адносна прадастаўлення памяшкання, дасланы ў Міністэрства юстыцыі, не можа быць прызнаны ў якасці неабходнага для рэгістрацыі дакумента, што пацвярджае наяўнасць у аб'яднання юрыдычнага адраса.

Вышэйназваныя акалічнасці, азначаныя ў лісце Міністэрства юстыцыі, пацвярджаюцца спісам заснавальнікаў Грамадскага праваабарончага аб'яднання «Наша Вясна», даследаванымі судом дакументамі адносна асабістых дадзеных заснавальнікаў ГПА, а таксама далучанымі да справы матэрыяламі, якія маюць дачыненне да праверкі гарантыйнага ліста аб прадстаўленні памяшкання для размяшчэння юрыдычнага адраса аб'яднання.





Наяўнасць некаторых недахопаў прызналі ў судовым пасяджэнні і заяўнікі.

З улікам зазначанага суд лічыць, што ў Міністэрства юстыцыі меліся падставы да адмовы ў дзяржаўнай регістрацыі Грамадскага праваабарончага аб'яднання «Наша Вясна».

У сувязі з гэтым скарга Бяляцкага А.В., Стэфановіча В.К. і Лабковіча У.М. не падлягае задавальненню.

Довады заяўнікоў аб тым, што паказаныя недахопы маглі быць выпраўлены ў працэсе рэгістрацыі аб'яднання, з'яўляюцца неабгрунтаванымі, паколькі прадстаўленне магчымасці для выпраўлення недахопаў з'яўляецца правам, а не абавязкам Міністэрства юстыцыі.

Іншыя акалічнасці, прыведзеныя ў лісце Міністэрства юстыцыі аб адмове ў дзяржаўнай регістрацыі Грамадскага праваабарончага абʼяднння «Наша Вясна», па меркаванні суда, не з'яўляюцца падставай для адмовы ў дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага аб'яднання.

Прымаючы да ўвагі выкладзенае і кіруючыся арт. арт. 302-306 ГПК Рэспублікі Беларусь, суд

Вырашыў:

Бяляцкаму Аляксандру Віктаравічу, Стэфановічу Валянціну Канстанцінавічу, Лабковічу Уладзіміру Мікалаевічу адмовіць у задавальненні скаргі на рашэнне Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі Грамадскага праваабарончага аб'яднання «Наша Вясна».

Рашэнне ўступае ў законную сілу неадкладна пасля яго абвяшчэння, абскарджанню і апратэставанню ў касацыйным парадку не падлягае.

Суддзя А. Р. Церах

Верна:
Суддзя А. Р. Церах

ДАДАТАК 5

*The Observatory for the Protection of Human Rights Defenders (OBS)*
*International Federation for Human Rights (FIDH)*
*World Organisation Against Torture (OMCT)*

## Судовы працэс «Грамадзкае праваабарончае аб'яднаньне «Наша Вясна» супраць Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь». Справаздача аб судовым назіраньні.

### *I — Уводзіны*

Кірыл Карацееў, кіраўнік місіі Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека (FIDH), атрымаў паўнамоцтвы ад Абсерваторыі па абароне правоў праваабаронцаў, сумеснай праграмы FIDH і Міжнароднай арганізацыі супраць катаваньняў (OMCT), на правядзеньне назіраньня за судовым працэсам па скарзе Грамадзкага праваабарончага аб'яднаньня «Наша Вясна» да Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, які разглядаўся ў Вярхоўным судзе Рэспублікі Беларусь. Перш за ўсё, трэба адзначыць, што Прэзідэнту FIDH сп. Сухаір Белхасэн было амоўлена ў атрыманьні візы для правядзеньня назіраньня за працэсам.

Судовы працэс распачаўся 10 жніўня 2009 году. Судовае рашэньне было вынесенае 12 жніўня 2009 году. Рашэньне зьяўляецца канчатковым і ня можа быць абскарджанае ў судовым парадку. Задачай кіраўніка місіі была ацэнка — ня толькі справядлівасьці судовага працэсу, але і аргументацыі ўладаў пры вынясеньні рашэньня аб адмове ў рэгістрацыі гэтай няўрадавай арганізацыі. Такім чынам, гэтая справаздача зьяўляецца спробай ацаніць прапарцыйнасьць умяшальніцтва ў права на свабоду мірных сходаў і асацыяцыяў, якое гарантавана Артыкулам 22 Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах (МПГПП).

### *II — Кароткае апісаньне праблемы*

Падставай для судовага разьбіральніцтва была скарга на рашэньне аб адмове ў рэгістрацыі аднаго з вядучых праваабарончых





аб'яднаньняў Беларусі, якое, да яго ліквідацыі праз судовае рашэньне ў 2003 годзе, мела назву «Праваабарончы цэнтр «Вясна». Разгледзеўшы скаргу сп.Бяляцкага і інш. да Рэспублікі Беларусь, Камітэт ААН па правах чалавека прыйшоў да высновы, што закрыцьцё арганізацыі ў 2003 годзе было парушэньнем Артыкулу 22 МПГПП. Арганізацыя працягвала сваю дзейнасьць без прызнаньня яе афіцыйнага статусу, што зьяўляецца парушэньнем Артыкулу 193-1 Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь («незаконныя арганізацыя дзейнасьці грамадзкага аб'яднаньня, альбо фонда, альбо ўдзел у іх дзейнасьці»). Яна двойчы — у 2007 і 2009 годзе — падавала дакументы на рэгістрацыю пад назвай «Наша Вясна» (зыходзячы з забароны на ўжываньне назвы ліквідаванай арганізацыі). Абедзьве заяўкі былі адхіленыя Міністэрствам юстыцыі, а Вярхоўны суд не задаволіў скаргі на рашэньні Міністэрства.

Паводле беларускага заканадаўства, кожная некамерцыйная арганізацыя павінна прайсьці працэдуру рэгістрацыі ў Міністэрстве юстыцыі для атрыманьня афіцыйнага статусу. Толькі ў гэтым выпадку яна можа легальна існаваць, атрымліваць і распараджацца рэсурсамі (пры гэтым атрыманьне рэсурсаў праваабарончым аб'яднаньнем практычна немагчымае з-за існуючых фінансавых абмежаваньняў), мець афіцыйны штат супрацоўнікаў і г.д.

Дадзеная справа была зьвязаная з трэцяй спробай рэгістрацыі арганізацыі ў Міністэрстве юстыцыі. Больш за 70% яе сяброў паставілі свае подпісы пад заявай аб рэгістрацыі 29 сакавіка 2009 году, аднак 25 траўня 2009 году заява была адхіленая. Міністэрства патлумачыла сваю адмову чатырма прычынамі:

— Па-першае, яно сьцьвярджала, што чатыры сябры арганізацыі прадаставілі недакладную або несапраўдную інфармацыю аб сваім месцы жыхарства і месцы занятасьці.
— Па-другое, яно палічыла гарантыйны ліст адносна прадастаўленьня памяшканьня аб'яднаньню несапраўдным, сьцьвярджаючы, што ў прадстаўнікоў рэгіструючага органу не было магчымасьці наведаць гэтае памяшканьне.
— Па-трэцяе, яно абвінаваціла заснавальнікаў аб'яднаньня ў непрадастаўленьні, нягледзячы на патрабаваньні Міністэрства, праграмы дзеяньняў, якая, паводле іх заяваў, была прынятая.
— Па-чацьвёртае, яно адзначыла, што назва НДА — «Наша Вясна» — не адпавядае яго Статуту. Яно таксама зьвярнула ўвагу

на тое, што заснавальнікі НДА ў мінулым неаднаразова прыцягваліся да «адміністрацыйнай адказнасьці».

Трое з ліку заснавальнікаў «Нашай Вясны», сп. Алесь Бяляцкі (старшыня), сп. Уладзімір Лабковіч і сп. Валянцін Стэфановіч, зьвярнуліся ў Вярхоўны суд са скаргай на рашэньне аб адмове. Яны сьцьвярджалі, што:

— Тое, што Міністэрства назвала недакладнай інфармацыяй аб заснавальніках арганізацыі, — усяго толькі канцылярскія памылкі,
— Гарантыйны ліст быў сапраўдным і не выклікаў прэтэнзіяў з боку Міністэрства падчас папярэдніх слуханьняў,
— Ніякай праграмы дзеяньняў не прымалася на сходзе заснавальнікаў,
— Астатнія прэтэнзіі Міністэрства былі неабгрунтаванымі з пункту гледжаньня закону.

### *III — Судовы працэс*

10 жніўня 2009 году судзьдзя Вярхоўнага суда сп. Анатоль Церах распачаў слуханьні па справе. Усе тры заяўнікі прыстунічалі на працягу ўсяго паседжаньня. Двое з іх зьяўляюцца юрыстамі, таму ў іх не было неабходнасьці ў наяўнасьці абаронцаў. Міністэрства юстыцыі было прадстаўлена сп. Аляксандрам Харытонам. Прадстаўнік Генеральнай пракуратуры ў званьні падпалкоўніка прымаў неафіцыйны ўдзел у паседжаньні. Толькі прадстаўніцы Пракуратуры было дазволена сядзець за сталом у зале суда, удзельнікі працэсу сядзелі на пярэдняй лаве, прызначанай для публікі. Прысутнічала да 30 чалавек, уключаючы некаторых сяброў «Нашай Вясны», прадстаўнікоў замежных дыпмісіяў і журналістаў.

Першы дзень слуханьняў быў падзелены паміж уступным словам бакоў, апытаньнем сьведкаў, вывучэньнем матэрыялаў справы, а таксама хадайніцтвамі па сутнасьці справы. На другі дзень прадстаўніца Пракуратуры выказала свае высновы, а бакі адказалі на хадайніцтвы.

На пачатку паседжаньня сп. Лабковіч папрасіў судзьдзю абмежаваць колькасьць аргументаў на карысьць нерэгістрацыі, прапанаваных Міністэрствам юстыцыі, у адпаведнасьці з заканадаўствам аб грамадзкіх арганізацыях, а таксама не распачынаць судовыя спрэчкі па такіх неістотных для сутнасьці справы момантах, як абвінавачаньні ў супрацьпраўнай дзейнасьці, вылучаных супраць сузаснавальнікаў НДА. Хаця судзьдзя і прызнаў, што аргументы адказчыка павінны супадаць з падставамі для скаргі, але не перашкаджаў сп. Харытону неаднаразова і ў разгорнутай форме спасылацца на асабістыя дадзеныя заяўнікаў.





1. Аргументы заяўнікаў:

Неістотныя дэталі былі трактаваныя як «скажоная інфармацыя».

Падчас свайго ўступнага слова, сп. Стэфановіч патлумачыў, што тое, што было названа «скажонай інфармацыяй адносна заснавальнікаў», заключалася ў наступным: адзін з іх, пазначаючы месца сваёй працы, замест «установа адукацыі — сярэдняя школа №1» напісаў «сярэдняя школа №1»; другі напісаў, што ён зьяўляецца «кіраўнікοм гуртка» замест «кіраўніка секцыі» ў адной з установаў адукацыі. Што датычыць праграмы дзеяньняў, запатрабаванай Міністэрствам, сп. Стэфановіч адзначыў, што такі дакумент не прымаўся, і яго прыняцьця не патрабуе закон. Што датычыць абвінавачаньняў у супрацьпраўнай дзейнасьці заснавальнікаў (гаворка ішла аб неістотным парушэньні правілаў дарожнага руху), ён заявіў, што гэта ня можа лічыцца падставай для адмовы ў рэгістрацыі паводле Закону аб грамадзкіх аб’яднаньнях.

Адпаведнасьць назвы НДА закону.

Сп. Лабковіч заявіў, што назва НДА адпавядае закону, бо ў ёй згаданы некамерцыйны характар арганізацыі і галіна яе дзейнасьці (правы чалавека). Ён таксама заявіў, што крытыка Міністэрства ў бок «Нашай Вясны» абсалютна беспадстаўная.

Гарантыйны ліст.

Што датычыць гарантыйнага ліста, было адзначана, што Міністэрства ня мела ніякіх прэтэнзіяў да гэтага самага ліста падчас двух папярэдніх паседжаньняў, і што з уладальнікам памяшкаsuccessфна зьвязаліся па тэлефоне падчас яго адсутнасьці, калі ён ня мог прыехаць і дазволіць інсьпекцыі трапіць у памяшканьне. Акрамя гэтага, было адзначана, што разам з гарантыйным лістом на адрас Міністэрства было накіравана тэхнічнае апісаньне памяш-

каньня, складзенае Бюро тэхнічнай інвентарызацыі, што выключае неабходнасьць правядзеньня дадатковай праверкі.

Калі судзьдзя і прадстаўнік Міністэрства юстыцыі спыталі сп. Лабковіча, як Міністэрства магло праверыць сапраўднасьць гарантыйнага ліста, ён адказаў, што ў некаторых выпадках прадстаўнікі пракуратуры маюць законнае права пранікаць у прыватныя памяшканьні, і што Міністэрства павінна было правесьці праверку пры дапамозе пракуратуры, а не праз мясцовыя ўлады.

2. Аргументы Міністэрства:

Прадстаўнік Міністэрства юстыцыі сп. Харытон неаднаразова адзначаў, што адзін з заснавальнікаў пазначыў сваё месца працы як АТ «Трэверс» замест ТАА «Трэверс», а таксама згадаў дзьве вышэйзгаданыя памылкі. Прэтэнзіі Міністэрства таксама тычыліся назвы арганізацыі. Паводле сп. Харытона, з той прычыны, што слова «Вясна» было напісана з вялікай літары, яно ня мае дачыненьня да пары года, але да іншай зьявы, пра якую ведаюць толькі заснавальнікі НДА. Ён таксама сказаў, што, зыходзячы з дакументаў, якія трапілі ў распараджэньне Міністэрства, было няясна, ці мае будучае памяшканьне НДА ўваход, і такім чынам заявіў аб неабходнасьці правядзеньня праверкі, якая не магла адбыцца з-за нежаданьня ўладальніка ісьці на супрацоўніцтва. Ён таксама заявіў, што Міністэрства запатрабавала копію праграмы дзеяньняў, прынятую заснавальнікамі, зыходзячы з паведамленняў на сайце арганізацыі www.spring96.org.

На пытаньне сп. Лабковіча, ці знаёмы ён з высновамі Камітэту ААН па правах чалавека па скарзе сп. Бяляцкага і інш. да Рэспублікі Беларусь, сп. Харытон адказаў, што гэтае паведамленьне датычыцца 2003 году і ня мае нічога агульнага з бягучай справай. Сп. Лабковіч запатрабаваў ад сп. Харытона назваць палажэньні закону, на падставе якіх гарантыйны ліст быў прызнаны несапраўдным, але сп. Харытон адмовіўся адказваць на пытаньне. На пытаньне аб тым, якія палажэньні Статуту НДА былі парушаныя назвай «Наша Вясна», ён адказаў «Усе», бо Статут не зьмяшчае тлумачэньняў адносна назвы «Наша Вясна». На пытаньне сп. Стэфановіча, чаму Міністэрства не прадаставіла заснавальнікам адтэрміноўку для выпраўленьня памылак, сп. Харытон адказаў, што гэта права, а не абавязак Міністэрства.





У якасьці заключэньня сп. Харытон сказаў, што заснавальнікі НДА парушалі ня толькі беларускае заканадаўства, але і законы іншых дзяржаваў, у прыватнасьці яны былі дэпартаваныя з тэрыторыі Малдовы падчас правядзеньня там парламенцкіх выбараў у ліпені 2009 году, але на патрабаваньне прадаставіць доказы не назваў ніводнага рашэньня малдоўскіх уладаў.

3. Паказанні сьведкаў:

У якасьці сьведкі у залу суда быў запрошаны ўласнік памяшканьня, згаданага ў гарантыйным лісьце. Ён пацьвердзіў, што ён зьяўляецца ўласьнікам памяшканьня, што ён атрымаў тэлефонны званок ад невядомай яму асобы адносна праверкі за гадзіну да яе правядзеньня і што ён запатрабаваў прадаставіць пісьмовыя падставы для інсьпекцыі. Што датычыць самога гарантыйнага ліста, на пытаньне сп. Харытона, ці ведае ён, што, паводле двух дакументаў адносна юрыдычных асобаў, любы ліст павінен зьмяшчаць юрыдычны адрас і кантактныя дадзеныя гэтай асобы, сьведка адказаў адмоўна. Пазьней сп. Харытон прызнаў, што ён наўмысна не назваў гэтыя два дакументы падчас слуханьняў (сп. Лабковіч назваў гэта парушэньнем прынцыпу роўнасьці бакоў), а калі заяўнікі заявілі аб непрымяняльнасьці гэтых дакументаў да дадзенай справы, бо уласьнік памяшканьня зьяўляецца не юрыдычнай, а фізічнай асобай, прадстаўнік Міністэрства юстыцыі адказаў, што гэтыя дакументы датычаць фізічных асобаў «па аналогіі».

4. Контраргументы заяўнікаў

Падчас спрэчак сп. Стэфановіч асудзіў дыскрымінацыйны падыход Міністэрства юстыцыі, які заключаецца ў шматлікіх паўторных адмовах у рэгістрацыі праваабарончых НДА. Ён адзначыў, што ўсе неабходныя паводле закону дакументы былі прадстаўленыя Міністэрству і што ніякай праграмы дзеяньняў, запатрабаванай Міністэрствам, ніколі не існавала.

Сп. Лабковіч адзначыў, што Міністэрства юстыцыі падзяліла падставы для адмовы на юрыдычныя і неюрыдычныя. Ён прызнаў, што трое з больш чым 70 заснавальнікаў зрабілі неістотныя памылкі ў назвах сваіх месцаў працы, але гэта не павінна ўплываць на права заснавальнікаў ствараць НДА. Ён аспрэчыў прэтэнзіі Міністэрства да назвы НДА, назваўшы іх хутчэй кафкіянскімі, чым

юрыдычнымі, а таксама раскрытыкаваў падыход Міністэрства, які заключаецца ў стварэньні як мага большай колькасьці перашкодаў для НДА. У адказ на заўвагі сп. Харытона адносна асобаў заяўнікаў і іх «супрацьпраўных дзеяньняў», сп. Лабковіч нагадаў, што шэраг такіх краінаў, як ЗША, Украіна, а таксама ЕС забаранілі прадстаўніку Міністэрства юстыцыі ўезд на сваю тэрыторыю.

Паводле сп. Бяляцкага, Міністэрства ня хоча наладжваць цывілізаваны дыялог паміж уладамі і грамадзянскай супольнасьцю. Ён адзначыў, што за апошнія 10 гадоў у Беларусі не была зарэгістраваная ніводная рэспубліканская праваабарончая арганізацыя і што ў Арменіі, напрыклад, існуе ў 10 разоў болей некамерцыйных арганізацыяў на душу насельніцтва, чым у Беларусі. Ён заявіў, што ў дадзенай справе можна казаць аб парушэньні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах, спасылаючыся на высновы Камітэту ААН па справе аб ліквідацыі «Вясны». Камітэт ААН прызнаў права заяўнікаў на атрыманьне кампенсацыі ў выглядзе перарэгістрацыі сваёй арганізацыі, але ўлады не зрабілі нічога, каб кампенсаваць парушэньне МПГПП. Пасьля таго, як, дзякуючы намаганьням Еўрапейскага Парламенту, ПАСЕ, а таксама ў кантэксьце еўрапейска-беларускіх адносінаў, сітуацыя вакол НДА атрымала міжнародны розгалас, справа перастала быць выключна персанальнай праблемай заяўнікаў — яна стала паказчыкам выкананьня Беларусьсю сваіх міжнародных абавязацельстваў.

5. Адказы Міністэрства

Сп. Харытон адказаў, што высновы Камітэту ААН носяць выключна рэкамендацыйны характар, што заяўнікам няма каго вінаваціць акрамя сябе і што ў кампетэнцыю Міністэрства не ўваходзіць выпраўленьне памылак, якія былі прызнаныя, паводле ягоных словаў, заяўнікамі.

Выкарыстоўваючы сваё права на адказ, заяўнікі асудзілі звышфармалісцкі падыход Міністэрства юстыцыі да разгляду іх заяўкі аб рэгістрацыі, а таксама адсутнасьць непрадузятасьці з боку Міністэрства.

Прадстаўнік Міністэрства юстыцыі, у сваю чаргу, абвінаваціў сп. Бяляцкага ў атрыманьні вялікіх сумаў грошай ад міжнародных спонсараў для падарожжаў за мяжу і падзякаваў Богу за тое, што





ён жыве ў «блакітнавокай» Беларусі, сказаўшы таксама, што яму няма чаго рабіць ва Ўкраіне, ЗША ці ЕС.

### *IV — Вынясеньне рашэньня*

На пачатку другога дня слуханьняў апошняй уступіла ў спрэчкі прадстаўніца пракуратуры. У сваіх заўвагах яна абмежавалася выказваньнем падтрымкі рашэньня аб адмове ў рэгістрацыі на падставе недакладнай інфармацыі адносна заснавальнікаў НДА, а таксама з прычыны немагчымасьці наведаць будучае памяшканьне «Нашай Вясны». Пракурор выказала думку, што гэтыя недахопы зьяўляюцца дастатковымі для адмовы ў рэгістрацыі і незадавальненьня скаргаў. Пракурор не пракаментавала ні аргументы бакоў, згаданыя падчас паседжаньня, ні спасылкі заяўнікаў на Канстытуцыю і МПГПП, на што зьвярнулі ўвагу заяўнікі падчас адказаў на пытаньні.

Пры вынясеньні рашэньня Суд кіраваўся высновамі прадстаўніка пракуратуры. Судзьдзя адхіліў аргумент Міністэрства аб «супрацьпраўнай дзейнасьці» заяўнікаў, прэтэнзіі да назвы арганізацыі, а таксама яго патрабаваньні прадаставіць праграму дзеяньняў. Тым ня менш, ён падтрымаў рашэньне Міністэрства на падставе недакладнай інфармацыі адносна заяўнікаў, а таксама з прычыны іх супрацьдзеяньня праверцы памяшканьня, згаданага ў гарантыйным лісьце. Судзьдзя адхіліў аргументы заяўнікаў адносна палажэньняў Канстытуцыі і МПГПП.

Рашэньне не падлягае абскарджваньню. Яно можа быць перагледжана толькі па ініцыятыве старшыні Вярхоўнага суда або ягоных намесьнікаў праз працэдуру нагляднай скаргі.

### *V — Аналіз*

Некаторыя асьпекты працэсу патрабуюць каментароў.

Па-першае, трэба адзначыць, што бакі мелі дастатковыя магчымасьці для прадстаўленьня сваіх аргументаў. Судзьдзя дазваляў бакам задаваць адзін аднаму пытаньні без аніякіх абмежаваньняў, прадстаўляць доказы і адказваць на хадайніцтвы бакоў і пракурора. З гэтага пункту гледжаньня была забясьпечана роўнасьць бакоў, і нельга казаць аб суб’ектыўнай перадузятасьці судзьдзі.

Па-другое, аднак, апанентам заяўнікаў быў ня толькі прадстаўнік Міністэрства юстыцыі, чыё рашэньне яны аспрэчвалі ў Вярхоўным

судзе, але і прадстаўніца Пракуратуры, чые высновы былі на карысьць Міністэрства без абмеркаваньня аргументаў бакоў. Пракурор удзельнічала ў працэсе неафіцыйна, што дазваляецца Грамадзянска-працэсуальным кодэксам Беларусі. Такім чынам, у паседжаньні прымалі ўдзел два прадстаўнікі дзяржавы, і абодва былі на баку выканаўчай ўлады. Яшчэ адным апанентам заяўнікаў, нягледзячы на сваю суб'ектыўную неперадузятасьць, быў судзьдзя. Як неаднаразова адзначалася ў іншых справаздачах, Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаваньні і статусе судзьдзяў ясна дае зразумець, што прызначэньне судзьдзяў, іх кар'ера, адукацыя, дысцыплінарная адказнасьць і звальненьне залежаць ад Міністэрства юстыцыі (адказчык у дадзеным працэсе). Такім чынам, нельга сказаць, што судзьдзя і суд былі аб'ектыўна незалежнымі і неперадузятымі.

Па-трэцяе, што датычыць сутнасьці судовага рашэньня, трэба адзначыць, што, нават калі б недакладнасьці ў дакументах, прадстаўленых «Нашай Вясной», былі дастатковымі для адмовы паводле Закону аб грамадзкіх арганізацыях Рэспублікі Беларусь, гэтага было б недастаткова для апраўданьня ўмяшальніцтва ў права заяўнікаў на свабоду асацыяцыяў. Як у Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, так і ў Міжнародным пакце аб грамадзянскіх і палітычных правах, адзначаецца, што такое ўмяшальніцтва павінна мець законную мэту. Падчас паседжаньня, як і падчас вынясеньня рашэньня, не было даведзена, што адмова ў рэгістрацыі «Нашай Вясьне» была апраўдана абмежаваньнямі, згаданымі ў Канстытуцыі Беларусі (Артыкул 23) і МПГПП (Артыкул 22-2). Акрамя гэтага, паводле апошняга палажэньня, умяшальніцтва павінна быць неабходным у дэмакратычным грамадстве, гэта значыць, сярод іншага, быць прапарцыйным законнай мэце. Улічваючы наяўнасьць крымінальнай адказнасьці за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі, для апраўданьня ўмяшальніцтва павінны быць прадстаўленыя асабліва пераканаўчыя аргументы. У дадзеным выпадку, довады, вылучаныя пракурорам у сваіх высновах, а таксама судзьдзём у рашэньні, з цяжкасьцю можна назваць пераканаўчымі і аргументаванымі. Калі адзін з заснавальнікаў пазначае сваё месца працы як «сярэдняя школа №1» замест «установа адукацыі — сярэдняя школа №1», гэта ня мае ніякага крымінальнага намеру, як і патрабаваньне ўласьніка будучага памяшканьня НДА прадставіць яму пісьмовыя падставы для правядзеньня праверкі, замест безапеляцыйнага загаду ад невядомай асобы па тэлефоне, не азначае амаральнасьці заснавальнікаў. Так і не было ўстаноўлена, што заснавальнікі «Нашай Вясны» заклікалі да гвалту або займаліся крымінальнай дзейнасьцю. Але ў рашэньні не было ні слова аб прапарцыйнасьці абмежаваньня іх правоў.





Па-чацьвёртае, трэба памятаць, што Камітэт ААН па правах чалавека ў сваім рашэньні па скарзе сп. Бяляцкага і інш. да Рэспублікі Беларусь прызнаў ліквідацыю першапачатковай «Вясны» ў 2003 годзе парушэньнем Артыкулу 22 МПГПП. Ён настойліва рэкамендаваў уладам прадаставіць заяўнікам кампенсацыю, у тым ліку перарэгістрацыю НДА. Тым ня менш, беларускія ўлады назвалі высновы Камітэту выключна рэкамендацыйнымі і адмовіліся іх выконваць. Аднак МПГПП гарантуе мінімальныя неад'емныя правы, і, як бы ні трактаваліся рэкамендацыі Камітэту, няма іншага шляху выкананьня палажэньняў МПГПП, акрамя наданьня рэкамендацыям законнай сілы. У дадзеным выпадку МПГПП быў цалкам праігнараваны.

Напрыканцы трэба адзначыць, што аргументы заяўнікаў у асноўным засноўваліся на незаконнасьці дзеяньняў Міністэрства, іх неадпаведнасьці Закону аб грамадзкіх арганізацыях, і толькі ўскосна на сваіх правах, гарантаваных Канстытуцыяй і МПГПП. Але нават калі б яны былі цалкам пабудаваныя на Канстытуцыі і МПГПП, вынік быў бы такім самым: судзьдзя Вярхоўнага суда меў паўнамоцтвы вырашаць, ці былі ў Міністэрства падставы для адмовы ў рэгістрацыі, а не ацэньваць пытаньні правоў чалавека, закранутыя адмовай.

### *VI — Каментары*

Старшыня «Нашай Вясны» і адзін з заяўнікаў, Алесь Бяляцкі, сказаў, што палітычныя прычыны стаялі за рашэньнем Вярхоўнага суда, якое мела мала агульнага з правасудзьдзем і верхавенствам закону. Заявы аб лібералізацыі рэжыму не знайшлі падтрымкі ў чакаемых дзеяньнях; Беларусь застаецца небясьпечнай для праваабаронцаў, дадаў сп. Бяляцкі.

Зыходзячы з вышэйзгаданых прычынаў, кіраўнік місіі назваў судовы працэс ганьбай для беларускага правасудзьдзя, але адзначыў, што Беларусь ужо прызвычаілася да такой ганьбы.

***Рэкамендацыі***

1. Да беларускіх уладаў

— гарантаваць пры любых абставінах спрыяльныя ўмовы для дзейнасьці праваабаронцаў, а таксама спыніць чыненьне перашкодаў іх працы, як і іх перасьлед, у адпаведнасьці з Дэкларацыяй аб праве і абавязку асобаў, групаў і органаў грамадзтва заахвочваць і абараняць агульнапрынятыя правы чалавека і асноўныя свабоды, прынятай Генеральнай асамблеяй ААН у 1998 годзе;

— прытрымлівацца пры любых абставінах міжнародных стандартаў у галіне свабоды асацыяцыяў, прадугледжаных МПГПП і Дэкларацыяй 1998 году;

— прытрымлівацца аргументаў і рэкамендацыяў, выкладзеных у Паведамленьні Камітэту ААН па правах чалавека па скарзе сп. Бяляцкага і інш. да Рэспублікі Беларусь №1296/2004 ад 27 ліпеня 2007 году;

— выконваць рэкамендацыі Камітэту ААН па правах чалавека і іншых органаў ААН, а таксама Сьпецыяльных працэдураў ААН;

— гарантаваць незалежнасьць судовай сістэмы, г.зн. усталяваць адпаведныя працэдуры прызначэньня, павышэньня па службе і звальненьня судзьдзяў;

— выдаць сталае запрашэньне Сьпецыяльным працэдурам ААН, а таксама прадаставіць станоўчы адказ адносна запыту аб візіце ў Беларусь, зробленага былым Сьпецыяльным прадстаўніком Генеральнага сакратара ААН у сувязі з сітуацыяй вакол беларускіх праваабаронцаў у 2003 годзе;

— шчыльна супрацоўнічаць з органамі АБСЕ па пытаньнях чалавечага вымярэньня, у прыватнасьці з Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека, а таксама з прадстаўніцтвам АБСЕ ў Менску;

— прытрымлівацца стандартаў АБСЕ ў галіне чалавечага вымярэньня, у прыватнасьці ў сферы верхавенства закону, грамадзянскіх і палітычных правоў, а таксама грамадзянскай супольнасьці;

2. Да Еўрапейскага Саюзу





— зьвярнуць увагу на пытаньне незалежнасьці судовай сістэмы і свабоды асацыяцыяў у межах дыялогу з беларускімі ўладамі на розных узроўнях, асабліва ў сувязі з сустрэчамі Тройкі ЕС з беларускімі ўладамі;

— зьвярнуць увагу на пытаньне праваабаронцаў і неабгрунтаваныя абмежаваньні дзейнасьці і існаваньня беларускіх НДА ў адпаведнасьці з Рэкамендацыямі ЕС па пытаньнях праваабаронцаў;

3. Да АБСЕ

— прадстаўніцтва АБСЕ ў Менску павінна зьвяртаць асаблівую ўвагу на пытаньні праваабарончай дзейнасьці і свабоды асацыяцыяў;

— Парламенцкая Асамблея АБСЕ павінна запрасіць яе беларускіх сяброў прыняць адпаведныя заканадаўчыя захады для прывядзеньня нацыянальнага заканадаўства ў адпаведнасьць з міжнароднымі стандартамі ў галіне правоў чалавека.

ДАДАТАК 6

## Рэзалюцыя Еўрапейскага парламенту ад 15 студзеня 2009 году аб стратэгіі ЕС у дачыненьні да Беларусі

***Еўрапейскі парламент,***

— прымаючы да ўвагі свае папярэднія рэзалюцыі аб сітуацыі ў Беларусі, у прыватнасьці Рэзалюцыю ад 9 кастрычніка 2008 году аб сітуацыі ў Беларусі пасьля парламенцкіх выбараў 28 верасьня 2008,

— прымаючы да ўвагі Заяву краіны-ўдзельніцы, якая старшынюе ў ЕС, ад імя Еўрапейскага Саюзу па Агульнай пазіцыі Савету 2008/844/CFSP ад 10 лістапада 2008 году, аб унясеньні зьменаў у Агульную пазіцыю 2006/276/CFSP, што датычыцца ўвядзеньня абмежавальных мераў у дачыненьні да некаторых службовых асобаў Рэспублікі Беларусь,

— прымаючы да ўвагі высновы Савету ЕС па агульных пытаньнях і замежных адносінах адносна Беларусі ад 13 кастрычніка 2008 году аб зьняцьці забароны на палітычныя кантакты з беларускімі ўладамі і прыпыненьні візавых санкцыяў для беларускіх чыноўнікаў, уключаючы прэзідэнта Аляксандра Лукашэнку, на працягу шасьці месяцаў,

— прымаючы да ўвагі штогадовую Справаздачу Савету па правах чалавека за 2008 год ад 27 лістапада 2008 году (14146/2/2008),

— прымаючы да ўвагі Паведамленьне Камісіі для Еўрапейскага парламенту і Савету ад 3 сьнежня 2008 году адносна «Ўсходняга партнёрства» (COM (2008) 0823),

— прымаючы да ўвагі Выніковую справаздачу па назіраньні за выбарамі місіі Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека (БДІПЧ) Арганізацыі па бясьпецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ) адносна парламенцкіх выбараў у Беларусі 27 лістапада 2008 году ад 28 верасьня 2008,

— прымаючы да ўвагі Правіла 103(4) Працэдурных правілаў,





A. у той час, як Савет у сваіх вышэйзгаданых высновах ад 13 кастрычніка 2008 году пацьвердзіў надзеі на паступовае пашырэньне адносінаў з Беларусьсю і гатоўнасьць разьвіваць дыялог з беларускімі ўладамі і з іншымі палітычнымі сіламі ў краіне з мэтай садзейнічаньня сапраўднаму прагрэсу ў напрамку дэмакратыі і павагі правоў чалавека,

B. у той час, як, для таго каб паскорыць дыялог з беларускімі ўладамі і прыняцьце пазітыўных захадаў па ўмацаваньні дэмакратыі і павагі правоў чалавека, Савет пастанавіў, што абмежаваньні на паездкі, уведзеныя ў дачыненьні да пэўных службовых асобаў, за выключэньнем асобаў, датычных да зьнікненьняў, якія адбыліся ў 1999 і 2000 гадах, і старшыні Цэнтральнай выбарчай камісіі, ня будуць прымяняцца на працягу перыяду ў шэсьць месяцаў, які можа быць працягнуты,

C. у той час, як у адказ на пазітыўныя крокі, зробленыя Беларусьсю, Камісія ўжо распачала актыўны дыялог з гэтай краінай у такіх сьферах, як энергетыка, ахова навакольнага асяродзьдзя, мытня, транспарт і харчовая бясьпека і пацьвердзіла сваю гатоўнасьць да далейшага пашырэньня сьферы гэтых тэхнічных перамоваў, якія зьяўляюцца выгаднымі для абодвух бакоў,

D. у той час, як місія па назіраньні за выбарамі АБСЕ/БДІПЧ заявіла ў сваёй выніковай справаздачы, што, хаця мелі месца некаторыя нязначныя паляпшэньні, выбары 28 верасьня 2008 году, якія праходзілі ў строга кантраляваных умовах з мінімальнымі прыкметамі палітычнай кампаніі і былі адзначаныя адсутнасьцю празрыстасьці пры падліку галасоў і падсумаваньні вынікаў з розных выбарчых участкаў, у выніку не адпавядалі міжнародна прызнаным дэмакратычным стандартам; у той час як Лідзія Ярмошына, старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі, прызнала, што выбары ў верасьні 2008 году не атрымлівалі «поўнага і безумоўнага прызнаньня адносна іх адпаведнасьці міжнародным стандартам з боку еўрапейскіх партнёраў», і таму «канчатковая мэта» выбараў не была выкананая,

E. у той час, як Камісія распачала ініцыятыву «Ўсходняе партнёрства», каб актывізаваць супрацоўніцтва з шэрагам краінаў Усходняй Еўропы, уключаючы Беларусь, пры ўмове выкананьня гэтай краінай канкрэтных крытэрыяў, якія адносяцца да дэмакратыі, павагі правоў чалавека і вяршэнства закону,

F. у той час, як міністр замежных справаў Беларусі Сяргей Мартынаў заявіў, што «Беларусь мае станоўчае меркаваньне аб удзе-

ле ў ініцыятыве «Ўсходняе партнёрства» і дадаў, што Беларусь мае намер прыняць удзел у гэтай ініцыятыве,

G. у той час, як беларускія ўлады пакаралі абмежаваньнем волі тэрмінам на адзін год актывіста апазіцыі Аляксандра Баразенку ў адказ на яго ролю ў дэманстрацыі, праведзенай у студзені 2008 г.

H. у той час, як беларускія ўлады адмаўляюць усё большай колькасьці пратэстанцкіх і каталіцкіх сьвятароў і манашак у праве праводзіць пропаведзі і навучаць духавенства,

1. Вітае рашэньне беларускіх уладаў аб рэгістрацыі Руху «За Свабоду» на чале з былым кандыдатам у прэзідэнты Беларусі Аляксандрам Мілінкевічам; спадзяецца, што беларускі ўрад палепшыць умовы, якія рэгулююць парадак рэгістрацыі і працы іншых няўрадавых групаў, у тым ліку палітычных партый і праваабарончай арганізацыі «Наша Вясна»;

2. Вітае рашэньне беларускіх уладаў аб дазволе на друк і распаўсюд дзьвюх незалежных газет, «Народнай волі» і «Нашай Нівы»; адзначае, у той жа час, што ёсьць яшчэ 13 незалежных газет, якія па-ранейшаму чакаюць рэгістрацыі; вітае рашэньне ўраду Беларусі абмеркаваць міжнародныя стандарты па інтэрнэт-СМІ і кансультавацца з Беларускай асацыяцыяй журналістаў па гэтых пытаньнях; спадзяецца, што будуць створаныя спрыяльныя ўмовы для працы іншых незалежных СМІ ў Беларусі, у тым ліку магчымасьці рэкламы;

3. Адзначае гатоўнасьць Беларусі дэталёва абмяркоўваць рэкамендацыі АБСЕ/БДІПЧ па паляпшэньні выбарчага заканадаўства; лічыць гэта важным і абнадзейваючым крокам з боку Беларусі і разьлічвае на яго хутчэйшае ажыцьцяўленьне і далейшыя крокі ў адпаведнасьці з чаканьнямі ЕС;

4. Вітае вызваленьне палітвязьняў у Беларусі, але выказвае шкадаваньне з нагоды таго, што Аляксандр Казулін, Сяргей Парсюкевіч і Андрэй Кім не карыстаюцца ўсімі правамі, гарантаванымі грамадзянам Беларусі Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і, як і ў выпадку з Аляксандрам Баразенкам, якога трымалі пад вартай на працягу тыдня ў чаканьні суда за ўдзел у дэманстрацыі ў студзені 2008 году, а таксама крытыкуе той факт, што супраць некаторых іншых актывістаў па-ранейшаму выкарыстоўваюцца розныя формы абмежаваньня волі;

5. Вітае рашэньне беларускіх уладаў часова адмяніць забарону на паездкі некаторым ахвярам аварыі на Чарнобыльскай АЭС, з тым каб дазволіць ім прыняць удзел у праграмах адпачынку і рэабілітацыі, і спадзяецца, што ў доўгатэрміновай перспектыве можа быць прынятае структурнае рашэньне; настойліва заклікае Чэскую Рэспубліку, якая старшынюе ў ЕС, правесьці ў прыярытэтным парадку перамовы паміж ЕС і беларускімі ўладамі адносна шырокага пагадненьня, якое б дазволіла дзецям выяжджаць з Беларусі ў любыя дзяржавы-ўдзельніцы ЕС, якія зьяўляюцца арганізатарамі такіх рэабілітацыйных праграмаў;

6. Адзначае, што для таго, каб істотна палепшыць адносіны з ЕС, Беларусь павінна (1) заставацца краінай без палітычных зьняволеных, (2) гарантаваць свабоду слова для сродкаў масавай інфармацыі, (3) працягваць супрацоўніцтва з АБСЕ па рэфармаваньні выбарчага права, (4) палепшыць умовы для працы няўрадавых арганізацыяў (НДА), і (5) гарантаваць свабоду сходаў і палітычных аб'яднаньняў;

7. Настойліва заклікае ўрад Беларусі захоўваць правы чалавека шляхам:

а) прыняцьця жыцьцёва неабходных зьмяненьняў у Крымінальным кодэксе Беларусі па адмене Артыкулаў 367, 368, 369-1 і, у прыватнасьці, Артыкулу 193, які часта выкарыстоўваецца як сродак рэпрэсіяў;

б) устрыманьня ад пагрозаў крымінальнага перасьледу, у тым ліку за ўхіленьне ад вайсковай службы ў Беларусі, у дачыненьні да студэнтаў, адлічаных з ВНУ за сваю грамадзянскую пазіцыю і таму вымушаных працягваць вучобу за мяжой;

с) ліквідацыі ўсіх перашкодаў для належнай рэгістрацыі грамадзкіх арганізацыяў у Беларусі; адмены забароны на выкарыстаньне прыватных кватэраў у якасьці адрасоў для рэгістрацыі некамерцыйных арганізацыяў, а таксама перагляду Указу Прэзідэнта № 533 ад 23 кастрычніка 2007 году, які рэгулюе выкарыстаньне службовых памяшканьняў НДА і палітычнымі партыямі;

г) паляпшэньня адносінаў і павагі да нацыянальных меншасьцяў, у тым ліку прызнаньне законна абранага органу «Саюзу палякаў на Беларусі» на чале з Анжалікай Борыс, іх культуры, царквы, сістэмы адукацыі і гістарычнай і матэрыяльнай спадчыны, з тым каб спыніць самаізаляцыю краіны ад астатняй Еўропы і для таго, каб адносіны паміж ЕС і Беларусьсю істотна палепшыліся;

8. Падкрэсьлівае, што дэмакратычная апазіцыя павінна быць часткай працэсу паступовага аднаўленьня кантактаў з Беларусьсю;

9. Заклікае Савет і Камісію прыняць наступныя захады па лібералізацыі візавага рэжыму для грамадзянаў Беларусі, паколькі такія дзеяньні маюць вырашальнае значэньне для выкананьня галоўнай мэты палітыкі ЕС у дачыненні да Беларусі, а менавіта: узмацненьня міжасобасных кантактаў, што ў сваю чаргу будзе спрыяць дэмакратызацыі ў краіне; настойліва заклікае іх, у гэтым кантэксце, разгледзець пытаньне аб магчымасьці зьніжэньня кошту візаў для беларускіх грамадзянаў, якія ўяжджаюць у Шэнгенскую прастору і спрашчэньня працэдуры іх атрыманьня;

10. Заклікае Савет і Камісію разгледзець пытаньне аб выбарачным выкарыстаньні Еўрапейскага інструменту добрасуседзтва і партнёрства і Еўрапейскага інструменту па правах чалавека і дэмакратыі ў Беларусі шляхам пашырэньня падтрымкі беларускай грамадзянскай супольнасьці; заклікаць беларускі ўрад, у знак добрай волі і пазітыўных зьменаў, дазволіць беларускаму «Еўрапейскаму гуманітарнаму ўніверсітэту» ў выгнаньні ў Вільні (Літва) на законных падставах вярнуцца ў Беларусь і аднавіць яго дзейнасьць пры спрыяльных умовах для яго далейшага разьвіцьця ў Менску, аказаць фінансавую падтрымку незалежнаму беларускаму тэлеканалу «Белсат», а таксама заклікаць беларускі ўрад афіцыйна зарэгістраваць «Белсат» у Беларусі;

11. Заклікае Савет і Камісію, у гэтым кантэксьце, разгледзець захады па паляпшэньні дзелавога клімату, гандлю, інвестыцый, энергетыкі і транспартнай інфраструктуры і прыгранічнага супрацоўніцтва паміж ЕС і Беларусьсю, з тым каб спрыяць дабрабыту грамадзянаў Беларусі і пашырыць іх магчымасьці мець зносіны і свабодна перамяшчацца па ЕС;

12. Заклікае Савет і Камісію разгледзець пытаньне аб удзеле Еўрапейскага інвестыцыйнага банка ў інвеставаньні ў беларускія інфраструктуры па транзіце энерганосьбітаў; падкрэслівае важнасьць удзелу еўрапейскіх кампаніяў у працэсе прыватызацыі ў Беларусі;

13. Заклікае беларускія ўлады строга выконваць міжнародныя стандарты і патрабаваньні бясьпекі ў працэсе будаўніцтва новай атамнай электрастанцыі; заклікае Беларусь ратыфікаваць Дадатковы пратакол да Пагадненьня аб усеабдымных гарантыях Міжнароднага агенцтва па атамнай энергіі (МАГАТЭ); заклікае Камісію правесьці маніторынг і прадставіць справаздачу яму і дзяржавам-удзельніцам аб выкананьні Беларусьсю рэкамендацыяў МАГАТЭ і патрабаваньняў Канвенцыі аб ядзернай бясьпецы і Дамовы аб ядзерным нераспаўсюджваньні і аб наступствах працы АЭС для суседніх дзяржаваў-удзельніц ЕС;

14. Выказвае шкадаваньне з нагоды неаднаразовых рашэньняў з боку беларускіх уладаў за апошнія некалькі гадоў аб адмовах ва ўязных візах для дэпутатаў Еўрапейскага парламенту і нацыянальных парламентаў; заклікае беларускія ўлады не ствараць ніякіх іншых перашкодаў, якія накіраваныя на недапушчэньне наведваньня краіны яго Дэлегацыяй па адносінах з Беларусьсю;

15. Вітае падыход, які да гэтага часу выкарыстоўваўся беларускімі ўладамі, нягледзячы на вялікі ціск, па непрызнаньні аднабаковага абвяшчэньня незалежнасьці Паўднёвай Асеціяй і Абхазіяй;

16. Асуджае той факт, што насуперак каштоўнасьцям ААН, Беларусь зьяўляецца адзінай краінай у Еўропе, якая да гэтага часу выкарыстоўвае сьмяротнае пакараньне;

17. Заклікае беларускія ўлады паважаць свабоду рэлігіі; асуджае той факт, што еўрапейскія грамадзяне, у тым ліку сьвятары, неаднаразова дэпартаваліся з Беларусі, што супярэчыць працэсу ўмацаваньня даверу з ЕС;

18. Даручае свайму Старшыні давесьці гэтую рэзалюцыю да Савету, Камісіі, Парламентаў і Ўрадаў дзяржаваў-удзельніц, Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб'яднаных Нацыяў, Парламенцкіх Асамблеяў АБСЕ і Савету Еўропы, Сакратарыяту Садружнасьці Незалежных Дзяржаваў і Парламенту і Ўраду Беларусі.

ДАДАТАК 7

## Рэзалюцыя Еўрапейскага парламенту па выніках ацэнкі дыялогу ЕС і Беларусі

02.04.2009

***Еўрапейскі парламент,***

— прымаючы да ўвагі свае папярэднія рэзалюцыі аб становішчы ў Беларусі, у прыватнасьці рэзалюцыю ад 15 студзеня 2009 году аб стратэгіі ЕС у адносінах да Беларусі,
— прымаючы да ўвагі высновы Савету ЕС па агульных пытаньнях і замежных адносінах адносна Беларусі ад 16 сакавіка 2009 году аб далейшым прыпыненьні візавых санкцыяў для беларускіх чыноўнікаў, уключаючы Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнку, і пашырэньні абмежавальных захадаў,
— прымаючы да ўвагі Паведамленьне Камісіі для Еўрапейскага парламенту і Савету ад 3 сьнежня 2008 году адносна ініцыятывы «Усходняе партнёрства» (COM (2008) 823),
— прымаючы да ўвагі заяву Камісіі ад 21 лістапада 2006 году аб гатоўнасьці Еўрапейскага Саюзу аднавіць свае адносіны з Беларусьсю і яе народам у рамках Еўрапейскай палітыкі добрасуседзтва (ЕПД),
— прымаючы да ўвагі Правіла 103 (2) Працэдурных правілаў,

A. у той час, як Савет у сваіх вышэйзгаданых Заўвагах ад 16 сакавіка 2009 году пацьвердзіў гатоўнасьць паглыбляць свае адносіны з Беларусьсю адносна прагрэсу, дасягнутага Беларусьсю на шляху да дэмакратыі, правоў чалавека і вяршэнства права, а таксама дапамагаць Беларусі ў дасягненьні гэтых мэтаў,

B. у той час, як Савет, ацэньваючы падзеі ў Беларусі пасьля прыняцьця рашэньня аб часовым прыпыненьні абмежаваньняў на паездкі некаторых службовых асобаў Рэспублікі Беларусь, прынятых у кастрычніку 2008 году, у адпаведнасьці з умовамі, выкладзенымі ў Агульнай пазіцыі Савету 2008/844/CFSP, прыняў рашэньне захаваць прыпыненьне прымяненьня гэтых абмежаваньняў на перамяшчэньне на дзевяць месяцаў,

C. у той час, як Савет пастанавіў падоўжыць на адзін год абмежавальныя захады ў дачыненьні да некаторых беларускіх чыноўнікаў, прадугледжаныя Агульнай пазіцыяй 2006/276/CFSP,

D. у той час, як Еўрасаюз працягвае выказваць занепакоенасьць з нагоды сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі і нядаўнімі выпадкамі парушэньняў у гэтай галіне,

Я. у той час, як у адказ на пазітыўныя крокі, зробленыя Беларусьсю, Камісія распачала актыўны дыялог з гэтай краінай у такіх сьферах, як энергетыка, ахова навакольнага асяродзьдзя, мытня, транспарт і харчовая бясьпека і пацьвердзіла сваю гатоўнасьць да далейшага пашырэньня сьферы гэтых тэхнічных перамоваў, якія зьяўляюцца выгаднымі для абодвух бакоў,

F. у той час, як Савет уключыў Беларусь у яго ініцыятыву «Усходняе партнёрства», распачатую Камісіяй для актывізацыі супрацоўніцтва з шэрагам краінаў Усходняй Еўропы,

Г. у той час, як міністр замежных справаў Беларусі Сяргей Мартынаў заявіў, што «Беларусь мае станоўчае меркаваньне аб удзеле ў ініцыятыве «Усходняе партнёрства» і дадаў, што Беларусь мае намер прыняць удзел у гэтай ініцыятыве,

H. у той час, як Камітэт па абароне журналістаў заклікаў беларускія ўлады аднавіць акрэдытацыю Анджэя Пачобута, карэспандэнта найбуйнейшай штодзённай газеты Польшчы «Gazeta Wyborcza», а таксама расьсьледаваць апошнія факты перасьледу яго і яго сям'і ў горадзе Гродна з-за крытыкі палітыкі ўраду; у той час, як 17 сакавіка Анджэй Пачобут быў пакараны штрафам у памеры 148 еўра за рэпартаж аб паседжаньні Саюзу палякаў у Беларусі,

1. Падтрымлівае рашэньне Савету падоўжыць на адзін год абмежавальныя захады ў дачыненьні да некаторых беларускіх чыноўнікаў і ў той жа час захаваць прыпыненьне прымяненьня абмежаваньняў на паездкі некаторых службовых асобаў Беларусі на дзевяць месяцаў;

2. Зноў выказвае заклапочанасьць з нагоды сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі і нядаўніх выпадкаў парушэньняў у гэтай га-

ліне; з нецярпеньнем чакае пачатку дыялогу па правах чалавека з Беларусьсю ў найбліжэйшай будучыні;

3. Вітае пашырэньне дыялогу паміж Еўрасаюзам і Беларусьсю на высокім узроўні, у тым ліку двухбаковых кантактаў, і актывізацыі тэхнічнага супрацоўніцтва, ініцыяваных Камісіяй, як спосабу дасягненьня ўзаемаразуменьня і прадастаўленьня магчымасьцяў вырашэньня інтарэсаў удзельнікаў і пытаньняў, якія ўяўляюць узаемную цікавасьць;

4. Лічыць, што актывізацыя палітычнага дыялогу паміж ЕС і Беларусьсю павінна залежаць ад зьняцьця абмежаваньняў на свабоду і спыненьня гвалту ў дачыненьні да ўдзельнікаў акцыяў пратэсту апазіцыі і праваабаронцаў, заклікае ў гэтай сувязі да неадкладнага вызваленьня прадпрымальнікаў Мікалая Аўтуховіча, Юрыя Лявонава і Уладзіміра Асіпенкі і актывіста моладзевай апазіцыі Арцёма Дубскага;

5. Вітае і рэкамендуе далей працягваць супрацоўніцтва Беларусі з АБСЕ/БДІПЧ па пытаньнях выбарчага заканадаўства;

6. Настойвае на тым, што дэмакратычная апазіцыя і грамадзянская супольнасьць Беларусі павінны быць уключаныя ў дыялог паміж ЕС і Беларусьсю;

7. Заклікае ўрад Беларусі выкарыстаць наступныя дзевяць месяцаў, каб прадэманстраваць значны прагрэс у наступных галінах:

— рэформа выбарчага заканадаўства Беларусі з мэтай забесьпячэньня ўдзелу прадстаўнікоў апазіцыі ў выбарчых камісіях на ўсіх узроўнях, а таксама дзеля забесьпячэньня празрыстасьці і падсправаздачнасьці пры падліку галасоў;
— прадастаўленьне роўных правоў усім СМІ шляхам зьняцьця забаронаў на падпіску і распаўсюд незалежных выданьняў праз дзяржаўную сетку распаўсюду «Саюздрук» (сістэма кіёскаў) і беларускі дзяржаўны паштовы сэрвіс «Белпошта»; адмена Артыкулаў 367, 368, 369 і 369-1 Крымінальнага кодэксу, якія часта выкарыстоўваюцца для перасьледу журналістаў за іх прафесійную дзейнасьць; спрашчэньне працэдуры атрыманьня акрэдытацыі для журналістаў, у тым ліку афіцыйных прадстаўнікоў замежных сродкаў масавай інфармацыі;
— гарантыя свабоды асацыяцыяў і сходаў шляхам адмены Артыкулу 193-1 Крымінальнага кодэксу, які прадугледжвае крымінальную адказнасьць за дзейнасьць ад імя незарэгістраваных грамадзкіх аб’яднаньняў, палітычных партыяў і фондаў; забесьпячэньне свабоды веравызнаньня;
— гарантыя палітычных правоў і свабодаў шляхам спыненьня практыкі палітычна матываваных звальненьняў, выключэньняў з ВНУ; спыненьне перасьледу за ўхіленьне ад воінскай службы студэнтаў, адлічаных з ВНУ за сваю грамадзянскую пазіцыю; перагляд нядаўніх выпадкаў прызываў у войска некаторых маладых актывістаў — Франака Вячоркі, Івана Шылы і Дзьмітрыя Федарука;

8. Заклікае ўрад Беларусі неадкладна ўвесьці мараторый на ўжываньне сьмяротнага пакараньня з мэтай далейшай адмены сьмяротнага пакараньня (як гэта прадугледжана рэзалюцыяй Генеральнай Асамблеі ААН 62/149 ад 18 сьнежня 2007 году), неадкладна замяніць прысуды ўсім зьняволеным, якія ў цяперашні час чакаюць выкананьня сьмяротных прысудаў, на пазбаўленьне волі, прывесьці ўнутранае заканадаўства ў адпаведнасьць з абавязацельствамі краіны ў рамках міжнародных дамоваў па правах чалавека і забясьпечыць строгае выкананьне міжнародна прызнаных стандартаў у галіне справядлівага суда;

9. Заклікае беларускія ўлады прызнаць «Саюз палякаў» на чале з Анжалікай Борыс, якая была пераабраная ўякасьці старшыні на зьездзе «Саюзу палякаў» 15 сакавіка 2009 г.;

10. Калі Беларусь выканае вышэйзгаданыя крытэрыі ў дзевяцімесячны перыяд, заклікае Савет і Еўракамісію разгледзець магчымасьць адмены забароны на паездкі на пастаяннай аснове, а таксама прыняцьця захадаў у мэтах садзейнічаньня эканамічнаму і сацыяльнаму прагрэсу і паскарэньню працэсу рэінтэграцыі Беларусі ў еўрапейскую сям’ю дэмакратычных краінаў;

11. Заклікае Савет і Камісію зрабіць наступныя крокі па лібералізацыі візавых працэдураў для беларускіх грамадзянаў, паколькі такія дзеяньні маюць вырашальнае значэньне для выкананьня галоўнай мэты палітыкі ЕС у дачыненьні да Беларусі, а менавіта ўключэньня Беларусі ў еўрапейскія і рэгіянальныя працэсы і наданьня працэсу дэмакратызацыі ў краіне незваротнага характару; настойліва заклікае іх у гэтым кантэксьце разгледзець магчымасьці для зьніжэньня кошту візаў для беларускіх грамадзянаў, якія ўязджаюць у Шэнгенскую прастору і спрашчэньня працэдуры іх атрыманьня;

12. Заклікае Камісію ў поўнай меры і эфектыўна выкарыстаць магчымасьці для падтрымкі грамадзянскай супольнасьці і дэмакратычных пераўтварэньняў у Беларусі праз Еўрапейскі інструмент садзейнічаньня дэмакратыі і правам чалавека, ЕІДПЧ; настойліва заклікае Камісію рэгулярна і цалкам інфармаваць Парламент аб тым, як выкарыстоўваецца фінансаваньне з ЕІДПЧ;

13. Заклікае Камісію аказаць фінансавую падтрымку незалежнаму беларускаму тэлеканалу «Белсат», а таксама заклікаць беларускі ўрад афіцыйна зарэгістраваць «Белсат» у Беларусі; заклікае беларускі ўрад, у якасьці знаку добрай волі і пазітыўных зьменаў, забясьпечыць вяртаньне беларускага «Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэту» ў выгнаньні ў Вільні (Літва) і аднаўленьне яго дзейнасьці пры спрыяльных умовах для яго далейшага разьвіцьця ў Менску, у прыватнасьці дазволіўшы ЕГУ аднавіць сваю бібліятэку ў Менску ў гэтым годзе шляхам прадастаўленьня памяшканьняў і стварэньня ўмоваў для забесьпячэньня ўсеагульнага доступу да яго калекцыяў на беларускай, рускай, англійскай, нямецкай і французскай мовах;

14. Заклікае Савет і Камісію разгледзець меры паляпшэньня дзелавога клімату, гандлю, інвестыцый, энергетыкі і транспартнай інфраструктуры, а таксама прыгранічнага супрацоўніцтва паміж ЕС і Беларусьсю, з тым каб спрыяць дабрабыту грамадзянаў Беларусі і пашырыць іх здольнасьці мець зносіны і свабодна перамяшчацца па ЕС;

15. Даручае свайму Старшыні давесьці гэтую Рэзалюцыю ў Савет, Камісію, парламенты і ўрады краінаў-удзельнікаў, Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб’яднаных Нацыяў, Парламенцкіх асамблей АБСЕ і Савету Еўропы, Сакратарыяту Садружнасьці Незалежных Дзяржаваў, а таксама Парламенту і Ўраду Беларусі.





ДАДАДАК 8

## Рэзалюцыя Еўрапейскага парламенту па Беларусі

17.12.2009

***Еўрапейскі парламент,***

— прымаючы да ўвагі свае папярэднія рэзалюцыі аб сітуацыі ў Беларусі, у прыватнасьці, Рэзалюцыю па выніках ацэнкі дыялогу ЕС і Беларусі ад 2 красавіка 2009 г.,

— прымаючы да ўвагі высновы ў дачыненьні да Беларусі, зробленыя Саветам па агульных пытаньнях і замежных зносінах на пасяджэньні 17 лістапада 2009 г., уключаючы прыпыненьне далейшага прымяненьня забароны на выдачу візаў пэўным службовым асобам Беларусі, у тым ліку Прэзідэнту Аляксандру Лукашэнку, і працяг абмежавальных захадаў да кастрычніка 2010 году,

— прымаючы да ўвагі Паведамленьне Камісіі ад 3 сьнежня 2008 году адносна «Ўсходняга партнёрства» (COM (2008) 0823),

— прымаючы да ўвагі Дэкларацыю аб «Усходнім партнёрстве», апублікаваную Еўрапейскім Саветам на пасяджэньні 19-20 сакавіка 2009 году і Сумесную дэкларацыю, прынятую на пражскім саміце «Ўсходняга партнёрства» 7 траўня 2009 году,

— прымаючы да ўвагі заяву Камісіі ад 21 лістапада 2006 году аб гатоўнасьці Еўрапейскага Саюзу аднавіць свае адносіны з Беларусьсю і яе народам у рамках Еўрапейскай палітыкі добрасуседзтва (ЕПД),

— прымаючы да ўвагі заяву краіны-ўдзельніцы, якая старшынюе ў Арганізацыі па бясьпецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ) аб сьмяротным пакараньні ў Беларусі ад 29 кастрычніка 2009 г.,

— прымаючы да ўвагі Правіла 110 (4) Працэдурных правілаў,

A. у той час, як Савет у сваіх вышэйзгаданых высновах ад 17 лістапада 2009 прызнае, што адкрываюцца новыя магчымасьці

для дыялогу і паглыбленьня супрацоўніцтва паміж Еўрапейскім Саюзам і Беларусьсю, з мэтай садзейнічаньня сапраўднаму прагрэсу ў напрамку дэмакратыі і павагі да правоў чалавека, і зноў заяўляе пра сваю гатоўнасьць да паглыбленьня адносінаў Еўрапейскага Саюзу з Беларусьсю, з мэтай далейшага прагрэсу ў накірунку дэмакратыі, правоў чалавека і вяршэнства закону, а таксама для аказаньня дапамогі краіне ў дасягненьні гэтых мэтаў,

B. у той час, як Еўрапейскі Саюз разглядае Беларусь як партнёра па такіх розных пытаньнях, як энергетычная бясьпека, транспарт, культурнае супрацоўніцтва, ахова навакольнага асяродзьдзя і харчовая бясьпека,

C. у той час, як Савет, ацэньваючы падзеі ў Беларусі пасьля рашэньня, прынятага 16 сакавіка 2009, у адпаведнасьці з умовамі, выкладзенымі ў яго Агульнай пазіцыі 2009/314/CFSP, вырашыў працягнуць абмежавальныя захады ў дачыненьні да некаторых беларускіх чыноўнікаў, але прыпыніць прымяненьне абмежаваньняў на паездкі ў ЕС да кастрычніка 2010 г.,

D. у той час, як некаторыя пазітыўныя крокі, такія, як вызваленьне шэрагу палітычных зьняволеных і дазвол на распаўсюд дзьвюх незалежных газет, былі прынятыя з кастрычніка 2008 году,

E. у той час, як у адказ на пазітыўныя крокі, зробленыя Беларусьсю, Камісія распачала актыўны дыялог з гэтай краінай у такіх сферах, як энергетыка, навакольнае асяродзьдзе, мытня, транспарт і харчовая бясьпека,

F. у той час, як Савет уключыў Беларусь у сваім рашэньні ад 20 сакавіка 2009 году ў ініцыятыву «Ўсходняе партнёрства», распачатую Камісіяй сваім вышэйзгаданым Паведамленьнем ад 3 сьнежня 2008 году з мэтай актывізацыі супрацоўніцтва з шэрагам краінаў Усходняй Еўропы; у той час, як адной з мэтаў удзелу Беларусі ва «Ўсходнім партнёрстве» і яе парламенцкім адгалінаваньні Euronest зьяўляецца актывізацыя супрацоўніцтва паміж краінай і ЕС, у тым ліку на ўзроўні кантактаў паміж народамі,

G. у той час, як Міжнародная федэрацыя журналістаў, на аснове дакладу аб дзейнасьці сваёй місіі па ўстанаўленьні фактаў у Менску 20-24 верасьня 2009 г., якая ажыцьцяўлялася ў супрацоўніцтве з шэрагам міжнародных няўрадавых арганізацыяў (НДА), ня выявіла якога-небудзь значнага прагрэсу ў галіне свабоды СМІ ў Беларусі;

H. у той час, як Беларусь узяла на сябе абавязацельства разгледзець рэкамендацыі АБСЕ і Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека (БДІПЧ), датычныя ўдасканаленьня выбарчага заканадаўства з тым, каб прывесьці яго ў адпаведнасьць з міжнароднымі стандартамі правядзеньня дэмакратычных выбараў і правесьці кансультацыі адносна прапанаваных АБСЕ паправак; у той час, як Нацыянальны Сход Рэспублікі Беларусь нядаўна прыняў праект рэформы Выбарчага кодэксу без папярэдніх кансультацый з АБСЕ,

I. у той час, як Беларусь застаецца адзінай еўрапейскай краінай, якая па-ранейшаму ўжывае сьмяротнае пакараньне; у той час, як новыя сьмяротныя прысуды выносіліся ў апошнія месяцы,

J. у той час, як 2 лістапада 2009 г. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў, што «адносіны з Еўрапейскім Саюзам як з магутным кансалідаваным партнёрам зьяўляюцца адным з асноўных фактараў забесьпячэньня незалежнасьці Беларусі і яе суверэнітэту, а таксама эканамічнага і навукова-тэхнічнага разьвіцьця»,

1. Падтрымлівае рашэньне Савету падоўжыць абмежавальныя захады ў дачыненьні да некаторых беларускіх чыноўнікаў, але ў той жа час надалей прыпыніць дзеяньне абмежаваньняў на паездкі да кастрычніка 2010 году;

2. Падкрэсьлівае, што пашырэньне палітычнага дыялогу і ўсталяваньне дыялогу па правах чалавека паміж ЕС і Беларусьсю павінна прывесьці да пэўных вынікаў і істотнага прагрэсу ў галіне дэмакратычных рэформаў і захаваньня правоў чалавека і вяршэнства права;

3. Вітае канструктыўны і актыўны ўдзел Беларусі ва «Ўсходнім партнёрстве», ініцыятывы, накіраванай на ўмацаваньне дэмакратыі і вяршэнства права і садзейнічаньне еўрапейскаму супрацоўніцтву; разглядае ўдзел Беларусі ва «Ўсходнім партнёрстве» ў якасьці кроку да садзейнічаньня працягу дыялогу з Еўрапейскім Саюзам і глыбейшага збліжэньня на аснове гатоўнасьці і прыхільнасьці з боку Беларусі ў дасягненьні гэтых мэтаў; вітае трохбаковае супрацоўніцтва Літвы, Беларусі і Ўкраіны ў рамках «Усходняга партнёрства», надаючы прыярытэтную ўвагу праектам па інтэграваным памежным кіраваньні, транспарце і транзіце, агульнай культурнай і гістарычнай спадчыне, сацыяльным забесьпячэньні і энергетычнай бясьпецы;

4. Заклікае Камісію падрыхтаваць прапановы па сумесным прамежкавым плане па ўстанаўленьні Беларусьсю прыярытэтаў рэформаў, натхнёных планамі дзеяньняў, распрацаваных у рамках

Еўрапейскай палітыкі добрасуседства ў мэтах актывізацыі прыпыненай працэдуры ратыфікацыі Пагадненьня аб партнёрстве і супрацоўніцтве паміж ЕС і Беларусьсю; прытрымліваецца меркаваньня, у гэтай сувязі, што Пагадненьне аб партнёрстве і супрацоўніцтве паміж ЕС і Беларусьсю, якое было замарожана з 1997 году, павінна быць актывізавана, калі ўсе палітычныя рэформы будуць завершаныя і рэалізаваныя;

5. Заклікае Еўрапейскі інвестыцыйны банк і Еўрапейскі банк рэканструкцыі і разьвіцьця разгледзець пытаньне аб павелічэньні фінансавай дапамогі Беларусі, зьвяртаючы асаблівую ўвагу на становішча малых і сярэдніх прадпрыемстваў, пры пераглядзе іх мандату ў мэтах садзейнічаньня пераходу Беларусі да дэмакратыі, плюралістычнага грамадзтва і рынкавай эканомікі; лічыць, што магчымая фінансавая падтрымка павінна залежаць ад дасягненьняў істотнага прагрэсу ў галінах, пазначаных ніжэй;

6. Заклікае Камісію разгледзець меры паляпшэньня дзелавога клімату, гандлю, інвестыцый, энергетыкі і транспартнай інфраструктуры і прыгранічнага супрацоўніцтва паміж Еўрапейскім Саюзам і Беларусьсю; прымае да ведама намаганьні і дасягненьні Беларусі ў барацьбе з наступствамі фінансавага і эканамічнага крызісу і пад’ёму эканомікі за кошт зьняцьця бар’ераў на шляху інвестыцыяў і рэфармаваньня ўласнасьці і прыватнага сектару;

7. Падкрэсьлівае, што намаганьні па барацьбе з карупцыяй, па павышэньні транспарэнтнасьці і ўмацаваньня вяршэнства права, якія зьяўляюцца асноватворнымі для прыцягненьня большага аб’ёму замежных інвестыцыяў, былі недастатковымі;

8. Заклікае Камісію падрыхтаваць рэкамендацыі для магчымага прыняцьця дырэктывы аб спрашчэньні візавага рэжыму і пагадненьняў аб рэадмісіі з Беларусьсю, як толькі адпаведныя ўмовы будуць выкананыя; лічыць, што такія захады маюць важнае значэньне для дасягненьня галоўнай мэты палітыкі ЕС у дачыненьні да Беларусі, а менавіта: умацаваньня кантактаў паміж народамі, уключаючы Беларусь у еўрапейскія і рэгіянальныя працэсы і наданьне працэсу дэмакратызацыі ў краіне незваротнага характару;

9. Настойліва заклікае Савет і Камісію, у гэтым кантэксьце, разгледзець пытаньне аб магчымасьці зьніжэньня кошту візаў для беларускіх грамадзянаў, якія ўяжджаюць у Шэнгенскую прастору і спрашчэньні працэдуры атрыманьня візаў; падкрэсьлівае, што доўгатэрміновай мэтай зьяўляецца бязьвізавы рэжым паміж Еўрапейскім Саюзам і Беларусьсю; заклікае беларускія ўлады падпісаць бязьвізавае пагадненьне для жыхароў зонаў, памежных з суседнімі краінамі ЕС;





10. Рашуча асуджае нядаўнія адмовы ўязных візаў Агнешцы Рамашэўскай, дырэктару тэлекампаніі «Белсат», прафесару Беластоцкага ўніверсітэту; Хрыстасу Пургурыдэсу, дэпутату Парламенту Кіпру; і Эмануэлісу Зінгерысу, дэпутату Парламенту Літвы;

11. Заклікае Савет і Камісію, у выпадку калі Беларусь дасягне значнага прагрэсу цягам наступнага году і выканае адпаведныя крытэрыі, разгледзець пытаньне аб зьняцьці забароны на паездкі на пастаяннай аснове, а таксама аб прыняцьці захадаў у мэтах садзейнічаньня эканамічнаму і сацыяльнаму прагрэсу і паскарэньню працэсу інтэграцыі Беларусі ў еўрапейскую сям’ю дэмакратычных краінаў;

12. Адзначае, што павінны быць нададзены новы імпульс ўзаемавыгаднаму дыялогу паміж Беларусьсю і Еўрапейскім Саюзам у рамках міжпарламенцкага супрацоўніцтва Euronest; адзначае, што Беларусі будзе прапанавана у поўнай меры і на роўнай аснове прыняць удзел ў Euronest Асамблеі — парламенцкім падразьдзяленьні «Ўсходняга партнёрства» — у выпадку калі выбары ў беларускі Парламент будуць свабоднымі і справядлівымі, і лічыць, што да гэтага часу павінны прымяняцца часовыя палажэньні;

13. Прытрымліваецца меркаваньня, што ўсе дзяржавы-сябры ЕС і іх ўрады павінны праводзіць узгодненую пазіцыю ў сваіх адносінах з трэцімі краінамі на аснове агульнай пазіцыі, узгодненай у Савеце; таксама лічыць, што еўрапейскія інстытуты павінны прытрымлівацца адзінай стратэгіі і аб’яднаць намаганьні ў дасягненьні канкрэтных вынікаў у адносінах ЕС з Беларусьсю; заклікае ўсіх прадстаўнікоў і дзяржавы-сябры Еўрапейскага Саюзу да правядзеньня палітычных сустрэчаў з прадстаўнікамі дэмакратычнай апазіцыі, у прыватнасьці пры наведваньні Беларусі;

14. Настойліва заклікае Беларусь і надалей супрацоўнічаць з Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека Арганізацыі па бясьпецы і супрацоўніцтву ў Еўропе (АБСЕ/БДІПЧ) па выбарчым кодэксе і разлічвае, што новы выбарчы закон будзе адпавядаць міжнародным стандартам і ўступіць у сілу да выбараў у мясцовыя органы, запланаваныя на вясну 2010 году;

15. Настойвае на тым, што яўны і значны прагрэс у накірунку дэмакратызацыі павінен адбыцца на працягу наступнага году, для

таго, каб санкцыі былі цалкам скасаваныя, і што ўмовы для поўнага аднаўленьня адносінаў з Беларусьсю павінны быць наступнымі:

— забесьпячэньне павагі свабоды выказваньня меркаваньняў шляхам прывядзеньня закону аб СМІ ў адпаведнасьць з рэкамендацыямі, якія зьмяшчаюцца ў дакладзе Міжнароднай місіі па ўсталяваньні фактаў у Рэспубліцы Беларусь 20-24 верасьня 2009 году;
— гарантаваць свабоду сходаў і асацыяцыяў, адмяніўшы артыкул 193-1 Крымінальнага кодэксу Беларусі, які кваліфікуе дзейнасьць ад імя незарэгістраваных грамадзкіх аб'яднаньняў, палітычных партыяў і фондаў як крымінальнае злачынства;
— дазвол на рэгістрацыю ўсіх палітычных партыяў і арганізацыяў грамадзянскай супольнасьці;
— забесьпячэньне свабоды веравызнаньня для рэлігійных канфесіяў, адрозных ад праваслаўнай царквы, у прыватнасьці, дазвол на свабоднае функцыянаваньне царквы «Новае жыцьцё»;
— пазьбягаць стварэньня перашкодаў для дзейнасьці арганізацыяў, ужо дзеючых у Рэспубліцы Беларусь, напрыклад, шляхам павышэння арэнднай платы (як гэта мела месца ў адносінах да «Беларускага Народнага Фронту») або ўвядзеньня незаконных падаткаў па праектах, якія ажыццяўляюцца з дапамогай субсідый ЕС (напрыклад, «Беларускі Хельсінскі камітэт»);
— стварэньне спрыяльных умоваў для дзейнасьці няўрадавых арганізацыяў і незалежных сродкаў масавай інфармацыі;
— гарантаваньне палітычных правоў і свабодаў шляхам спыненьня практыкі палітычна матываваных актаў запалохваньня, у прыватнасьці, звальненьня з працы і адлічэньня з універсітэтаў (як гэта мела месца ў дачыненні да Тацяны Шапуцькі, якая была выключаная са свайго ўніверсітэту за ўдзел у форуме грамадзянскай супольнасьці «Ўсходняга партнёрства» ў Брусэлі);
— спыненьне перасьледу па абвінавачваньні ва ўхіленьні ад вайсковай службы студэнтаў, якія былі выключаныя з ВНУ за сваю грамадзянскую пазіцыю і ў цяперашні час вымушаны атрымліваць адукацыю за мяжой;





— перагляд усіх выпадкаў гвалтоўнага прызыву, якія парушылі законныя правы шэрагу маладых актывістаў, у тым ліку Франака Вячоркі, Івана Шылы і Дзьмітрыя Федарука, і якія прыраўноўваюцца да дзяржаўнай практыкі захопу закладнікаў;

16. Са шкадаваньнем адзначае, што пасьля першапачатковых пазітыўных крокаў, прынятых урадам Беларусі, ніякага далейшага істотнага прагрэсу ў галіне правоў чалавека і асноўных свабодаў не было дасягнута; нагадвае ў гэтай сувязі аб няспынных рэпрэсіях у дачыненьні да палітычных апанентаў і адмовах у рэгістрацыі палітычных партый («Беларуская хрысьціянская дэмакратыя»), НДА («Вясна») і незалежных сродкаў масавай інфармацыі («Белсат»); заклікае беларускія ўлады перагледзець прысуды, зьвязаныя з абмежаваньнем свабоды, вынесеныя ў дачыненьні да ўдзельнікаў мірнай дэманстрацыі, якая адбылася ў студзені 2008 году і пазбаўленьнем волі Арцёма Дубскага; адзначае, што «Міжнародная Амністыя» разглядае ўсіх гэтых асобаў у якасьці вязьняў сумленьня; заклікае да неадкладнага вызваленьня прадпрымальнікаў Мікалая Аўтуховіча і Уладзіміра Асіпенкі, якія ўтрымліваюцца ў папярэднім зьняволеньні на працягу васьмі месяцаў;

17. Заклікае ўрад Беларусі неадкладна ўвесьці мараторый на ўжываньне сьмяротнага пакараньня, з мэтай далейшай адмены сьмяротнага пакараньня (як гэта прадугледжана рэзалюцыяй Генеральнай Асамблеі ААН 62/149 ад 18 сьнежня 2007 году аб увядзеньні мараторыю на ўжываньне сьмяротнага пакараньня), неадкладна замяніць прысуды ўсім зьняволеным, якія ў цяперашні час чакаюць выкананьня сьмяротных прысудаў, на пазбаўленьне волі; прывесьці ўнутранае заканадаўства ў адпаведнасьць з абавязацельствамі краіны ў рамках міжнародных дамоваў па правах чалавека і забясьпечыць строгае выкананьне міжнародна прызнаных стандартаў у галіне справядлівага суда;

18. Настойліва заклікае беларускія ўлады пачаць аб'ектыўнае і галоснае расьсьледаваньне выкраданьняў маладых актывістаў (Артура Фінькевіча, які быў выкрадзены 17 кастрычніка 2009 г.; Насты Палажанкі і Дзяніса Карнова, абодва выкрадзеныя 5 сьнежня 2009 году; Уладзіміра Лемеша, выкрадзенага 27 лістапада 2009 году; Зьміцера Дашкевіча, выкрадзенага 5 сьнежня 2009 году; і Яўгена Афнагеля, выкрадзенага 6 сьнежня 2009 году), і нядаўнюю сьмерць сябра БНФ і актывіста Валянціна Доўнара, а таксама публікаваць вынікі расьсьледаваньняў;

19. Заклікае беларускія ўлады паважаць правы нацыянальных меншасьцяў у адпаведнасьці з Рамачнай канвенцыяй Савету Эўропы аб абароне нацыянальных меншасьцяў ад 1 лютага 1995 г.; у гэтай сувязі заклікае беларускія ўлады прызнаць ГА «Саюз палякаў на Беларусі» на чале з Анжалікай Борыс, якая была пераабраная ў якасьці старшыні на зьезьдзе «Саюзу палякаў» 15 сакавіка 2009 году;

20. Настойліва заклікае беларускія ўлады да пачатку сапраўднага дыялогу з прадстаўнікамі дэмакратычнай апазіцыі; падкрэсьлівае, такім чынам, важнасьць вызначэньня ролі і метадаў работы Грамадзкага кансультацыйнага савету;

21. Заклікае Камісію ў поўнай меры і эфектыўна выкарыстаць магчымасьці для падтрымкі грамадзянскай супольнасьці і дэмакратычных пераўтварэньняў у Беларусі праз Эўрапейскі Інструмент садзейнічаньня дэмакратыі і правам чалавека, і падкрэслівае ў той жа час, што падтрымка дэмакратычнай апазіцыі павінна быць неад’емнай часткай паступовага аднаўленьня працэсу дыялогу з Беларусьсю;

22. Заклікае Камісію і ўрады дзяржаваў-сяброў прадаставіць фінансавую падтрымку «Белсату» і заклікаць беларускі ўрад афіцыйна зарэгістраваць «Белсат» у Беларусі; заклікае беларускі ўрад, у якасьці знаку добрай волі і пазітыўных зьменаў, забясьпечыць вяртаньне беларускага «Эўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта» ў выгнаньні ў Вільні (Літва) і аднаўленьне яго дзейнасьці пры спрыяльных умовах для яго далейшага разьвіцьця ў Менску, у прыватнасьці дазволіўшы ЕГУ аднавіць сваю бібліятэку ў Менску ў гэтым годзе шляхам прадастаўленьня памяшканьняў і стварэньня ўмоваў для забесьпячэньня ўсеагульнага доступу да яго калекцый на беларускай, рускай, англійскай, нямецкай і французскай мовах;

23. Даручае свайму Старшыні давесьці гэтую рэзалюцыю да Савету, Камісіі, Парламентаў і Ўрадаў дзяржаў-сяброў, Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб’яднаных Нацыяў, Парламенцкіх асамблеяў АБСЕ і Савету Эўропы, Сакратарыяту Садружнасьці Незалежных Дзяржаваў, а таксама Парламенту і Ўраду Беларусі.





ДАДАТАК 9

## Рэзалюцыя Парламенцкай Асамблеі Савету Эўропы аб сітуацыі ў Беларусі

23.06.2009

1. Парламенцкая Асамблея пільна сачыла за сітуацыяй у Беларусі пачынаючы ад 1992 году, калі беларускаму парламенту быў нададзены статус сьпецыяльна запрошанага ў ПАСЕ. Аднак адсутнасьць прагрэсу з боку Беларусі ў галіне дэмакратыі, правоў чалавека і верхавенства закону стала прычынай прыпыненьня гэтага статусу ў 1997 годзе, а таксама да замарозкі разгляду заяўкі Беларусі на ўступленьне ў Савет Эўропы годам пазьней. Асамблея папранейшаму спадзяецца, што Беларусь калісьці выканае патрабаваньні па ўступленьні ў Савет Эўропы, а яе ўлады возьмуць на сябе цьвёрдыя абавязацельствы па выкананьні стандартаў Арганізацыі і прымуць яе каштоўнасьці.

2. За апошнія месяцы адбылося некалькі вельмі важных падзеяў: у тэрмін паміж студзенем і жніўнем 2008 году былі вызваленыя дзевяць апазіцыйных палітыкаў, якія лічыліся палітычнымі зьняволенымі, у тым ліку былы кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Казулін. У выніку, з таго часу ў Беларусі не было міжнародна прызнаных палітычных зьняволеных. Асамблея вітае гэтыя істотныя крокі і заклікае беларускія ўлады не адмяняць свае рашэньні.

3. Асамблея таксама вітае рашэньне аб рэгістрацыі апазіцыйнага Руху «За свабоду», а таксама рашэньне, якое дазволіла тром незалежным выданьням — «Народнай волі», «Нашай ніве» і «Узгорку» друкавацца ў Беларусі, а таксама ўключэньне гэтых выданьняў у дзяржаўны каталог. Тым ня менш, сітуацыя са свабодай СМІ ў Беларусі далёкая ад ідэальнай, асабліва ў адносінах да электронных сродкаў масавай інфармацыі.

4. Мы таксама разглядаем як станоўчы крок стварэньне шэрагу кансультацыйных саветаў пад эгідай Адміністрацыі прэзідэнта і іншых дзяржаўных органаў, якія могуць стаць форумам для арганізацыі канструктыўнага дыялогу паміж уладамі і няўрадавымі ар-

ганізацыямі і іншымі прадстаўнікамі грамадзянскай супольнасьці. Асамблея спадзяецца, што вынікам дыскусіяў у межах кансультацыйных саветаў будуць заканадаўчыя і палітычныя рашэньні.

5. Што датычыць зьнікненьня чатырох апанентаў рэжыму ў 1999-2000 гадах, Асамблея з задавальненьнем адзначае, што ніводная з высокапастаўленых дзяржаўных асобаў, згаданых у Рэзалюцыі №1371 (2004 год) у сувязі з падазрэньнем або непасрэдна ў зьнікненьнях, або ў іх замоўчваньні, не займаюць адказныя пасады. Але мы выказваем шкадаваньне адносна таго, што сьледзтвы па гэтых справах зайшлі ў тупік, нягледзячы на інфармацыю, выкладзеную ў справаздачы Асамблеі.

6. Важнасьць гэтых крокаў павышаецца, у тым ліку і з прычыны таго, што яны цалкам адпавядаюць патрабаваньням еўрапейскіх арганізацыяў, а таксама дзякуючы таму, што яны былі зробленыя ў кантэксьце ўзнаўленьня палітычнага дыялогу з беларускім кіраўніцтвам.

7. Пасьля вызваленьня ўсіх беларускіх палітычных зьняволеных Еўрапейскі Саюз прыняў рашэньне аб аднаўленьні кантактаў з беларускім кіраўніцтвам на самым высокім узроўні, а таксама прыпыніць, хаця б часткова і часова, візавыя санкцыі ў адносінах да шэрагу высокапастаўленых беларускіх чыноўнікаў, у тым ліку ў адносінах да прэзідэнта Лукашэнкі. У красавіку 2009 году прыпыненьне было працягнутае яшчэ на дзевяць месяцаў. Імкненьне Еўрасаюзу да нармалізацыі стасункаў з Беларусьсю было выказана падчас візіту ў Менск Вярхоўнага прадстаўніка ЕС па агульнай зьнешняй палітыцы і палітыцы бясьпекі сп.Хаўера Саланы і яго сустрэчы з прэзідэнтам Лукашэнкам 19 лютага 2009 году.

8. Беларусь таксама зьяўляецца адной з шасьці краінаў, якія прымуць удзел ва «Ўсходнім партнёрстве», новым органе, які створаны для разьвіцьця палітычнага і эканамічнага супрацоўніцтва паміж Еўрасаюзам і яго ўсходнімі і каўказскімі суседзямі; яго задачай зьяўляецца павышэньне іх стабільнасьці, а таксама падтрымка дэмакратычных і рынкавых рэформаў. З гэтай нагоды Беларусь была запрошаная на Саміт «Усходяга партнёрства», які адбыўся 7 траўня 2009 у Празе. Еўрасаюз таксама мае намер распачаць з Беларусьсю дыялог па пытаньнях правоў чалавека.

9. Савет Еўропы, са свайго боку, пачаў паглыбляць свае кантакты з беларускімі ўладамі: пасьля візіту дэлегацыі Камітэту па палітычных пытаньнях Асамблеі ў лютым 2009 году Міністр Мігель





Анхель Марацінас прыехаў з афіцыйным візітам у Менск у сакавіку 2009 году ў якасьці старшыні Камітэту міністраў. За некалькі тыдняў да гэтага беларускія ўлады нарэшце далі згоду на адкрыцьцё інфармацыйнага прадстаўніцтва Савету Еўропы ў Менску, якое было ініцыяванае Асамблеяй і зьдзейсьненае падчас славацкага старшынства ў Камітэце міністраў. Цырымонія адкрыцьця інфармацыйнага цэнтру адбылася ў чэрвені 2009 году.

10. Пасьля гэтага, у сьнежні 2008 году, Кангрэс мясцовых і рэгіянальных уладаў Савету Еўропы вырашыў надаць статус назіральніка Савету па ўзаемадзеяньню органаў мясцовага самакіраваньня пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь.

11. Нягледзячы на нядаўнія станоўчыя зьмены і аднаўленьне кантактаў з еўрапейскімі арганізацыямі, сітуацыя ў Беларусі паранейшаму выклікае заклапочанасьць.

12. Па-першае, парламенцкія выбары ў верасьні 2008 году сталі страчанай магчымасьцю для рашучых зьменаў у накірунку да дэмакратыі: яны не адпавядалі еўрапейскім стандартам свабоды і сумленнасьці. Як падкрэсьліваў Офіс па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ, сур'ёзныя недахопы на ўсіх этапах выбарчага працэсу, ад даступнасьці інфармацыі для выбаршчыкаў да адсутнасьці празрыстасьці падліку галасоў. Гэтыя недахопы непазьбежна ставяць пад сумненьне прадстаўніцтва дзеючага беларускага парламенту, у якім не знайшлося месца ніводнаму апазіцыйнаму кандыдату. Аднак трэба прызнаць, што, зважаючы на канчатковыя рэкамендацыі Офісу па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ, беларускія ўлады пагадзіліся супрацоўнічаць з БДІПЧ па пытаньнях рэформы беларускага заканадаўства і правапрымяняльнай практыкі, з мэтай правядзеньня іх у адпаведнасьць з абавязацельствамі Беларусі ў межах АБСЕ.

13. Што датычыць павагі да палітычных свабодаў, перасьледу і запалохваньня апазіцыйных кандыдатаў, у прыватнасьці моладзі, гэтыя парушэньні працягваюць адбывацца ў разнастайных формах, такіх як незаконныя вобыскі прыватных дамоў, незаконная канфіскацыя маёмасьці, жорсткасьць праваахоўнікаў падчас масавых акцыяў, а таксама гвалтоўны прызыў у войска, нягледзячы на папярэднія заявы аб непрыдатнасьці да службы. Акрамя гэтага, шэраг палітычных актывістаў знаходзяцца пад хатнім арыштам, а ранейшыя прысуды палітычным актывістам, якія былі ўсё ж вызва-

леныя, не былі цалкам ануляваныя — у выніку яны сутыкаюцца з абмежаваньнем некаторых правоў, у тым ліку права ўдзельнічаць у выбарах у якасьці кандыдатаў.

14. Асамблея таксама адзначае той факт, што на дадзены момант тры прадпрымальнікі, якія зараз знаходзяцца ў турме, як і іншыя асобы, абмежаваныя ў свабодзе, разглядаюцца беларускай апазіцыяй у якасьці палітычных зьняволеных, або, прынамсі, як ахвяры парушэньня сістэмы крымінальнага правасудзьдзя па палітычных матывах. Асамблея заклікае правесьці незалежнае расьсьледаваньне гэтых справаў дзеля высьвятленьня, ці сапраўды яны зьяўляюцца палітычнымі зьняволенымі і, калі так, паспрыяньня іх вызваленьню.

15. Сітуацыя са свабодай асацыяцыяў таксама выклікае заклапочанасьць: нават улічваючы тое, што апазіцыйны палітычны Рух «За свабоду» быў нарэшце зарэгістраваны ў сьнежні 2008 году, іншыя апазіцыйныя і праваабарончыя арганізацыі па-ранейшаму сутыкаюцца з перашкодамі пры спробе атрыманьня рэгістрацыі ад Міністэрства юстыцыі; апошнім прыкладам зьяўляецца сітуацыя з праваабарончай арганізацыяй «Наша Вясна» — яе сябры рызыкуюць трапіць пад крымінальны перасьлед за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі паводле Артыкулу 193.1 Крымінальнага кодэксу.

16. Асамблея выказвае шкадаваньне з нагоды таго, што, нягледзячы на ўключэньне трох незалежных выданьняў у дзяржаўны каталог падпіскі, іншыя незалежныя СМІ ня могуць карыстацца гэтай сістэмай і вымушаныя друкавацца па-за межамі Беларусі. Абсалютны дзяржаўны кантроль за друкам і распаўсюдам прэсы, а таксама электроннымі СМІ, зьяўляецца абуральным парушэньнем свабоды сродкаў масавай інфармацыі. Асамблея таксама выказвае занепакоенасьць з прычыны цяжкасьцяў, з якімі сутыкаюцца замежныя журналісты ў атрыманьні акрэдытацыі, а таксама замежнымі СМІ, такімі як «Белсат», у атрыманьні рэгістрацыі ад Міністэрства замежных справаў. Мы таксама зьвяртаем увагу на шматлікія заявы беларускага кіраўніцтва аб гатоўнасьці забясьпечыць выкананьне заканадаўства аб СМІ без абмежаваньня свабоды слова. Асамблея выказвае спадзяваньне, што тое самае будзе датычыць прымяненьня «Закону аб супрацьдзеяньні экстрэмізму», якое нядаўна прывяло да забароны на публікацыю часопіса «ARCHE», якая пазьней была адменена пад ціскам міжнароднай супольнасьці.





17. Мы таксама выказваем шкадаваньне з тае прычыны, што сьмяротныя прысуды па-ранейшаму прыводзяцца ў выкананьне ў Беларусі, нягледзячы на скарачэньне сьпісу злачынстваў, за якія яны могуць быць вынесеныя, памяншэньне колькасьці вынесеных сьмяротных прысудаў, а таксама на той факт, што, паводле афіцыйных дадзеных, з кастрычніка 2008 году не было прыведзена ў выкананьне ніводнага сьмяротнага прысуду. У той час, калі афіцыйныя дадзеныя па гэтым пытаньні зьяўляюцца недаступнымі, Асамблея таксама адзначае інфармацыю, прадастаўленую ўладамі, паводле якой на дазены момант няма сьмяротных прысудаў, выкананьне якіх было прыпыненае.

18. Улічваючы, што хаця Беларусь і далёкая ад выкананьня стандартаў Савету Еўропы ў галіне дэмакратыі, вяршэнства закону і правоў чалавека, яе ўлады апошнім часам зрабілі важныя захады ў правільным накірунку. Асамблея прыняла рашэньне спрыяць працягу гэтага працэсу шляхам наладжваньня палітычнага дыялогу з уладамі, у той жа самы час працягваючы падтрымку дэмакратычных сілаў і грамадзянскай супольнасьці ў краіне.

19. Улічваючы ўсё вышэйзгаданае, Асамблея заклікае сваё Бюро:

19.1. адмяніць прыпыненьне статусу сьпецыяльна запрошанага для беларускага парламенту пасьля таго, як мараторый на выкананьне сьмяротных прысудаў будзе абвешчаны кампетэнтным беларускім органам;

19.2. таксама, прымаючы пад увагу пазіцыю Камітэту па палітычных пытаньнях, сачыць за сітуацыяй у Беларусі і, па заканчэньні перыяду ў адзін год або раней, калі сітуацыя будзе вымагаць такіх дзеяньняў, зрабіць ацэнку, ці зрабіла гэтая краіна істотныя і незваротныя захады на шляху да выкананьня стандартаў Савету Еўропы. У гэтым кантэксьце асаблівую ўвагу трэба надаваць узроўню адпаведнасьці захадаў Беларусі рэкамендацыям, пазначаным у пунктах 21 і 22 дадзенай Рэзалюцыі, а таксама імкненьня да супрацоўніцтва, праўяленага Беларусьсю ў яе стасунках з Саветам Еўропы;

19.3. у кантэксьце аднаўленьня статусу сьпецыяльна запрошанага для беларускага парламенту і толькі ў выпадку, дзе апазіцыя мусіць атрымаць адэкватнае прадстаўніцтва, забясьпечыць запрашэньне беларускай міжпарламенцкай апазіцыі для ўдзелу ў працы Асамблеі і яе камітэтаў, у адпаведнасьці з правіламі, устаноўленымі Бюро ў будучыні;

19.4. рэкамендаваць Камітэту па палітычных пытаньнях надалей сачыць за сітуацыяй у Беларусі, абапіраючыся на дзейнасьць сваіх падкамітэтаў па справах Беларусі, а таксама прадастаўляць справаздачы ў Асамблею, калі гэта будзе неабходна;

20. Акрамя таго, Асамблея заклікае Генеральнага сакратара Савету Еўропы прызначыць савет незалежных экспертаў для расьсьледаваньня новых выпадкаў зьяўленьня палітычных зьняволеных у Беларусі.

21. Будучы перакананымі, што дыялогу можна дасягнуць толькі праз няспынны прагрэс Беларусі на шляху да выкананьня стандартаў Савету Еўропы, Асамблея заклікае беларускія ўлады:

21.1. забясьпечыць неадкладнае вызваленьне ўсіх палітычных зьняволеных (як пазначана ў пункце 20), а таксама немагчымасьць рэгрэсу ў гэтым важным пытаньні;

21.2. неадкладна і безумоўна зьняць абмежаваньні, накладзеныя на 11 маладых асобаў, асуджаных на абмежаваньне свабоды за ўдзел у мірных дэманстрацыях у студзені 2008 году;

21.3. забясьпечыць паўнавартаснае супрацоўніцтва з Саветам Еўропы з мэтай высьвятленьня наяўнасьці палітычных зьняволеных у Беларусі;

21.4.ануляваць наступствы крымінальнага перасьледу былых палітычных зьняволеных з мэтай забесьпячэньня поўнага карыстаньня імі сваімі грамадзянскімі і палітычнымі правамі;

21.5. адмовіцца ад перасьледу і запалохваньня апазіцыйных актывістаў;

21.6. спыніць практыку гвалтоўнага прызыву апазіцыйных актывістаў на вайсковую службу, нягледзячы на папярэднія заявы аб іх непрыгоднасьці да службы;

21.7. забясьпечыць павагу да свабоды асацыяцыяў, у прыватнасьці шляхам:

21.7.1. адмены ўсялякіх практычных і юрыдычных перашкодаў для рэгістрацыі палітычных партыяў, групаў і праваабарончых НДА, а таксама праз прадастаўленьне ім магчымасьці мець юрыдычны адрас у жылых будынках

21.7.2. прадастаўленьня рэгістрацыі праваабарончай арганізацыі «Наша Вясна»;

21.7.3. адмены Артыкулу 193.1 Крымінальнага кодэксу;

21.8. забясьпечыць павагу да свабоды мірных сходаў, у прыватнасьці шляхам:





21.8.1. прадастаўленьня беларускай апазіцыі магчымасьці праводзіць мірныя дэманстрацыі ў месцах, выгодных з пункту гледжаньня грамадзкай увагі, і

21.8.1. забесьпячэньня адмовы выкарыстаньня праваахоўнымі органамі празьмернай фізічнай сілы супраць дэманстрантаў;

21.9. рэфармаваць выбарчае заканадаўства і практыку праз выкананьне рэкамендацыяў БДІПЧ/АБСЕ і Еўрапейскай камісіі за дэмакратыю праз закон (Венскай камісіі), з мэтай прывядзеньня іх у адпаведнасьць з еўрапейскімі стандартамі і прыцягненьня Венскай камісіі, з якой яна падтрымлівае партнёрскія стасункі, да саўдзелу ў гэтым працэсе;

21.10. забясьпечыць свабоду СМІ і выкананьне прынцыпаў плюралізму ў доступе да інфармацыі, у прыватнасьці шляхам:

21.10.1. прадастаўленьня незалежным выданьням магчымасьці друкавацца ў Беларусі, а таксама распаўсюджвацца праз дзяржаўную сістэму падпіскі і распаўсюду;

21.10.1. прадастаўленьня магчымасьці стварэньня незалежных выдавецтваў і незалежных распаўсюднікаў друкаваных СМІ;

21.10.3. адмены існуючага татальнага прамога дзяржаўнага кантролю над дзяржаўнымі электроннымі СМІ і забесьпячэньня справядлівага доступу палітычнай апазіцыі да эфіру, асабліва перад выбарамі;

21.10.4. забесьпячэньня функцыянаваньня інтэрнэт-выданьняў без адміністрацыйных абмежаваньняў;

21.10.5. адмены празьмернай крымінальнай адказнасьці за паклёп, у прыватнасьці за адмоўныя выказваньні ў адносінах Рэспублікі Беларусь і яе дзяржаўных органаў;

21.10.6. адмены перашкодаў на атрыманьне ўязных візаў і акрэдытацыі замежнымі журналістамі;

21.10.7. рэгістрацыі спадарожнікавага каналу «Белсат» і іншых спадарожнікавых каналаў, што датычыць доступу да тэхнічных рэсурсаў;

21.10.8. адмовы ад прымяненьня «Закону аб супрацьдзеяньні экстрэмізму» ў якасьці падставы для абмежаваньня ці забароны дзейнасьці незалежных СМІ;

21.10.9. забесьпячэньня адмовы ад абмежавальнага прымяненьня новага Закону «Аб СМІ», асабліва што датычыць іх рэгістрацыі;

21.11. забясьпечыць незалежнасьць ВНУ і акадэмічную свабоду, дазволіць Еўрапейскаму гуманітарнаму ўніверсітэту зноў адчыніцца ў Беларусі і ўстрымацца ад адлічэньня студэнтаў і выкладчыкаў з беларускіх адукацыйных установаў па палітычных матывах;

21.12. забясьпечыць рэгістрацыю Ўсходне-Еўрапейскай школе палітычных дасьледаваньняў і абмеркаваць магчымасьць удзелу ў яе дзейнасьці маладых дзяржаўных служачых;

21.13. прадаставіць паўнавартасную падтрымку дзейнасьці Інфармацыйнага прадстаўніцтва Савету Еўропы ў Менску;

21.14. максімальна выкарыстоўваць канвенцыі Савету Еўропы, падпісантам якіх зьяўляецца Беларусь, шляхам актыўнага і канструктыўнага ўдзелу ў дзейнасьці, прадугледжанай гэтымі дамовамі.

22. Нарэшце, Асамблея заклікае беларускі парламент і іншыя органы ўлады неадкладна абвесьціць афіцыйны мараторый на сьмяротнае пакараньне і іх выкананьне з мэтай забароны прымяненьня сьмяротнага пакараньня і ўвядзеньня адпаведнага заканадаўства як наступны крок на шляху яго поўнай забароны.



## Зьмест

Уступ ..... 3

1. Сьмяротнае пакараньне ..... 30
2. Праблема палітычна матываваных зьнікненьняў ..... 46
3. Крымінальны перасьлед па палітычных матывах ..... 59
4. Выкананьне правоў грамадзянаў на свабоду выказваньня меркаваньняў, атрыманьне і распаўсюд інфармацыі ..... 69
5. Дыскрымінацыя ..... 109
6. Рэалізацыя свабоды асацыяцыяў ..... 127
7. Рэалізацыя свабоды мірных сходаў ..... 143
8. Ціск сьпецслужбаў на грамадзянаў у сувязі з іх грамадзка-палітычнай дзейнасьцю ..... 153
9. Незаконны прызыў на тэрміновую вайсковую службу ў мэтах ізаляцыі грамадзка і палітычна актыўнай моладзі ..... 160
10. Выкарыстаньне катаваньняў і іншых відаў жорсткага ці негуманнага абыходжаньня ..... 167

Дадаткі

Дадатак 1. Рашэньне Міністэрства юстыцыі аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі ГПА «Наша Вясна» ад 02.03.2009 г. ..... 178

Дадатак 2. Рашэньне Вярхоўнага суда аб адмове ў задавальненьні скаргі на рашэньне Міністэрства юстыцыі аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі ГПА «Наша Вясна» ад 22.04.2009 г. ..... 183

Дадатак 3. Рашэньне Міністэрства юстыцыі аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі ГПА «Наша Вясна» ад 12.05.2009 г. ........................ 186
Дадатак 4. Рашэньне Вярхоўнага суда аб адмове ў задавальненьні скаргі на рашэньне Міністэрства юстыцыі аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі ГПА «Наша Вясна» ад 12.08.2009 г. ........................ 189
Дадатак 5. Судовы працэс «Грамадзкае праваабарончае аб'яднаньне «Наша Вясна» супраць Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь». Справаздача аб судовым назіраньні. ........................................... 192
Дадатак 6. Рэзалюцыя Еўрапейскага парламенту ад 15 студзеня 2009 году аб стратэгіі ЕС у дачыненьні да Беларусі. ...................................... 204
Дадатак 7. Рэзалюцыя Еўрапейскага парламенту па выніках ацэнкі дыялогу ЕС і Беларусі ад 02.04.2009 г. ........ 210
Дадатак 8. Рэзалюцыя Еўрапейскага парламенту па Беларусі ад 17.12.2009 г. .................................... 215
Дадатак 9. Рэзалюцыя Парламенцкай Асамблеі Савету Еўропы аб сітуацыі ў Беларусі ад 23.06.2009 г. ...... 223